# БЮДЖЭТНЫ КОДЭКС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
16 ліпеня 2008 г. № 412-З

*Прыняты Палатай прадстаўнікоў 17 чэрвеня 2008 года*
*Адобраны Саветам Рэспублікі 28 чэрвеня 2008 года*

Змяненні і дапаўненні:

Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 кастрычніка 2010 г. № 175-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 252, 2/1727) <H11000175>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 13 снежня 2011 г. № 325-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 140, 2/1877) <H11100325>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2011 г. № 334-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2012 г., № 2, 2/1884) <H11100334> – **Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 6 красавіка 2012 г.;**

Закон Рэспублікі Беларусь ад 26 кастрычніка 2012 г. № 429-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 02.11.2012, 2/1981) <H11200429>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 31 снежня 2014 г. № 229-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 09.01.2015, 2/2227) <H11400229>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2015 г. № 342-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 01.01.2016, 2/2342) <H11500342>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 31 снежня 2017 г. № 84-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 05.01.2018, 2/2522) <H11700084> – унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 1 студзеня 2019 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2018 г. № 159-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 01.01.2019, 2/2594) <H11800159>

Прыпыненне дзеяння:

Закон Рэспублікі Беларусь ад 29 снежня 2009 г. № 70-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 2, 2/1622) <H10900070>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 29 снежня 2009 г. № 73-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 14, 2/1625) <H10900073>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 кастрычніка 2010 г. № 173-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 251, 2/1725) <H11000173>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 кастрычніка 2010 г. № 176-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 261, 2/1728) <H11000176>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2011 г. № 329-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2012 г., № 2, 2/1881) <H11100329>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2011 г. № 331-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2012 г., № 5, 2/1883) <H11100331>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 26 кастрычніка 2012 г. № 430-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 01.11.2012, 2/1982) <H11200430>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 26 кастрычніка 2012 г. № 432-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 03.11.2012, 2/1984) <H11200432>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 31 снежня 2013 г. № 95-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 02.01.2014, 2/2093) <H11300095>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 31 снежня 2013 г. № 97-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 02.01.2014, 2/2095) <H11300097>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2014 г. № 221-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 03.01.2015, 2/2219) <H11400221>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2014 г. № 225-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 03.01.2015, 2/2223) <H11400225>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2015 г. № 339-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 01.01.2016, 2/2337) <H11500339>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 18 кастрычніка 2016 г. № 430-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 21.10.2016, 2/2428) <H11600430>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 31 снежня 2017 г. № 85-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 05.01.2018, 2/2523) <H11700085>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 31 снежня 2017 г. № 86-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 05.01.2018, 2/2524) <H11700086>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2018 г. № 158-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 01.01.2019, 2/2593) <H11800158>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2018 г. № 160-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 01.01.2019, 2/2595) <H11800160>

## ЗМЕСТ

АГУЛЬНАЯ ЧАСТКА
РАЗДЗЕЛ I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ
ГЛАВА 1. АСНОЎНЫЯ ПАЛАЖЭННІ
Артыкул 1. Бюджэтныя адносіны

Артыкул 2. Асноўныя тэрміны і іх азначэнні
ГЛАВА 2. БЮДЖЭТНАЕ ЗАКАНАДАЎСТВА
Артыкул 3. Бюджэтнае заканадаўства
Артыкул 4. Дзеянне закона аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год і рашэнняў мясцовых Саветаў дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год у часе
Артыкул 4[1]. План фарміравання і выкарыстання грашовых сродкаў ва ўмовах надзвычайнага, ваеннага становішча
Артыкул 5. Фінансавы год
РАЗДЗЕЛ II. БЮДЖЭТНАЯ СІСТЭМА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ. ДЗЯРЖАЎНЫЯ ПАЗАБЮДЖЭТНЫЯ ФОНДЫ
ГЛАВА 3. БЮДЖЭТНАЯ СІСТЭМА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ. КАНСАЛІДАВАНЫЯ БЮДЖЭТЫ
Артыкул 6. Структура бюджэтнай сістэмы Рэспублікі Беларусь
Артыкул 7. Кансалідаваны бюджэт
Артыкул 8. Прынцыпы бюджэтнай сістэмы Рэспублікі Беларусь
Артыкул 9. Прававая форма рэспубліканскага бюджэту і мясцовых бюджэтаў
ГЛАВА 4. БЮДЖЭТНАЯ КЛАСІФІКАЦЫЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
Артыкул 10. Склад бюджэтнай класіфікацыі Рэспублікі Беларусь
Артыкул 11. Адзінства бюджэтнай класіфікацыі Рэспублікі Беларусь
Артыкул 12. Класіфікацыя даходаў бюджэту
Артыкул 13. Функцыянальная класіфікацыя расходаў бюджэту
Артыкул 14. Праграмная класіфікацыя расходаў бюджэту
Артыкул 15. Эканамічная класіфікацыя расходаў бюджэту
Артыкул 16. Ведамасная класіфікацыя расходаў рэспубліканскага бюджэту і мясцовых бюджэтаў
Артыкул 17. Класіфікацыя фінансавання дэфіцыту (выкарыстання прафіцыту) бюджэту
Артыкул 18. Класіфікацыя відаў дзяржаўнага доўгу Рэспублікі Беларусь
Артыкул 19. Устанаўленне бюджэтнай класіфікацыі Рэспублікі Беларусь
ГЛАВА 5. ДЗЯРЖАЎНЫЯ ПАЗАБЮДЖЭТНЫЯ ФОНДЫ
Артыкул 20. Прынцыпы і прававы статус дзяржаўных пазабюджэтных фондаў
Артыкул 21. Складанне, разгляд і зацвярджэнне бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў
Артыкул 21[1]. Паказчыкі, якія зацвярджаюцца заканадаўчым актам аб бюджэце дзяржаўнага пазабюджэтнага фонда
Артыкул 22. Даходы, расходы і дэфіцыт (прафіцыт) бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў
Артыкул 22[1]. Бюджэтны роспіс бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонда
Артыкул 23. Выкананне бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў і кантроль за іх выкананнем
Артыкул 23[1]. Унясенне змяненняў і (або) дапаўненняў у заканадаўчыя акты аб бюджэтах дзяржаўных пазабюджэтных фондаў на бягучы фінансавы год на працягу фінансавага года
Артыкул 23[2]. Удакладненне асобных паказчыкаў бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў на працягу фінансавага года
Артыкул 23[3]. Парадак унясення змяненняў і (або) дапаўненняў у заканадаўчыя акты аб бюджэтах дзяржаўных пазабюджэтных фондаў на бягучы

фінансавы год і ўдакладненне асобных паказчыкаў бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў на працягу фінансавага года
РАЗДЗЕЛ III. ДАХОДЫ І РАСХОДЫ БЮДЖЭТАЎ
ГЛАВА 6. ДАХОДЫ БЮДЖЭТАЎ
Артыкул 24. Групы даходаў бюджэтаў
Артыкул 25. Выплата і залічэнне даходаў у бюджэты
Артыкул 25[1]. Залічэнне дзяржаўнай пошліны
Артыкул 26. Залічэнне штрафаў
Артыкул 26[1]. Залічэнне сродкаў, якія атрымліваюцца дзяржаўнымі органамі
Артыкул 27. Уласныя даходы рэспубліканскага бюджэту і мясцовых бюджэтаў
Артыкул 2 8. Устанаўленне нарматываў адлічэнняў ад рэспубліканскіх падаткаў, збораў (пошлін), мясцовых падаткаў і збораў
Артыкул 29. Фарміраванне даходаў рэспубліканскага бюджэту і мясцовых бюджэтаў
Артыкул 30. Падатковыя даходы рэспубліканскага бюджэту
Артыкул 31. Непадатковыя даходы рэспубліканскага бюджэту
Артыкул 32. Падатковыя даходы абласных бюджэтаў
Артыкул 33. Непадатковыя даходы абласных бюджэтаў
Артыкул 34. Падатковыя даходы бюджэтаў базавага і першаснага ўзроўняў
Артыкул 35. Непадатковыя даходы бюджэтаў базавага і першаснага ўзроўняў
Артыкул 36. Падатковыя даходы бюджэту г. Мінска
Артыкул 37. Непадатковыя даходы бюджэту г. Мінска
ГЛАВА 7. РАСХОДЫ БЮДЖЭТАЎ
Артыкул 38. Фарміраванне расходаў бюджэтаў
Артыкул 39. Бягучыя расходы бюджэтаў
Артыкул 40. Капітальныя расходы бюджэтаў
Артыкул 41. Формы давання бюджэтных сродкаў
Артыкул 42. Рэзервовыя фонды
Артыкул 43. Рэзервовы фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь
Артыкул 44. Расходы, якія фінансуюцца з рэспубліканскага бюджэту
Артыкул 45. Расходы, якія фінансуюцца з абласных бюджэтаў
Артыкул 46. Расходы, якія фінансуюцца з бюджэтаў базавага і першаснага ўзроўняў
Артыкул 47. Расходы бюджэту г. Мінска
РАЗДЗЕЛ IV. ЗБАЛАНСАВАНАСЦЬ БЮДЖЭТАЎ
ГЛАВА 8. ДЭФІЦЫТ (ПРАФІЦЫТ) РЭСПУБЛІКАНСКАГА БЮДЖЭТУ, МЯСЦОВЫХ БЮДЖЭТАЎ, ЯГО ЗАЦВЯРДЖЭННЕ
Артыкул 48. Дэфіцыт (прафіцыт) бюджэту і парадак яго зацвярджэння
Артыкул 49. Крыніцы фінансавання дэфіцыту (напрамкі выкарыстання прафіцыту) бюджэту
Артыкул 50. Крыніцы фінансавання дэфіцыту (напрамкі выкарыстання прафіцыту) рэспубліканскага бюджэту
Артыкул 51. Крыніцы фінансавання дэфіцыту (напрамкі выкарыстання прафіцыту) мясцовых бюджэтаў
ГЛАВА 9. ЗАПАЗЫЧАННІ
Артыкул 52. Ажыццяўленне запазычанняў
Артыкул 53. Даўгавыя абавязацельствы Рэспублікі Беларусь
Артыкул 54. Кіраванне дзяржаўным доўгам Рэспублікі Беларусь

Артыкул 55. Ліміты ўнутранага дзяржаўнага доўгу і ўнутранага доўгу, гарантаванага Рэспублікай Беларусь, знешняга дзяржаўнага доўгу і знешняга доўгу, гарантаванага Рэспублікай Беларусь
Артыкул 56. Дзяржаўныя каштоўныя паперы
Артыкул 57. Абслугоўванне і пагашэнне дзяржаўнага доўгу Рэспублікі Беларусь
Артыкул 58. Рэструктурызацыя дзяржаўнага доўгу Рэспублікі Беларусь і даўгавых абавязацельстваў перад рэспубліканскім бюджэтам
Артыкул 59. Склад дзяржаўнага доўгу Рэспублікі Беларусь
Артыкул 60. Абслугоўванне і пагашэнне знешняга дзяржаўнага доўгу
Артыкул 61. Выключаны
Артыкул 62. Улік знешняга дзяржаўнага доўгу і знешняга доўгу, гарантаванага Рэспублікай Беларусь
Артыкул 63. Абслугоўванне і пагашэнне ўнутранага дзяржаўнага доўгу
Артыкул 64. Улік унутранага дзяржаўнага доўгу і ўнутранага доўгу, гарантаванага Рэспублікай Беларусь
Артыкул 65. Даўгавыя абавязацельствы органаў мясцовага кіравання і самакіравання
Артыкул 66. Бюджэтная пазыка
Артыкул 67. Даванне бюджэтнага крэдыту
Артыкул 68. Гарантыі Урада Рэспублікі Беларусь
ГЛАВА 10. ДАВАННЕ ДЗЯРЖАЎНЫХ КРЭДЫТАЎ РЭСПУБЛІКАЙ БЕЛАРУСЬ
Артыкул 69. Даванне дзяржаўных крэдытаў Рэспублікай Беларусь і доўг замежных дзяржаў, міжнародных арганізацый і іншых нерэзідэнтаў Рэспублікі Беларусь перад Рэспублікай Беларусь
Артыкул 70. Праграма давання Рэспублікай Беларусь дзяржаўных крэдытаў замежным дзяржавам, міжнародным арганізацыям і іншым нерэзідэнтам Рэспублікі Беларусь
РАЗДЗЕЛ V. МІЖБЮДЖЭТНЫЯ АДНОСІНЫ
ГЛАВА 11. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ
Артыкул 71. Асновы міжбюджэтных адносін
Артыкул 72. Прынцыпы міжбюджэтных адносін
Артыкул 73. Перадача даходаў і расходаў бюджэтаў
Артыкул 74. Правы дзяржаўных органаў пры даванні міжбюджэтных трансфертаў ніжэйстаячым бюджэтам
ГЛАВА 12. МІЖБЮДЖЭТНЫЯ ТРАНСФЕРТЫ
Артыкул 75. Формы міжбюджэтных трансфертаў
Артыкул 76. Разлік расходаў, якія ўлічваюцца пры вызначэнні аб'ёму датацыі
Артыкул 77. Субвенцыі
АСАБЛІВАЯ ЧАСТКА
РАЗДЗЕЛ VI. УДЗЕЛЬНІКІ БЮДЖЭТНАГА ПРАЦЭСУ І ІХ ПАЎНАМОЦТВЫ
ГЛАВА 13. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ
Артыкул 78. Удзельнікі бюджэтнага працэсу
Артыкул 79. Бюджэтныя арганізацыі
Артыкул $79^1$. Адміністратары даходаў бюджэту
ГЛАВА 14. РАСПАРАДЧЫКІ І АТРЫМАЛЬНІКІ БЮДЖЭТНЫХ СРОДКАЎ
Артыкул 80. Распарадчыкі бюджэтных сродкаў
Артыкул 81. Асноўныя функцыі распарадчыкаў бюджэтных сродкаў
Артыкул 82. Правы і абавязкі атрымальнікаў бюджэтных сродкаў

РАЗДЗЕЛ VII. СКЛАДАННЕ ПРАЕКТАЎ РЭСПУБЛІКАНСКАГА БЮДЖЭТУ, МЯСЦОВЫХ БЮДЖЭТАЎ І СЯРЭДНЕТЭРМІНОВЫХ ФІНАНСАВЫХ ПРАГРАМ
ГЛАВА 15. АСНОВЫ СКЛАДАННЯ ПРАЕКТАЎ РЭСПУБЛІКАНСКАГА БЮДЖЭТУ, МЯСЦОВЫХ БЮДЖЭТАЎ І СЯРЭДНЕТЭРМІНОВЫХ ФІНАНСАВЫХ ПРАГРАМ
Артыкул 83. Агульныя палажэнні
Артыкул 84. Арганізацыя складання праектаў рэспубліканскага бюджэту і мясцовых бюджэтаў
Артыкул 85. Асноўныя напрамкі бюджэтна-фінансавай і падатковай палітыкі Рэспублікі Беларусь на чарговы фінансавы год і планавы перыяд
Артыкул $85^1$. Абаротная касавая наяўнасць
Артыкул 86. Сярэднетэрміновая фінансавая праграма
Артыкул 87. Дзяржаўныя праграмы
Артыкул $87^1$. Рэестры расходных абавязацельстваў
ГЛАВА 16. СКЛАДАННЕ ПРАЕКТА РЭСПУБЛІКАНСКАГА БЮДЖЭТУ
Артыкул 88. Дакументы і матэрыялы, якія складаюцца і падаюцца адначасова з праектам закона аб рэспубліканскім бюджэце на наступны фінансавы год
Артыкул 89. Паказчыкі, якія зацвярджаюцца законам аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год
Артыкул 90. Асаблівасці выкарыстання праграмна-мэтавага метаду пры складанні праекта рэспубліканскага бюджэту
Артыкул 91. Парадак складання праекта рэспубліканскага бюджэту і разліковых паказчыкаў па кансалідаваным бюджэце Рэспублікі Беларусь
ГЛАВА 17. СКЛАДАННЕ ПРАЕКТАЎ МЯСЦОВЫХ БЮДЖЭТАЎ
Артыкул 92. Дакументы і матэрыялы, якія складаюцца і падаюцца адначасова з праектам рашэння мясцовага Савета дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год
Артыкул 93. Паказчыкі, якія зацвярджаюцца рашэннем мясцовага Савета дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год
Артыкул $93^1$. Асаблівасці выкарыстання праграмна-мэтавага метаду пры складанні праекта мясцовага бюджэту
Артыкул 94. Парадак і тэрміны складання праектаў мясцовых бюджэтаў
РАЗДЗЕЛ VIII. РАЗГЛЯД І ЗАЦВЯРДЖЭННЕ РЭСПУБЛІКАНСКАГА БЮДЖЭТУ І МЯСЦОВЫХ БЮДЖЭТАЎ
ГЛАВА 18. АСНОВЫ РАЗГЛЯДУ І ЗАЦВЯРДЖЭННЯ РЭСПУБЛІКАНСКАГА БЮДЖЭТУ І МЯСЦОВЫХ БЮДЖЭТАЎ
Артыкул 95. Унясенне праектаў рэспубліканскага бюджэту і мясцовых бюджэтаў на чарговы фінансавы год на разгляд Палаты прадстаўнікоў і мясцовых Саветаў дэпутатаў
Артыкул 96. Разгляд і зацвярджэнне рэспубліканскага бюджэту і мясцовых бюджэтаў на чарговы фінансавы год
Артыкул 97. Часовае кіраванне рэспубліканскім бюджэтам і мясцовымі бюджэтамі
ГЛАВА 19. ПАРАДАК РАЗГЛЯДУ І ЗАЦВЯРДЖЭННЯ РЭСПУБЛІКАНСКАГА БЮДЖЭТУ І МЯСЦОВЫХ БЮДЖЭТАЎ
Артыкул 98. Унясенне праекта закона аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год у Палату прадстаўнікоў

Артыкул 99. Парадак разгляду праекта закона аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год Парламентам Рэспублікі Беларусь
Артыкул 100. Асновы разгляду і зацвярджэння праектаў рашэнняў мясцовых Саветаў дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год
РАЗДЗЕЛ IX. ВЫКАНАННЕ РЭСПУБЛІКАНСКАГА БЮДЖЭТУ І МЯСЦОВЫХ БЮДЖЭТАЎ
ГЛАВА 20. АСНОВЫ ВЫКАНАННЯ РЭСПУБЛІКАНСКАГА БЮДЖЭТУ І МЯСЦОВЫХ БЮДЖЭТАЎ
Артыкул 101. Асновы выканання бюджэтаў
Артыкул 102. Арганізацыя выканання бюджэтаў
Артыкул 103. Бюджэтны каштарыс
Артыкул 104. Правы Міністэрства фінансаў, яго тэрытарыяльных органаў і мясцовых фінансавых органаў, выканаўчых і распарадчых органаў першаснага тэрытарыяльнага ўзроўню пры выкананні бюджэтаў
Артыкул 105. Казначэйская сістэма выканання бюджэтаў
Артыкул $105^1$. Асаблівасці выканання рэспубліканскага бюджэту дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі і консульскімі ўстановамі Рэспублікі Беларусь
ГЛАВА 21. ВЫКАНАННЕ РЭСПУБЛІКАНСКАГА БЮДЖЭТУ
Артыкул 106. Казначэйскае выкананне рэспубліканскага бюджэту
Артыкул 107. Бюджэтны роспіс рэспубліканскага бюджэту
Артыкул 108. Выкананне рэспубліканскага бюджэту па даходах
Артыкул 109. Выкананне рэспубліканскага бюджэту па расходах
ГЛАВА $21^1$. ВЫКАНАННЕ СУДОВЫХ ПАСТАНОЎ ЗА КОШТ СРОДКАЎ БЮДЖЭТАЎ
Артыкул $109^1$. Выкананне судовых пастаноў аб накіраванні спагнання на сродкі бюджэтаў
Артыкул $109^2$. Парадак выканання судовых пастаноў
ГЛАВА 22. УНЯСЕННЕ ЗМЯНЕННЯЎ І (АБО) ДАПАЎНЕННЯЎ У ЗАКОН АБ РЭСПУБЛІКАНСКІМ БЮДЖЭЦЕ НА БЯГУЧЫ ФІНАНСАВЫ ГОД, УДАКЛАДНЕННЕ АСОБНЫХ ПАКАЗЧЫКАЎ РЭСПУБЛІКАНСКАГА БЮДЖЭТУ
Артыкул 110. Унясенне змяненняў і (або) дапаўненняў у закон аб рэспубліканскім бюджэце на бягучы фінансавы год на працягу фінансавага года
Артыкул 111. Удакладненне асобных паказчыкаў рэспубліканскага бюджэту на працягу фінансавага года
Артыкул 112. Парадак унясення змяненняў і (або) дапаўненняў у закон аб рэспубліканскім бюджэце на бягучы фінансавы год, удакладнення асобных паказчыкаў рэспубліканскага бюджэту на працягу фінансавага года
ГЛАВА 23. ПАДРЫХТОЎКА І РАЗГЛЯД ПРАЕКТА ЗАКОНА АБ ЗАЦВЯРДЖЭННІ СПРАВАЗДАЧЫ АБ ВЫКАНАННІ РЭСПУБЛІКАНСКАГА БЮДЖЭТУ ЗА СПРАВАЗДАЧНЫ ФІНАНСАВЫ ГОД
Артыкул 113. Падрыхтоўка справаздачы аб выкананні рэспубліканскага бюджэту за справаздачны фінансавы год
Артыкул 114. Дакументы і матэрыялы, якія ўносяцца адначасова з праектам закона аб зацвярджэнні справаздачы аб выкананні рэспубліканскага бюджэту за справаздачны фінансавы год

Артыкул 115. Правядзенне знешняй праверкі справаздачы аб выкананні рэспубліканскага бюджэту за справаздачны фінансавы год
Артыкул 116. Разгляд праекта закона аб зацвярджэнні справаздачы аб выкананні рэспубліканскага бюджэту за справаздачны фінансавы год Парламентам Рэспублікі Беларусь
ГЛАВА 24. ВЫКАНАННЕ МЯСЦОВЫХ БЮДЖЭТАЎ
Артыкул 117. Органы, якія ажыццяўляюць выкананне мясцовых бюджэтаў
Артыкул 118. Казначэйскае выкананне мясцовых бюджэтаў
Артыкул 119. Бюджэтны роспіс мясцовых бюджэтаў
Артыкул 120. Выкананне мясцовых бюджэтаў па даходах
Артыкул 121. Выкананне мясцовых бюджэтаў па расходах
Артыкул 122. Унясенне змяненняў і (або) дапаўненняў у рашэнне мясцовага Савета дэпутатаў аб бюджэце на бягучы фінансавы год
Артыкул 123. Функцыі адміністрацый раёнаў у г. Мінску і фінансавых органаў адміністрацый раёнаў у г. Мінску па складанні і выкананні бюджэтнага каштарыса адміністрацыі раёна ў г. Мінску
Артыкул 124. Справаздачы аб выкананні мясцовых бюджэтаў
РАЗДЗЕЛ X. АСНОВЫ КАНТРОЛЮ ЗА ВЫКАНАННЕМ БЮДЖЭТНАГА ЗАКАНАДАЎСТВА І АДКАЗНАСЦЬ ЗА ЯГО ПАРУШЭННЕ
ГЛАВА 25. АСНОВЫ КАНТРОЛЮ ЗА ВЫКАНАННЕМ БЮДЖЭТНАГА ЗАКАНАДАЎСТВА
Артыкул 125. Паўнамоцтвы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Парламента Рэспублікі Беларусь і Урада Рэспублікі Беларусь
Артыкул 126. Паўнамоцтвы органаў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь
Артыкул 127. Паўнамоцтвы мясцовых Саветаў дэпутатаў
Артыкул 128. Паўнамоцтвы Міністэрства фінансаў, яго тэрытарыяльных органаў, мясцовых фінансавых органаў, фінансавых органаў адміністрацый раёнаў
Артыкул 129. Паўнамоцтвы Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь і інспекцый Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь
Артыкул 130. Паўнамоцтвы мытных органаў Рэспублікі Беларусь
Артыкул 131. Паўнамоцтвы мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў
Артыкул 132. Паўнамоцтвы распарадчыкаў бюджэтных сродкаў
ГЛАВА 26. АДКАЗНАСЦЬ ЗА ПАРУШЭННЕ БЮДЖЭТНАГА ЗАКАНАДАЎСТВА
Артыкул 133. Парушэнне бюджэтнага заканадаўства
Артыкул 134. Меры прымусу, якія прымяняюцца за парушэнне бюджэтнага заканадаўства, і органы, якія маюць права на іх прымяненне
Артыкул 135. Падставы для прымянення мер прымусу за парушэнне бюджэтнага заканадаўства
Артыкул 136. Незаконнае атрыманне сродкаў з бюджэту
Артыкул 137. Нямэтавае выкарыстанне сродкаў бюджэту
Артыкул 138. Выкарыстанне сродкаў бюджэту з парушэннем бюджэтнага заканадаўства
Артыкул 139. Даванне бюджэтных пазычак , бюджэтных пазык з парушэннем устаноўленага парадку

Артыкул 140. Незварот або несвоечасовы зварот бюджэтных сродкаў, дадзеных на зваротнай аснове
Артыкул 141. НеПералічэнне, няпоўнае пералічэнне бюджэтных сродкаў атрымальнікам бюджэтных сродкаў
Артыкул 142. Непералічэнне працэнтаў (платы) за карыстанне бюджэтнымі сродкамі, дадзенымі на аплатнай аснове
Артыкул 143. Невыкананне або неналежнае выкананне банкамі плацежных інструкцый на пералічэнне грашовых сродкаў
Артыкул 144. Непадаванне ва ўстаноўленыя тэрміны бухгалтарскай справаздачнасці і іншых звестак аб выкарыстанні бюджэтных сродкаў, інфармацыі аб руху бюджэтных сродкаў па рахунках іх атрымальнікаў
Артыкул 145. Парушэнне ўмоў дагавора з выкарыстаннем бюджэтных сродкаў
Артыкул 146. Спагнанне грашовых сродкаў з арганізацый, індывідуальных прадпрымальнікаў і прыпыненне аперацый па рахунках арганізацый, індывідуальных прадпрымальнікаў у банках
РАЗДЗЕЛ XI. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ
ГЛАВА 27. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ
Артыкул 147. Прызнанне, што некаторыя акты заканадаўства і асобныя палажэнні заканадаўчых актаў страцілі сілу
Артыкул 148. Прывядзенне актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Кодэксам
Артыкул 149. Уступленне ў сілу гэтага Кодэкса
Дадатак. Функцыянальная класіфікацыя расходаў бюджэту па раздзелах і падраздзелах

## АГУЛЬНАЯ ЧАСТКА

## РАЗДЗЕЛ I
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

## ГЛАВА 1
## АСНОЎНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

**Артыкул 1. Бюджэтныя адносіны**

Бюджэтныя адносіны – адносіны паміж удзельнікамі бюджэтнага працэсу, якія ўзнікаюць пры складанні, разглядзе, зацвярджэнні, выкананні рэспубліканскага бюджэту, мясцовых бюджэтаў і бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, складанні, разглядзе і зацвярджэнні справаздач аб іх выкананні, вызначэнні праў і абавязкаў удзельнікаў бюджэтнага працэсу, ажыццяўленні запазычанняў у бюджэты, у міжбюджэтных адносінах, а таксама пры ажыццяўленні кантролю за выкананнем бюджэтаў і прымяненні адказнасці за парушэнне бюджэтнага заканадаўства.

**Артыкул 2. Асноўныя тэрміны і іх азначэнні**

1. У гэтым Кодэксе прымяняюцца наступныя асноўныя тэрміны і іх азначэнні:

1.1. банк-агент Урада Рэспублікі Беларусь – банк, упаўнаважаны рашэннем Урада Рэспублікі Беларусь на ажыццяўленне аперацый па прыцягненні, абслугоўванні і пагашэнні знешніх дзяржаўных пазык і знешніх пазык, прыцягнутых пад гарантыі Урада Рэспублікі Беларусь;

$1.1^{1}$. выключаны;

1.2. бюджэт – план фарміравання і выкарыстання грашовых сродкаў для забеспячэння рэалізацыі задач і функцый дзяржавы;

1.3. бюджэтная класіфікацыя Рэспублікі Беларусь – сістэматызаваная групоўка даходаў і расходаў бюджэту, крыніц фінансавання дэфіцыту (напрамкаў выкарыстання прафіцыту) бюджэту, відаў дзяржаўнага доўгу Рэспублікі Беларусь, якая забяспечвае рэспубліканскую і міжнародную супастаўнасць паказчыкаў;

1.4. бюджэтная арганізацыя – арганізацыя, створаная (утвораная) Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, дзяржаўнымі органамі, у тым ліку мясцовым выканаўчым і распарадчым органам, або іншай упаўнаважанай на тое Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь дзяржаўнай арганізацыяй для ажыццяўлення кіраўніцкіх, сацыяльна-культурных, навукова-тэхнічных або іншых функцый некамерцыйнага характару, функцыянаванне якой фінансуецца за кошт сродкаў адпаведнага бюджэту на аснове бюджэтнага каштарыса і бухгалтарскі ўлік якой вядзецца ў адпаведнасці з планам рахункаў бухгалтарскага ўліку, зацверджаным ва ўстаноўленым парадку для бюджэтных арганізацый, і (або) з улікам асаблівасцей бухгалтарскага ўліку і справаздачнасці ў адпаведнасці з заканадаўствам;

1.5. бюджэтны роспіс – размеркаванне даходаў і расходаў бюджэту, крыніц фінансавання дэфіцыту (напрамкаў выкарыстання прафіцыту) бюджэту па кварталах года ў адпаведнасці з бюджэтнай класіфікацыяй Рэспублікі Беларусь;

1.6. бюджэтная сістэма Рэспублікі Беларусь – сукупнасць рэспубліканскага бюджэту і мясцовых бюджэтаў Рэспублікі Беларусь, якая рэгулюецца заканадаўствам, заснаваная на эканамічных адносінах і дзяржаўным ладзе Рэспублікі Беларусь;

1.7. бюджэтны каштарыс – фінансавы план, які ўстанаўлівае аб'ём, мэтавае накіраванне і размеркаванне бюджэтных сродкаў у адпаведнасці з бюджэтным роспісам;

1.8. бюджэтная пазычка – бюджэтныя сродкі, якія даюцца юрыдычным асобам, якія з'яўляюцца рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь (акрамя бюджэтных арганізацый, банкаў, страхавых і нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацый, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь), індывідуальным прадпрымальнікам на зваротнай і бязвыплатнай аснове на ажыццяўленне пэўных мэтавых расходаў;

1.9. бюджэтныя асігнаванні – паўнамоцтвы на выкарыстанне сумы бюджэтных сродкаў, вызначанай распарадчыкам бюджэтных сродкаў атрымальніку бюджэтных сродкаў у адпаведным фінансавым годзе для выканання бюджэтных абавязацельстваў;

1.10. бюджэтныя прызначэнні – паўнамоцтвы на выкарыстанне і (або) размеркаванне пэўнай сумы бюджэтных сродкаў, дадзеныя на падставе рэестра расходных абавязацельстваў распарадчыкам бюджэтных сродкаў законам аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год або рашэннем мясцовага Савета дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год у парадку, вызначаным гэтым Кодэксам;

1.11. бюджэтныя абавязацельствы – расходныя абавязацельствы, атрыманыя і прынятыя атрымальнікам бюджэтных сродкаў і (або) падлеглыя выкананню ў адпаведным фінансавым годзе за кошт сродкаў адпаведнага бюджэту;

1.12. бюджэтныя трансферты – сродкі, якія перадаюцца з бюджэту на беззваротнай і бязвыплатнай аснове;

1.13. бюджэтная пазыка – бюджэтныя сродкі, што даюцца юрыдычным асобам, якія з'яўляюцца рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь (акрамя бюджэтных арганізацый, банкаў, страхавых і нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацый, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь), індывідуальным прадпрымальнікам на аснове платнасці, тэрміновасці і зваротнасці на ажыццяўленне пэўных мэтавых расходаў;

1.14. бюджэтны крэдыт – бюджэтныя сродкі, якія даюцца з вышэйстаячага бюджэту ніжэйстаячаму бюджэту, а таксама з рэспубліканскага бюджэту бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду або з бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду рэспубліканскаму бюджэту на зваротнай аснове;

1.15. бюджэтны працэс – рэгламентаваная заканадаўствам дзейнасць дзяржаўных органаў, іншых удзельнікаў бюджэтнага працэсу па складанні, разглядзе, зацвярджэнні і выкананні бюджэтаў, кантролі за іх выкананнем, а таксама складанні, разглядзе і зацвярджэнні справаздач аб іх выкананні;

1.16. знешнія дзяржаўныя пазыкі – дзяржаўныя пазыкі, якія прыцягваюцца ад нерэзідэнтаў Рэспублікі Беларусь;

1.16[1]. знешнія пазыкі – пазыкі, якія прыцягваюцца ад нерэзідэнтаў Рэспублікі Беларусь;

1.17. знешні дзяржаўны доўг Рэспублікі Беларусь (далей – знешні дзяржаўны доўг) – сума асноўнага доўгу Рэспублікі Беларусь па знешніх дзяржаўных пазыках і падлеглыя выкананню абавязацельствы ў адпаведнасці з гарантыямі Урада Рэспублікі Беларусь па знешніх пазыках на пэўны момант часу;

1.17[1]. знешні доўг, гарантаваны Рэспублікай Беларусь, – сума асноўнага доўгу па знешніх пазыках, прыцягнутых ад нерэзідэнтаў Рэспублікі Беларусь пад гарантыі Урада Рэспублікі Беларусь, на пэўны момант часу;

1.18. унутраныя дзяржаўныя пазыкі – дзяржаўныя пазыкі, якія прыцягваюцца ад рэзідэнтаў Рэспублікі Беларусь;

1.19. унутраны дзяржаўны доўг Рэспублікі Беларусь (далей – унутраны дзяржаўны доўг) – сума асноўнага доўгу Рэспублікі Беларусь па ўнутраных дзяржаўных пазыках і падлеглыя выкананню абавязацельствы ў адпаведнасці з гарантыямі Урада Рэспублікі Беларусь па ўнутраных пазыках на пэўны момант часу;

1.19[1]. унутраны доўг, гарантаваны Рэспублікай Беларусь, – сума асноўнага доўгу па крэдытах, дадзеных банкамі Рэспублікі Беларусь рэзідэнтам Рэспублікі Беларусь пад гарантыі Урада Рэспублікі Беларусь, на пэўны момант часу;

1.20. часовы касавы разрыў – незбалансаванасць даходаў, расходаў і крыніц фінансавання дэфіцыту (напрамкаў выкарыстання прафіцыту), якая часова ўтварылася пры выкананні бюджэту;

1.21. вышэйстаячы бюджэт – рэспубліканскі бюджэт або бюджэт вышэйстаячай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі ў адносінах да бюджэту ніжэйстаячай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі;

1.22. гарантыя мясцовага выканаўчага і распарадчага органа – абавязацельства мясцовага выканаўчага і распарадчага органа абласнога або базавага тэрытарыяльнага ўзроўню як гаранта несці поўнасцю або часткова адказнасць перад крэдыторам за выкананне пазычальнікам абавязацельстваў па звароце крэдыту, выдадзенага банкам Рэспублікі Беларусь, і (або) выплаце працэнтаў за карыстанне ім;

1.23. гарантыя Урада Рэспублікі Беларусь – абавязацельства Рэспублікі Беларусь, ад імя якой выступае Урад Рэспублікі Беларусь, як гаранта несці поўнасцю або часткова адказнасць перад крэдыторам за выкананне пазычальнікам абавязацельстваў па заключаным ім дагаворы пазыкі (крэдыту);

1.24. дзяржаўныя запазычанні – прыцягненне дзяржаўных пазык;

1.25. дзяржаўныя пазыкі – пазыкі (крэдыты), па якіх узнікаюць даўгавыя абавязацельствы Рэспублікі Беларусь як пазычальніка, эмітэнта каштоўнай паперы;

1.26. дзяржаўныя крэдыты – крэдыты (пазыкі), па якіх у замежных дзяржаў, міжнародных арганізацый і іншых нерэзідэнтаў Рэспублікі Беларусь узнікаюць даўгавыя абавязацельствы перад Рэспублікай Беларусь як крэдыторам;

1.27. дзяржаўны пазабюджэтны фонд – фонд грашовых сродкаў, які ўтвараецца ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі па-за рэспубліканскім бюджэтам для ажыццяўлення пэўных задач і функцый дзяржаўных органаў і іншых дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных Ураду Рэспублікі Беларусь;

1.28. дзяржаўны доўг Рэспублікі Беларусь – сукупнасць знешняга дзяржаўнага доўгу і ўнутранага дзяржаўнага доўгу на пэўны момант часу;

1.29. дзяржаўны мэтавы бюджэтны фонд – сукупнасць грашовых сродкаў, якая фарміруецца ў складзе рэспубліканскага бюджэту, мясцовых бюджэтаў за кошт пэўных даходаў і (або) сродкаў рэспубліканскага бюджэту, мясцовых бюджэтаў і іншых крыніц, якая выкарыстоўваецца на пэўныя мэты;

1.30. дэфіцыт бюджэту – перавышэнне расходаў бюджэту над яго даходамі;

1.31. добраахвотныя ўзносы – добраахвотныя індывідуальна бязвыплатныя плацяжы арганізацый і фізічных асоб у форме адчужэння грашовых сродкаў, якія належаць ім на праве ўласнасці, гаспадарчага вядзення або аператыўнага кіравання, у бюджэт на ажыццяўленне расходаў у адпаведнасці з заканадаўствам;

1.31[1]. доўг, гарантаваны мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, – сума асноўнага доўгу адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак па пазыках, прыцягнутых пад гарантыі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, на пэўны момант часу;

1.32. доўг органаў мясцовага кіравання і самакіравання – сума асноўнага доўгу адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак па пазыках органаў мясцовага кіравання і самакіравання і падлеглыя выкананню абавязацельствы ў адпаведнасці з гарантыямі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў на пэўны момант часу;

1.33. датацыя – міжбюджэтны трансферт, які даецца з вышэйстаячага бюджэту ніжэйстаячаму бюджэту ў выпадку, калі ўласных даходаў недастакова для збалансаванасці ніжэйстаячага бюджэту;

1.34. даходы бюджэту – грашовыя сродкі, якія паступаюць у бюджэт, за выключэннем сродкаў, якія з'яўляюцца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі актамі бюджэтнага заканадаўства крыніцамі фінансавання дэфіцыту бюджэту;

1.34[1]. адзіны казначэйскі рахунак – сукупнасць рахункаў па ўліку сродкаў рэспубліканскага бюджэту, мясцовых бюджэтаў, бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў і іншых сродкаў, адкрытых Міністэрству фінансаў Рэспублікі Беларусь (далей – Міністэрства фінансаў) і яго тэрытарыяльным органам;

1.34[2]. касавае абслугоўванне выканання бюджэту – ажыццяўленне аперацый са сродкамі бюджэту праз адзіны казначэйскі рахунак, улік усіх аперацый і складанне справаздачнасці па выкананні бюджэту;

1.35. ліміты ўнутранага дзяржаўнага доўгу і знешняга дзяржаўнага доўгу – максімальна дапушчальныя сумы ўнутранага дзяржаўнага доўгу і знешняга дзяржаўнага доўгу па стане на канец фінансавага года;

1.35[1]. ліміты ўнутранага доўгу, гарантаванага Рэспублікай Беларусь, і знешняга доўгу, гарантаванага Рэспублікай Беларусь, – максімальна дапушчальныя сумы ўнутранага доўгу, гарантаванага Рэспублікай Беларусь, і знешняга доўгу, гарантаванага Рэспублікай Беларусь, на канец фінансавага года;

1.35[2]. ліміт доўгу органаў мясцовага кіравання і самакіравання – максімальна дапушчальная сума доўгу органаў мясцовага кіравання і самакіравання на канец фінансавага года;

1.35[3]. ліміт доўгу, гарантаванага мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, – максімальна дапушчальная сума доўгу, гарантаванага мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, на канец фінансавага года;

1.36. міжбюджэтныя трансферты – бюджэтныя сродкі, якія перадаюцца з аднаго бюджэту ў іншы бюджэт на беззваротнай і бязвыплатнай аснове;

1.37. мясцовы фінансавы орган – структурнае падраздзяленне мясцовага выканаўчага і распарадчага органа абласнога або базавага тэрытарыяльнага ўзроўню, да асноўных функцый якога адносіцца арганізацыя работы па складанні і выкананні адпаведнага мясцовага бюджэту;

1.37[1]. незакончаныя разлікі – абавязацельствы, прынятыя атрымальнікам бюджэтных сродкаў у межах бюджэтных асігнаванняў, але не аплачаныя на працягу фінансавага года па прычынах, якія не залежаць ад атрымальніка бюджэтных сродкаў;

1.38. нерэзідэнты Рэспублікі Беларусь:

фізічныя асобы – замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, акрамя асоб без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь;

юрыдычныя асобы і арганізацыі, якія не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі, з месцазнаходжаннем за граніцамі Рэспублікі Беларусь, створаныя згодна з правам замежных дзяржаў, а таксама іх прадстаўніцтвы, якія знаходзяцца ў Рэспубліцы Беларусь;

дыпламатычныя і іншыя афіцыйныя прадстаўніцтвы замежных дзяржаў, якія знаходзяцца ў Рэспубліцы Беларусь;

міжнародныя арганізацыі і іх прадстаўніцтвы;

замежныя дзяржавы, іх адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі;

1.39. ніжэйстаячы бюджэт – бюджэт ніжэйстаячай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі ў адносінах да бюджэту вышэйстаячай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі або рэспубліканскага бюджэту;

1.40. нарматыў бюджэтнай забяспечанасці – гарантаваны Рэспублікай Беларусь у межах наяўных бюджэтных сродкаў узровень фінансавага забеспячэння паўнамоцтваў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў;

1.41. абаротная касавая наяўнасць – сума сродкаў бюджэту звыш прадугледжаных расходаў за кошт рэшт сродкаў на пачатак фінансавага года, які плануецца, і даходаў бюджэту бягучага года, якая выкарыстоўваецца на працягу года на пакрыццё часовых касавых разрываў і аднаўляецца да канца бягучага года ў памеры, устаноўленым пры зацвярджэнні бюджэту;

1.42. органы мясцовага кіравання і самакіравання – мясцовыя Саветы дэпутатаў і мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы;

1.43. асноўны доўг – сума пазыкі (крэдыту), атрыманая пазычальнікам, эмітэнтам каштоўнай паперы і не вернутая імі;

1.43[1]. справаздачны фінансавы год – год, які папярэднічае бягучаму фінансаваму году;

1.43[2]. чарговы фінансавы год – год, які ідзе следам за бягучы фінансавым годам;

1.43[3]. планавы перыяд – два фінансавыя гады, якія ідуць следам за чарговым фінансавым годам;

1.43[4]. падтрымка – накіраванне асобным катэгорыям юрыдычных асоб, фізічных асоб, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, бюджэтных сродкаў у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі;

1.44. атрымальнік бюджэтных сродкаў – бюджэтная або іншая арганізацыя, індывідуальны прадпрымальнік, якія маюць права на прыняцце і (або) выкананне бюджэтных абавязацельстваў у адпаведным фінансавым годзе і якія адказваюць за мэтавае і эфектыўнае выкарыстанне атрыманых бюджэтных сродкаў;

1.44[1]. карыстальнік знешняй пазыкі – рэзідэнт Рэспублікі Беларусь, якому даюцца сродкі знешняй дзяржаўнай пазыкі або сродкі знешняй пазыкі, гарантаваныя Урадам Рэспублікі Беларусь;

1.44[2]. праграмна-мэтавы метад у бюджэтным працэсе – метад кіравання сродкамі рэспубліканскіх і (або) мясцовых бюджэтаў, бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных

фондаў пры выкананні дзяржаўных праграм, накіраваны на дасягненне канкрэтных вынікаў з улікам ацэнкі эфектыўнасці выкарыстання дадзеных сродкаў на ўсіх стадыях бюджэтнага працэсу;

1.45. прафіцыт бюджэту – перавышэнне даходаў бюджэту над яго расходамі;

1.46. распарадчык бюджэтных сродкаў – арганізацыя, якая ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі актамі бюджэтнага заканадаўства мае паўнамоцтвы на размеркаванне бюджэтных асігнаванняў паміж атрымальнікамі бюджэтных сродкаў, а таксама ажыццяўляе іншыя функцыі;

1.46[1]. расходныя абавязацельствы – абумоўленыя законам Рэспублікі Беларусь, актам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дагаворам або пагадненнем, заключанымі ад імя Рэспублікі Беларусь, яе адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, пастановай Урада Рэспублікі Беларусь, рашэннем мясцовага Савета дэпутатаў, мясцовага выканаўчага і распарадчага органа абавязацельствы Рэспублікі Беларусь, адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі Рэспублікі Беларусь або атрымальніка бюджэтных сродкаў, які дзейнічае ад іх імя, па даванні рэзідэнту і (або) нерэзідэнту Рэспублікі Беларусь сродкаў з адпаведнага бюджэту;

1.47. расходы бюджэту – грашовыя сродкі, якія накіроўваюцца на фінансавае забеспячэнне задач і функцый дзяржавы;

1.48. выключаны;

1.49. рэзідэнты Рэспублікі Беларусь:

фізічныя асобы – грамадзяне Рэспублікі Беларусь, а таксама асобы без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь;

юрыдычныя асобы і арганізацыі, якія не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі, з месцазнаходжаннем у Рэспубліцы Беларусь, створаныя ў адпаведнасці з заканадаўствам, а таксама іх прадстаўніцтвы і філіялы, якія знаходзяцца за граніцамі Рэспублікі Беларусь;

дыпламатычныя прадстаўніцтвы і консульскія ўстановы Рэспублікі Беларусь;

Рэспубліка Беларусь, яе адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі;

1.50. уласныя даходы – даходы бюджэту, залічэнне якіх поўнасцю або часткова ў адпаведны бюджэт прадугледжана ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам;

1.51. субвенцыя – міжбюджэтны трансферт, які даецца іншаму бюджэту на ажыццяўленне пэўных мэтавых расходаў;

1.52. субсідыя – бюджэтны трансферт, які даецца арганізацыі, фізічнай асобе, у тым ліку індывідуальнаму прадпрымальніку, на бягучыя мэты на ўмовах удзелу ў фінансаванні (суфінансаванні) для вытворчасці і (або) рэалізацыі тавараў (работ, паслуг) або частковага пакрыцця мэтавых расходаў;

1.52[1]. бягучы фінансавы год – год, у якім ажыццяўляюцца выкананне бюджэту, складанне і разгляд праекта бюджэту на чарговы фінансавы год і сярэднетэрміновай фінансавай праграмы на чарговы фінансавы год і планавы перыяд;

1.53. фінансавы орган адміністрацыі раёна ў г. Мінску – структурнае падраздзяленне адміністрацыі раёна ў г. Мінску, да асноўных функцый якога адносіцца арганізацыя работы па складанні і выкананні бюджэтнага каштарыса адміністрацыі адпаведнага раёна ў г. Мінску.

2. Тэрміны, прадугледжаныя ў актах грамадзянскай і іншых галін заканадаўства, якія выкарыстоўваюцца ў гэтым Кодэксе, прымяняюцца ў тым значэнні, у якім яны выкарыстоўваюцца ў актах адпаведных галін заканадаўства, калі іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам.

## ГЛАВА 2
## БЮДЖЭТНАЕ ЗАКАНАДАЎСТВА

**Артыкул 3. Бюджэтнае заканадаўства**

1. Бюджэтнае заканадаўства грунтуецца на Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і ўключае ў сябе наступныя акты заканадаўства:

1.1. гэты Кодэкс і прынятыя ў адпаведнасці з ім законы, якія рэгулююць пытанні бюджэтных адносін;

1.2. дэкрэты, указы і распараджэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якія рэгулююць пытанні бюджэтных адносін;

1.3. пастановы Урада Рэспублікі Беларусь, сумесныя пастановы Урада Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, якія рэгулююць пытанні бюджэтных адносін і прымаюцца на падставе і дзеля выканання гэтага Кодэкса, прынятых у адпаведнасці з ім законаў, якія рэгулююць пытанні бюджэтных адносін, і актаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

1.4. нарматыўныя прававыя акты, якія прымаюцца Міністэрствам фінансаў, або Міністэрствам фінансаў і Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь, або іншымі рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання сумесна (па ўзгадненні) з Міністэрствам фінансаў у выпадках і межах, прадугледжаных гэтым Кодэксам, а таксама прынятымі ў адпаведнасці з ім законамі, якія рэгулююць пытанні бюджэтных адносін, актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і пастановамі Урада Рэспублікі Беларусь;

1.5. нарматыўныя прававыя акты органаў мясцовага кіравання і самакіравання, якія прымаюцца ў выпадках і межах, прадугледжаных гэтым Кодэксам, а таксама прынятымі ў адпаведнасці з ім законамі, якія рэгулююць пытанні бюджэтных адносін, актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і пастановамі Урада Рэспублікі Беларусь.

2. Уключэнне палажэнняў, якія рэгулююць пытанні бюджэтных адносін, у іншыя акты заканадаўства забараняецца, калі іншае не ўстаноўлена гэтым Кодэксам або Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

3. Пры ажыццяўленні бюджэтнага працэсу ў Рэспубліцы Беларусь палажэнні бюджэтнага заканадаўства прымяняюцца ў той частцы, у якой яны не супярэчаць палажэнням Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

4. У выпадку разыходжання дэкрэта або ўказа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з гэтым Кодэксам або іншым законам, які рэгулюе пытанні бюджэтных адносін, гэты Кодэкс або іншы закон маюць вяршэнства толькі тады, калі паўнамоцтвы на выданне дэкрэта або ўказа былі дадзены законам.

5. У выпадку разыходжання акта бюджэтнага заканадаўства з актам іншай галіны права, які ўтрымлівае нормы па пытаннях рэгулявання бюджэтных адносін, прымяняюцца палажэнні акта бюджэтнага заканадаўства, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных пунктамі 3 і 4 гэтага артыкула.

6. Нормы бюджэтнага заканадаўства, што ўтрымліваюцца ў міжнародных дагаворах Рэспублікі Беларусь, якія ўступілі ў сілу, з'яўляюцца часткай дзейнага на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь бюджэтнага заканадаўства, падлягаюць непасрэднаму прымяненню, за выключэннем выпадкаў, калі з міжнароднага дагавора вынікае, што для прымянення такіх норм патрабуецца прыняцце (выданне) унутрыдзяржаўнага нарматыўнага прававога акта, і маюць сілу таго нарматыўнага прававога акта, якім выражана згода Рэспублікі Беларусь на абавязковасць для яе адпаведнага міжнароднага дагавора.

**Артыкул 4. Дзеянне закона аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год і рашэнняў мясцовых Саветаў дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год у часе**

1. Закон аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год, рашэнні мясцовых Саветаў дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год павінны ўступаць у сілу з 1 студзеня чарговага фінансавага года.

2. Прыняцце закона аб рэспубліканскім бюджэце на іншы перыяд, чым прадугледжана артыкулам 5 гэтага Кодэкса, можа быць ажыццёўлена толькі ва ўмовах надзвычайнага або ваеннага становішча.

3. У выпадку прыняцця закона аб рэспубліканскім бюджэце на іншы перыяд, чым прадугледжана артыкулам 5 гэтага Кодэкса, рашэнні мясцовых Саветаў дэпутатаў аб бюджэце могуць быць прыняты на такі ж перыяд.

**Артыкул 4[1]. План фарміравання і выкарыстання грашовых сродкаў ва ўмовах надзвычайнага, ваеннага становішча**

1. Ва ўмовах надзвычайнага, ваеннага становішча зацвярджаецца план фарміравання і выкарыстання грашовых сродкаў для забеспячэння бесперабойнага фінансавання мерапрыемстваў па абароне суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці Рэспублікі Беларусь, задавальнення патрэбнасцей дзяржавы і патрэб насельніцтва – надзвычайны бюджэт.

2. Парадак фарміравання, выканання і падрыхтоўкі справаздачы аб выкананні надзвычайнага бюджэту ўстанаўліваецца Урадам Рэспублікі Беларусь з улікам асаблівасцей, устаноўленых заканадаўствам.

3. Зацвярджае надзвычайны бюджэт, справаздачу аб выкананні надзвычайнага бюджэту, прымае рашэнне аб спыненні яго выканання Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 5. Фінансавы год**

Фінансавы год для ўсіх бюджэтаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь устанаўліваецца з 1 студзеня па 31 снежня каляндарнага года.

## РАЗДЗЕЛ II
## БЮДЖЭТНАЯ СІСТЭМА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ. ДЗЯРЖАЎНЫЯ ПАЗАБЮДЖЭТНЫЯ ФОНДЫ

### ГЛАВА 3
### БЮДЖЭТНАЯ СІСТЭМА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ. КАНСАЛІДАВАНЫЯ БЮДЖЭТЫ

**Артыкул 6. Структура бюджэтнай сістэмы Рэспублікі Беларусь**

1. У бюджэтную сістэму Рэспублікі Беларусь як самастойныя часткі ўключаюцца рэспубліканскі бюджэт і мясцовыя бюджэты.

2. Мясцовыя бюджэты дзеляцца на:

2.1. бюджэты першаснага ўзроўню (сельскія, пасялковыя, гарадскія (гарадоў раённага падпарадкавання));

2.2. бюджэты базавага ўзроўню (раённыя і гарадскія (гарадоў абласнога падпарадкавання));

2.3. бюджэты абласнога ўзроўню (абласныя бюджэты і бюджэт г. Мінска).

**Артыкул 7. Кансалідаваны бюджэт**

1. Кансалідаваны бюджэт уяўляе сабой звод бюджэтаў на адпаведнай тэрыторыі без уліку міжбюджэтных трансфертаў паміж гэтымі бюджэтамі, бюджэтных крэдытаў і працэнтаў за карыстанне імі.

2. Кансалідаваны бюджэт раёна складаецца з бюджэтаў сельсаветаў, пасёлкаў гарадскога тыпу, гарадоў раённага падпарадкавання, размешчаных на тэрыторыі раёна, і раённага бюджэту.

3. Кансалідаваны бюджэт вобласці складаецца з кансалідаваных бюджэтаў раёнаў, бюджэтаў гарадоў абласнога падпарадкавання, размешчаных на тэрыторыі вобласці, і абласнога бюджэту.

4. Кансалідаваны бюджэт Рэспублікі Беларусь складаецца з рэспубліканскага бюджэту, кансалідаваных бюджэтаў абласцей і бюджэту г. Мінска.

5. Кансалідаваны бюджэт сектара дзяржаўнага кіравання Рэспублікі Беларусь складаецца з кансалідаванага бюджэту Рэспублікі Беларусь, бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, сродкаў ад дзейнасці, якая прыносіць даходы (далей – пазабюджэтныя сродкі), бюджэтных арганізацый.

**Артыкул 8. Прынцыпы бюджэтнай сістэмы Рэспублікі Беларусь**

1. Бюджэтная сістэма Рэспублікі Беларусь грунтуецца на прынцыпах:

1.1. адзінства;

1.2. паўнаты адлюстравання даходаў і расходаў бюджэтаў;

1.3. збалансаванасці бюджэтаў;

1.4. галоснасці і адкрытасці;

1.5. самастойнасці бюджэтаў;

1.6. эфектыўнасці выкарыстання бюджэтных сродкаў;

1.7. агульнага (сумеснага) пакрыцця расходаў бюджэтаў;

1.8. дакладнасці бюджэтаў;

1.9. адраснасці і мэтавага прызначэння бюджэтных сродкаў;

1.10. адказнасці ўдзельнікаў бюджэтнага працэсу.

2. Прынцып адзінства азначае, што адзінства бюджэтнай сістэмы Рэспублікі Беларусь забяспечваецца адзінай прававой базай, адзінай грашовай сістэмай, адзіным рэгуляваннем бюджэтных адносін, адзінай бюджэтнай класіфікацыяй Рэспублікі Беларусь, адзінствам парадку выканання бюджэтаў, вядзення бухгалтарскага ўліку і складання справаздачнасці.

3. Прынцып паўнаты адлюстравання даходаў і расходаў бюджэтаў азначае, што ўсе даходы і расходы бюджэтаў, вызначаныя заканадаўствам, падлягаюць адлюстраванню ў бюджэтах у абавязковым парадку і поўным аб'ёме.

4. Прынцып збалансаванасці бюджэтаў азначае, што аб'ём прадугледжаных бюджэтам расходаў павінен адпавядаць сумарнаму аб'ёму даходаў бюджэту і паступленняў з крыніц фінансавання яго дэфіцыту. Пры складанні, разглядзе, зацвярджэнні і выкананні бюджэту дзяржаўныя органы павінны зыходзіць з неабходнасці мінімізацыі памеру дэфіцыту бюджэту.

5. Прынцып галоснасці і адкрытасці азначае:

5.1. афіцыйнае апублікаванне, абнародаванне (апублікаванне) іншымі спосабамі ва ўстаноўленым заканадаўчымі актамі парадку нарматыўных прававых актаў аб рэспубліканскім бюджэце, мясцовых бюджэтах і бюджэтах дзяржаўных пазабюджэтных фондаў на чарговы фінансавы год, аб унясенні змяненняў і (або) дапаўненняў у закон аб рэспубліканскім бюджэце, рашэнні мясцовых Саветаў дэпутатаў аб бюджэце, заканадаўчыя акты аб бюджэтах дзяржаўных пазабюджэтных фондаў на бягучы фінансавы год, аб зацвярджэнні справаздач аб выкананні рэспубліканскага бюджэту, мясцовых бюджэтаў і бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў за справаздачны фінансавы год;

5.2. адкрытасць для грамадства і сродкаў масавай інфармацыі:

працэдур разгляду праектаў закона аб рэспубліканскім бюджэце, рашэнняў мясцовых Саветаў дэпутатаў аб бюджэце, заканадаўчых актаў аб бюджэтах дзяржаўных пазабюджэтных фондаў на чарговы фінансавы год і прыняцця адпаведных нарматыўных прававых актаў;

праекта рэспубліканскага бюджэту, унесенага ва ўстаноўленым парадку на разгляд Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага схода Рэспублікі Беларусь (далей – Палата прадстаўнікоў);

праектаў мясцовых бюджэтаў, унесеных ва ўстаноўленым парадку на разгляд мясцовых Саветаў дэпутатаў;

праектаў бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, унесеных ва ўстаноўленым парадку на разгляд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Палаты прадстаўнікоў;

звестак аб ходзе выканання рэспубліканскага бюджэту, мясцовых бюджэтаў і бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, аб дзяржаўным доўгу Рэспублікі Беларусь, доўгу органаў мясцовага кіравання і самакіравання, а таксама доўгу, гарантаваным Рэспублікай Беларусь і мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі (акрамя звестак, якія з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, іншай інфармацыі, распаўсюджванне і (або) даванне якой абмежавана ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі);

вынікаў праверак Камітэтам дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь справаздач аб выкананні рэспубліканскага бюджэту і бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў за справаздачны фінансавы год, а таксама праверак выканання мясцовых бюджэтаў, праведзеных Камітэтам дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь і (або) яго тэрытарыяльнымі органамі ў справаздачным фінансавым годзе (акрамя звестак, якія з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, іншай інфармацыі, распаўсюджванне і (або) даванне якой абмежавана ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі);

зводных справаздач аб рэалізацыі дзяржаўных праграм (падпраграм), уключаючы ацэнку эфектыўнасці іх рэалізацыі, у адпаведнасці з заканадаўствам (акрамя звестак, якія з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, іншай інфармацыі, распаўсюджванне і (або) даванне якой абмежавана ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі);

звестак аб ажыццяўленні распарадчыкамі бюджэтных сродкаў ускладзеных на іх функцый, у тым ліку па выкананні імі дзяржаўных праграм, падпраграм і мерапрыемстваў за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, мясцовых бюджэтаў і бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў (акрамя звестак, якія з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, іншай інфармацыі, распаўсюджванне і (або) даванне якой абмежавана ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі).

Адкрытасць для грамадства і сродкаў масавай інфармацыі забяспечваецца (у тым ліку шляхам размяшчэння на афіцыйных сайтах адпаведных дзяржаўных органаў і арганізацый) па праектах нарматыўных прававых актаў і інфармацыі, указаных:

у абзацах другім, трэцім і шостым часткі першай гэтага падпункта, – Міністэрствам фінансаў;

у абзацах другім, чацвёртым і шостым часткі першай гэтага падпункта (у частцы мясцовых бюджэтаў, доўгу органаў мясцовага кіравання і самакіравання і доўгу, гарантаванага мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі), – мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі;

у абзацы сёмым часткі першай гэтага падпункта, – Камітэтам дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь;

у абзацы восьмым часткі першай гэтага падпункта, – Міністэрствам эканомікі Рэспублікі Беларусь;

у абзацы дзявятым часткі першай гэтага падпункта, – распарадчыкамі сродкаў рэспубліканскага бюджэту і сродкаў мясцовых бюджэтаў;

у абзацах другім, пятым, шостым і дзявятым часткі першай гэтага падпункта (у частцы бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў), – распарадчыкамі сродкаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў.

6. Прынцып самастойнасці бюджэтаў забяспечваецца наяўнасцю ў бюджэтаў усіх узроўняў бюджэтнай сістэмы Рэспублікі Беларусь уласных даходаў і крыніц фінансавання дэфіцыту бюджэту, а таксама правам адпаведных дзяржаўных органаў у парадку, устаноўленым заканадаўствам, вызначаць напрамкі расходаў, самастойна складаць, разглядаць, зацвярджаць і выконваць бюджэт.

7. Прынцып эфектыўнасці выкарыстання бюджэтных сродкаў азначае, што пры складанні, разглядзе, зацвярджэнні і выкананні бюджэтаў усе ўдзельнікі бюджэтнага працэсу павінны зыходзіць з неабходнасці дасягнення зададзеных мэт з выкарыстаннем мінімальнага аб'ёму бюджэтных сродкаў або дасягнення максімальнага выніку з выкарыстаннем вызначанага бюджэтам аб'ёму сродкаў.

8. Прынцып агульнага (сумеснага) пакрыцця расходаў бюджэтаў азначае, што ўсе расходы бюджэту павінны забяспечвацца агульнай сумай даходаў бюджэту і паступленняў з крыніц фінансавання яго дэфіцыту. Расходы бюджэту не могуць быць узгоднены з пэўнымі даходамі бюджэту і крыніцамі фінансавання дэфіцыту бюджэту, за выключэннем:

8.1. расходаў дзяржаўных мэтавых бюджэтных фондаў;

8.2. мэтавых сродкаў, атрыманых з бюджэтаў іншых узроўняў бюджэтнай сістэмы Рэспублікі Беларусь;

8.3. дзяржаўных пазык;

8.4. добраахвотных узносаў;

8.5. сродкаў гарантыйных фондаў і фондаў папераджальных (прэвентыўных) мерапрыемстваў;

8.6. сродкаў бюджэту ў адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь;

8.7. сродкаў бюджэту за граніцамі тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

8.8. іншых выпадкаў, прадугледжаных Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь і (або) законамі, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

9. Прынцып дакладнасці бюджэтаў азначае, што бюджэты фарміруюцца на аснове абгрунтаваных прагнозных макраэканамічных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь, адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі Рэспублікі Беларусь.

10. Прынцып адраснасці і мэтавага прызначэння бюджэтных сродкаў азначае, што бюджэтныя сродкі выдзяляюцца ў распараджэнне канкрэтных атрымальнікаў бюджэтных сродкаў з накіраваннем іх на фінансаванне канкрэтных мэт у адпаведнасці з заканадаўствам.

11. Прынцып адказнасці ўдзельнікаў бюджэтнага працэсу заключаецца ў тым, што кожны ўдзельнік бюджэтнага працэсу нясе адказнасць за свае дзеянні (бяздзейнасць) на кожнай стадыі бюджэтнага працэсу.

**Артыкул 9. Прававая форма рэспубліканскага бюджэту і мясцовых бюджэтаў**

Рэспубліканскі бюджэт зацвярджаецца законам, мясцовыя бюджэты зацвярджаюцца рашэннямі мясцовых Саветаў дэпутатаў.

## ГЛАВА 4
## БЮДЖЭТНАЯ КЛАСІФІКАЦЫЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**Артыкул 10. Склад бюджэтнай класіфікацыі Рэспублікі Беларусь**

Бюджэтная класіфікацыя Рэспублікі Беларусь уключае ў сябе:

класіфікацыю даходаў бюджэту;

функцыянальную класіфікацыю расходаў бюджэту;

праграмную класіфікацыю расходаў бюджэту;

эканамічную класіфікацыю расходаў бюджэту;

ведамасную класіфікацыю расходаў бюджэту;

класіфікацыю фінансавання дэфіцыту (выкарыстання прафіцыту) бюджэту;

класіфікацыю відаў дзяржаўнага доўгу Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 11. Адзінства бюджэтнай класіфікацыі Рэспублікі Беларусь**

1. Бюджэтная класіфікацыя Рэспублікі Беларусь у частцы класіфікацыі даходаў бюджэту, функцыянальнай класіфікацыі расходаў бюджэту, праграмнай класіфікацыі расходаў бюджэту, эканамічнай класіфікацыі расходаў бюджэту, класіфікацыі фінансавання дэфіцыту (выкарыстання прафіцыту) бюджэту і класіфікацыі відаў дзяржаўнага доўгу Рэспублікі Беларусь з'яўляецца адзінай для бюджэтаў усіх узроўняў бюджэтнай сістэмы Рэспублікі Беларусь, а таксама бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў.

2. Акты заканадаўства, якія рэгулююць адносіны, не звязаныя непасрэдна з вызначэннем складу і структуры бюджэтнай класіфікацыі Рэспублікі Беларусь, не павінны ўтрымліваць палажэнняў, якія яе мяняюць.

**Артыкул 12. Класіфікацыя даходаў бюджэту**

1. Класіфікацыя даходаў бюджэту з'яўляецца групоўкай даходаў бюджэту, якая грунтуецца на нарматыўных прававых актах Рэспублікі Беларусь, якія вызначаюць крыніцы іх фарміравання.

2. Даходы бюджэту ў залежнасці ад эканамічнага зместу падраздзяляюцца на групы.

Групы даходаў складаюцца з падгруп, якія падраздзяляюцца на віды. Даходы па відах уключаюць у сябе раздзелы і падраздзелы.

**Артыкул 13. Функцыянальная класіфікацыя расходаў бюджэту**

1. Функцыянальная класіфікацыя расходаў бюджэту з'яўляецца групоўкай расходаў, якая адлюстроўвае накіраванне сродкаў бюджэту на выкананне функцый дзяржавы.

2. Першым узроўнем функцыянальнай класіфікацыі расходаў бюджэту з'яўляюцца раздзелы, якія вызначаюць расходаванне сродкаў бюджэту на выкананне функцый дзяржавы.

3. Другім узроўнем функцыянальнай класіфікацыі расходаў бюджэту з'яўляюцца падраздзелы, якія канкрэтызуюць накіраванне сродкаў бюджэту на выкананне функцый дзяржавы ў межах раздзелаў.

4. Міністэрства фінансаў можа праводзіць дэталізацыю расходаў бюджэту ў межах падраздзелаў, не парушаючы агульных прынцыпаў пабудовы і адзінства функцыянальнай класіфікацыі расходаў бюджэту.

**Артыкул 14. Праграмная класіфікацыя расходаў бюджэту**

1. Праграмная класіфікацыя расходаў бюджэту з'яўляецца групоўкай расходаў бюджэту па дзяржаўных праграмах і падпраграмах.

2. Міністэрства фінансаў можа праводзіць дэталізацыю расходаў бюджэту ў межах падпраграм, не парушаючы агульных прынцыпаў пабудовы і адзінства праграмнай класіфікацыі расходаў бюджэту.

**Артыкул 15. Эканамічная класіфікацыя расходаў бюджэту**

Эканамічная класіфікацыя расходаў бюджэту з'яўляецца групоўкай расходаў бюджэту па іх эканамічным змесце.

**Артыкул 16. Ведамасная класіфікацыя расходаў рэспубліканскага бюджэту і мясцовых бюджэтаў**

Ведамасная класіфікацыя расходаў рэспубліканскага бюджэту і мясцовых бюджэтаў з'яўляецца групоўкай расходаў бюджэту, якая адлюстроўвае размеркаванне бюджэтных прызначэнняў па распарадчыках сродкаў рэспубліканскага бюджэту і сродкаў мясцовых бюджэтаў адпаведна.

**Артыкул 17. Класіфікацыя фінансавання дэфіцыту (выкарыстання прафіцыту) бюджэту**

Класіфікацыя фінансавання дэфіцыту (выкарыстання прафіцыту) бюджэту з'яўляецца групоўкай крыніц фінансавання (напрамкаў), якія прыцягваюцца (вызначаюцца) для пакрыцця дэфіцыту (выкарыстання прафіцыту) бюджэту, зыходзячы з іх відаў і форм даўгавых абавязацельстваў.

**Артыкул 18. Класіфікацыя відаў дзяржаўнага доўгу Рэспублікі Беларусь**

Класіфікацыя відаў дзяржаўнага доўгу Рэспублікі Беларусь з'яўляецца групоўкай знешніх дзяржаўных пазык і ўнутраных дзяржаўных пазык зыходзячы з відаў крэдытораў і форм даўгавых абавязацельстваў.

**Артыкул 19. Устанаўленне бюджэтнай класіфікацыі Рэспублікі Беларусь**

1. Функцыянальная класіфікацыя расходаў бюджэту па раздзелах і падраздзелах устанаўліваецца згодна з дадаткам да гэтага Кодэкса.

2. Класіфікацыя даходаў бюджэту, функцыянальная класіфікацыя расходаў бюджэту ў межах падраздзелаў, праграмная класіфікацыя расходаў бюджэту, эканамічная класіфікацыя расходаў бюджэту, ведамасная класіфікацыя расходаў рэспубліканскага бюджэту, класіфікацыя фінансавання дэфіцыту (выкарыстання прафіцыту) бюджэту, класіфікацыя відаў дзяржаўнага доўгу Рэспублікі Беларусь устанаўліваюцца Міністэрствам фінансаў.

3. Ведамасная класіфікацыя расходаў бюджэтаў абласнога ўзроўню ўстанаўліваецца адпаведнымі мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі па ўзгадненні з Міністэрствам фінансаў.

Ведамасная класіфікацыя расходаў бюджэтаў базавага і першаснага ўзроўняў устанаўліваецца адпаведнымі мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі па ўзгадненні з вышэйстаячымі выканаўчымі і распарадчымі органамі (або па іх даручэнні па ўзгадненні з мясцовымі фінансавымі органамі вышэйстаячых выканаўчых і распарадчых органаў).

## ГЛАВА 5
## ДЗЯРЖАЎНЫЯ ПАЗАБЮДЖЭТНЫЯ ФОНДЫ

**Артыкул 20. Прынцыпы і прававы статус дзяржаўных пазабюджэтных фондаў**

1. Дзяржаўныя пазабюджэтныя фонды грунтуюцца на прынцыпах бюджэтнай сістэмы Рэспублікі Беларусь.

2. Стварэнне дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, вызначэнне крыніц іх утварэння, парадку фарміравання і выкарыстання ажыццяўляюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь і (або) законамі, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

3. Распарадчыкамі сродкаў дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду з'яўляюцца дзяржаўны орган, іншая дзяржаўная арганізацыя, падпарадкаваная Ураду Рэспублікі Беларусь, Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь, на якія ўскладзены функцыі па зборы і кантролі за паступленнем сродкаў, якія фарміруюць даходы дзяржаўнага пазабюджэтнага фонда, а таксама па кіраванні сродкамі бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду і іх выкарыстанні.

4. Сродкі дзяржаўных пазабюджэтных фондаў знаходзяцца ў рэспубліканскай уласнасці.

**Артыкул 21. Складанне, разгляд і зацвярджэнне бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў**

1. Складанне, разгляд і зацвярджэнне бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі аб гэтых фондах і гэтым Кодэксам. Зацвярджэнне штогод бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў на чарговы фінансавы год ажыццяўляецца заканадаўчымі актамі.

2. Праекты заканадаўчых актаў аб бюджэтах дзяржаўных пазабюджэтных фондаў на чарговы фінансавы год уносяцца на разгляд Урада Рэспублікі Беларусь і адначасова з праектам закона аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год у адпаведнасці з заканадаўствам падаюцца Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь для разгляду, а таксама зацвярджэння ў выпадках, калі гэта прадугледжана актамі аб гэтых фондах.

У выпадку зацвярджэння бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў законамі Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь уносіць у Палату прадстаўнікоў праекты законаў аб бюджэтах дзяржаўных пазабюджэтных фондаў на чарговы фінансавы год адначасова з праектам закона аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год.

3. Праекты законаў аб бюджэтах дзяржаўных пазабюджэтных фондаў на чарговы фінансавы год прымаюцца Палатай прадстаўнікоў да прыняцця праекта закона аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год у першым чытанні і далей разглядаюцца ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і рэгламентамі палат Парламента Рэспублікі Беларусь.

4. Выключаны.

**Артыкул 21$^{1}$. Паказчыкі, якія зацвярджаюцца заканадаўчым актам аб бюджэце дзяржаўнага пазабюджэтнага фонда**

Заканадаўчым актам аб бюджэце дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду на чарговы фінансавы год устанаўліваюцца і зацвярджаюцца наступныя асноўныя паказчыкі:

максімальны памер дэфіцыту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду на канец года і крыніцы яго фінансавання або мінімальны памер прафіцыту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду і напрамкі яго выкарыстання;

даходы бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду ў агульнай суме і па групах, падгрупах, раздзелах і падраздзелах класіфікацыі даходаў бюджэту;

расходы бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду ў агульнай суме, па раздзелах і падраздзелах функцыянальнай і праграмнай класіфікацый расходаў бюджэту, а таксама пры неабходнасці размеркаванне бюджэтных прызначэнняў па распарадчыках сродкаў бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду па ведамаснай класіфікацыі расходаў рэспубліканскага бюджэту, артыкулах і падартыкулах эканамічнай класіфікацыі расходаў бюджэту;

даходы бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду па крыніцах фарміравання бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонда, вызначаных заканадаўчым актам аб гэтым фондзе;

расходы бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду па напрамках выкарыстання сродкаў бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонда, вызначаных заканадаўчым актам аб гэтым фондзе.

**Артыкул 22. Даходы, расходы і дэфіцыт (прафіцыт) бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў**

1. Даходы бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў могуць фарміравацца за кошт узносаў на дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне, непадатковых даходаў і бязвыплатных паступленняў, якія ўлічваюцца ў даходах бюджэтаў у адпаведнасці з артыкулам 24 гэтага Кодэкса.

2. Збор даходаў бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў і кантроль за іх паступленнем ажыццяўляюцца распарадчыкамі сродкаў адпаведных дзяржаўных пазабюджэтных фондаў.

3. Сродкі дзяржаўных пазабюджэтных фондаў выкарыстоўваюцца на мэты, вызначаныя заканадаўчымі актамі аб гэтых фондах.

4. Максімальны памер дэфіцыту і крыніцы яго фінансавання або мінімальны памер і напрамкі выкарыстання прафіцыту бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду вызначаюцца ў парадку, устаноўленым заканадаўчым актам аб гэтым фондзе.

5. Памеры даходаў, расходаў, дэфіцыту і крыніц яго фінансавання або памер і напрамкі выкарыстання прафіцыту бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў вызначаюцца штогод заканадаўчымі актамі.

**Артыкул 22$^{1}$. Бюджэтны роспіс бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонда**

1. Бюджэтны роспіс бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду складаецца ў адпаведнасці з бюджэтнай класіфікацыяй Рэспублікі Беларусь на аснове паказчыкаў бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонда, зацверджаных заканадаўчым актам аб бюджэце дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду на чарговы фінансавы год, і ўзгадняецца распарадчыкам сродкаў дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду з Міністэрствам фінансаў у частцы міжбюджэтных трансфертаў, якія перадаюцца з рэспубліканскага бюджэту ў бюджэт дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду (пры іх наяўнасці).

2. Бюджэтны роспіс бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду зацвярджаецца распарадчыкам сродкаў дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду ў месячны тэрмін пасля прыняцця заканадаўчага акта аб бюджэце дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду на чарговы фінансавы год і падаецца ў Міністэрства фінансаў.

**Артыкул 23. Выкананне бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў і кантроль за іх выкананнем**

1. Выкананне бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў ажыццяўляецца праз адзіны казначэйскі рахунак.

Выкананне бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў ажыццяўляецца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам, заканадаўчымі актамі аб гэтых фондах, бюджэтах гэтых фондаў на чарговы фінансавы год і бюджэтным роспісам бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонда.

Бюджэтныя каштарысы дзяржаўных пазабюджэтных фондаў складаюцца на аснове бюджэтнага роспісу бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонда.

Парадак складання, разгляду і зацвярджэння бюджэтных каштарысаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, а таксама ўнясення ў іх змяненняў і (або) дапаўненняў

устанаўліваецца Міністэрствам фінансаў, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі аб гэтых фондах.

Парадак залічэння, размеркавання і механізм звароту даходаў бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, парадак фінансавання расходаў, прадугледжаных у бюджэтах дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, парадак аплаты абавязацельстваў, прынятых атрымальнікамі сродкаў бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, парадак перадачы сродкаў бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў у форме міжбюджэтных трансфертаў іншым бюджэтам, парадак і тэрміны падавання перыядычнай і гадавой справаздачнасці аб выкананні бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, арганізацыя і ажыццяўленне адзінай метадалогіі ўліку выканання бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў устанаўліваюцца Міністэрствам фінансаў.

Органы дзяржаўнага казначэйства ажыццяўляюць касавае абслугоўванне выканання бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў.

Распарадчыкі сродкаў бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў складаюць і падаюць у Міністэрства фінансаў зводную бухгалтарскую справаздачнасць у складзе і парадку, устаноўленых Міністэрствам фінансаў.

За карыстанне грашовымі сродкамі бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, якія знаходзяцца на адзіным казначэйскім рахунку, Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь, банкі выплачваюць у даход рэспубліканскага бюджэту працэнты па стаўцы, вызначанай Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Адкрыццё і абслугоўванне банкамі рахункаў арганізацый, фізічных асоб, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, па адкрытых імі рахунках для ўліку сродкаў бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, а таксама выкананне аперацый з гэтымі сродкамі, выкананне плацежных інструкцый на пералічэнне выплат у бюджэты дзяржаўных пазабюджэтных фондаў ажыццяўляюцца без спагнання ўзнагароджання (платы).

Залічэнне грашовых сродкаў на бягучыя (разліковыя) банкаўскія рахункі, уклады, (дэпазіты) і выплата з гэтых рахункаў пенсій, дапамог і іншых грашовых выплат, якія праводзяцца грамадзянам у адпаведнасці з заканадаўствам за кошт сродкаў дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь, ажыццяўляюцца банкамі без спагнання ўзнагароджання (платы).

2. Складанне, разгляд і зацвярджэнне справаздач аб выкананні бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў за справаздачны фінансавы год ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі аб гэтых фондах і гэтым Кодэксам. Зацвярджэнне штогод справаздач аб выкананні бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў за справаздачны фінансавы год ажыццяўляецца заканадаўчымі актамі таго ж віду, што і зацвярджэнне бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў.

Справаздачы аб выкананні бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў складаюцца распарадчыкамі сродкаў гэтых фондаў у форме праектаў заканадаўчых актаў да 1 сакавіка года, які ідзе следам за справаздачным фінансавым годам, і ўносяцца ва ўстаноўленым парадку на разгляд Урада Рэспублікі Беларусь.

Адначасова з праектам заканадаўчага акта аб зацвярджэнні справаздачы аб выкананні бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду за справаздачны фінансавы год ва Урад Рэспублікі Беларусь падаюцца звесткі аб стане запазычанасці па выплатах у бюджэт дзяржаўнага пазабюджэтнага фонда, звесткі аб рэштах сродкаў бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду на пачатак і канец справаздачнага фінансавага года і тлумачальная запіска да праекта заканадаўчага акта аб зацвярджэнні справаздачы аб выкананні бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду за справаздачны фінансавы год.

Урад Рэспублікі Беларусь:

на працягу пяці рабочых дзён накіроўвае праекты заканадаўчых актаў аб зацвярджэнні справаздач аб выкананні бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў за справаздачны фінансавы год і іншыя дакументы, указаныя ў частцы трэцяй гэтага пункта, у Камітэт дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь для падрыхтоўкі заключэнняў аб выкананні бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў за справаздачны фінансавы год;

падае праекты заканадаўчых актаў аб зацвярджэнні справаздач аб выкананні бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў за справаздачны фінансавы год і іншыя дакументы, указаныя ў частцы трэцяй гэтага пункта, Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь.

У выпадках зацвярджэння справаздач аб выкананні бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў законамі Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь уносіць у Палату прадстаўнікоў праекты такіх законаў.

Камітэт дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь праводзіць праверку справаздач аб выкананні бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў за справаздачны фінансавы год, рыхтуе адпаведныя заключэнні, выкарыстоўваючы матэрыялы і вынікі праведзеных праверак, і не пазней 15 мая года, які ідзе следам за справаздачным фінансавым годам, уносіць іх на разгляд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і Парламента Рэспублікі Беларусь, а таксама накіроўвае іх ва Урад Рэспублікі Беларусь.

Пры разглядзе праектаў законаў аб зацвярджэнні справаздач аб выкананні бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў за справаздачны фінансавы год Палата прадстаўнікоў заслухоўвае даклады Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь або яго прадстаўнікоў аб выкананні бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў за справаздачны фінансавы год і заключэнні Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь.

Праекты законаў аб зацвярджэнні справаздач аб выкананні бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў за справаздачны фінансавы год разглядае Парламент Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Кодэксам і рэгламентамі палат Парламента Рэспублікі Беларусь.

3. Кантроль за выкананнем бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў ажыццяўляецца распарадчыкамі сродкаў гэтых фондаў, а таксама органамі, якія забяспечваюць кантроль за выкананнем рэспубліканскага бюджэту, у парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі.

4. Незаконнае атрыманне, нямэтавае выкарыстанне сродкаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, а таксама выкарыстанне сродкаў указаных фондаў з парушэннем бюджэтнага заканадаўства цягнуць за сабой прымяненне адказнасці, прадугледжанай гэтым Кодэксам за незаконнае атрыманне, нямэтавае выкарыстанне сродкаў бюджэту, а таксама выкарыстанне сродкаў бюджэту з парушэннем бюджэтнага заканадаўства.

Незаконнае атрыманне, выкарыстанне не па мэтавым прызначэнні або з парушэннем бюджэтнага заканадаўства сродкаў з бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў цягнуць за сабой прыпыненне або абмежаванне фінансавання расходаў за кошт сродкаў указаных фондаў або спагнанне ў бясспрэчным парадку ў бюджэт адпаведнага дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду атрыманых сродкаў з налічэннем працэнтаў у памеры 1/360 стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь на дату спагнання за кожны дзень з даты іх атрымання да даты пакрыцця (спагнання).

У выпадку добраахвотнага пакрыцця незаконна атрыманых, выкарыстаных не па мэтавым прызначэнні або з парушэннем бюджэтнага заканадаўства сродкаў з бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў налічэнне працэнтаў праводзіцца ў памеры 1/360

стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь на дату іх выплаты за кожны дзень з даты іх атрымання да даты выплаты.

**Артыкул 23[1]. Унясенне змяненняў і (або) дапаўненняў у заканадаўчыя акты аб бюджэтах дзяржаўных пазабюджэтных фондаў на бягучы фінансавы год на працягу фінансавага года**

1. Унясенне змяненняў і (або) дапаўненняў у заканадаўчыя акты аб бюджэтах дзяржаўных пазабюджэтных фондаў на бягучы фінансавы год на працягу фінансавага года ажыццяўляецца заканадаўчымі актамі таго ж віду, што і зацвярджэнне бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў.

2. У выпадку ўнясення змяненняў, якія прадугледжваюць павелічэнне фінансавання па існых напрамках расходаў бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, або дапаўненняў, якія прадугледжваюць стварэнне новых напрамкаў расходаў бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, якія не фінансуюцца да прыняцця ўказаных заканадаўчых актаў, павінны быць вызначаны крыніцы і парадак фінансавання гэтых расходаў бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў.

**Артыкул 23[2]. Удакладненне асобных паказчыкаў бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў на працягу фінансавага года**

1. Павелічэнне або змяншэнне зацверджаных аб'ёмаў даходаў і расходаў бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў на бягучы фінансавы год, памеру і крыніц фінансавання дэфіцыту або памеру і напрамкаў выкарыстання прафіцыту бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, а таксама ўдакладненне іншых паказчыкаў бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў на бягучы фінансавы год, якія зацвярджаюцца законамі аб бюджэтах дзяржаўных пазабюджэтных фондаў на бягучы фінансавы год, праводзяцца дэкрэтамі і ўказамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

2. Пры выданні дэкрэтаў і ўказаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якія прадугледжваюць павелічэнне фінансавання па існых напрамках расходаў бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў або стварэнне новых напрамкаў расходаў бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, якія не фінансуюцца да прыняцця ўказаных заканадаўчых актаў, павінны быць вызначаны крыніцы і парадак фінансавання гэтых расходаў бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў.

3. Удакладненне асобных паказчыкаў бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў на бягучы фінансавы год у межах сум даходаў і расходаў бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, зацверджаных законамі аб бюджэтах дзяржаўных пазабюджэтных фондаў на бягучы фінансавы год, можа праводзіцца:

3.1. Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

3.2. Урадам Рэспублікі Беларусь або па яго даручэнні распарадчыкамі сродкаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў Рэспублікі Беларусь у межах праў, дадзеных ім законамі аб бюджэтах дзяржаўных пазабюджэтных фондаў на бягучы фінансавы год і пунктам 4 гэтага артыкула.

4. Распарадчыкі сродкаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў у працэсе выканання бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў маюць права ўносіць змяненні ў:

4.1. квартальнае размеркаванне даходаў бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў;

4.2. даходы бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў у межах зацверджаных гадавых паступленняў;

4.3. квартальнае размеркаванне расходаў бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў;

4.4. расходы бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў па эканамічнай і праграмнай класіфікацыях расходаў бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў у межах зацверджаных гадавых бюджэтных прызначэнняў.

5. У выпадку зніжэння паступленняў даходаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, якія могуць прывесці да скарачэння фінансавання расходаў бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў у параўнанні з запланаваным аб'ёмам на год больш чым на 10 працэнтаў, распарадчыкі сродкаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў неадкладна інфармуюць аб гэтым Урад Рэспублікі Беларусь. Урад Рэспублікі Беларусь уносіць Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь прапановы аб скарачэнні расходаў бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў.

6. Пры вызначэнні распарадчыкамі сродкаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў напрамкаў расходаў і іх фінансавання ў бягучым фінансавым годзе за кошт рэшт сродкаў, якія ўтварыліся на рахунках для ўліку сродкаў бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў на 1 студзеня бягучага фінансавага года, праводзіцца ўдакладненне асобных паказчыкаў бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, зацверджаных заканадаўчымі актамі аб бюджэтах гэтых фондаў на бягучы фінансавы год.

**Артыкул 23$^{3}$. Парадак унясення змяненняў і (або) дапаўненняў у заканадаўчыя акты аб бюджэтах дзяржаўных пазабюджэтных фондаў на бягучы фінансавы год і ўдакладнення асобных паказчыкаў бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў на працягу фінансавага года**

1. Урад Рэспублікі Беларусь распрацоўвае і падае Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь праекты заканадаўчых актаў аб унясенні змяненняў і (або) дапаўненняў у заканадаўчыя акты аб бюджэтах дзяржаўных пазабюджэтных фондаў на бягучы фінансавы год.

2. Праекты законаў аб унясенні змяненняў і (або) дапаўненняў у законы аб бюджэтах дзяржаўных пазабюджэтных фондаў на бягучы фінансавы год уносяцца ў Палату прадстаўнікоў Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

3. Падрыхтоўка, унясенне і разгляд праектаў актаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб удакладненні асобных паказчыкаў бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

4. У адпаведнасці з прынятымі заканадаўчымі актамі аб унясенні змяненняў і (або) дапаўненняў у заканадаўчыя акты аб бюджэтах дзяржаўных пазабюджэтных фондаў на бягучы фінансавы год, актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб удакладненні асобных паказчыкаў бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, пастановамі Урада Рэспублікі Беларусь, прынятымі ў межах праў, дадзеных Ураду Рэспублікі Беларусь законамі аб бюджэтах дзяржаўных пазабюджэтных фондаў на бягучы фінансавы год, распарадчыкі сродкаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў уносяць змяненні і (або) дапаўненні ў бюджэтны роспіс бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонда.

Удакладненне асобных паказчыкаў бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў на працягу фінансавага года, якое ажыццяўляецца распарадчыкамі сродкаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў у выпадках, устаноўленых у падпункце 3.2 пункта 3 і пункце 4 артыкула 23$^{2}$ гэтага Кодэкса, праводзіцца пры дапамозе ўнясення змяненняў і (або) дапаўненняў у бюджэтны роспіс бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонда.

5. Унясенне змяненняў і (або) дапаўненняў у бюджэтны роспіс бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду ажыццяўляецца ў форме даведкі аб змяненні бюджэтнага роспісу бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду (бюджэтнага каштарыса), які падаецца ў Міністэрства фінансаў.

Форма даведкі аб змяненні бюджэтнага роспісу бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду (бюджэтнага каштарыса) і форма паведамлення аб змяненні міжбюджэтных трансфертаў устанаўліваюцца Міністэрствам фінансаў.

# РАЗДЗЕЛ III
# ДАХОДЫ І РАСХОДЫ БЮДЖЭТАЎ

## ГЛАВА 6
## ДАХОДЫ БЮДЖЭТАЎ

### Артыкул 24. Групы даходаў бюджэтаў

1. Даходы бюджэтаў класіфікуюцца па наступных групах:

1.1. падатковыя даходы;

1.2. узносы на дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне;

1.3. непадатковыя даходы;

1.4. бязвыплатныя паступленні.

2. Падатковыя даходы ўключаюць у сябе:

2.1. рэспубліканскія падаткі, зборы (пошліны), мясцовыя падаткі і зборы і іншыя падатковыя даходы, устаноўленыя Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь і (або) законамі;

2.2. пені, налічаныя за несвоечасовую выплату падаткаў, збораў (пошлін);

2.3. працэнты за карыстанне адтэрміноўкай і (або) растэрміноўкай выплаты падаткаў, збораў, мытных плацяжоў і пені, падатковым крэдытам.

3. Пені і працэнты за карыстанне адтэрміноўкай і (або) растэрміноўкай выплаты падаткаў, збораў, мытных плацяжоў і пені, падатковым крэдытам улічваюцца ў даходах бюджэтаў па падраздзелах класіфікацыі даходаў бюджэтаў, прадугледжаных для падаткаў, збораў (пошлін), за несвоечасовую выплату якіх налічаюцца пені або па якім даюцца адтэрміноўка і (або) растэрміноўка выплаты падаткаў, збораў, мытных плацяжоў і пені, падатковы крэдыт.

4. Да непадатковых даходаў адносяцца:

4.1. даходы ад выкарыстання маёмасці, якая знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці;

4.2. штрафы;

4.2[1]. пені, налічаныя за несвоечасовую выплату непадатковых даходаў;

4.3. іншыя непадатковыя даходы.

5. Да бязвыплатных паступленняў адносяцца неабавязковыя бягучыя і капітальныя выплаты, якія ўключаюць у сябе паступленні ад:

5.1. замежных дзяржаў;

5.2. міжнародных арганізацый;

5.3. іншага бюджэту ў форме міжбюджэтных трансфертаў.

6. Бязвыплатныя паступленні ў форме міжбюджэтных трансфертаў падлягаюць уліку ў даходах таго бюджэту, якому гэтыя сродкі даюцца.

### Артыкул 25. Выплата і залічэнне даходаў у бюджэты

1. Падатковыя даходы лічацца заплачанымі ў даход адпаведнага бюджэту з моманту, які вызначаецца падатковым заканадаўствам.

2. Днём выплаты іншых даходаў у даход адпаведнага бюджэту прызнаецца:

2.1. дзень выдачы плацельшчыкам (іншай абавязанай асобай) банку або нябанкаўскай крэдытна-фінансавай арганізацыі (далей – банк) плацежных інструкцый на пералічэнне належных сум даходаў шляхам падавання ў банк плацежнага даручэння на папяровым носьбіце, накіравання плацежных інструкцый у банк у электронным выглядзе пры дапамозе сістэм дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання (Кліент-банк, Інтэрнэт-банк, Тэлефон-банк і іншыя) або сістэм разлікаў з выкарыстаннем электронных грошай пры наяўнасці на рахунку (у электронным кашальку)

плацельшчыка (іншай абавязанай асобы) сродкаў, дастатковых для выканання банкам плацежных інструкцый плацельшчыка (іншай абавязанай асобы) у поўным аб'ёме;

2.2. дзень выканання банкам плацежных інструкцый плацельшчыка (іншай абавязанай асобы) на пералічэнне належных сум даходаў, раней не выкананых па прычыне адсутнасці на рахунку плацельшчыка (іншай абавязанай асобы) сродкаў, дастатковых для выканання плацежных інструкцый плацельшчыка (іншай абавязанай асобы) у поўным аб'ёме;

2.3. дзень унясення плацельшчыкам (іншай абавязанай асобай) для пералічэння належных сум даходаў наяўных грашовых сродкаў у банк, выканаўчы і распарадчы орган першаснага тэрытарыяльнага ўзроўню або ў выпадках, устаноўленых заканадаўствам, – у іншую ўпаўнаважаную арганізацыю;

2.4. дзень, калі грашовыя сродкі ў лік выплаты належных сум даходаў прыняты плацежным агентам ад фізічнай асобы пры дапамозе выкарыстання аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы ў парадку, устаноўленым заканадаўствам.

3. Даходы лічацца залічанымі ў даход бюджэту з моманту іх паступлення на рахункі па ўліку сродкаў адпаведнага бюджэту, за выключэннем выпадкаў правядзення ўзаемазалікаў у адпаведнасці з падпунктам 1.2 пункта 1 артыкула 108, падпунктам 1.7 пункта 1 артыкула 109, абзацам чацвёртым артыкула 120 і падпунктам 1.7 пункта 1 артыкула 121 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 25$^{1}$. Залічэнне дзяржаўнай пошліны**

Дзяржаўная пошліна залічваецца ў рэспубліканскі і (або) адпаведныя мясцовыя бюджэты згодна з размеркаваннем, якое ўстанаўліваецца Міністэрствам фінансаў, па месцы здзяйснення юрыдычна значнага дзеяння, уключаючы даванне пэўных праў або выдачу асобных дакументаў, і (або) у залежнасці ад органа, які здзяйсняе гэтыя дзеянні.

**Артыкул 26. Залічэнне штрафаў**

1. Штрафы за парушэнне парадку выкарыстання сродкаў рэспубліканскага бюджэту і мясцовых бюджэтаў, а таксама дзяржаўных пазабюджэтных фондаў або арганізацыі дзяржаўных закупак за кошт указаных сродкаў, якія накладаюцца на арганізацыі (іх службовых асоб), індывідуальных прадпрымальнікаў, залічваюцца ў даход бюджэту, за кошт сродкаў якога праведзена фінансаванне.

2. Штрафы за правапарушэнні супраць парадку падаткаабкладання, акрамя тых, якія накладаюцца мытнымі органамі, падлягаюць залічэнню ў бюджэты базавага ўзроўню і бюджэт г. Мінска па месцы знаходжання арганізацыі (у адносінах арганізацый і іх службовых асоб) і па месцы жыхарства фізічнай асобы (у адносінах фізічных асоб, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў).

Штрафы за правапарушэнні супраць парадку падаткаабкладання, якія накладаюцца мытнымі органамі, а таксама за правапарушэнні супраць парадку мытнага рэгулявання падлягаюць залічэнню ў рэспубліканскі бюджэт.

3. Штрафы за парушэнне тэрміну пастаноўкі на ўлік у якасці плацельшчыка абавязковых страхавых узносаў, нявыплату або няпоўную выплату абавязковых страхавых узносаў і (або) узносаў на прафесійнае пенсійнае страхаванне, даванне крэдыту для выплаты заработнай платы, выдачу або пералічэнне грашовых сродкаў для аплаты працы з парушэннем патрабаванняў заканадаўства, непадаванне дакументаў, справаздач і іншых матэрыялаў у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь, іншыя парушэнні супраць парадку кіравання ў сферы дзейнасці органаў Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь залічваюцца ў

бюджэт дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь.

3[1]. Штрафы, якія накладаюцца ў выпадках, устаноўленых Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь, залічваюцца ў рэспубліканскі бюджэт.

4. Штрафы за здзяйсненне правапарушэнняў, не ўказаных у пунктах 1–3[1] гэтага артыкула, падлягаюць залічэнню ў рэспубліканскі і адпаведныя мясцовыя бюджэты згодна з размеркаваннем, якое ўстанаўліваецца Міністэрствам фінансаў, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

**Артыкул 26[1]. Залічэнне сродкаў, якія атрымліваюцца дзяржаўнымі органамі**

Сродкі, у тым ліку ў замежнай валюце, атрыманыя дзяржаўнымі органамі (іх тэрытарыяльнымі органамі), якія фінансуюцца за кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, уключаючы сродкі, атрыманыя ад здачы ў арэнду маёмасці, залічваюцца адпаведна ў рэспубліканскі бюджэт і адпаведныя мясцовыя бюджэты, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

**Артыкул 27. Уласныя даходы рэспубліканскага бюджэту і мясцовых бюджэтаў**

1. Уласныя даходы рэспубліканскага бюджэту і мясцовых бюджэтаў могуць уключаць у сябе:

1.1. падатковыя даходы, якія залічваюцца ў бюджэт у адпаведнасці з заканадаўствам;

1.2. выключаны;

1.3. непадатковыя даходы, якія залічваюцца ў бюджэт у адпаведнасці з заканадаўствам.

2. Уласныя даходы бюджэтаў розных узроўняў бюджэтнай сістэмы Рэспублікі Беларусь залічваюцца ў бюджэты згодна з нарматывамі адлічэнняў ад падатковых і непадатковых даходаў, устаноўленых у адпаведнасці з артыкуламі 28, 30–37 гэтага Кодэкса, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь і (або) законамі.

**Артыкул 28. Устанаўленне нарматываў адлічэнняў ад рэспубліканскіх падаткаў, збораў (пошлін), мясцовых падаткаў і збораў**

1. У кансалідаваныя бюджэты абласцей адлічваецца 24,56 працэнта ад падатку на дабаўлены кошт, які атрымліваецца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Законам аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год устанаўліваюцца нарматывы адлічэнняў ад падатку на дабаўлены кошт, які атрымліваецца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, у кансалідаваныя бюджэты абласцей прапарцыянальна колькасці насельніцтва, якое пастаянна пражывае на тэрыторыі абласцей на 1 студзеня года, які папярэднічае чарговаму фінансаваму году.

2. Рашэннямі абласных Саветаў дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год устанаўліваюцца (калі іншае не ўстаноўлена пунктамі 3 і 7 гэтага артыкула):

2.1. нарматывы адлічэнняў ад падаходнага падатку з фізічных асоб, падатку на прыбытак, падатку на дабаўлены кошт, якія падлягаюць залічэнню ў абласныя бюджэты ў адпаведнасці з артыкулам 32 гэтага Кодэкса;

2.2. нарматывы адлічэнняў ад падатку на дабаўлены кошт у кансалідаваныя бюджэты раёнаў і бюджэты гарадоў абласнога падпарадкавання прапарцыянальна колькасці насельніцтва, якое пастаянна пражывае на тэрыторыі раёнаў і гарадоў абласнога падпарадкавання на 1 студзеня года, які папярэднічае чарговаму фінансаваму году;

2.3. адзіныя нарматывы адлічэнняў ад падаходнага падатку з фізічных асоб, падатку на прыбытак, якія падлягаюць залічэнню ў кансалідаваныя бюджэты раёнаў у адпаведнасці з гэтым Кодэксам;

2.4. адзіныя нарматывы адлічэнняў ад падаходнага падатку з фізічных асоб, падатку на прыбытак, якія падлягаюць залічэнню ў бюджэты гарадоў абласнога падпарадкавання ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам.

3. Рашэннямі абласных Саветаў дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год могуць устанаўлівацца індывідуальныя (паніжаныя) нарматывы адлічэнняў у кансалідаваныя бюджэты раёнаў (бюджэты гарадоў абласнога падпарадкавання) ад падаходнага падатку з фізічных асоб, падатку на прыбытак, якія падлягаюць залічэнню ў кансалідаваныя бюджэты раёнаў (бюджэты гарадоў абласнога падпарадкавання) у адпаведнасці з гэтым Кодэксам, у выпадку, калі памер падаходнага падатку з фізічных асоб, падатку на прыбытак, заплачаныя на тэрыторыі раёна (горада абласнога падпарадкавання) у справаздачным фінансавым годзе, перавысіў 10 працэнтаў памеру адпаведнага падатку, заплачанага на тэрыторыі вобласці ў справаздачным фінансавым годзе.

4. Рашэннямі раённых Саветаў дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год устанаўліваюцца нарматывы адлічэнняў ад падаходнага падатку з фізічных асоб, мясцовых падаткаў і збораў, якія падлягаюць залічэнню ў раённыя бюджэты і бюджэты першаснага ўзроўню ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам.

5. Не дапускаецца змяненне нарматываў адлічэнняў у ніжэйстаячыя мясцовыя (кансалідаваныя) бюджэты ад рэспубліканскіх падаткаў, збораў (пошлін) і нарматываў адлічэнняў ад мясцовых падаткаў і збораў на працягу трох фінансавых гадоў, калі іншае не ўстаноўлена падпунктам 2.2 пункта 2, пунктамі 3 і 7 гэтага артыкула.

6. Устанаўленне мясцовымі Саветамі дэпутатаў нарматываў адлічэнняў ад рэспубліканскіх падаткаў, збораў (пошлін) у адпаведны мясцовы бюджэт і ніжэйстаячыя мясцовыя (кансалідаваныя) бюджэты праводзіцца з улікам нарматываў адлічэнняў ад рэспубліканскіх падаткаў, збораў (пошлін), устаноўленых гэтым Кодэксам, законам аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год і (або) рашэннем вышэйстаячага Савета дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год.

7. Пры змяненні адміністрацыйна-тэрытарыяльнай будовы Рэспублікі Беларусь мясцовыя Саветы дэпутатаў у межах сваёй кампетэнцыі прымаюць рашэнні аб унясенні змяненняў і (або) дапаўненняў у рашэнні мясцовых Саветаў дэпутатаў аб бюджэце на адпаведны фінансавы год у частцы нарматываў адлічэнняў ад рэспубліканскіх падаткаў, збораў (пошлін), мясцовых падаткаў і збораў.

**Артыкул 29. Фарміраванне даходаў рэспубліканскага бюджэту і мясцовых бюджэтаў**

1. Даходы рэспубліканскага бюджэту і мясцовых бюджэтаў на чарговы фінансавы год вызначаюцца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства.

2. Даходы рэспубліканскага бюджэту фарміруюцца за кошт уласных даходаў з улікам адлічэнняў ад рэспубліканскіх падаткаў, збораў (пошлін), а таксама за кошт бязвыплатных паступленняў.

Даходы мясцовых бюджэтаў фарміруюцца за кошт уласных даходаў з улікам адлічэнняў ад рэспубліканскіх падаткаў, збораў (пошлін) і адлічэнняў ад мясцовых падаткаў і збораў, а таксама за кошт бязвыплатных паступленняў.

3. У складзе рэспубліканскага бюджэту і мясцовых бюджэтаў могуць стварацца дзяржаўныя мэтавыя бюджэтныя фонды. Дзяржаўныя мэтавыя бюджэтныя фонды фарміруюцца за кошт даходаў, вызначаных артыкуламі 30–37 гэтага Кодэкса.

Дзеянне падпункта 1.1 і абзацаў другога – чацвёртага падпункта 1.11 пункта 1 артыкула 30 у 2012 годзе прыпынена Законам Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2011 г. № 331-З.

---

---

Дзеянне падпунктаў 1.1, 1.2 і 1.5 пункта 1 артыкула 30 у 2010 годзе прыпынена Законам Рэспублікі Беларусь ад 29 снежня 2009 г. № 73-З.

---

**Артыкул 30. Падатковыя даходы рэспубліканскага бюджэту**

1. У рэспубліканскі бюджэт залічваюцца наступныя падатковыя даходы (згодна з нарматывам адлічэнняў ад падатковага даходу, які атрымліваецца на тэрыторыі рэспублікі, калі іншае не вызначана заканадаўчымі актамі):

1.1. падатак на прыбытак, які выплачваецца арганізацыямі, маёмасць якіх знаходзіцца ва ўласнасці Рэспублікі Беларусь, і арганізацыямі, у статутных фондах якіх 50 і болей працэнтаў акцый (доляў) належыць Рэспубліцы Беларусь, а таксама арганізацыямі, якія з'яўляюцца ўдзельнікамі холдынгаў, у статутных фондах кіруючых кампаній якіх 50 і болей працэнтаў акцый (доляў) знаходзіцца ў рэспубліканскай уласнасці і перададзена рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання і іншым дзяржаўным арганізацыям, падпарадкаваным Ураду Рэспублікі Беларусь, у кіраванне, – 100 працэнтаў;

1.2. выключаны;

1.3. падатак на даходы ад ажыццяўлення латарэйнай дзейнасці па рэспубліканскіх латарэях – 100 працэнтаў;

1.4. падатак на даходы ад правядзення электронных інтэрактыўных гульняў – 100 працэнтаў;

1.5. падатак на дабаўлены кошт – 75,44 працэнта;

1.6. акцызы – 100 працэнтаў;

1.7. выключаны;

1.8. выключаны;

1.9. патэнтныя пошліны – 100 працэнтаў;

1.10. утылізацыйны збор – 100 працэнтаў;

1.11. экалагічны падатак:

за выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра – 40 працэнтаў;

за скіданне сцёкавых вод – 40 працэнтаў;

за захоўванне, пахаванне адходаў вытворчасці – 40 працэнтаў;

1.11[1]. падатак за здабычу (вынятку) прыродных рэсурсаў у адносінах:

нафты – 85 працэнтаў;

солі калійнай у частцы, падлічанай па адвалорнай стаўцы, – 100 працэнтаў;

1.12. мытныя пошліны і мытныя зборы ў адпаведнасці з заканадаўствам – 100 працэнтаў;

1.12[1]. спецыяльныя, антыдэмпінгавыя і кампенсацыйныя пошліны – 100 працэнтаў;

1.13. афшорны збор – 100 працэнтаў;

1.14. дзяржаўная пошліна, якая залічваецца ў рэспубліканскі бюджэт у адпаведнасці з актамі заканадаўства, – 100 працэнтаў;

1.15. консульскі збор – 100 працэнтаў;

1.16. гербавы збор – 100 працэнтаў.

2. У рэспубліканскі бюджэт могуць таксама залічвацца іншыя падатковыя даходы, устаноўленыя Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь і (або) законамі.

---

Дзеянне абзаца трэцяга падпункта 1.9 пункта 1 артыкула 31 у 2010 годзе прыпынена Законам Рэспублікі Беларусь ад 29 снежня 2009 г. № 73-З.

---

**Артыкул 31. Непадатковыя даходы рэспубліканскага бюджэту**

1. Непадатковыя даходы рэспубліканскага бюджэту ўключаюць у сябе (згодна з нарматывам адлічэнняў ад непадатковага даходу, які атрымліваецца на тэрыторыі рэспублікі, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі):

1.1. даходы ад размяшчэння грашовых сродкаў рэспубліканскага бюджэту, а таксама даходы ад размяшчэння ў банках-нерэзідэнтах сродкаў крэдытаў Міжнароднага валютнага фонду і іншых знешніх дзяржаўных пазык, атрыманых Урадам Рэспублікі Беларусь, і знешніх пазык, атрыманых пад гарантыі Урада Рэспублікі Беларусь, – 100 працэнтаў;

1.2. дывідэнды па акцыях, за выключэннем акцый, якія знаходзяцца ў гаспадарчым судаводстве і аператыўным кіраванні ўнітарных прадпрыемстваў, і даходы ад іншых форм удзелу ў капітале, які знаходзіцца ў рэспубліканскай уласнасці, – 100 працэнтаў;

1.3. выключаны;

1.4. плату за выдзяленне і выкарыстанне радыёчастотнага спектра – 100 працэнтаў;

1.4[1]. плату за права заключэння дагавораў арэнды капітальных будынін (будынкаў, збудаванняў), ізаляваных памяшканняў, машына-месцаў, іх частак, якія знаходзяцца ў рэспубліканскай уласнасці, – 100 працэнтаў, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі;

1.4[2]. разавую выплату за права карыстання нетрамі і па аб'ектах канцэсіі – 100 працэнтаў;

1.5. даходы ад здачы ў арэнду маёмасці, якая знаходзіцца ў рэспубліканскай уласнасці, – 100 працэнтаў, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі;

1.6. адміністрацыйныя выплаты:

плату за даванне гарантый Урада Рэспублікі Беларусь па крэдытах, якія выдаюцца банкамі Рэспублікі Беларусь, – 100 працэнтаў;

плату за даванне гарантый Урада Рэспублікі Беларусь па знешніх пазыках – 100 працэнтаў;

узнагароджанне за выкананне дзяржаўнымі служачымі абавязкаў прадстаўніка дзяржавы ў гаспадарчых таварыствах, акцыі (долі ў статутных фондах) якіх належаць Рэспубліцы Беларусь, – 100 працэнтаў;

плату за прабірныя работы і паслугі – 100 працэнтаў;

1.7. сродкі, якія паступаюць у рэспубліканскі бюджэт у лік кампенсацыі расходаў дзяржавы ў адпаведнасці з заканадаўствам, – 100 працэнтаў;

1.8. даходы ад рэалізацыі маёмасці, маёмасных праў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці, якія знаходзяцца ў рэспубліканскай уласнасці, акрамя сродкаў ад рэалізацыі маёмасці, якая належыць дзяржаве, у адпаведнасці з заканадаўствам аб прыватызацыі, – 100 працэнтаў, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам;

1.9. даходы ад маёмасці, канфіскаванай і іншым спосабам вернутай у даход дзяржавы:

даходы ад рэалізацыі тавараў, транспартных сродкаў і іншай маёмасці, канфіскаванай (арыштаванай, затрыманай) мытнымі органамі і вернутай у даход дзяржавы пры парушэнні мытнага заканадаўства, – 100 працэнтаў;

даходы ад рэалізацыі канфіскаваных і іншым спосабам вернутых у даход дзяржавы прылад палявання і здабычы рыбы і іншых водных жывёл, а таксама ад продажу незаконна здабытай з дапамогай гэтых прылад прадукцыі – 100 працэнтаў;

грашовыя сродкі, канфіскаваныя і іншым спосабам вернутыя ў даход дзяржавы, – 100 працэнтаў, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі;

даходы ад рэалізацыі канфіскаваных і іншым спосабам вернутых у даход дзяржавы каштоўных папер – 100 працэнтаў;

даходы ад рэалізацыі іншай канфіскаванай і іншым спосабам вернутай у даход дзяржавы маёмасці, акрамя сродкаў, атрыманых ад рэалізацыі вернутых у даход дзяржавы безгаспадарнай маёмасці, знаходак або скарбаў, безнаглядных жывёл, – 100 працэнтаў;

сродкі ад аперацый па бязвыплатнай перадачы канфіскаванай і іншым спосабам вернутай у даход дзяржавы маёмасці – 100 працэнтаў;

$1.9^1$. даходы ад продажу зямельных участкаў ва ўласнасць замежным дзяржавам і міжнародным арганізацыям – 100 працэнтаў;

1.10. вылічэнні з заработнай платы асуджаных у адпаведнасці з заканадаўствам – 100 працэнтаў;

1.11. штрафы, якія падлягаюць выплаце ў рэспубліканскі бюджэт у адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства, – 100 працэнтаў;

1.12. пакрыццё страт, шкоды:

пакрыццё страт сельскагаспадарчай і лесагаспадарчай вытворчасці, выкліканых адабраннем сельскагаспадарчых зямель, зямель ляснога фонду, – 100 працэнтаў;

пакрыццё шкоды, прычыненай навакольнаму асяроддзю, – 100 працэнтаў;

пакрыццё шкоды, прычыненай лясной гаспадарцы парушэннем заканадаўства аб выкарыстанні, ахове, абароне і ўзнаўленні лясоў, – 100 працэнтаў;

пакрыццё іншай шкоды, прычыненай маёмасці, якая знаходзіцца ў рэспубліканскай уласнасці, – 100 працэнтаў;

1.13. добраахвотныя ўзносы, якія паступаюць у рэспубліканскі бюджэт, – 100 працэнтаў;

1.14. плату за праезд цяжкіх і (або) буйнагабарытных транспартных сродкаў па аўтамабільных дарогах агульнага карыстання Рэспублікі Беларусь – 100 працэнтаў;

1.15. плату за праезд транспартных сродкаў па платных аўтамабільных дарогах Рэспублікі Беларусь з сістэмай электроннага збору платы – 100 працэнтаў;

1.16. адлічэнні юрыдычных асоб, якія ажыццяўляюць дзейнасць у сферы мытнай справы ў якасці ўладальніка магазіна бяспошліннага гандлю, ад выручкі ад рэалізацыі тавараў, атрыманай у выніку дзейнасці ў якасці ўладальніка магазіна бяспошліннага гандлю, – 100 працэнтаў;

1.17. сродкі, атрыманыя ад продажу адзінак скарачэння выкідаў парніковых газаў на падставе заключаных Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь міжнародных дагавораў міжведамаснага характару аб продажы такіх адзінак, – 100 працэнтаў.

2. У рэспубліканскі бюджэт могуць таксама залічвацца іншыя непадатковыя даходы, устаноўленыя заканадаўствам.

---

Дзеянне падпунктаў 1.2, 1.7, $1.7^1$ (у частцы здабычы (выняткі) нафты і солі калійнай) пункта 1 артыкула 32 у 2012 годзе прыпынена Законам Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2011 г. № 331-З.

---

---

Дзеянне падпунктаў 1.2 і 1.3 пункта 1 артыкула 32 у 2010 годзе прыпынена Законам Рэспублікі Беларусь ад 29 снежня 2009 г. № 73-З.

---

**Артыкул 32. Падатковыя даходы абласных бюджэтаў**

1. У абласныя бюджэты залічваюцца наступныя падатковыя даходы (згодна з нарматывам адлічэнняў ад падатковага даходу, які атрымліваецца на тэрыторыі вобласці, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі):

1.1. падаходны падатак з фізічных асоб – згодна з нарматывам, устаноўленым рашэннем абласнога Савета дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год;

1.2. падатак на прыбытак, за выключэннем падатку на прыбытак, які залічваецца ў рэспубліканскі бюджэт у адпаведнасці з падпунктам 1.1 пункта 1 артыкула 30, – згодна з нарматывам, устаноўленым рашэннем абласнога Савета дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год;

1.3. падатак на даходы замежных арганізацый, якія не ажыццяўляюць дзейнасць у Рэспубліцы Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва, – 100 працэнтаў;

1.4. падатак на даходы ад ажыццяўлення латарэйнай дзейнасці па абласных латарэях – 100 працэнтаў;

1.5. падатак на нерухомую маёмасць, падлічаны па аб'ектах, якія знаходзяцца на тэрыторыі гарадоў абласнога падпарадкавання, – 40 працэнтаў;

1.6. падатак на дабаўлены кошт – згодна з нарматывам, устаноўленым рашэннем абласнога Савета дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год ад паступленняў па нарматыве, устаноўленым законам аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год;

1.7. экалагічны падатак:

за выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра – 60 працэнтаў;

за скіданне сцёкавых вод – 60 працэнтаў;

за захоўванне, пахаванне адходаў вытворчасці – 60 працэнтаў;

1.7[1]. выключаны;

1.7[2]. дзяржаўная пошліна, якая залічваецца ў абласны бюджэт у адпаведнасці з актамі заканадаўства, – 100 працэнтаў;

1.7[3]. падатак за здабычу (вынятку) прыродных рэсурсаў у адносінах нафты, які выплачваецца плацельшчыкам па месцы знаходжання аб'екта падаткаабкладання, – 15 працэнтаў;

1.7[4]. падатак за здабычу (вынятку) прыродных рэсурсаў у адносінах солі калійнай у частцы, падлічанай па спецыфічнай стаўцы, – 100 працэнтаў.

2. У абласныя бюджэты могуць таксама залічвацца іншыя падатковыя даходы, устаноўленыя Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь і (або) законамі.

**Артыкул 33. Непадатковыя даходы абласных бюджэтаў**

1. Непадатковыя даходы абласных бюджэтаў уключаюць у сябе (па нарматыве адлічэнняў ад непадатковага даходу, які атрымліваецца на тэрыторыі вобласці, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі):

1.1. даходы ад размяшчэння грашовых сродкаў абласнога бюджэту – 100 працэнтаў;

1.2. дывідэнды за акцыі, за выключэннем акцый, якія знаходзяцца ў гаспадарчым вядзенні і аператыўным кіраванні ўнітарных прадпрыемстваў, і даходы ад іншых форм удзелу ў капітале, якія знаходзіцца ў абласной камунальнай уласнасці, – 100 працэнтаў;

1.3. плату за права заключэння дагавораў арэнды зямельных участкаў у адпаведнасці з заканадаўствам – 100 працэнтаў;

1.3[1]. плату за даванне ў арэнду (карыстанне) паляўнічых, рыбалоўных угоддзяў, паверхневых водных аб'ектаў, іх частак, участкаўляснога фонду ў адпаведнасці з заканадаўствам – 100 працэнтаў;

1.4. сродкі, атрыманыя ад правядзення таргоў на рэалізацыю квот на адлоў рыбы ў фондзе запасу рыбалоўных угоддзяў, – 100 працэнтаў;

1.4[1]. плату за права заключэння дагавораў арэнды капітальных будынін (будынкаў, збудаванняў), ізаляваных памяшканняў, машына-месцаў, іх частак, якія знаходзяцца ў камунальнай уласнасці адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню, – 100 працэнтаў, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі;

1.5. даходы ад здачы ў арэнду маёмасці, якая знаходзіцца ў абласной камунальнай уласнасці, – 100 працэнтаў, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам;

1.6. адміністрацыйныя выплаты:

плату за даванне гарантый абласных выканаўчых камітэтаў па крэдытах, якія выдаюцца банкамі Рэспублікі Беларусь, – 100 працэнтаў;

узнагароджанне за выкананне дзяржаўнымі служачымі абавязкаў прадстаўнікоў абласных выканаўчых камітэтаў у гаспадарчых таварыствах, акцыі (долі ў статутных фондах) якіх знаходзяцца ў абласной камунальнай уласнасці, – 100 працэнтаў;

1.7. сродкі, якія паступаюць у абласны бюджэт у лік кампенсацыі расходаў дзяржавы ў адпаведнасці з заканадаўствам;

1.8. даходы ад рэалізацыі маёмасці, маёмасных праў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці, якія знаходзяцца ў абласной камунальнай уласнасці, акрамя сродкаў ад рэалізацыі маёмасці ў адпаведнасці з заканадаўствам аб прыватызацыі, – 100 працэнтаў;

1.9. плату ад продажу зямельных участкаў у прыватную ўласнасць грамадзянам, недзяржаўным юрыдычным асобам у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі – 100 працэнтаў;

1.10. штрафы, якія падлягаюць выплаце ў абласны бюджэт у адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства, – 100 працэнтаў;

1.11. пакрыццё шкоды, прычыненай маёмасці, якая знаходзіцца ў абласной камунальнай уласнасці, – 100 працэнтаў;

1.12. добраахвотныя ўзносы, якія паступаюць у абласны бюджэт, – 100 працэнтаў.

2. У абласныя бюджэты могуць таксама залічвацца іншыя непадатковыя даходы, устаноўленыя заканадаўствам.

---

Дзеянне падпунктаў 1.3 і 1.17 пункта 1 артыкула 34 у 2012 годзе прыпынена Законам Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2011 г. № 331-З.

---

---

Дзеянне падпунктаў 1.3 і 1.4 пункта 1 артыкула 34 у 2010 годзе прыпынена Законам Рэспублікі Беларусь ад 29 снежня 2009 г. № 73-З.

---

**Артыкул 34. Падатковыя даходы бюджэтаў базавага і першаснага ўзроўняў**

1. У бюджэты базавага ўзроўню залічваюцца наступныя падатковыя даходы (па нарматыве адлічэнняў ад падатковага даходу, які атрымліваецца адпаведна на тэрыторыі раёна, горада раённага падпарадкавання, які з'яўляецца цэнтрам

адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі і не мае бюджэту, або горада абласнога падпарадкавання, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі):

1.1. падаходны падатак з фізічных асоб – згодна з нарматывам, устаноўленым рашэннем раённага Савета дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год, ад падатковага даходу, які атрымліваецца на тэрыторыі раёна;

1.2. падаходны падатак з фізічных асоб – згодна з нарматывам, устаноўленым рашэннем абласнога Савета дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год, ад падатковага даходу, які атрымліваецца на тэрыторыі горада абласнога падпарадкавання;

1.3. падатак на прыбытак, за выключэннем падатку на прыбытак, які залічваецца ў рэспубліканскі бюджэт у адпаведнасці з падпунктам 1.1 пункта 1 артыкула 30, – згодна з нарматывам, устаноўленым рашэннем абласнога Савета дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год;

1.4. выключаны;

1.5. падатак на даходы ад ажыццяўлення латарэйнай дзейнасці па раённых (гарадскіх) латарэях – 100 працэнтаў;

1.6. падатак на нерухомую маёмасць, падлічаны па аб'ектах, якія знаходзяцца на тэрыторыі горада абласнога падпарадкавання, – 60 працэнтаў;

1.7. падатак на нерухомую маёмасць, падлічаны па аб'ектах, што знаходзяцца на тэрыторыі горада раённага падпарадкавання, які з'яўляецца цэнтрам адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі і не мае бюджэту – 100 працэнтаў;

1.8. падатак на нерухомую маёмасць, падлічаны па аб'ектах, якія належаць арганізацыям і членам садаводчых суполак і знаходзяцца на тэрыторыі раёна, – 100 працэнтаў;

1.9. зямельны падатак на зямельныя ўчасткі, што знаходзяцца на тэрыторыі раёна, які выплачваецца арганізацыямі і членамі садаводчых суполак, – 100 працэнтаў;

1.10. зямельны падатак на зямельныя ўчасткі, што знаходзяцца на тэрыторыі горада абласнога падпарадкавання, горада раённага падпарадкавання, які з'яўляецца цэнтрам адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі і не мае бюджэту– 100 працэнтаў;

1.11. падатак на дабаўлены кошт – згодна з нарматывам, устаноўленым рашэннем абласнога Савета дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год ад паступленняў па нарматыве, устаноўленым законам аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год;

1.12. падатак пры спрошчанай сістэме падаткаабкладання – 100 працэнтаў;

1.13. адзіны падатак з індывідуальных прадпрымальнікаў і іншых фізічных асоб – 100 працэнтаў;

1.14. адзіны падатак для вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі – 100 працэнтаў;

1.14[1]. адзіны падатак на прылічаны даход – 100 працэнтаў;

1.15. падатак на ігральны бізнес – 100 працэнтаў;

1.16. збор за ажыццяўленне рамеснай дзейнасці – 100 працэнтаў;

1.17. выключаны;

1.17[1]. падатак за здабычу (вынятку) прыродных рэсурсаў (за выключэннем нафты і солі калійнай), які выплачваецца плацельшчыкам па месцы знаходжання аб'екта падаткаабкладання, – 100 працэнтаў;

1.18. дзяржаўная пошліна, якая залічваецца ў бюджэты базавага ўзроўню ў адпаведнасці з актамі заканадаўства, – 100 працэнтаў;

1.19. мясцовыя падаткі і зборы:

якія ўстанаўліваюцца раённым Саветам дэпутатаў, – згодна з нарматывамі, якія ўстанаўліваюцца раённым Саветам дэпутатаў;

якія ўстанаўліваюцца гарадскім (горадам абласнога падпарадкавання) Саветам дэпутатаў, – 100 працэнтаў;

1.20. іншыя падатковыя даходы, устаноўленыя Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь і (або) законамі.

2. У бюджэты першаснага ўзроўню залічваюцца наступныя падатковыя даходы (згодна з нарматывам адлічэнняў ад падатковага даходу):

2.1. падатак на нерухомую маёмасць, падлічаны па аб'ектах, якія належаць фізічным асобам і знаходзяцца на тэрыторыі сельсавета, пасёлка гарадскога тыпу, горада раённага падпарадкавання, за выключэннем падатку на нерухомую маёмасць, які залічваецца ў бюджэты базавага ўзроўню ў адпаведнасці з падпунктам 1.7 пункта 1 гэтага артыкула, – 100 працэнтаў;

2.2. падатак на нерухомую маёмасць, за выключэннем падатку на нерухомую маёмасць, які залічваецца ў бюджэты базавага ўзроўню ў адпаведнасці з падпунктам 1.7 пункта 1 гэтага артыкула, – 100 працэнтаў;

2.3. зямельны падатак на зямельныя ўчасткі, што знаходзяцца на тэрыторыі сельсавета, пасёлка гарадскога тыпу, горада раённага падпарадкавання, які выплачваецца фізічнымі асобамі, за выключэннем зямельнага падатку, які залічваецца ў бюджэты базавага ўзроўню ў адпаведнасці з падпунктамі 1.9 і 1.10 пункта 1 гэтага артыкула, – 100 працэнтаў;

2.3$^{1}$. падаходны падатак з фізічных асоб – згодна з нарматывам, устаноўленым рашэннем раённага Савета дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год;

2.4. збор за ажыццяўленне дзейнасці па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму – 100 працэнтаў;

2.5. дзяржаўная пошліна, якая залічваецца ў бюджэты першаснага ўзроўню ў адпаведнасці з актамі заканадаўства, – 100 працэнтаў;

2.6. выключаны;

2.7. выключаны;

2.8. мясцовыя падаткі і зборы, што ўстанаўліваюцца раённым Саветам дэпутатаў, – згодна з нарматывамі, якія ўстанаўліваюцца рашэннем раённага Савета дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год;

2.9. іншыя падатковыя даходы, устаноўленыя Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь і (або) законамі.

---

Дзеянне абзаца другога падпункта 1.10 пункта 1 артыкула 35 у 2010 годзе прыпынена Законам Рэспублікі Беларусь ад 29 снежня 2009 г. № 73-З.

---

**Артыкул 35. Непадатковыя даходы бюджэтаў базавага і першаснага ўзроўняў**

1. Непадатковыя даходы бюджэтаў базавага ўзроўню ўключаюць у сябе (згодна з нарматывам адлічэнняў ад непадатковага даходу, што атрымліваецца адпаведна на тэрыторыі раёна, горада раённага падпарадкавання, які з'яўляецца цэнтрам адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі і не мае бюджэту, або горада абласнога падпарадкавання, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі):

1.1. даходы ад размяшчэння грашовых сродкаў бюджэтаў базавага ўзроўню – 100 працэнтаў;

1.2. дывідэнды за акцыі, за выключэннем акцый, якія знаходзяцца ў гаспадарчым судаводстве і аператыўным кіраванні ўнітарных прадпрыемстваў, і даходы ад іншых форм удзелу ў капітале, які знаходзіцца ў камунальнай уласнасці адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак базавага тэрытарыяльнага ўзроўню, – 100 працэнтаў;

1.3. даходы ад здачы ў арэнду зямельных участкаў, што знаходзяцца на тэрыторыі горада абласнога падпарадкавання, горада раённага падпарадкавання, які з'яўляецца цэнтрам адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі і не мае бюджэту, – 100 працэнтаў;

1.4. плату за права заключэння дагавораў арэнды зямельных участкаў у адпаведнасці з заканадаўствам – 100 працэнтаў;

1.5. плату за даванне ў арэнду паверхневых водных аб'ектаў, іх частак у адпаведнасці з заканадаўствам – 100 працэнтаў;

1.5[1]. плату за права заключэння дагавораў арэнды капітальных будынін (будынкаў, збудаванняў), ізаляваных памяшканняў, машына-месцаў, іх частак, якія знаходзяцца ў камунальнай уласнасці адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі базавага тэрытарыяльнага ўзроўню, – 100 працэнтаў, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі;

1.6. даходы ад здачы ў арэнду маёмасці, якая знаходзіцца ў камунальнай уласнасці адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак базавага тэрытарыяльнага ўзроўню, – 100 працэнтаў, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам;

1.7. адміністрацыйныя выплаты:

плату за даванне гарантый выканаўчых і распарадчых органаў базавага тэрытарыяльнага ўзроўню па крэдытах, якія выдаюцца банкамі Рэспублікі Беларусь, – 100 працэнтаў;

узнагароджанне за выкананне дзяржаўнымі служачымі абавязкаў прадстаўнікоў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў у гаспадарчых таварыствах, акцыі (долі ў статутных фондах) якіх знаходзяцца ў камунальнай уласнасці адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак базавага тэрытарыяльнага ўзроўню, – 100 працэнтаў;

1.8. сродкі, якія паступаюць у бюджэты базавага ўзроўню ў лік кампенсацыі расходаў дзяржавы ў адпаведнасці з заканадаўствам;

1.9. даходы ад рэалізацыі маёмасці, уключаючы даходы ад прыватызацыі жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонда, маёмасных праў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці, якія знаходзяцца ў камунальнай уласнасці адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак базавага тэрытарыяльнага ўзроўню, акрамя іншых сродкаў ад рэалізацыі маёмасці ў адпаведнасці з заканадаўствам аб прыватызацыі, – 100 працэнтаў;

1.10. даходы ад маёмасці, канфіскаванай і іншым спосабам вернутай у даход дзяржавы:

сродкі, атрыманыя ад рэалізацыі вернутых у даход дзяржавы безгаспадарнай маёмасці, знаходак або скарбаў, безнаглядных жывёл, якія знаходзяцца на тэрыторыі горада абласнога падпарадкавання, горада раённага падпарадкавання, што з'яўляецца цэнтрам адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі і не мае бюджэту, – 100 працэнтаў;

даходы, атрыманыя суб'ектамі гаспадарання, дзяржаўная рэгістрацыя якіх прызнана несапраўднай, што выплачваюцца плацельшчыкам па месцы пастаноўкі на ўлік у падатковых органах, – 100 працэнтаў;

1.11. плату ад продажу зямельных участкаў у прыватную ўласнасць грамадзянам, недзяржаўным юрыдычным асобам у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі, за выключэннем даходаў, якія залічваюцца ў бюджэты першаснага ўзроўню ў адпаведнасці з падпунктам 2.7 пункта 2 гэтага артыкула, – 100 працэнтаў;

1.12. штрафы, якія падлягаюць выплаце ў бюджэты базавага ўзроўню ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства, – 100 працэнтаў;

1.12[1]. вылічэнні з заработнай платы асоб, вызваленых ад крымінальнай адказнасці ў адпаведнасці з заканадаўствам, – 100 працэнтаў;

1.12[2]. плату за размяшчэнне (распаўсюджванне) вонкавай рэкламы – 100 працэнтаў;

1.13. пакрыццё шкоды, прычыненай маёмасці, якая знаходзіцца ў камунальнай уласнасці адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак базавага тэрытарыяльнага ўзроўню, – 100 працэнтаў;

1.14. добраахвотныя ўзносы, якія паступаюць у бюджэты базавага ўзроўню, – 100 працэнтаў;

1.15. іншыя непадатковыя даходы, устаноўленыя заканадаўствам.

2. Непадатковыя даходы бюджэтаў першаснага ўзроўню ўключаюць у сябе:

2.1. даходы ад размяшчэння ў адпаведнасці з заканадаўствам грашовых сродкаў бюджэтаў першаснага ўзроўню – 100 працэнтаў;

2.2. дывідэнды за акцыі, за выключэннем акцый, якія знаходзяцца ў гаспадарчым судаводстве і аператыўным кіраванні ўнітарных прадпрыемстваў, і даходы ад іншых форм удзелу ў капітале, што знаходзіцца ў камунальнай уласнасці сельсавета, пасёлка гарадскога тыпу, горада раённага падпарадкавання, – 100 працэнтаў;

$2.2^{1}$. плату за права заключэння дагавораў арэнды капітальных будынін (будынкаў, збудаванняў), ізаляваных памяшканняў, машына-месцаў, іх частак, якія знаходзяцца ў камунальнай уласнасці сельсавета, пасёлка гарадскога тыпу, горада раённага падпарадкавання, – 100 працэнтаў, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі;

2.3. даходы ад здачы ў арэнду маёмасці, якая знаходзіцца ў камунальнай уласнасці сельсавета, пасёлка гарадскога тыпу, горада раённага падпарадкавання, – 100 працэнтаў, а таксама ад здачы ў арэнду маёмасці, якая знаходзіцца ў абласной, раённай, гарадской (горада абласнога падпарадкавання) камунальнай уласнасці і перададзенага ў аператыўнае кіраванне Саветам дэпутатаў першаснага тэрытарыяльнага ўзроўню, – згодна з нарматывам у адпаведнасці з заканадаўствам;

2.4. даходы ад здачы ў арэнду зямельных участкаў, што знаходзяцца на тэрыторыі сельсавета, пасёлка гарадскога тыпу, горада раённага падпарадкавання, за выключэннем даходаў, якія залічваюцца ў бюджэты базавага ўзроўню ў адпаведнасці з падпунктам 1.3 пункта 1 гэтага артыкула, – 100 працэнтаў;

$2.4^{1}$. плату за права заключэння дагавораў арэнды зямельных участкаў у адпаведнасці з заканадаўствам – 100 працэнтаў;

2.5. паступленні ад рэалізацыі маёмасці, якая знаходзіцца ў камунальнай уласнасці сельсавета, пасёлка гарадскога тыпу, горада раённага падпарадкавання, калі іншае не прадугледжана рашэннямі адпаведнага Савета дэпутатаў, – 100 працэнтаў;

2.6. сродкі, атрыманыя ад рэалізацыі вернутых у даход дзяржавы безгаспадарнай маёмасці, знаходак або скарбаў, безнаглядных жывёл, якія знаходзяцца на тэрыторыі сельсавета, пасёлка гарадскога тыпу, горада раённага падпарадкавання, за выключэннем даходаў, што залічваюцца ў бюджэты базавага ўзроўню ў адпаведнасці з абзацам другім падпункта 1.10 пункта 1 гэтага артыкула, – 100 працэнтаў;

2.7. плату ад продажу грамадзянам зямельных участкаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі сельсавета, пасёлка гарадскога тыпу, горада раённага падпарадкавання, – 100 працэнтаў;

$2.7^{1}$. сродкі, якія паступаюць у бюджэты першаснага ўзроўню ў лік кампенсацыі расходаў дзяржавы ў адпаведнасці з актамі заканадаўства, – 100 працэнтаў;

$2.7^{2}$. штрафы, якія падлягаюць выплаце ў бюджэты першаснага ўзроўню ў адпаведнасці з актамі заканадаўства, – 100 працэнтаў;

$2.7^{3}$. плату за размяшчэнне (распаўсюджванне) вонкавай рэкламы – 100 працэнтаў;

$2.7^{4}$. паступленні сродкаў на фінансаванне і (або) пакрыццё выдаткаў адпаведнага мясцовага бюджэту на мэты, вызначаныя мясцовым сходам або органам тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання (далей – сродкі самаабкладання);

2.7[5]. пакрыццё шкоды, прычыненай маёмасці, якая знаходзіцца ў камунальнай уласнасці адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак першаснага тэрытарыяльнага ўзроўню, – 100 працэнтаў;

2.7[6]. добраахвотныя ўзносы, якія паступаюць у бюджэты першаснага ўзроўню, – 100 працэнтаў;

2.8. іншыя непадатковыя даходы, устаноўленыя заканадаўствам.

3. Выключаны.

---

Дзеянне падпунктаў 1.2 і 1.13 пункта 1 артыкула 36 у 2012 годзе прыпынена Законам Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2011 г. № 331-З.

---

---

Дзеянне падпунктаў 1.2 і 1.3 пункта 1 артыкула 36 у 2010 годзе прыпынена Законам Рэспублікі Беларусь ад 29 снежня 2009 г. № 73-З.

---

**Артыкул 36. Падатковыя даходы бюджэту г. Мінска**

1. У бюджэт г. Мінска залічваюцца наступныя падатковыя даходы (згодна з нарматывам адлічэнняў ад падатковага даходу, які атрымліваецца на тэрыторыі г. Мінска, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі):

1.1. падаходны падатак з фізічных асоб – 100 працэнтаў;

1.2. падатак на прыбытак, за выключэннем падатку на прыбытак, што выплачваецца арганізацыямі, маёмасць якіх знаходзіцца ва ўласнасці Рэспублікі Беларусь, і арганізацыямі, у статутных фондах якіх 50 і болей працэнтаў акцый (доляў) належыць Рэспубліцы Беларусь, а таксама арганізацыямі, якія з'яўляюцца ўдзельнікамі холдынгаў, у статутных фондах кіруючых кампаній якіх 50 і болей працэнтаў акцый (доляў) знаходзіцца ў рэспубліканскай уласнасці і перададзена рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання і іншым дзяржаўным арганізацыям, падпарадкаваным Ураду Рэспублікі Беларусь, у кіраванне, – 100 працэнтаў;

1.3. падатак на даходы замежных арганізацый, якія не ажыццяўляюць дзейнасць у Рэспубліцы Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва, – 100 працэнтаў;

1.4. падатак на даходы ад ажыццяўлення латарэйнай дзейнасці па латарэях г. Мінска – 100 працэнтаў;

1.5. выключаны;

1.6. зямельны падатак – 100 працэнтаў;

1.7. падатак на нерухомую маёмасць, падлічаны па аб'ектах, якія знаходзяцца на тэрыторыі г. Мінска, – 100 працэнтаў;

1.8. выключаны;

1.9. адзіны падатак з індывідуальных прадпрымальнікаў і іншых фізічных асоб – 100 працэнтаў;

1.9[1]. адзіны падатак на прылічаны даход – 100 працэнтаў;

1.10. падатак пры спрошчанай сістэме падаткаабкладання – 100 працэнтаў;

1.11. падатак на ігральны бізнес – 100 працэнтаў;

1.12. збор за ажыццяўленне рамеснай дзейнасці – 100 працэнтаў;

1.13. экалагічны падатак:

за выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра – 60 працэнтаў;

за скіданне сцёкавых вод – 60 працэнтаў;

за захоўванне, пахаванне адходаў вытворчасці – 60 працэнтаў;

1.14. дзяржаўная пошліна, якая залічваецца ў бюджэт г. Мінска ў адпаведнасці з актамі заканадаўства, – 100 працэнтаў;

1.14[1]. падатак за здабычу (вынятку) прыродных рэсурсаў (за выключэннем нафты і солі калійнай), які выплачваецца плацельшчыкам па месцы знаходжання аб'екта падаткаабкладання, – 100 працэнтаў;

1.15. мясцовыя падаткі і зборы, якія ўстанаўліваюцца Мінскім гарадскім Саветам дэпутатаў, – 100 працэнтаў.

2. У бюджэт г. Мінска могуць таксама залічвацца іншыя падатковыя даходы, устаноўленыя Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь і (або) законамі.

---

Дзеянне абзаца другога падпункта 1.9 пункта 1 артыкула 37 у 2010 годзе прыпынена Законам Рэспублікі Беларусь ад 29 снежня 2009 г. № 73-З.

---

### Артыкул 37. Непадатковыя даходы бюджэту г. Мінска

1. Непадатковыя даходы бюджэту г. Мінска ўключаюць у сябе (згодна з нарматывам адлічэнняў ад непадатковага даходу, які атрымліваецца на тэрыторыі г. Мінска, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі):

1.1. даходы ад размяшчэння грашовых сродкаў бюджэту г. Мінска – 100 працэнтаў;

1.2. дывідэнды па акцыях, за выключэннем акцый, якія знаходзяцца ў гаспадарчым вядзенні і аператыўным кіраванні ўнітарных прадпрыемстваў, і даходы ад іншых форм удзелу ў капітале, якія знаходзіцца ў камунальнай уласнасці г. Мінска, – 100 працэнтаў;

1.3. даходы ад здачы ў арэнду зямельных участкаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі г. Мінска, – 100 працэнтаў;

1.4. плату за права заключэння дагавораў арэнды зямельных участкаў у адпаведнасці з заканадаўствам – 100 працэнтаў;

1.4[1]. плату за права заключэння дагавораў арэнды капітальных збудаванняў (будынкаў), ізаляваных памяшканняў, машына-месцаў, іх частак, якія знаходзяцца ў камунальнай уласнасці г. Мінска, – 100 працэнтаў, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі;

1.5. даходы ад здачы ў арэнду маёмасці, якая знаходзіцца ў камунальнай уласнасці г. Мінска, – 100 працэнтаў, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам;

1.6. адміністрацыйныя выплаты:

плату за даванне гарантый Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта па крэдытах, якія выдаюцца банкамі Рэспублікі Беларусь, – 100 працэнтаў;

узнагароджанне за выкананне дзяржаўнымі служачымі абавязкаў прадстаўнікоў Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта ў гаспадарчых таварыствах, акцыі (долі ў статутных фондах) якіх знаходзяцца ў камунальнай уласнасці г. Мінска, – 100 працэнтаў;

1.7. сродкі, якія паступаюць у бюджэт г. Мінска ў лік кампенсацыі расходаў дзяржавы ў адпаведнасці з заканадаўствам;

1.8. даходы ад рэалізацыі маёмасці, уключаючы даходы ад прыватызацыі жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонда, маёмасных праў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці, якія знаходзяцца ў камунальнай уласнасці г. Мінска, акрамя іншых сродкаў ад рэалізацыі маёмасці ў адпаведнасці з заканадаўствам аб прыватызацыі, – 100 працэнтаў, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам;

1.9. даходы ад маёмасці, канфіскаванай і іншым спосабам вернутай у даход дзяржавы:

даходы, атрыманыя суб'ектамі гаспадарання, дзяржаўная рэгістрацыя якіх прызнана несапраўднай, якія выплачваюцца плацельшчыкам па месцы пастаноўкі на ўлік у падатковых органах, – 100 працэнтаў;

даходы ад рэалізацыі звернутых ва ўласнасць дзяржавы безгаспадарнай маёмасці, знаходак або скарбаў, безнаглядных жывёл, якія знаходзяцца на тэрыторыі г. Мінска, – 100 працэнтаў;

1.10. плату ад продажу зямельных участкаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі г. Мінска, у прыватную ўласнасць грамадзянам, недзяржаўным юрыдычным асобам – 100 працэнтаў;

1.11. штрафы, якія падлягаюць выплаце ў бюджэт г. Мінска ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства, – 100 працэнтаў;

1.12. пакрыццё шкоды, прычыненай маёмасці, якая знаходзіцца ў камунальнай уласнасці г. Мінска, – 100 працэнтаў;

1.13. добраахвотныя ўзносы, якія паступаюць у бюджэт г. Мінска, – 100 працэнтаў;

1.14. вылічэнні з заработнай платы асоб, вызваленых ад крымінальнай адказнасці ў адпаведнасці з заканадаўствам, – 100 працэнтаў;

1.15. плату за размяшчэнне (распаўсюджванне) вонкавай рэкламы – 100 працэнтаў.

2. У бюджэт г. Мінска могуць таксама залічвацца іншыя непадатковыя даходы, устаноўленыя заканадаўствам.

## ГЛАВА 7
## РАСХОДЫ БЮДЖЭТАЎ

### Артыкул 38. Фарміраванне расходаў бюджэтаў

1. Фарміраванне расходаў бюджэтаў ажыццяўляецца ў адпаведнасці з расходнымі абавязацельствамі, абумоўленымі ўстаноўленым заканадаўствам размежаваннем паўнамоцтваў дзяржаўных органаў.

Расходы рэспубліканскага бюджэту і мясцовых бюджэтаў вызначаюцца з улікам праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь і адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, нарматываў бюджэтнай забяспечанасці і ажыццяўляюцца па напрамках у адпаведнасці з артыкуламі 44–47 гэтага Кодэкса ў памерах, устаноўленых законам аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год і рашэннямі мясцовых Саветаў дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год.

2. У бюджэце на чарговы фінансавы год у адпаведнасці з прынятымі раней абавязацельствамі прадугледжваюцца ў поўным аб'ёме асігнаванні на абслугоўванне даўгавых абавязацельстваў.

3. У складзе рэспубліканскага бюджэту і мясцовых бюджэтаў ствараюцца адпаведна рэзервовыя фонды Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Урада Рэспублікі Беларусь і мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў.

### Артыкул 39. Бягучыя расходы бюджэтаў

Бягучыя расходы бюджэтаў з'яўляюцца часткай расходаў бюджэтаў, бягучае функцыянаванне бюджэтных арганізацый, абслугоўванне даўгавых абавязацельстваў, даванне субсідый, міжбюджэтных трансфертаў, іншых расходаў бюджэтаў, у тым ліку ў рамках дзяржаўна-прыватнага партнёрства ў адпаведнасці з заканадаўствам, якія не павялічваюць кошт асноўных сродкаў, нематэрыяльных актываў і матэрыяльных запасаў.

**Артыкул 40. Капітальныя расходы бюджэтаў**

1. Капітальныя расходы бюджэтаў з'яўляюцца часткай расходаў бюджэтаў, якая забяспечвае інавацыйную і інвестыцыйную дзейнасць, у тым ліку ў рамках пагадненняў аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве, якая ўключае ў сябе расходы, прызначаныя для інвестыцый у арганізацыі, якія дзейнічаюць або нанава ствараюцца, расходы на правядзенне мадэрнізацыі, рэканструкцыі і іншыя расходы, звязаныя з павелічэннем кошту асноўных сродкаў, нематэрыяльных актываў і матэрыяльных запасаў, а таксама расходы, пры ажыццяўленні якіх ствараецца або павялічваецца маёмасць арганізацый.

2. Капітальныя расходы бюджэтаў таксама ўключаюць у сябе расходы на стварэнне дзяржаўных запасаў і рэзерваў, набыццё зямельных участкаў і маёмасных праў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці.

**Артыкул 41. Формы давання бюджэтных сродкаў**

Даванне бюджэтных сродкаў ажыццяўляецца ў наступных формах:

расходы на функцыянаванне бюджэтных арганізацый;

субсідыі арганізацыям, фізічным асобам, у тым ліку індывідуальным прадпрымальнікам;

бюджэтныя трансферты за мяжу;

міжбюджэтныя трансферты;

расходы на павелічэнне кошту асноўных сродкаў, нематэрыяльных актываў і матэрыяльных запасаў;

бюджэтныя пазыкі;

бюджэтныя крэдыты;

уклады ў статутныя фонды арганізацый;

расходы на пагашэнне і абслугоўванне даўгавых абавязацельстваў;

выкананне абавязацельстваў па гарантыях Урада Рэспублікі Беларусь, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў;

іншыя формы давання бюджэтных сродкаў у адпаведнасці з заканадаўствам.

---

Дзеянне пункта 3 артыкула 42 у 2019 годзе прыпынена Законам Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2018 г. № 160-З.

---

---

Дзеянне пунктаў 3–6 (у частцы стварэння і расходавання сродкаў рэзервовых фондаў, указаных у артыкуле 24 Закона Рэспублікі Беларусь ад 31 снежня 2017 года «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2018 год») артыкула 42 у 2018 годзе прыпынена Законам Рэспублікі Беларусь ад 31 снежня 2017 г. № 86-З.

---

---

Дзеянне пункта 3, а таксама пунктаў 5 і 6 (у частцы расходавання сродкаў рэзервовых фондаў, указаных у пункце 2 артыкула 27 Закона Рэспублікі Беларусь ад 26 кастрычніка 2012 года «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2013 год») артыкула 42 у 2013 годзе прыпынена Законам Рэспублікі Беларусь ад 26 кастрычніка 2012 г. № 432-З.

---

---

Дзеянне пункта 3, а таксама пунктаў 5 і 6 (у частцы расходавання сродкаў рэзервовых фондаў, указаных у пункце 2 артыкула 28 Закона Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2011 года «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2012 год») артыкула 42 у 2012 годзе прыпынена Законам Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2011 г. № 331-З.

---

---

Дзеянне пункта 3, а таксама пунктаў 5 і 6 (у частцы расходавання сродкаў рэзервовых фондаў, указаных у пункце 2 артыкула 9 Закона Рэспублікі Беларусь ад 29 снежня 2009 года «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2010 год») артыкула 42 у 2010 годзе прыпынена Законам Рэспублікі Беларусь ад 29 снежня 2009 г. № 73-З.

---

**Артыкул 42. Рэзервовыя фонды**

1. У расходнай частцы рэспубліканскага бюджэту прадугледжваецца стварэнне рэзервовых фондаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і Урада Рэспублікі Беларусь, у расходнай частцы мясцовых бюджэтаў – стварэнне рэзервовых фондаў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў.

2. У расходнай частцы бюджэтаў усіх узроўняў бюджэтнай сістэмы Рэспублікі Беларусь забараняецца стварэнне рэзервовых фондаў палат Парламента Рэспублікі Беларусь і мясцовых Саветаў дэпутатаў.

3. Агульны памер рэзервовых фондаў у рэспубліканскім бюджэце не можа перавышаць 2 працэнтаў уласных даходаў рэспубліканскага бюджэту без уліку даходаў дзяржаўных мэтавых бюджэтных фондаў.

4. Памер рэзервовых фондаў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў устанаўліваецца рашэннямі мясцовых Саветаў дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год і не можа перавышаць 1 працэнта ўласных даходаў мясцовых бюджэтаў без уліку даходаў дзяржаўных мэтавых бюджэтных фондаў.

5. Сродкі рэзервовых фондаў Урада Рэспублікі Беларусь і мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў расходуюцца на папярэджанне і ліквідацыю наступстваў надзвычайных сітуацый і на фінансаванне бюджэтных абавязацельстваў, якія не былі падлічаны пры зацвярджэнні адпаведных бюджэтаў або былі прадугледжаны ў недастатковых сумах.

Сродкі рэзервовых фондаў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў расходуюцца на тэрыторыі адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі.

6. Расходаванне сродкаў рэзервовага фонду Урада Рэспублікі Беларусь устанаўліваецца рашэннямі Урада Рэспублікі Беларусь, рэзервовых фондаў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў – рашэннямі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў.

7. Урад Рэспублікі Беларусь або па яго даручэнні Міністэрства фінансаў штоквартальна інфармуюць палаты Парламента Рэспублікі Беларусь аб расходаванні сродкаў рэзервовага фонду Урада Рэспублікі Беларусь.

Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы штоквартальна інфармуюць адпаведныя мясцовыя Саветы дэпутатаў аб расходаванні сродкаў рэзервовых фондаў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў.

8. Гранічны памер рэзервовага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і напрамкі яго выкарыстання вызначаюцца ў адпаведнасці з артыкулам 43 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 43. Рэзервовы фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь**

1. Памер рэзервовага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь устанаўліваецца законам аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год і, як правіла, не можа перавышаць 1 працэнта даходаў рэспубліканскага бюджэту.

2. Расходаванне сродкаў рэзервовага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца на падставе рашэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

---

Дзеянне абзацаў чацвёртага, пятага (у частцы фінансавання пенсій ваеннаслужачым тэрміновай ваеннай службы і членам іх сямей, дзяржаўным служачым, асобам, якія маюць права на пенсію за асаблівыя заслугі перад рэспублікай і на сацыяльную пенсію) і восьмага падпункта 1.10 пункта 1 артыкула 44 прыпынена на 2019 год Законам Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2018 г. № 158-З.

---

---

Дзеянне абзацаў чацвёртага, пятага (у частцы фінансавання пенсій ваеннаслужачым тэрміновай ваеннай службы і членам іх сямей, дзяржаўным служачым, асобам, якія маюць права на пенсію за асаблівыя заслугі перад рэспублікай і на сацыяльную пенсію) і восьмага падпункта 1.10 пункта 1 артыкула 44 прыпынена на 2018 год Законам Рэспублікі Беларусь ад 31 снежня 2017 г. № 85-З.

---

---

Дзеянне абзацаў чацвёртага, пятага (у частцы фінансавання пенсій ваеннаслужачым тэрміновай ваеннай службы і членам іх сямей, дзяржаўным служачым, асобам, якія маюць права на пенсію за асаблівыя заслугі перад рэспублікай і на сацыяльную пенсію) і восьмага падпункта 1.10 пункта 1 артыкула 44 прыпынена на 2017 год Законам Рэспублікі Беларусь ад 18 кастрычніка 2016 г. № 430-З.

---

---

Дзеянне абзацаў чацвёртага, пятага (у частцы фінансавання пенсій ваеннаслужачым тэрміновай ваеннай службы і членам іх сямей, дзяржаўным служачым, асобам, якія маюць права на пенсію за асаблівыя заслугі перад рэспублікай і на сацыяльную пенсію) і восьмага падпункта 1.10 пункта 1 артыкула 44 прыпынена на 2016 год Законам Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2015 г. № 339-З.

---

---

Дзеянне падпункта 1.10 пункта 1 артыкула 44 (у частцы фінансавання дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, пенсій ваеннаслужачым тэрміновай ваеннай службы і членам іх сямей, дзяржаўным служачым, асобам, якія маюць права на пенсію за асаблівыя заслугі перад рэспублікай і на сацыяльную пенсію, мерапрыемстваў па забеспячэнні занятасці насельніцтва) прыпынена на 2015 год Законам Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2014 г. № 221-З.

---

---

Дзеянне падпункта 1.10 пункта 1 артыкула 44 (у частцы фінансавання дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, пенсій ваеннаслужачым тэрміновай ваеннай службы і членам іх сямей, дзяржаўным служачым, асобам, якія маюць права на пенсію за асаблівыя заслугі перад рэспублікай і на сацыяльную пенсію, мерапрыемстваў па забеспячэнні занятасці насельніцтва) прыпынена на 2014 год Законам Рэспублікі Беларусь ад 31 снежня 2013 г. № 97-З.

---

---

Дзеянне падпункта 1.10 пункта 1 артыкула 44 (у частцы дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, пенсій ваеннаслужачым тэрміновай ваеннай службы і членам іх сямей, дзяржаўным служачым, асобам, якія маюць права на пенсію за асаблівыя заслугі перад рэспублікай і на сацыяльную пенсію, фінансавання мерапрыемстваў па забеспячэнні занятасці насельніцтва) прыпынена на 2013 год Законам Рэспублікі Беларусь ад 26 кастрычніка 2012 г. № 430-З.

---

---

Дзеянне падпункта 1.10 пункта 1 артыкула 44 (у частцы дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, пенсійных выплат ваеннаслужачым тэрміновай ваеннай службы і членам іх сямей, дзяржаўным служачым, асобам, якія маюць права на пенсію за асаблівыя заслугі перад рэспублікай і на сацыяльную пенсію, фінансавання мерапрыемстваў па забеспячэнні занятасці насельніцтва) прыпынена на 2012 год Законам Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2011 г. № 329-З.

---

---

Дзеянне падпункта 1.10 пункта 1 артыкула 44 (у частцы выплат дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, пенсійных выплат ваеннаслужачым тэрміновай ваеннай службы і членам іх сямей, дзяржаўным служачым, асобам, якія маюць права на пенсію за асаблівыя заслугі перад рэспублікай, і на сацыяльную пенсію, мерапрыемстваў па забеспячэнні занятасці насельніцтва) прыпынена на 2011 год Законам Рэспублікі Беларусь ад 15 кастрычніка 2010 г. № 173-З.

---

---

Дзеянне падпункта 1.10 пункта 1 артыкула 44 (у частцы выплат дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей; пенсійных выплат ваеннаслужачым тэрміновай службы і членам іх сямей, дзяржаўным служачым, асобам, якія маюць права на пенсію за асаблівыя заслугі перад Рэспублікай Беларусь, і на сацыяльную пенсію; мерапрыемстваў па забеспячэнні занятасці насельніцтва) прыпынена на 2010 год Законам Рэспублікі Беларусь ад 29 снежня 2009 г. № 70-З.

---

**Артыкул 44. Расходы, якія фінансуюцца з рэспубліканскага бюджэту**

1. З рэспубліканскага бюджэту могуць фінансавацца наступныя функцыянальныя віды расходаў:

1.1. агульнадзяржаўная дзейнасць:

забеспячэнне функцыянавання Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

забеспячэнне функцыянавання Парламента Рэспублікі Беларусь;

забеспячэнне функцыянавання фінансавых, падатковых органаў і органаў дзяржаўнай статыстыкі;

забеспячэнне функцыянавання іншых дзяржаўных органаў рэспубліканскага значэння, якія выконваюць агульнадзяржаўныя функцыі;

забеспячэнне функцыянавання арганізацый, падпарадкаваных рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання, якія выконваюць агульнадзяржаўныя функцыі;

забеспячэнне функцыянавання рэспубліканскіх архіваў;

міжнародная дзейнасць;

міжнародная эканамічная і гуманітарная дапамога;

забеспячэнне дзейнасці Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў;

забеспячэнне правядзення выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, членаў Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, рэспубліканскіх рэферэндумаў, а таксама іншыя расходы ў адпаведнасці з заканадаўствам;

абслугоўванне дзяржаўнага доўгу Рэспублікі Беларусь;

фарміраванне дзяржаўнага матэрыяльнага рэзерву;

фундаментальныя навуковыя даследаванні;

прыкладныя даследаванні ў галіне агульнадзяржаўнай дзейнасці;

фарміраванне рэзервовых фондаў;

іншая агульнадзяржаўная дзейнасць;

міжбюджэтныя трансферты;

1.2. нацыянальная абарона:

абарона і Узброеныя сілы Рэспублікі Беларусь;

забеспячэнне мабілізацыйнай падрыхтоўкі і мабілізацыі, а таксама расходы на тэрытарыяльную абарону (у частцы расходаў на ўтрыманне органаў ваеннага кіравання, якія забяспечваюць арганізацыю і кіраўніцтва тэрытарыяльнай абаронай дзяржавы);

забеспячэнне функцыянавання рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання ў сферы нацыянальнай абароны;

іншыя пытанні, звязаныя з нацыянальнай абаронай;

1.3. судовая ўлада, праваахоўная дзейнасць і забеспячэнне бяспекі:

забеспячэнне функцыянавання органаў судовай улады;

забеспячэнне функцыянавання органаў унутраных спраў, унутраных войск;

забеспячэнне функцыянавання органаў пракуратуры;

забеспячэнне функцыянавання органаў пагранічнай службы;

забеспячэнне функцыянавання органаў і арганізацый крымінальна-выканаўчай сістэмы;

забеспячэнне функцыянавання органаў дзяржаўнай бяспекі;

забеспячэнне функцыянавання мытных органаў;

забеспячэнне функцыянавання органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях;

папярэджанне і ліквідацыя наступстваў надзвычайных сітуацый;

забеспячэнне функцыянавання сістэмы Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь;

забеспячэнне функцыянавання сістэмы Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь;

прыкладныя даследаванні ў галіне праваахоўнай дзейнасці і забеспячэння бяспекі;

іншыя пытанні ў галіне праваахоўнай дзейнасці і забеспячэння бяспекі;

1.4. нацыянальная эканоміка:

1.4.1. агульныя эканамічныя пытанні:

рэгуляванне эканамічнай дзейнасці, уключаючы мерапрыемствы па санацыі і банкруцтве;

праграмы і мерапрыемствы для развіцця прадпрымальніцтва;

1.4.2. сельская гаспадарка, рыбагаспадарчая дзейнасць:

забеспячэнне функцыянавання бюджэтных сельскагаспадарчых арганізацый, падпарадкаваных рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання;

развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці ў частцы фінансавання мерапрыемстваў для развіцця аграпрамысловага комплексу, проціэпізаатычных мерапрыемстваў, падтрымкі фермерскіх гаспадарак;

мерапрыемствы для падтрымкі вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі;

мерапрыемствы для захавання і пашырэння сельскагаспадарчых зямель;

іншыя пытанні ў галіне сельскай гаспадаркі;

дзяржаўнае рэгуляванне рыбагаспадарчай дзейнасці;

забеспячэнне функцыянавання рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання ў сферы сельскай гаспадаркі, рыбагаспадарчай дзейнасці;

1.4.3. лясная гаспадарка:

вядзенне лясной гаспадаркі;

вядзенне паляўнічай гаспадаркі;

іншыя пытанні ў галіне лясной гаспадаркі рэспубліканскага значэння;

забеспячэнне функцыянавання рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання ў сферы лясной гаспадаркі;

1.4.4. прамысловасць, будаўніцтва і архітэктура:

рэалізацыя дзяржаўнай прамысловай палітыкі;

рэалізацыя дзяржаўнай палітыкі ў галіне будаўніцтва і архітэктуры;

іншыя пытанні ў галіне прамысловасці, будаўніцтва і архітэктуры рэспубліканскага значэння;

забеспячэнне функцыянавання рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання ў сферы прамысловасці, будаўніцтва і архітэктуры;

1.4.5. транспарт:

ільгатаванне праезду грамадзян аўтамабільным, чыгуначным, паветраным і водным транспартам;

забеспячэнне бяспечнага суднаходства на ўнутраных водных шляхах Рэспублікі Беларусь;

іншыя расходы ў галіне транспарту дзяржаўных арганізацый і арганізацый, у статутных фондах якіх 50 і болей працэнтаў акцый (доляў) знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці;

забеспячэнне функцыянавання рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання ў сферы транспарту;

1.4.6. дарожная гаспадарка:

будаўніцтва, рэканструкцыя, рамонт і ўтрыманне рэспубліканскіх аўтамабільных дарог;

прыкладныя навуковыя даследаванні ў галіне дарожнай гаспадаркі;

іншыя пытанні ў галіне дарожнай гаспадаркі рэспубліканскага значэння;

1.4.7. сувязь:

пакрыццё страт, звязаных з даваннем ільгот пры аказанні паслуг сувязі грамадзянам у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі;

забеспячэнне функцыянавання дзяржаўнай фельд'егерскай службы;

заканадаўча ўстаноўленыя мерапрыемствы і напрамкі рэалізацыі палітыкі дзяржавы ў галіне сувязі і інфарматызацыі;

забеспячэнне функцыянавання рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання ў сферы сувязі і інфарматызацыі;

1.4.8. паліва і энергетыка:

рэалізацыя дзяржаўнай палітыкі ў галіне энергазберажэння;

падтрымка паліўна-энергетычнага комплексу;

забеспячэнне функцыянавання рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання ў сферы энергетыкі;

1.4.9. прыкладныя даследаванні, звязаныя з нацыянальнай эканомікай;

1.4.10. іншая дзейнасць у галіне нацыянальнай эканомікі:

гідраметэаралагічная дзейнасць, якая ажыццяўляецца дзяржаўнай гідраметэаралагічнай службай Рэспублікі Беларусь;

маёмасныя адносіны, геадэзія і картаграфія;

падтрымка іншых галін у галіне нацыянальнай эканомікі;

забеспячэнне функцыянавання адпаведных рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання;

1.5. ахова навакольнага асяроддзя:

утрыманне прыродных тэрыторый рэспубліканскага значэння, якія асабліва ахоўваюцца;

нацыянальная сістэма маніторынгу навакольнага асяроддзя;

вядзенне дзяржаўных кадастраў прыродных рэсурсаў;

мерапрыемствы па рацыянальным (устойлівым) выкарыстанні прыродных рэсурсаў і ахове навакольнага асяроддзя;

прыкладныя даследаванні ў галіне аховы навакольнага асяроддзя;

іншыя мерапрыемствы рэспубліканскага значэння ў галіне аховы навакольнага асяроддзя і прыродных рэсурсаў;

забеспячэнне функцыянавання органаў дзяржаўнага кіравання ў сферы аховы навакольнага асяроддзя;

правядзенне аналітычнага (лабараторнага) кантролю ў галіне аховы навакольнага асяроддзя;

інфармацыйнае забеспячэнне, выхаванне, навучанне і асвета ў галіне аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў;

1.6. жыллёва-камунальныя паслугі і жыллёвае будаўніцтва:

рэалізацыя дзяржаўнай палітыкі ў галіне жыллёвага будаўніцтва і жыллёва-камунальнай гаспадаркі, добраўпарадкавання населеных пунктаў;

прыкладныя даследаванні ў галіне жыллёва-камунальных паслуг;

забеспячэнне функцыянавання рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання ў сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі і жыллёвага будаўніцтва;

1.7. ахова здароўя:

забеспячэнне функцыянавання дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання, Кіраўніцтву справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, якія ажыццяўляюць аказанне і (або) арганізацыю аказання медыцынскай дапамогі насельніцтву;

аказанне высокатэхналагічнай і спецыялізаванай медыцынскай дапамогі ў арганізацыях аховы здароўя, падпарадкаваных рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання;

забеспячэнне функцыянавання дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання, якія ажыццяўляюць правядзенне медыцынскай экспертызы;

ажыццяўленне дзяржаўнага санітарнага нагляду і забеспячэнне функцыянавання органаў і ўстаноў, якія ажыццяўляюць дзяржаўны санітарны нагляд;

забеспячэнне функцыянавання арганізацый (цэнтраў, станцый) пералівання крыві, падпарадкаваных рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання;

забеспячэнне функцыянавання дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання, Кіраўніцтву справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якія ажыццяўляюць санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне;

прыкладныя даследаванні ў галіне ахове здароўя;

забеспячэнне функцыянавання арганізацый, якія абслугоўваюць дзяржаўныя арганізацыі аховы здароўя, падпарадкаваныя рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання;

ажыццяўленне прафесійнай падрыхтоўкі ўрачоў-спецыялістаў у клінічнай ардынатуры;

іншыя пытанні рэспубліканскага значэння ў галіне ахове здароўя;

забеспячэнне функцыянавання рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання ў сферы аховы здароўя;

1.8. фізічная культура, спорт, культура і сродкі масавай інфармацыі:

правядзенне рэспубліканскіх і міжнародных спартыўных, спартыўна-масавых мерапрыемстваў і ўдзел у іх, а таксама фізкультурна-аздараўленчай і спартыўна-масавай работы з насельніцтвам;

развіццё спорту вышэйшых дасягненняў;

забеспячэнне функцыянавання спецыялізаваных навучальна-спартыўных устаноў, рэспубліканскага навучальна-метадычнага цэнтра фізічнага выхавання насельніцтва, рэспубліканскага цэнтра фізічнага выхавання і спорту навучэнцаў і студэнтаў, іншых дзяржаўных арганізацый фізічнай культуры і спорту, падпарадкаваных рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання;

падтрымка арганізацый, якія аказваюць паслугі ў галіне фізічнай культуры і спорту;

адраджэнне, захаванне, развіццё і распаўсюджванне беларускай нацыянальнай культуры і іншых нацыянальных культур;

стварэнне і (або) набыццё твораў мастацтва;

падтрымка рэспубліканскіх тэатральна-відовішчных арганізацый;

забеспячэнне захаванасці гістарычна-культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца ва ўласнасці Рэспублікі Беларусь, і доступу да іх, а таксама гістарычна-культурных каштоўнасцей катэгорый «0», «1» і «2», якія знаходзяцца ва ўласнасці адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак Рэспублікі Беларусь і ва ўласнасці рэлігійных арганізацый, адпаведна пераліку такіх каштоўнасцей, зацверджанаму Урадам Рэспублікі Беларусь, у частцы капітальных расходаў;

падтрымка дзяржаўных арганізацый культуры змешанага тыпу ў частцы іх падраздзяленняў, якія забяспечваюць стварэнне выкананняў твораў сцэнічнага мастацтва і іх публічнае выкананне;

правядзенне культурных мерапрыемстваў;

забеспячэнне функцыянавання дзяржаўных арганізацый культуры, падпарадкаваных рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання, а таксама арганізацый, якія іх абслугоўваюць;

падтрымка рэспубліканскіх сродкаў масавай інфармацыі;

забеспячэнне функцыянавання Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь;

прыкладныя даследаванні ў галіне фізічнай культуры, спорту, культуры і сродкаў масавай інфармацыі;

правядзенне дзяржаўнай палітыкі на рэспубліканскім узроўні па пытаннях рэлігіі;

падрыхтоўка і выпуск навучальна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм, навучальна-метадычнай дакументацыі для ўсіх узроўняў асноўнай (за выключэннем пасляўніверсітэцкай) адукацыі, спецыяльнай адукацыі і дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, навучальных выданняў, у тым ліку вырабленых рэльефна-кропкавым метадам (шрыфтам Брайля), для выкарыстання пры атрыманні прафесіянальна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі;

іншыя пытанні і мерапрыемствы рэспубліканскага значэння ў галіне фізічнай культуры, спорту, культуры і сродкаў масавай інфармацыі;

забеспячэнне функцыянавання рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання ў сферы фізічнай культуры, спорту, культуры і сродкаў масавай інфармацыі;

1.9. адукацыя:

забеспячэнне функцыянавання дзяржаўных устаноў адукацыі і дзяржаўных арганізацый адукацыі, што забяспечваюць функцыянаванне сістэмы адукацыі, маёмасць якіх знаходзіцца ў рэспубліканскай уласнасці;

забеспячэнне атрымання пасляўніверсітэцкай адукацыі;

забеспячэнне ў дзяржаўных установах адукацыі атрымання дадатковай адукацыі дарослых у адпаведнасці з заканадаўствам;

прыкладныя даследаванні ў галіне адукацыі;

правядзенне цэнтралізаваных мерапрыемстваў у галіне адукацыі;

падрыхтоўка, выпуск, камплектаванне і дастаўка навучальных дапаможнікаў для выкарыстання ў працэсе атрымання дашкольнай адукацыі, спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, падручнікаў і навучальных дапаможнікаў для выкарыстання ў працэсе атрымання агульнай сярэдняй адукацыі, спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, а таксама для камплектавання гэтымі навучальнымі выданнямі бібліятэчных фондаў устаноў вышэйшай адукацыі і ўстаноў адукацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, якія ажыццяўляюць падрыхтоўку кадраў па спецыяльнасцях (напрамках спецыяльнасцей), па якіх пасля завяршэння навучання надаюцца педагагічныя кваліфікацыі;

падтрымка навучэнцаў, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у навучальнай і грамадскай рабоце;

забеспячэнне ў адпаведнасці з заканадаўствам мер сацыяльнай абароны навучэнцаў;

іншая дзейнасць для забеспячэння функцыянавання дзяржаўных устаноў адукацыі і дзяржаўных арганізацый адукацыі, што забяспечваюць функцыянаванне сістэмы адукацыі, маёмасць якіх знаходзіцца ў рэспубліканскай уласнасці;

забеспячэнне функцыянавання рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання ў сферы адукацыі;

1.10. сацыяльная палітыка:

забеспячэнне функцыянавання дзяржаўных устаноў сацыяльнага абслугоўвання, падпарадкаваных рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання;

выплаты сем'ям ваеннаслужачых, работнікаў праваахоўных органаў, прадугледжаныя заканадаўчымі актамі;

дзяржаўныя дапамогі сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей;

пенсійныя выплаты грамадзянам, якія маюць права на пенсійнае забеспячэнне ў адпаведнасці з заканадаўствам, якія выплачваюцца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту;

расходы на забеспячэнне асобных катэгорый грамадзян тэхнічнымі сродкамі сацыяльнай рэабілітацыі;

правядзенне дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі;

мерапрыемствы для забеспячэння занятасці насельніцтва;

правядзенне дзяржаўнай палітыкі ў галіне будаўніцтва (рэканструкцыі) жылля для асобных катэгорый грамадзян;

прыкладныя даследаванні ў галіне сацыяльнай палітыкі;

сацыяльная дапамога асобам, якія пражываюць у зонах экалагічнага бедства;

сацыяльная абарона грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый;

расходы на выраб і ўстаноўку надмагільных збудаванняў для асобных катэгорый памерлых (загінулых) грамадзян у адпаведнасці з заканадаўствам;

іншыя пытанні і мерапрыемствы ў галіне сацыяльнай палітыкі;

забеспячэнне функцыянавання рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання ў галіне сацыяльнай палітыкі, установы «Нацыянальны цэнтр усынаўлення Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь».

2. З рэспубліканскага бюджэту могуць фінансавацца расходы на інвестыцыйныя праграмы і праекты, па ўнясенні ўкладаў у статутныя фонды арганізацый, а таксама расходы на аб'екты інфраструктуры і іншыя расходы ў рамках дзяржаўна-прыватнага партнёрства ў адпаведнасці з заканадаўствам па функцыянальных відах расходаў, устаноўленых пунктам 1 гэтага артыкула.

**Артыкул 45. Расходы, якія фінансуюцца з абласных бюджэтаў**

1. З абласных бюджэтаў могуць фінансавацца наступныя функцыянальныя віды расходаў:

1.1. агульнадзяржаўная дзейнасць:

забеспячэнне функцыянавання органаў мясцовага кіравання і самакіравання;

забеспячэнне функцыянавання абласных і занальных архіваў;

забеспячэнне правядзення паўторных выбараў дэпутатаў абласных Саветаў дэпутатаў і абласных рэферэндумаў, а таксама іншыя расходы ў адпаведнасці з заканадаўствам;

абслугоўванне доўгу органаў мясцовага кіравання і самакіравання абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню;

забеспячэнне функцыянавання вадалазна-выратавальнай службы;

прыкладныя даследаванні ў галіне агульнадзяржаўнай дзейнасці, накіраваныя на рэалізацыю функцый абласных выканаўчых камітэтаў;

фарміраванне рэзервовых фондаў;

мерапрыемствы, накіраваныя на падтрыманне і далейшае развіццё інфраструктуры Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь і пагранічнай тэрыторыі;

пералічэнне ўзносаў асацыяцыям мясцовых Саветаў дэпутатаў;

іншая дзейнасць, звязаная з ажыццяўленнем функцый органаў мясцовага кіравання і самакіравання абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню;

міжбюджэтныя трансферты;

1.2. нацыянальная абарона:

забеспячэнне мабілізацыйнай падрыхтоўкі і мабілізацыі ў адпаведнасці з заканадаўствам;

расходы на тэрытарыяльную абарону ў адпаведнасці з заканадаўствам;

1.3. судовая ўлада, праваахоўная дзейнасць і забеспячэнне бяспекі:

расходы на праектаванне, устаноўку, эксплуатацыю, рамонт і ўкараненне сучасных тэхнічных сродкаў і аўтаматызаваных сістэм рэгулявання дарожнага руху, дарожную разметку і іншыя віды работ, звязаных з бяспекай дарожнага руху;

забеспячэнне функцыянавання органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях у адпаведнасці з заканадаўствам;

папярэджанне і ліквідацыя наступстваў надзвычайных сітуацый;

1.4. нацыянальная эканоміка:

1.4.1. агульныя эканамічныя пытанні:

рэгуляванне эканамічнай дзейнасці ў частцы мерапрыемстваў для санацыі і банкруцтва;

праграмы і мерапрыемствы для развіцця і падтрымкі прадпрымальніцтва;

1.4.2. сельская гаспадарка, рыбагаспадарчая дзейнасць:

забеспячэнне функцыянавання бюджэтных сельскагаспадарчых арганізацый, падпарадкаваных абласным выканаўчым камітэтам;

мерапрыемствы для развіцця аграпрамысловага комплексу;

расходы на правядзенне комплексных работ у галіне зямельных рэсурсаў;

іншыя пытанні ў галіне сельскай гаспадаркі;

1.4.3. прамысловасць, будаўніцтва і архітэктура:

комплекснае горадабудаўнічае планаванне і іншая архітэктурная і горадабудаўнічая дзейнасць на тэрыторыі вобласці;

іншыя пытанні ў галіне прамысловасці, будаўніцтва і архітэктуры;

1.4.4. транспарт:

субсідыі дзяржаўным арганізацыям і арганізацыям, у статутных фондах якіх 50 і болей працэнтаў акцый (доляў) знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці, пры ажыццяўленні прыгарадных аўтамабільных перавозак пасажыраў у рэгулярных зносінах на тэрыторыі вобласці;

абнаўленне пасажырскага транспарту дзяржаўных арганізацый і арганізацый, у статутных фондах якіх 50 і болей працэнтаў акцый (доляў) знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці;

іншыя капітальныя расходы ў галіне транспарту дзяржаўных арганізацый і арганізацый, у статутных фондах якіх 50 і болей працэнтаў акцый (доляў) знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці;

1.4.5. дарожная гаспадарка:

будаўніцтва, рэканструкцыя, рамонт і ўтрыманне мясцовых аўтамабільных дарог;

іншыя расходы на дарожную гаспадарку абласнога значэння, у тым ліку капітальныя ўкладанні;

1.4.6. паліва і энергетыка;

1.4.7. іншая дзейнасць у галіне нацыянальнай эканомікі на абласным узроўні:

маёмасныя адносіны, картаграфія і геадэзія;

падтрымка іншых галін у галіне нацыянальнай эканомікі;

1.5. ахова навакольнага асяроддзя:

мерапрыемствы для рацыянальнага (устойлівага) выкарыстання прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя на тэрыторыі вобласці;

1.6. жыллёва-камунальныя паслугі і жыллёвае будаўніцтва:

фінансаванне жыллёвага будаўніцтва, уключаючы расходы на будаўніцтва аб'ектаў інжынернай і транспартнай інфраструктуры для раёнаў жылой забудовы, праектаванне і будаўніцтва новых вулічных размеркавальных газаправодаў з газаправодамі-ўводамі для газіфікацыі эксплуатаванага жыллёвага фонду грамадзян, на тэрыторыі вобласці ў адпаведнасці з актамі заканадаўства;

стварэнне і рэканструкцыя аб'ектаў інжынернай інфраструктуры, сетак камунальнага прызначэння;

капітальны рамонт, рэканструкцыя, мадэрнізацыя аб'ектаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі, уключаючы перавод кацельняў на мясцовыя віды паліва;

мерапрыемствы для добраўпарадкавання населеных пунктаў вобласці;

расходы арганізацый, якія ажыццяўляюць налічэнне платы за жыллёва-камунальныя паслугі і платы за карыстанне жылым памяшканнем, звязаныя з выкананнем функцый па даванні безнаяўных жыллёвых субсідый;

іншыя мерапрыемствы ў галіне жыллёва-камунальнай гаспадаркі;

1.7. ахова здароўя:

забеспячэнне функцыянавання дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных абласным выканаўчым камітэтам, якія ажыццяўляюць аказанне і (або) арганізацыю аказання медыцынскай дапамогі насельніцтву;

ажыццяўленне дзяржаўнага санітарнага нагляду на тэрыторыі вобласці і забеспячэнне функцыянавання ўстаноў, якія ажыццяўляюць дзяржаўны санітарны нагляд;

забеспячэнне функцыянавання арганізацый (станцый) пералівання крыві, падпарадкаваных абласным выканаўчым камітэтам;

забеспячэнне функцыянавання арганізацый, якія абслугоўваюць дзяржаўныя арганізацыі аховы здароўя, падпарадкаваныя абласным выканаўчым камітэтам;

субсідыі недзяржаўным некамерцыйным арганізацыям на аказанне паслуг і (або) рэалізацыю праектаў, накіраваных на папярэджанне распаўсюджвання сацыяльна небяспечных захворванняў, віруса імунадэфіцыту чалавека;

іншыя пытанні і мерапрыемствы ў галіне ахове здароўя, за выключэннем напрамкаў, якія фінансуюцца з рэспубліканскага бюджэту і бюджэтаў базавага ўзроўню;

1.8. фізічная культура, спорт, культура і сродкі масавай інфармацыі:

правядзенне абласных спартыўных, спартыўна-масавых мерапрыемстваў, фізкультурна-аздараўленчай і спартыўна-масавай работы з насельніцтвам, падрыхтоўка да рэспубліканскіх і міжнародных спартыўных, спартыўна-масавых мерапрыемстваў і ўдзел у іх;

забеспячэнне функцыянавання абласных навучальна-метадычных цэнтраў фізічнага выхавання насельніцтва, абласных спецыялізаваных навучальна-спартыўных устаноў, цэнтраў фізічнага выхавання і спорту навучэнцаў і студэнтаў, іншых дзяржаўных арганізацый фізічнай культуры і спорту, уключаючы клубы па відзе (відах) спорту, падпарадкаваных абласным выканаўчым камітэтам;

падтрымка клубаў па відзе (відах) спорту, іншых арганізацый, якія аказваюць паслугі ў галіне фізічнай культуры і спорту;

правядзенне культурных мерапрыемстваў, падрыхтоўка і ўдзел у рэспубліканскіх і міжнародных культурных мерапрыемствах;

стварэнне і (або) набыццё твораў мастацтва;

забеспячэнне функцыянавання дзяржаўных арганізацый культуры, падпарадкаваных абласным выканаўчым камітэтам, а таксама арганізацый, якія іх абслугоўваюць;

забеспячэнне захаванасці гістарычна-культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца ва ўласнасці адпаведнай вобласці, і доступу да іх;

падтрымка абласных тэатральна-відовішчных арганізацый, паркаў культуры і адпачынку, заапаркаў і абласных арганізацый кінематаграфіі, якія ажыццяўляюць распаўсюджванне і (або) паказ фільмаў;

падтрымка абласных сродкаў масавай інфармацыі;

абласныя мерапрыемствы ў галіне фізічнай культуры, спорту, культуры і сродкаў масавай інфармацыі;

1.9. адукацыя:

забеспячэнне функцыянавання дзяржаўных устаноў адукацыі, дзяржаўных арганізацый адукацыі, якія забяспечваюць функцыянаванне сістэмы адукацыі, падпарадкаваных абласным выканаўчым камітэтам;

правядзенне цэнтралізаваных мерапрыемстваў у галіне адукацыі;

забеспячэнне ў дзяржаўных установах адукацыі атрымання дадатковай адукацыі дарослых у адпаведнасці з заканадаўствам;

іншая дзейнасць па забеспячэнні функцыянавання дзяржаўных устаноў адукацыі, дзяржаўных арганізацый адукацыі, якія забяспечваюць функцыянаванне сістэмы адукацыі, падпарадкаваных абласным выканаўчым камітэтам;

забеспячэнне ў адпаведнасці з заканадаўствам мер сацыяльнай абароны навучэнцаў;

1.10. сацыяльная палітыка:

забеспячэнне функцыянавання дзяржаўных устаноў сацыяльнага абслугоўвання і дзяржаўных сацыяльна-педагагічных устаноў, падпарадкаваных абласным выканаўчым камітэтам;

дзяржаўнае забеспячэнне дзяцей-сірот, дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, якія знаходзяцца ў дзіцячых дамах сямейнага тыпу, апякунскіх і прыёмных сем'ях;

забеспячэнне асобных катэгорый грамадзян тэхнічнымі сродкамі сацыяльнай рэабілітацыі;

правядзенне дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі;

мерапрыемствы для забеспячэння занятасці насельніцтва на тэрыторыі вобласці;

субсідыі і іншая фінансавая дапамога на жыллёвае будаўніцтва;

даванне безнаяўных жыллёвых субсідый;

іншыя пытанні і мерапрыемствы ў галіне сацыяльнай палітыкі.

2. З абласных бюджэтаў могуць фінансавацца расходы на інвестыцыйныя праграмы і праекты органаў мясцовага кіравання і самакіравання абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню, па ўнясенні ўкладаў у статутныя фонды арганізацый, а таксама расходы на аб'екты інфраструктуры і іншыя расходы ў рамках дзяржаўна-прыватнага партнёрства ў адпаведнасці з заканадаўствам па функцыянальных відах расходаў, устаноўленых пунктам 1 гэтага артыкула.

**Артыкул 46. Расходы, якія фінансуюцца з бюджэтаў базавага і першаснага ўзроўняў**

1. З бюджэтаў базавага ўзроўню могуць фінансавацца наступныя функцыянальныя віды расходаў:

1.1. агульнадзяржаўная дзейнасць:

забеспячэнне функцыянавання органаў мясцовага кіравання і самакіравання;

забеспячэнне функцыянавання раённых, гарадскіх архіваў, у тым ліку для захоўвання дакументаў аб асабовым складзе;

забеспячэнне правядзення паўторных выбараў дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў і мясцовых рэферэндумаў, а таксама іншыя расходы ў адпаведнасці з заканадаўствам;

абслугоўванне доўгу органаў мясцовага кіравання і самакіравання базавага тэрытарыяльнага ўзроўню;

фарміраванне рэзервовых фондаў;

матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне саветаў грамадскіх пунктаў аховы правапарадку неабходнымі памяшканнямі, сродкамі сувязі, мэбляй, іншымі

матэрыяльна-тэхнічнымі сродкамі, аплата камунальных паслуг, паслуг сувязі, эксплуатацыйных расходаў указаных пунктаў;

мерапрыемствы, накіраваныя на падтрыманне і далейшае развіццё інфраструктуры Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь і пагранічнай тэрыторыі;

пералічэнне ўзносаў асацыяцыям мясцовых Саветаў дэпутатаў;

расходы на ўтрыманне жылых памяшканняў камунальнага жыллёвага фонду да іх рэалізацыі або заключэння дагавора найму, а таксама на знос невыкарыстоўваемых нежылых памяшканняў і жылых дамоў у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі;

іншая дзейнасць, звязаная з ажыццяўленнем функцый органаў мясцовага кіравання і самакіравання базавага тэрытарыяльнага ўзроўню;

міжбюджэтныя трансферты;

1.1$^{1}$. нацыянальная абарона:

забеспячэнне мабілізацыйнай падрыхтоўкі і мабілізацыі ў адпаведнасці з заканадаўствам;

расходы на тэрытарыяльную абарону ў адпаведнасці з заканадаўствам;

1.2. судовая ўлада, праваахоўная дзейнасць і забеспячэнне бяспекі:

папярэджанне і ліквідацыя наступстваў надзвычайных сітуацый;

1.3. нацыянальная эканоміка:

1.3.1. агульныя эканамічныя пытанні:

рэгуляванне эканамічнай дзейнасці ў частцы мерапрыемстваў па санацыі і банкруцтве;

праграмы і мерапрыемствы па падтрымцы і развіцці прадпрымальніцтва;

расходы на будаўніцтва інжынернай і (або) транспартнай інфраструктуры для абслугоўвання аб'ектаў нерухомай маёмасці, якія ствараюцца на тэрыторыі сярэдніх, малых гарадскіх пасяленняў, сельскай мясцовасці камерцыйнымі арганізацыямі Рэспублікі Беларусь, індывідуальнымі прадпрымальнікамі, зарэгістраванымі ў Рэспубліцы Беларусь, з месцам знаходжання (жыхарства) на тэрыторыі сярэдніх, малых гарадскіх пасяленняў, сельскай мясцовасці, адасобленымі падраздзяленнямі для мэт арганізацыі вытворчасці тавараў (работ, паслуг) уласнай вытворчасці і (або) іх рэалізацыі;

1.3.2. сельская гаспадарка, рыбагаспадарчая дзейнасць:

забеспячэнне функцыянавання бюджэтных сельскагаспадарчых арганізацый, падпарадкаваных выканаўчым і распарадчым органам базавага тэрытарыяльнага ўзроўню;

раённыя, гарадскія (гарадоў абласнога падпарадкавання) мерапрыемствы ў галіне аграпрамысловага комплексу;

1.3.3. прамысловасць, будаўніцтва і архітэктура:

горадабудаўнічае планаванне і іншая архітэктурная і горадабудаўнічая дзейнасць на тэрыторыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі;

іншыя пытанні ў галіне прамысловасці, будаўніцтва і архітэктуры;

1.3.4. транспарт:

субсідыі дзяржаўным арганізацыям і арганізацыям, у статутных фондах якіх 50 і болей працэнтаў акцый (доляў) знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці, пры ажыццяўленні гарадскіх перавозак пасажыраў у рэгулярных зносінах, прыгарадных аўтамабільных перавозак пасажыраў у рэгулярных зносінах;

абнаўленне пасажырскага транспарту дзяржаўных арганізацый і арганізацый, у статутных фондах якіх 50 і болей працэнтаў акцый (доляў) знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці;

іншыя бягучыя расходы ў галіне транспарту дзяржаўных арганізацый і арганізацый, у статутных фондах якіх 50 і болей працэнтаў акцый (доляў) знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці;

іншыя капітальныя расходы ў галіне транспарту дзяржаўных арганізацый і арганізацый, у статутных фондах якіх 50 і болей працэнтаў акцый (доляў) знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці;

1.3.5. паліва і энергетыка:

субсідыі арганізацыям, якія рэалізуюць цвёрдае паліва, паліўныя брыкеты і дровы для насельніцтва па фіксаваных рознічных цэнах;

1.3.6. іншая дзейнасць у галіне нацыянальнай эканомікі на базавым узроўні:

маёмасныя адносіны, картаграфія і геадэзія;

падтрымка іншых  галін у галіне нацыянальнай эканомікі;

1.4. ахова навакольнага асяроддзя:

мерапрыемствы па рацыянальным (устойлівым) выкарыстанні прыродных рэсурсаў і ахове навакольнага асяроддзя на тэрыторыі адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак;

забеспячэнне функцыянавання дзяржаўных прыродаахоўных устаноў, якія ажыццяўляюць кіраванне заказнікамі;

1.5. жыллёва-камунальныя паслугі і жыллёвае будаўніцтва:

фінансаванне жыллёвага будаўніцтва, уключаючы расходы на будаўніцтва аб'ектаў інжынернай і транспартнай інфраструктуры для раёнаў жылой забудовы, праектаванне і будаўніцтва новых вулічных размеркавальных газаправодаў з газаправодамі-ўводамі для газіфікацыі эксплуатуемага жыллёвага фонда грамадзян, на тэрыторыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі базавага тэрытарыяльнага ўзроўню ў адпаведнасці з актамі заканадаўства;

фінансаванне будаўніцтва індывідуальных сістэм ацяплення і гарачага водазабеспячэння, вулічных размеркавальных газаправодаў, газаправодаў-уводаў, унутрыдамавых сістэм газазабеспячэння пры пераводзе жыллёвага эксплуатуемага фонда грамадзян з цэнтралізаванага цеплазабеспячэння і гарачага водазабеспячэння на індывідуальнае па рашэнні мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, у тым ліку набыццё індывідуальных сістэм ацяплення і гарачага водазабеспячэння;

субсідыі арганізацыям, якія ажыццяўляюць эксплуатацыю жыллёвага фонду і (або) якія аказваюць жыллёва-камунальныя паслугі насельніцтву;

расходы на бягучы рамонт жыллёвага фонду і аб'ектаў інжынернай інфраструктуры, якія абслугоўваюць жыллёвы фонд;

набыццё спецыяльнай камунальнай тэхнікі і абсталявання для патрэб жыллёва-камунальнай гаспадаркі;

расходы арганізацый жыллёва-камунальнай гаспадаркі, звязаныя з рэгістрацыяй грамадзян па месцы жыхарства і месцы знаходжання;

капітальны рамонт, рэканструкцыя, мадэрнізацыя аб'ектаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі, уключаючы перавод кацельняў на мясцовыя віды паліва;

добраўпарадкаванне населеных пунктаў на тэрыторыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі;

добраўпарадкаванне і падтрыманне ў належным санітарным стане тэрыторыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі;

расходы арганізацый, якія ажыццяўляюць налічэнне платы за жыллёва-камунальныя паслугі і платы за карыстанне жылым памяшканнем, звязаныя з выкананнем функцый па даванні безнаяўных жыллёвых субсідый, а таксама з рэгістрацыяй грамадзян па месцы жыхарства і месцы знаходжання;

1.6. ахова здароўя:

забеспячэнне функцыянавання дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных выканаўчым і распарадчым органам базавага тэрытарыяльнага ўзроўню, якія аказваюць і (або) арганізуюць аказанне медыцынскай дапамогі насельніцтву;

забеспячэнне функцыянавання іншых дзяржаўных арганізацый аховы здароўя, падпарадкаваных выканаўчым і распарадчым органам базавага тэрытарыяльнага ўзроўню;

забеспячэнне функцыянавання арганізацый, якія абслугоўваюць дзяржаўныя арганізацыі аховы здароўя, падпарадкаваныя выканаўчым і распарадчым органам базавага тэрытарыяльнага ўзроўню;

субсідыі недзяржаўным некамерцыйным арганізацыям на аказанне паслуг і (або) рэалізацыю праектаў, накіраваных на папярэджанне распаўсюджвання сацыяльна небяспечных захворванняў, віруса імунадэфіцыту чалавека;

1.7. фізічная культура, спорт, культура і сродкі масавай інфармацыі:

расходы на фізкультурна-аздараўленчую і спартыўна-масавую работу з насельніцтвам;

правядзенне раённых, гарадскіх (гарадоў абласнога падпарадкавання) спартыўных, спартыўна-масавых мерапрыемстваў, а таксама падрыхтоўка да рэспубліканскіх, абласных і міжнародных спартыўных, спартыўна-масавых мерапрыемстваў і ўдзел у іх;

забеспячэнне функцыянавання раённых, гарадскіх (гарадоў абласнога падпарадкавання) спецыялізаваных навучальна-спартыўных устаноў, фізкультурна-аздараўленчых, спартыўных цэнтраў (камбінатаў, комплексаў, цэнтраў фізкультурна-аздараўленчай работы), фізкультурна-спартыўных клубаў, іншых дзяржаўных арганізацый фізічнай культуры і спорту, уключаючы клубы па відзе (відах) спорту, падпарадкаваныя выканаўчым і распарадчым органам базавага тэрытарыяльнага ўзроўню;

падтрымка клубаў па відзе (відах) спорту;

правядзенне культурных мерапрыемстваў, падрыхтоўка і ўдзел у рэгіянальных, рэспубліканскіх і міжнародных культурных мерапрыемствах;

стварэнне і (або) набыццё твораў мастацтва;

забеспячэнне функцыянавання дзяржаўных арганізацый культуры, падпарадкаваных выканаўчым і распарадчым органам базавага тэрытарыяльнага ўзроўню, а таксама арганізацый, якія іх абслугоўваюць;

забеспячэнне захаванасці гістарычна-культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца ва ўласнасці адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі Рэспублікі Беларусь, і доступу да іх;

падтрымка раённых, гарадскіх (гарадоў абласнога падпарадкавання) тэатральна-відовішчных арганізацый, паркаў культуры і адпачынку, заапаркаў і раённых (гарадскіх) арганізацый кінематаграфіі, якія ажыццяўляюць распаўсюджванне і (або) паказ фільмаў;

выплата ўзнагароджанняў за выпадкова выяўленую культурную каштоўнасць, якая з'яўляецца скарбам і якой нададзены статус гістарычна-культурнай каштоўнасці;

падтрымка раённых (гарадскіх) сродкаў масавай інфармацыі;

раённыя, гарадскія (гарадоў абласнога падпарадкавання) мерапрыемствы ў галіне фізічнай культуры, спорту, культуры і сродкаў масавай інфармацыі;

1.8. адукацыя:

функцыянаванне дзяржаўных устаноў адукацыі, дзяржаўных арганізацый адукацыі, якія забяспечваюць функцыянаванне сістэмы адукацыі, падпарадкаваных выканаўчым і распарадчым органам базавага тэрытарыяльнага ўзроўню;

фінансаванне часткі расходаў іншых арганізацый, якім у адпаведнасці з заканадаўствам дадзена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць, пры рэалізацыі імі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю ў адпаведнасці з заканадаўствам;

правядзенне цэнтралізаваных мерапрыемстваў у галіне адукацыі;

забеспячэнне ў дзяржаўных установах адукацыі атрымання дадатковай адукацыі дарослых у адпаведнасці з заканадаўствам;

іншая дзейнасць па забеспячэнні функцыянавання дзяржаўных устаноў адукацыі, дзяржаўных арганізацый адукацыі, якія забяспечваюць функцыянаванне сістэмы адукацыі, падпарадкаваных выканаўчым і распарадчым органам базавага тэрытарыяльнага ўзроўню;

раённыя, гарадскія (гарадоў абласнога падпарадкавання) мерапрыемствы ў галіне адукацыі;

забеспячэнне ў адпаведнасці з заканадаўствам мер сацыяльнай абароны навучэнцаў;

1.9. сацыяльная палітыка:

забеспячэнне функцыянавання дзяржаўных устаноў сацыяльнага абслугоўвання, дзяржаўных сацыяльна-педагагічных устаноў, падпарадкаваных выканаўчым і распарадчым органам базавага тэрытарыяльнага ўзроўню;

дзяржаўнае забеспячэнне дзяцей-сірот, дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, якія знаходзяцца ў дзіцячых дамах сямейнага тыпу, апякунскіх, прыёмных сем'ях;

субсідыі і іншая фінансавая дапамога на жыллёвае будаўніцтва;

даванне безнаяўных жыллёвых субсідый;

правядзенне дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі;

іншыя пытанні і мерапрыемствы ў галіне сацыяльнай палітыкі.

2. З бюджэтаў базавага ўзроўню могуць фінансавацца расходы на інвестыцыйныя праграмы і праекты органаў мясцовага кіравання і самакіравання базавага тэрытарыяльнага ўзроўню, па ўнясенні ўкладаў у статутныя фонды арганізацый, а таксама расходы на аб'екты інфраструктуры і іншыя расходы ў рамках дзяржаўна-прыватнага партнёрства ў адпаведнасці з заканадаўствам па функцыянальных відах расходаў, устаноўленых пунктам 1 гэтага артыкула.

3. З бюджэтаў першаснага ўзроўню могуць фінансавацца наступныя віды расходаў:

3.1. агульнадзяржаўная дзейнасць:

забеспячэнне функцыянавання органаў мясцовага кіравання і самакіравання, уключаючы садзейнічанне ў стварэнні (выбранні) і забеспячэнні дзейнасці органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання;

забеспячэнне правядзення паўторных выбараў дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў і мясцовых рэферэндумаў, а таксама іншыя расходы ў адпаведнасці з заканадаўствам;

матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне саветаў грамадскіх пунктаў аховы правапарадку неабходнымі памяшканнямі, сродкамі сувязі, мэбляй, іншымі матэрыяльна-тэхнічнымі сродкамі, аплата камунальных паслуг, паслуг сувязі, эксплуатацыйных расходаў указаных пунктаў;

мерапрыемствы, накіраваныя на падтрыманне і далейшае развіццё інфраструктуры Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь і пагранічнай тэрыторыі;

пералічэнне ўзносаў асацыяцыям мясцовых Саветаў дэпутатаў;

расходы за кошт паступленняў ад сродкаў самаабкладання;

іншая дзейнасць, звязаная з ажыццяўленнем функцый органаў мясцовага кіравання і самакіравання першаснага тэрытарыяльнага ўзроўню;

фарміраванне рэзервовых фондаў;

міжбюджэтныя трансферты;

3.2. добраўпарадкаванне населеных пунктаў на тэрыторыі адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі;

3.2[1]. добраўпарадкаванне і падтрыманне ў належным санітарным стане тэрыторыі адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі;

3.2[2]. забеспячэнне захаванасці гістарычна-культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца ва ўласнасці адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі Рэспублікі Беларусь, і доступу да іх;

3.3. маёмасныя адносіны, картаграфія і геадэзія;

3.4. пытанні і мерапрыемствы ў галіне сацыяльнай палітыкі.

4. З бюджэтаў першаснага ўзроўню могуць фінансавацца расходы на інвестыцыйныя праграмы і праекты органаў мясцовага кіравання і самакіравання першаснага тэрытарыяльнага ўзроўню, па ўнясенні ўкладаў у статутныя фонды арганізацый, а таксама расходы на аб'екты інфраструктуры і іншыя расходы ў рамках дзяржаўна-прыватнага партнёрства ў адпаведнасці з заканадаўствам па функцыянальных відах расходаў, устаноўленых пунктам 3 гэтага артыкула.

**Артыкул 47. Расходы бюджэту г. Мінска**

1. З бюджэту г. Мінска могуць фінансавацца наступныя функцыянальныя віды расходаў:

1.1. агульнадзяржаўная дзейнасць:

забеспячэнне функцыянавання органаў мясцовага кіравання і самакіравання г. Мінска;

забеспячэнне функцыянавання Мінскага гарадскога архіва;

забеспячэнне правядзення паўторных выбараў дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў і гарадскіх рэферэндумаў, а таксама іншыя расходы ў адпаведнасці з заканадаўствам;

абслугоўванне доўгу органаў кіравання і самакіравання г. Мінска;

прыкладныя даследаванні ў галіне агульнадзяржаўнай дзейнасці, накіраваныя на рэалізацыю функцый Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта;

забеспячэнне функцыянавання вадалазна-выратавальнай службы;

матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне саветаў грамадскіх пунктаў аховы правапарадку неабходнымі памяшканнямі, сродкамі сувязі, мэбляй, іншымі матэрыяльна-тэхнічнымі сродкамі, аплата камунальных паслуг, паслуг сувязі, эксплуатацыйных расходаў указаных пунктаў;

пералічэнне ўзносаў асацыяцыям мясцовых Саветаў дэпутатаў, Нацыянальнай асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў;

расходы на ўтрыманне жылых памяшканняў камунальнага жыллёвага фонду да іх рэалізацыі або заключэння дагавора найму, а таксама на знос у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі невыкарыстоўваемых нежылых памяшканняў і жылых дамоў, якімі не карыстаюцца;

іншая дзейнасць, звязаная з ажыццяўленнем функцый органаў кіравання і самакіравання г. Мінска;

міжбюджэтныя трансферты ў рэспубліканскі бюджэт;

1.2. нацыянальная абарона:

забеспячэнне мабілізацыйнай падрыхтоўкі і мабілізацыі ў адпаведнасці з заканадаўствам;

расходы на тэрытарыяльную абарону ў адпаведнасці з заканадаўствам;

1.3. судовая ўлада, праваахоўная дзейнасць і забеспячэнне бяспекі:

расходы на праектаванне, устаноўку, эксплуатацыю, рамонт і ўкараненне сучасных тэхнічных сродкаў і аўтаматызаваных сістэм рэгулявання дарожнага руху, дарожную разметку і іншыя віды работ, звязаных з бяспекай дарожнага руху;

забеспячэнне функцыянавання органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях у адпаведнасці з заканадаўствам;

папярэджанне і ліквідацыя наступстваў надзвычайных сітуацый;

1.4. нацыянальная эканоміка:

1.4.1. агульныя эканамічныя пытанні:

рэгуляванне эканамічнай дзейнасці ў частцы мерапрыемстваў па санацыі і банкруцтве;

праграмы і мерапрыемствы для развіцця і падтрымкі прадпрымальніцтва;

1.4.2. сельская гаспадарка, рыбагаспадарчая дзейнасць:

забеспячэнне функцыянавання бюджэтных сельскагаспадарчых арганізацый, падпарадкаваных Мінскаму гарадскому выканаўчаму камітэту;

мерапрыемствы для развіцця аграпрамысловага комплексу;

1.4.3. прамысловасць, будаўніцтва і архітэктура:

комплекснае горадабудаўнічае планаванне і іншая архітэктурная дзейнасць на тэрыторыі горада;

1.4.4. транспарт:

субсідыі дзяржаўным арганізацыям і арганізацыям, у статутных фондах якіх 50 і болей працэнтаў акцый (доляў) знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці, пры ажыццяўленні гарадскіх перавозак пасажыраў усімі відамі транспарту ў рэгулярных зносінах і прыгарадных аўтамабільных перавозак пасажыраў у рэгулярных зносінах;

абнаўленне пасажырскага транспарту дзяржаўных арганізацый і арганізацый, у статутных фондах якіх 50 і болей працэнтаў акцый (доляў) знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці;

будаўніцтва метрапалітэна;

іншыя расходы ў галіне транспарту дзяржаўных арганізацый і арганізацый, у статутных фондах якіх 50 і болей працэнтаў акцый (доляў) знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці;

1.4.5. паліва і энергетыка:

расходы на пакрыццё розніцы ў цэнах на цвёрдыя віды паліва, якія рэалізуюцца насельніцтву;

1.4.6. іншая дзейнасць у галіне нацыянальнай эканомікі на тэрыторыі г. Мінска:

маёмасныя адносіны, картаграфія і геадэзія;

падтрымка іншых галін у галіне нацыянальнай эканомікі;

1.5. ахова навакольнага асяроддзя:

мерапрыемствы для рацыянальнага (устойлівага) выкарыстання прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя на тэрыторыі г. Мінска;

1.6. жыллёва-камунальныя паслугі і жыллёвае будаўніцтва:

фінансаванне жыллёвага будаўніцтва, уключаючы расходы на будаўніцтва аб'ектаў інжынернай і транспартнай інфраструктуры для раёнаў жылой забудовы, на тэрыторыі горада;

субсідыі арганізацыям, якія ажыццяўляюць эксплуатацыю жыллёвага фонду і (або) якія аказваюць жыллёва-камунальныя паслугі насельніцтву;

расходы арганізацый, якія ажыццяўляюць налічэнне платы за жыллёва-камунальныя паслугі і платы за карыстанне жылым памяшканнем, звязаныя з выкананнем функцый па даванні безнаяўных жыллёвых субсідый, а таксама з рэгістрацыяй грамадзян па месцы жыхарства і месцы знаходжання;

расходы на бягучы рамонт жыллёвага фонду і аб'ектаў інжынернай інфраструктуры, якія абслугоўваюць жыллёвы фонд;

набыццё спецыяльнай камунальнай тэхнікі і абсталявання для патрэб жыллёва-камунальнай гаспадаркі;

капітальны рамонт, рэканструкцыя, мадэрнізацыя аб'ектаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі, уключаючы перавод кацельняў на мясцовыя віды паліва;

добраўпарадкаванне горада, у тым ліку развіццё і рамонт праезнай часткі вуліц г. Мінска, якія з'яўляюцца працягам рэспубліканскіх аўтамабільных дарог;

расходы арганізацый жыллёва-камунальнай гаспадаркі, звязаныя з рэгістрацыяй грамадзян па месцы жыхарства і месцы знаходжання;

1.7. ахова здароўя:

забеспячэнне функцыянавання дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных Мінскаму гарадскому выканаўчаму камітэту, якія ажыццяўляюць аказанне і (або) арганізацыю аказання медыцынскай дапамогі насельніцтву;

ажыццяўленне дзяржаўнага санітарнага нагляду на тэрыторыі г. Мінска і забеспячэнне функцыянавання ўстаноў, якія ажыццяўляюць дзяржаўны санітарны нагляд;

забеспячэнне функцыянавання арганізацый, якія абслугоўваюць дзяржаўныя арганізацыі аховы здароўя, падпарадкаваныя Мінскаму гарадскому выканаўчаму камітэту;

субсідыі недзяржаўным некамерцыйным арганізацыям на аказанне паслуг і (або) рэалізацыю праектаў, накіраваных на папярэджанне распаўсюджвання сацыяльна небяспечных захворванняў, віруса імунадэфіцыту чалавека;

іншыя пытанні і мерапрыемствы ў галіне аховы здароўя, за выключэннем напрамкаў, якія фінансуюцца з рэспубліканскага бюджэту;

1.8. фізічная культура, спорт, культура і сродкі масавай інфармацыі:

расходы на фізкультурна-аздараўленчую і спартыўна-масавую работу з насельніцтвам;

правядзенне гарадскіх спартыўных, спартыўна-масавых мерапрыемстваў, а таксама падрыхтоўка да рэспубліканскіх і міжнародных спартыўных, спартыўна-масавых мерапрыемстваў і ўдзел у іх;

забеспячэнне функцыянавання Мінскага гарадскога навучальна-метадычнага цэнтра фізічнага выхавання насельніцтва, спецыялізаваных навучальна-спартыўных устаноў, фізкультурна-аздараўленчых, спартыўных цэнтраў (камбінатаў, комплексаў, цэнтраў фізкультурна-аздараўленчай работы), фізкультурна-спартыўных клубаў, іншых дзяржаўных арганізацый фізічнай культуры і спорту, уключаючы клубы па відзе (відах) спорту, падпарадкаваныя Мінскаму гарадскому выканаўчаму камітэту;

падтрымка клубаў па відзе (відах) спорту, а таксама арганізацый, якія аказваюць паслугі ў галіне фізічнай культуры і спорту;

правядзенне культурных мерапрыемстваў, падрыхтоўка, удзел у рэспубліканскіх і міжнародных культурных мерапрыемствах;

стварэнне і (або) набыццё твораў мастацтва;

забеспячэнне функцыянавання дзяржаўных арганізацый культуры, падпарадкаваных Мінскаму гарадскому выканаўчаму камітэту, а таксама арганізацый, якія іх абслугоўваюць;

забеспячэнне захаванасці гістарычна-культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца ва ўласнасці г. Мінска, і доступу да іх;

падтрымка гарадскіх тэатральна-відовішчных арганізацый, паркаў культуры і адпачынку, заапаркаў, арганізацый кінематаграфіі, якія ажыццяўляюць распаўсюджванне і (або) паказ фільмаў;

выплата ўзнагароджанняў за выпадкова выяўленую культурную каштоўнасць, якая з'яўляецца скарбам і якой нададзены статус гістарычна-культурнай каштоўнасці;

падтрымка гарадскіх сродкаў масавай інфармацыі;

гарадскія мерапрыемствы ў галіне фізічнай культуры, спорту, культуры і сродкаў масавай інфармацыі;

1.9. адукацыя:

функцыянаванне дзяржаўных устаноў адукацыі, дзяржаўных арганізацый адукацыі, якія забяспечваюць функцыянаванне сістэмы адукацыі, падпарадкаваных Мінскаму гарадскому выканаўчаму камітэту;

фінансаванне часткі расходаў іншых арганізацый, якім у адпаведнасці з заканадаўствам дадзена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць, пры рэалізацыі імі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю ў адпаведнасці з заканадаўствам;

правядзенне цэнтралізаваных мерапрыемстваў у галіне адукацыі;

забеспячэнне ў дзяржаўных установах адукацыі атрымання дадатковай адукацыі дарослых у адпаведнасці з заканадаўствам;

іншая дзейнасць па забеспячэнні функцыянавання дзяржаўных устаноў адукацыі, дзяржаўных арганізацый адукацыі, якія забяспечваюць функцыянаванне сістэмы адукацыі, падпарадкаваных Мінскаму гарадскому выканаўчаму камітэту;

забеспячэнне ў адпаведнасці з заканадаўствам мер сацыяльнай абароны навучэнцаў;

1.10. сацыяльная палітыка:

забеспячэнне функцыянавання дзяржаўных устаноў сацыяльнага абслугоўвання, дзяржаўных сацыяльна-педагагічных устаноў, падпарадкаваных Мінскаму гарадскому выканаўчаму камітэту;

дзяржаўнае забеспячэнне дзяцей-сірот, дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, якія знаходзяцца ў дзіцячых дамах сямейнага тыпу, апякунскіх, прыёмных сем'ях;

забеспячэнне асобных катэгорый грамадзян тэхнічнымі сродкамі сацыяльнай рэабілітацыі;

даванне безнаяўных жыллёвых субсідый;

правядзенне дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі;

мерапрыемствы для забеспячэння занятасці насельніцтва на тэрыторыі горада;

субсідыі і іншая фінансавая дапамога на жыллёвае будаўніцтва;

іншыя пытанні і мерапрыемствы ў галіне сацыяльнай палітыкі.

2. З бюджэту г. Мінска могуць фінансавацца расходы на інвестыцыйныя праграмы і праекты органаў мясцовага кіравання і самакіравання г. Мінска, па ўнясенні ўкладаў у статутныя фонды арганізацый, а таксама расходы на аб'екты інфраструктуры і іншыя расходы ў рамках дзяржаўна-прыватнага партнёрства ў адпаведнасці з заканадаўствам па функцыянальных відах расходаў, устаноўленых пунктам 1 гэтага артыкула.

## РАЗДЗЕЛ IV
## ЗБАЛАНСАВАНАСЦЬ БЮДЖЭТАЎ

# ГЛАВА 8
# ДЭФІЦЫТ (ПРАФІЦЫТ) РЭСПУБЛІКАНСКАГА БЮДЖЭТУ, МЯСЦОВЫХ БЮДЖЭТАЎ, ЯГО ЗАЦВЯРДЖЭННЕ

## Артыкул 48. Дэфіцыт (прафіцыт) бюджэту і парадак яго зацвярджэння

1. Зацвярджэнне бюджэту з дэфіцытам (прафіцытам) дапускаецца пры наяўнасці абгрунтаваных крыніц фінансавання дэфіцыту (з вызначэннем напрамкаў выкарыстання прафіцыту) бюджэту.

2. Максімальны памер дэфіцыту (мінімальны памер прафіцыту) рэспубліканскага бюджэту, а таксама максімальныя памеры дэфіцыту (мінімальныя памеры прафіцыту) кансалідаваных бюджэтаў абласцей і бюджэту г. Мінска ўстанаўліваюцца законам аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год.

3. Максімальныя памеры дэфіцыту (мінімальныя памеры прафіцыту) кансалідаваных бюджэтаў раёнаў і бюджэтаў гарадоў абласнога падпарадкавання ўстанаўліваюцца рашэннямі Саветаў дэпутатаў абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню аб бюджэце на чарговы фінансавы год у межах памеру дэфіцыту (прафіцыту), устаноўленага для кансалідаваных бюджэтаў абласцей.

4. Максімальныя памеры дэфіцыту (мінімальныя памеры прафіцыту) бюджэтаў сельсаветаў, пасёлкаў гарадскога тыпу, гарадоў раённага падпарадкавання ўстанаўліваюцца рашэннямі Саветаў дэпутатаў базавага тэрытарыяльнага ўзроўню аб бюджэце на чарговы фінансавы год у межах памеру дэфіцыту (прафіцыту), устаноўленага для кансалідаваных бюджэтаў раёнаў.

5. Прынятыя ў ходзе выканання бюджэту рашэнні, якія прыводзяць да змяненняў даходаў або расходаў, якія цягнуць за сабой дэфіцыт (прафіцыт) бюджэту або яго павелічэнне (змяншэнне), павінны вызначаць крыніцы фінансавання дэфіцыту (напрамкі выкарыстання прафіцыту) бюджэту і прадугледжваць меры для кампенсацыі страт даходаў бюджэту пры іх узнікненні.

## Артыкул 49. Крыніцы фінансавання дэфіцыту (напрамкі выкарыстання прафіцыту) бюджэту

1. У выпадку прыняцця бюджэту з дэфіцытам (прафіцытам) крыніцы фінансавання дэфіцыту (напрамкі выкарыстання прафіцыту) бюджэту зацвярджаюцца:

1.1. для рэспубліканскага бюджэту – законам аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год;

1.2. для мясцовых бюджэтаў – рашэннямі адпаведных мясцовых Саветаў дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год.

2. Крэдыты Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, а таксама сродкі ад набыцця Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь дзяржаўных каштоўных папер Рэспублікі Беларусь, каштоўных папер мясцовых органаў кіравання і самакіравання пры іх размяшчэнні не могуць быць крыніцамі фінансавання дэфіцыту (напрамкамі выкарыстання прафіцыту) бюджэту.

## Артыкул 50. Крыніцы фінансавання дэфіцыту (напрамкі выкарыстання прафіцыту) рэспубліканскага бюджэту

У склад крыніц фінансавання дэфіцыту (напрамкаў выкарыстання прафіцыту) рэспубліканскага бюджэту ўключаюцца:

розніца паміж сродкамі, якія паступілі ад размяшчэння дзяржаўных каштоўных папер Рэспублікі Беларусь, і сродкамі, накіраванымі на пагашэнне асноўнага доўгу па іх;

розніца паміж атрыманымі і пагашанымі Рэспублікай Беларусь пазыкамі (крэдытамі) міжнародных фінансавых арганізацый, замежных дзяржаў і іншых замежных крэдытораў;

розніца паміж сродкамі, атрыманымі ад звароту асноўнага доўгу па дадзеных з рэспубліканскага бюджэту мясцовым бюджэтам, бюджэтам дзяржаўных пазабюджэтных фондаў бюджэтных крэдытах, і сумай дадзеных з рэспубліканскага бюджэту мясцовым бюджэтам, бюджэтам дзяржаўных пазабюджэтных фондаў бюджэтных крэдытаў;

сродкі ад аперацый з маёмасцю, якая знаходзіцца ў рэспубліканскай уласнасці, акрамя сродкаў ад аперацый з маёмасцю, якія з'яўляюцца даходамі і расходамі рэспубліканскага бюджэту ў адпаведнасці з бюджэтным заканадаўствам;

змяненне рэшт сродкаў на рахунках па ўліку сродкаў рэспубліканскага бюджэту, у тым ліку размешчаных у аблігацыі, на працягу адпаведнага фінансавага года;

курсавая розніца па сродках рэспубліканскага бюджэту, якая вызначаецца ў адпаведнасці з заканадаўствам;

розніца паміж сродкамі, якія паступілі ад звароту выплат, праведзеных у адпаведнасці з гарантыямі Урада Рэспублікі Беларусь, і сродкамі, накіраванымі на выкананне абавязацельстваў у адпаведнасці з гарантыямі Урада Рэспублікі Беларусь па пагашэнні і абслугоўванні пазык (крэдытаў);

розніца паміж сродкамі, якія паступілі ад звароту дадзеных з рэспубліканскага бюджэту рэзідэнтам Рэспублікі Беларусь сродкаў на зваротнай аснове, у тым ліку за кошт знешніх дзяржаўных пазык, і сумай дадзеных з рэспубліканскага бюджэту рэзідэнтам Рэспублікі Беларусь сродкаў на зваротнай аснове, у тым ліку за кошт знешніх дзяржаўных пазык;

розніца паміж сродкамі ад звароту доўгу па набытых Міністэрствам фінансаў актывах банкаў, сфарміраваных па крэдытах, дадзеных арганізацыям банкамі Рэспублікі Беларусь, і сродкамі, накіраванымі на набыццё Міністэрствам фінансаў актываў банкаў, сфарміраваных па крэдытах, дадзеных арганізацыям банкамі Рэспублікі Беларусь;

іншыя крыніцы фінансавання дэфіцыту (напрамкі выкарыстання прафіцыту) рэспубліканскага бюджэту.

**Артыкул 51. Крыніцы фінансавання дэфіцыту (напрамкі выкарыстання прафіцыту) мясцовых бюджэтаў**

У склад крыніц фінансавання дэфіцыту (напрамкаў выкарыстання прафіцыту) мясцовых бюджэтаў уключаюцца:

розніца паміж сродкамі, якія паступілі ад размяшчэння на ўнутраным фінансавым рынку аблігацый, эмітаваных мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі абласнога і базавага тэрытарыяльных узроўняў, і сродкамі, накіраванымі на пагашэнне асноўнага доўгу па іх;

розніца паміж сродкамі, атрыманымі ў выглядзе бюджэтных крэдытаў з вышэйстаячых бюджэтаў, і сродкамі, накіраванымі на пагашэнне асноўнага доўгу па іх;

розніца паміж сродкамі, атрыманымі ад звароту асноўнага доўгу па дадзеных ніжэйстаячым бюджэтам бюджэтных крэдытах, і сумай дадзеных ніжэйстаячым бюджэтам бюджэтных крэдытаў;

сродкі ад аперацый з маёмасцю, якая знаходзіцца ў камунальнай уласнасці, акрамя сродкаў ад аперацый з маёмасцю, якія з'яўляюцца даходамі і расходамі адпаведнага мясцовага бюджэту ў адпаведнасці з бюджэтным заканадаўствам;

змяненне рэшт сродкаў на рахунках па ўліку сродкаў адпаведнага мясцовага бюджэту, у тым ліку размешчаных у аблігацыі, на працягу адпаведнага фінансавага года;

курсавая розніца па сродках адпаведнага мясцовага бюджэту, якая вызначаецца ў адпаведнасці з заканадаўствам;

розніца паміж сродкамі, якія паступілі ад звароту выплат, праведзеных у адпаведнасці з гарантыямі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў па крэдытах, выдадзеных банкамі Рэспублікі Беларусь, і сродкамі, накіраванымі на выкананне абавязацельстваў у адпаведнасці з гарантыямі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў па пагашэнні і абслугоўванні крэдытаў, выдадзеных банкамі Рэспублікі Беларусь;

розніца паміж сродкамі, якія паступілі ад звароту дадзеных з мясцовых бюджэтаў сродкаў на зваротнай аснове, і сумай дадзеных з мясцовых бюджэтаў сродкаў на зваротнай аснове;

розніца паміж сродкамі, якія паступілі ад даўжніка ў адпаведнасці з дагаворамі ўступкі патрабавання ў адпаведны мясцовы бюджэт, і сродкамі, аплачанымі з адпаведнага мясцовага бюджэту першапачатковаму крэдытору ў адпаведнасці з дагаворамі ўступкі патрабавання;

іншыя крыніцы фінансавання дэфіцыту (напрамкі выкарыстання прафіцыту) мясцовых бюджэтаў.

## ГЛАВА 9
## ЗАПАЗЫЧАННІ

### Артыкул 52. Ажыццяўленне запазычанняў

1. Права ажыццяўляць дзяржаўныя запазычанні належыць Рэспубліцы Беларусь, Ураду Рэспублікі Беларусь.

Ад імя Рэспублікі Беларусь дзяржаўныя запазычанні ажыццяўляе Урад Рэспублікі Беларусь.

2. Дзяржаўныя запазычанні ажыццяўляюцца ў межах лімітаў унутранага дзяржаўнага доўгу і знешняга дзяржаўнага доўгу, устаноўленых законам аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год.

3. Унутраныя дзяржаўныя пазыкі прыцягвае Урад Рэспублікі Беларусь або па яго даручэнні Міністэрства фінансаў.

4. Знешнія дзяржаўныя пазыкі ад імя Рэспублікі Беларусь прыцягвае Урад Рэспублікі Беларусь па рашэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Прыцягненне знешніх дзяржаўных пазык Урадам Рэспублікі Беларусь і прыцягненне знешніх пазык рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь пад гарантыі Урада Рэспублікі Беларусь ажыццяўляюцца па рашэнні Урада Рэспублікі Беларусь, узгодненым з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

5. Дагаворы і іншыя дакументы, звязаныя з падрыхтоўкай і ажыццяўленнем дзяржаўных запазычанняў, уключаючы дакументы, звязаныя з эмісіяй (выдачай), зваротам, пагашэннем, улікам праў на дзяржаўныя каштоўныя паперы, а таксама з вырашэннем пытанняў па падрыхтоўцы эмісіі (выдачы) такіх каштоўных папер, заключаюць (складаюць) Урад Рэспублікі Беларусь або Міністэрства фінансаў па яго даручэнні з вызначанымі Урадам Рэспублікі Беларусь арганізацыямі.

6. Выключаны.

7. Пры падрыхтоўцы прапаноў аб выбары крэдытора, тэрміну, валюты і іншых умоў дзяржаўнага запазычання Міністэрства фінансаў павінна зыходзіць з эканоміі бюджэтных сродкаў і эфектыўнасці іх выкарыстання.

8. Парадак прыцягнення знешніх дзяржаўных пазык і знешніх пазык, якія прыцягваюцца пад гарантыі Урада Рэспублікі Беларусь, устанаўлівае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 53. Даўгавыя абавязацельствы Рэспублікі Беларусь**

1. Даўгавыя абавязацельствы Рэспублікі Беларусь могуць існаваць у выглядзе даўгавых абавязацельстваў па:

1.1. крэдытах (пазыках), прыцягнутых ад імя Рэспублікі Беларусь як пазычальніка ад крэдытных арганізацый, замежных дзяржаў, міжнародных арганізацый і іншых рэзідэнтаў і нерэзідэнтаў Рэспублікі Беларусь;

1.2. дзяржаўных каштоўных паперах, эмітаваных (выдадзеных) ад імя Рэспублікі Беларусь;

1.3. гарантыях Урада Рэспублікі Беларусь;

1.4. іншых даўгавых абавязацельствах, раней аднесеных у адпаведнасці з заканадаўствам на дзяржаўны доўг Рэспублікі Беларусь.

2. Даўгавыя абавязацельствы могуць быць кароткатэрміновымі (да аднаго года ўключна) і доўгатэрміновымі (больш за адзін год).

**Артыкул 54. Кіраванне дзяржаўным** доўгам **Рэспублікі Беларусь**

1. Кіраванне дзяржаўным доўгам Рэспублікі Беларусь уяўляе сабой дзейнасць дзяржавы па аптымізацыі яго структуры і кошту абслугоўвання.

2. Кіраванне дзяржаўным доўгам Рэспублікі Беларусь ажыццяўляе Урад Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 55. Ліміты ўнутранага дзяржаўнага** доўгу **і ўнутранага** доўгу**, гарантаванага Рэспублікай Беларусь, знешняга дзяржаўнага** доўгу **і знешняга** доўгу**, гарантаванага Рэспублікай Беларусь**

Ліміты ўнутранага дзяржаўнага доўгу і ўнутранага доўгу, гарантаванага Рэспублікай Беларусь, знешняга дзяржаўнага доўгу і знешняга доўгу, гарантаванага Рэспублікай Беларусь, устанаўліваюцца законам аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год.

**Артыкул 56. Дзяржаўныя каштоўныя паперы**

1. Дзяржаўнымі каштоўнымі паперамі з'яўляюцца каштоўныя паперы, якія эмітуе (якія выдае) Міністэрства фінансаў ад імя Рэспублікі Беларусь.

2. Парадак прыцягнення ўнутраных дзяржаўных пазык пры дапамозе эмісіі (выдачы), звароту і пагашэння дзяржаўных каштоўных папер зацвярджае Урад Рэспублікі Беларусь.

3. Агульны аб'ём эмісіі (выдачы) дзяржаўных каштоўных папер вызначаецца законам аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год і адлюстроўваецца ў крыніцах знешняга і ўнутранага фінансавання рэспубліканскага бюджэту.

4. Дзяржаўныя каштоўныя паперы, размешчаныя на ўнутраным фінансавым рынку (на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь), фарміруюць унутраны дзяржаўны доўг, дзяржаўныя каштоўныя паперы, размешчаныя на знешніх фінансавых рынках (за граніцамі тэрыторыі Рэспублікі Беларусь), фарміруюць знешні дзяржаўны доўг.

**Артыкул 57. Абслугоўванне і пагашэнне дзяржаўнага** доўгу **Рэспублікі Беларусь**

1. Пад абслугоўваннем дзяржаўнага доўгу Рэспублікі Беларусь разумеецца выплата працэнтаў або іншага ўзнагароджання пазыкадаўцу (крэдытору), штрафаў і іншых выплат па дзяржаўных пазыках, за выключэннем пагашэння дзяржаўнага доўгу Рэспублікі Беларусь.

2. Пад пагашэннем дзяржаўнага доўгу Рэспублікі Беларусь разумеецца выплата, выкуп або іншае выключэнне са звароту даўгавых абавязацельстваў Рэспублікі Беларусь у частцы асноўнага доўгу.

3. Рэспубліка Беларусь нясе безумоўныя абавязацельствы па абслугоўванні і пагашэнні дзяржаўнага доўгу Рэспублікі Беларусь. Дзяржаўны доўг Рэспублікі Беларусь поўнасцю забяспечваецца сродкамі рэспубліканскага бюджэту і іншай маёмасцю, якая знаходзіцца ў рэспубліканскай уласнасці.

4. Выплаты па абслугоўванні і пагашэнні знешняга дзяржаўнага доўгу і ўнутранага дзяржаўнага доўгу прадугледжваюцца законам аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год.

5. У выпадку ўзнікнення рызыкі перавышэння расходаў на абслугоўванне і пагашэнне дзяржаўнага доўгу Рэспублікі Беларусь над аб'ёмам сродкаў, прадугледжаных на гэтыя мэты законам аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год, Міністэрства фінансаў інфармуе аб гэтым Урад Рэспублікі Беларусь, які неадкладна падае Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь прапановы аб удакладненні паказчыкаў рэспубліканскага бюджэту на чарговы фінансавы год.

6. Выплаты па абслугоўванні і пагашэнні дзяржаўнага доўгу Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца першачарговымі ў адносінах да іншых выплат пры выкананні рэспубліканскага бюджэту.

7. Паступленне ў рэспубліканскі бюджэт сродкаў ад дзяржаўных запазычанняў, а таксама пакрыццё пазычальнікамі ў рэспубліканскі бюджэт выплат, праведзеных з рэспубліканскага бюджэту ў адпаведнасці з гарантыямі Урада Рэспублікі Беларусь, падлягаюць адлюстраванню ў крыніцах фінансавання дэфіцыту (напрамках выкарыстання прафіцыту) рэспубліканскага бюджэту шляхам павелічэння аб'ёму крыніц фінансавання дэфіцыту (напрамкаў выкарыстання прафіцыту) рэспубліканскага бюджэту.

8. Пагашэнне дзяржаўнага доўгу Рэспублікі Беларусь і ажыццяўленне Урадам Рэспублікі Беларусь выплат з рэспубліканскага бюджэту ў адпаведнасці з гарантыямі Урада Рэспублікі Беларусь падлягаюць адлюстраванню ў крыніцах фінансавання дэфіцыту (напрамках выкарыстання прафіцыту) рэспубліканскага бюджэту шляхам змяншэння аб'ёму крыніц фінансавання дэфіцыту (напрамкаў выкарыстання прафіцыту) рэспубліканскага бюджэту, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

9. Пазычальнікі ажыццяўляюць абслугоўванне і пагашэнне знешніх пазык, гарантаваных Урадам Рэспублікі Беларусь, праз банкі — агенты Урада Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 58. Рэструктурызацыя дзяржаўнага** доўгу **Рэспублікі Беларусь і даўгавых абавязацельстваў перад рэспубліканскім бюджэтам**

1. Пад рэструктурызацыяй дзяржаўнага доўгу Рэспублікі Беларусь разумеецца заснаванае на пагадненні з пазыкадаўцам спыненне даўгавых абавязацельстваў Рэспублікі Беларусь, якія складаюць дзяржаўны доўг Рэспублікі Беларусь, з заменай указаных даўгавых абавязацельстваў іншымі даўгавымі абавязацельствамі Рэспублікі Беларусь, якія прадугледжваюць іншыя ўмовы абслугоўвання і пагашэння даўгавых абавязацельстваў Рэспублікі Беларусь.

2. Парадак і ўмовы рэструктурызацыі даўгавых абавязацельстваў перад рэспубліканскім бюджэтам па выплатах, праведзеных з рэспубліканскага бюджэту ў адпаведнасці з гарантыямі Урада Рэспублікі Беларусь па пазыках (крэдытах), вызначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. Рэструктурызацыя запазычанасці па

пазыцы (крэдыце) перад рэспубліканскім бюджэтам ажыццяўляецца на аснове платнасці, тэрміновасці і зваротнасці.

**Артыкул 59. Склад дзяржаўнага** доўгу **Рэспублікі Беларусь**

Дзяржаўны доўг Рэспублікі Беларусь уключае ў сябе суму, якая падлягае звароту, і нявернутую суму ўнутраных дзяржаўных пазык і знешніх дзяржаўных пазык, фактычна атрыманых Рэспублікай Беларусь ад рэзідэнтаў і нерэзідэнтаў Рэспублікі Беларусь, і суму абавязацельстваў, якія падлягаюць выкананню ў адпаведнасці з гарантыямі Урада Рэспублікі Беларусь па ўнутраных і знешніх пазыках.

**Артыкул 60. Абслугоўванне і пагашэнне знешняга дзяржаўнага** доўгу

1. Міністэрства фінансаў за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту абслугоўвае і пагашае знешнія дзяржаўныя пазыкі .

Выплаты па абслугоўванні і пагашэнні знешняга дзяржаўнага доўгу ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з пералікам знешніх дзяржаўных пазык, абслугоўванне і пагашэнне якіх ажыццяўляюцца з прыцягненнем сродкаў рэспубліканскага бюджэту.

2. Абслугоўванне і пагашэнне знешніх пазык, прыцягнутых пад гарантыі Урада Рэспублікі Беларусь, ажыццяўляюць пазычальнікі за кошт уласных сродкаў, калі іншае не прадугледжана рашэннямі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь або Урада Рэспублікі Беларусь. У выпадку невыканання пазычальнікам абавязацельстваў выплаты ажыццяўляюцца ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам.

3. Пазычальнікі могуць прыцягваць сродкі знешніх дзяржаўных пазык і знешніх пазык, гарантаваных Урадам Рэспублікі Беларусь, у мэтах іх давання карыстальнікам знешніх пазык. Пазычальнікі абслугоўваюць і пагашаюць такія пазыкі за кошт сродкаў, якія пералічаюцца на іх рахункі карыстальнікамі знешніх пазык, калі іншае не прадугледжана рашэннямі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь або Урада Рэспублікі Беларусь.

Карыстальнікі знешняй пазыкі нясуць адказнасць за выкананне абавязацельстваў па дадзеных знешніх дзяржаўных пазыках або знешніх пазыках, прыцягнутых пад гарантыі Урада Рэспублікі Беларусь, перад пазычальнікамі ў адпаведнасці з заканадаўствам і дагаворамі.

Гарантыі Урада Рэспублікі Беларусь, выдадзеныя па знешніх пазыках, якія прыцягваюцца ў мэтах давання карыстальнікам знешніх пазык, з'яўляюцца забеспячэннем выканання абавязацельстваў карыстальніка знешніх пазык перад пазычальнікам без давання якога-небудзь іншага забеспячэння выканання абавязацельстваў па гэтых пазыках.

У выпадку невыканання абавязацельстваў карыстальнікам знешняй пазыкі выплаты ажыццяўляюцца ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам.

**Артыкул 61. Выключаны**

**Артыкул 62. Улік знешняга дзяржаўнага** доўгу **і знешняга** доўгу**,
гарантаванага Рэспублікай Беларусь**

Міністэрства фінансаў вядзе ўлік знешняга дзяржаўнага доўгу і знешняга доўгу, гарантаванага Рэспублікай Беларусь, і ажыццяўляе рэгістрацыю знешніх дзяржаўных пазык і знешніх пазык, прыцягнутых пад гарантыі Урада Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 63. Абслугоўванне і пагашэнне ўнутранага дзяржаўнага** доўгу

1. Міністэрства фінансаў за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту абслугоўвае і пагашае ўнутраны дзяржаўны доўг .

2. Абслугоўванне і пагашэнне крэдытаў, выдадзеных банкамі Рэспублікі Беларусь пад гарантыі Урада Рэспублікі Беларусь рэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, ажыццяўляюць рэзідэнты Рэспублікі Беларусь за кошт уласных сродкаў, калі іншае не прадугледжана Урадам Рэспублікі Беларусь. У выпадку невыканання пазычальнікам абавязацельстваў выплаты ажыццяўляюцца ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам.

**Артыкул 64. Улік унутранага дзяржаўнага** доўгу **і ўнутранага** доўгу**, гарантаванага Рэспублікай Беларусь**

Улік унутранага дзяржаўнага доўгу і ўнутранага доўгу, гарантаванага Рэспублікай Беларусь, ажыццяўляе Міністэрства фінансаў пры дапамозе вядзення адпаведнага рэестра.

**Артыкул 65. Даўгавыя абавязацельствы органаў мясцовага кіравання і самакіравання**

1. Органы мясцовага кіравання і самакіравання нясуць безумоўныя абавязацельствы па абслугоўванні і пагашэнні доўгу органаў мясцовага кіравання і самакіравання. Абавязак органаў мясцовага кіравання і самакіравання поўнасцю забяспечваецца сродкамі адпаведнага мясцовага бюджэту і іншай маёмасцю, якая знаходзіцца ва ўласнасці адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі.

Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы не нясуць адказнасці па даўгах іншых мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў.

Кіраванне доўгам органаў мясцовага кіравання і самакіравання ажыццяўляюць мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы.

2. Даўгавыя абавязацельствы органаў мясцовага кіравання і самакіравання могуць існаваць у выглядзе даўгавых абавязацельстваў па:

2.1. аблігацыях, эмітаваных мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі абласнога і базавага тэрытарыяльных узроўняў, якія размяшчаюцца на ўнутраным фінансавым рынку. Эмісія мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі аблігацый, намінаваных у замежнай валюце, не дапускаецца;

2.2. гарантыях мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў абласнога і базавага тэрытарыяльных узроўняў;

2.3. бюджэтных крэдытах;

2.4. выключаны.

3. Абслугоўванне і пагашэнне доўгу органаў мясцовага кіравання і самакіравання, акрамя крэдытаў, выдадзеных банкамі Рэспублікі Беларусь пад гарантыі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў рэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, ажыццяўляюць мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы за кошт сродкаў адпаведных мясцовых бюджэтаў.

Абслугоўванне і пагашэнне крэдытаў, выдадзеных банкамі Рэспублікі Беларусь пад гарантыі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў рэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, ажыццяўляюць рэзідэнты Рэспублікі Беларусь за кошт уласных сродкаў, калі іншае не прадугледжана рашэннямі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў. У выпадку невыканання пазычальнікам абавязацельстваў выплаты ажыццяўляюцца ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам.

$3^1$. Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы вядуць улік доўгу органаў мясцовага кіравання і самакіравання і доўгу, гарантаванага мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, і падаюць у Міністэрства фінансаў неабходныя звесткі для

вядзення рэестра доўгу органаў мясцовага кіравання і самакіравання ў парадку, устаноўленым Міністэрствам фінансаў.

4. Ліміт доўгу органаў мясцовага кіравання і самакіравання на чарговы фінансавы год і ліміт доўгу, гарантаванага мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, устанаўліваюцца рашэннем мясцовага Савета дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год.

Ліміты доўгу органаў мясцовага кіравання і самакіравання абласцей і г. Мінска і доўгу, гарантаванага мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі абласцей і г. Мінска, на чарговы фінансавы год падлягаюць узгадненню з Міністэрствам фінансаў.

Ліміты доўгу органаў мясцовага кіравання і самакіравання базавага тэрытарыяльнага ўзроўню і доўгу, гарантаванага мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі базавага тэрытарыяльнага ўзроўню, на чарговы фінансавы год падлягаюць узгадненню з мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню.

Памер лімітаў доўгу органаў мясцовага кіравання і самакіравання, якія ўстанаўліваюцца на чарговы фінансавы год, і доўгу, гарантаванага мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, сумарна не можа перавышаць 80 працэнтаў аб'ёму даходаў бюджэту, які плануецца на чарговы фінансавы год, за вылікам субвенцый, якія атрымліваюцца, а таксама міжбюджэтных трансфертаў, якія перадаюцца ў іншыя бюджэты.

У бягучым фінансавым годзе памер лімітаў доўгу органаў мясцовага кіравання і самакіравання і доўгу, гарантаванага мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, за выключэннем доўгу органаў мясцовага кіравання і самакіравання, які ўтварыўся ў сувязі з атрыманнем бюджэтных крэдытаў для пакрыцця часовых касавых разрываў, сумарна не можа перавышаць 80 працэнтаў аб'ёму даходаў бюджэту, які плануецца ў бягучым фінансавым годзе, за вылікам субвенцый, якія атрымліваюцца, а таксама міжбюджэтных трансфертаў, якія перадаюцца ў іншыя бюджэты.

5. Пры перавышэнні ліміту доўгу органаў мясцовага кіравання і самакіравання эмісія аблігацый і даванне гарантый мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі не дапускаюцца.

Абласныя (Мінскія гарадскія) выканаўчыя камітэты абавязаны распрацаваць узгоднены з Міністэрствам фінансаў комплекс мер для скарачэння доўгу да памеру, які не перавышае гранічна дапушчальны ўзровень, і штоквартальна інфармаваць Міністэрства фінансаў аб выніках яго выканання.

Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы першаснага і базавага тэрытарыяльных узроўняў абавязаны распрацаваць узгоднены з вышэйстаячымі мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі комплекс мер для скарачэння доўгу да памеру, які не перавышае гранічна дапушчальны ўзровень, і штоквартальна інфармаваць вышэйстаячыя мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы аб выніках яго выканання.

6. У адпаведным мясцовым бюджэце на чарговы фінансавы год згодна з прынятымі раней абавязацельствамі прадугледжваюцца асігнаванні на абслугоўванне доўгу органаў мясцовага кіравання і самакіравання, пагашэнне наяўнай у мясцовым бюджэце на дадзены год запазычанасці па доўгу мінулых гадоў з надышоўшым тэрмінам выплаты, а таксама асігнаванні для выканання абавязацельстваў у адпаведнасці з гарантыямі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў.

7. Гарантыі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў на крэдыты, выдадзеныя банкамі Рэспублікі Беларусь, даюцца, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, арганізацыям, маёмасць якіх знаходзіцца ў камунальнай уласнасці, а таксама арганізацыям, акцыі (долі ў статутных фондах) якіх належаць адміністрацыйна-

тэрытарыяльным адзінкам, і недзяржаўным арганізацыям мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі на платнай аснове ў межах лімітаў доўгу, гарантаванага мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі. Памер платы за даванне гарантыі мясцовага выканаўчага і распарадчага органа ўстанаўліваецца рашэннем адпаведнага мясцовага Савета дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год.

8. Гарантыі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў не даюцца на крэдыты, якія выдаюць банкі Рэспублікі Беларусь юрыдычным асобам Рэспублікі Беларусь, якія маюць запазычанасць, указананую ў пункце 3 артыкула 68 гэтага Кодэкса.

9. У выпадку невыканання пазычальнікам абавязацельстваў па звароце крэдыту і (або) выплаце працэнтаў за карыстанне ім і прад'яўлення банкам ва ўстаноўленым парадку патрабаванняў да мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў аб выкананні выдадзеных імі гарантый мясцовыя фінансавыя органы ва ўстаноўленым парадку праводзяць выплаты ў адпаведнасці з гарантыямі.

10. Выплаты, праведзеныя з мясцовых бюджэтаў у адпаведнасці з гарантыямі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, банк спаганяе ў бясспрэчным парадку з рахункаў крэдытаатрымальнікаў (за выключэннем спецыяльных рахункаў і субрахункаў арганізацый, індывідуальных прадпрымальнікаў, іх дэбітораў, адкрытых у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі, дабрачынных рахункаў, адкрытых для збору, захоўвання і выкарыстання грашовых сродкаў, у тым ліку ў замежнай валюце, якія паступаюць у выглядзе бязвыплатнай (спонсарскай) дапамогі або ахвяраванняў, а таксама рахункаў, якія выкарыстоўваюцца для ажыццяўлення разлікаў у форме акрэдытываў за кошт бюджэтных сродкаў) са спагнаннем працэнтаў з заплачанай мясцовым выканаўчым і распарадчым органам сумы. Пры разліку сумы працэнтаў колькасць каляндарных дзён у годзе прымаецца роўнай 360 дням, у месяцы – 30 дням.

Указаныя выплаты спаганяюцца на падставе рашэння банка з пералічэннем іх у мясцовыя бюджэты.

11. Гарантыі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, а таксама пакрыццё ў бюджэт выплат, праведзеных мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі пры выкананні абавязацельстваў гаранта, даюцца і выконваюцца ў адпаведнасці з умовамі, вызначанымі заканадаўчымі актамі, у парадку, устаноўленым мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню.

12. Не дапускаюцца эмісія аблігацый органамі мясцовага кіравання і самакіравання і даванне гарантый мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, калі сума планаваных выплат на абслугоўванне і пагашэнне новых і раней прынятых даўгавых абавязацельстваў у бягучым або ў кожным наступным годзе перавышае 15 працэнтаў планаванага на бягучы год аб'ёму даходаў бюджэту за вылікам субвенцый, якія атрымліваюцца, а таксама міжбюджэтных трансфертаў, якія перадаюцца ў іншыя бюджэты.

13. Паступленне ў мясцовыя бюджэты сродкаў ад запазычанняў органаў мясцовага кіравання і самакіравання, а таксама пакрыццё пазычальнікамі выплат, праведзеных з мясцовых бюджэтаў у адпаведнасці з гарантыямі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, падлягаюць адлюстраванню ў крыніцах фінансавання дэфіцыту (напрамках выкарыстання прафіцыту) адпаведнага мясцовага бюджэту шляхам павелічэння аб'ёму крыніц фінансавання дэфіцыту (напрамкаў выкарыстання прафіцыту) мясцовага бюджэту.

14. Пагашэнне доўгу органаў мясцовага кіравання і самакіравання і ажыццяўленне выплат у адпаведнасці з гарантыямі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў падлягаюць адлюстраванню ў крыніцах фінансавання дэфіцыту (напрамках выкарыстання прафіцыту) адпаведнага мясцовага бюджэту шляхам змяншэння аб'ёму

крыніц фінансавання дэфіцыту (напрамкаў выкарыстання прафіцыту) мясцовага бюджэту.

**Артыкул 66. Бюджэтная пазыка**

1. Дзяржаўная фінансавая падтрымка на аснове платнасці, тэрміновасці і зваротнасці аказваецца за кошт рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў у выглядзе давання бюджэтнай пазыкі, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

2. Бюджэтная пазыка даецца па рашэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у межах сродкаў, прадугледжаных на гэтыя мэты законам аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год, рашэннямі мясцовых Саветаў дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год.

3. У рашэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб даванні бюджэтнай пазыкі ўказваюцца:

3.1. найменне пазычальніка;

3.2. сума бюджэтнай пазыкі, якая даецца;

3.3. мэты, на якія даецца бюджэтная пазыка;

3.4. тэрмін звароту бюджэтнай пазыкі;

3.5. памер працэнтаў за карыстанне бюджэтнай пазыкай, парадак іх налічэння і выплаты;

3.6. іншыя ўмовы.

4. На падставе рашэння Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб даванні бюджэтнай пазыкі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту і (або) мясцовых бюджэтаў Міністэрства фінансаў і (або) мясцовыя фінансавыя органы заключаюць з пазычальнікам і ўпаўнаважаным дзяржаўным органам, які ажыццяўляе дзяржаўнае кіраванне і рэгуляванне ў адпаведнай сферы дзейнасці, калі іншае не ўстаноўлена рашэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дагавор бюджэтнай пазыкі ў адпаведнасці з умовамі, вызначанымі рашэннем аб даванні бюджэтнай пазыкі.

5. Бюджэтная пазыка выдаецца шляхам аплаты Міністэрствам фінансаў, яго тэрытарыяльнымі органамі, мясцовымі фінансавымі органамі разліковых дакументаў пазычальніка па яго абавязацельствах перад пастаўшчыкамі тавараў (работ, паслуг) згодна з дагаворам, які адпавядае мэтам давання бюджэтнай пазыкі, у тым ліку ў парадку авансавых плацяжоў, а таксама шляхам пералічэння сродкаў на банкаўскі бягучы (разліковы) рахунак пазычальніка для пакрыцця выдаткаў, праведзеных ім за кошт уласных сродкаў, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

6. Пазычальнік вяртае бюджэтную пазыку ў тэрмін, устаноўлены рашэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб даванні бюджэтнай пазыкі і дагаворам бюджэтнай пазыкі (згодна з графікам пагашэння бюджэтнай пазыкі).

Прадаўжэнне тэрміну звароту бюджэтнай пазыкі не дапускаецца.

7. Пры парушэнні пазычальнікам устаноўленага рашэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і дагаворам бюджэтнай пазыкі (згодна з графікам пагашэння бюджэтнай пазыкі) тэрміну звароту бюджэтнай пазыкі налічаецца пеня ў памеры працэнтаў за карыстанне бюджэтнай пазыкай, указаных у рашэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб даванні бюджэтнай пазыкі і дагаворы бюджэтнай пазыкі, павялічаных у 1,5 разы.

Налічэнне пені за парушэнне пазычальнікам устаноўленага тэрміну звароту бюджэтнай пазыкі праводзіцца з дня, які ідзе следам за днём надыходу абавязацельства па звароце, па дзень звароту ўключна.

Пры разліку працэнтаў, пені колькасць каляндарных дзён у годзе прымаецца роўнай 360 дням, у месяцы – 30 дням.

8. Нявыкананыя абавязацельствы аб звароце бюджэтнай пазыкі, выплаце працэнтаў па ёй, пені падлягаюць спагнанню ў бясспрэчным парадку ў адпаведнасці з заканадаўствам.

9. Пазычальнік нясе адказнасць за мэтавае выкарыстанне бюджэтнай пазыкі, своечасовасць яе звароту, прытрымліванне іншых умоў давання бюджэтнай пазыкі.

Бюджэтныя пазыкі, выкарыстаныя пазычальнікам не па мэтавым прызначэнні або з парушэннем іншых умоў іх давання, падлягаюць звароту (спагнанню) з прымяненнем адказнасці ў адпаведнасці з главой 26 гэтага Кодэкса.

10. Выкананне пазычальнікам абавязацельстваў дагавора бюджэтнай пазыкі кантралюе ўпаўнаважаны дзяржаўны орган, указаны ў пункце 4 гэтага артыкула, а таксама іншыя дзяржаўныя органы ў адпаведнасці з заканадаўствам.

**Артыкул 67. Даванне бюджэтнага крэдыту**

1. Бюджэтны крэдыт даецца пасля заключэння дагавора, які дзейнічае з моманту яго заключэння і да поўнага выканання крэдытаатрымальнікам сваіх абавязацельстваў па звароце бюджэтнага крэдыту і выплаце працэнтаў за карыстанне бюджэтным крэдытам.

Тэрмін карыстання бюджэтным крэдытам лічыцца з дня пералічэння грашовых сродкаў на рахунак крэдытаатрымальніка або ў аплату абавязацельстваў крэдытаатрымальніка перад пастаўшчыкамі тавараў (работ, паслуг) да поўнага выканання крэдытаатрымальнікам сваіх абавязацельстваў па пагашэнні бюджэтнага крэдыту і выплаце працэнтаў за карыстанне бюджэтным крэдытам.

2. Бюджэтны крэдыт даецца абласному бюджэту і бюджэту г. Мінска на падставе дагавора, які заключаецца з Міністэрствам фінансаў, на пакрыццё часовага касавага разрыву і для рэалізацыі інвестыцыйных праектаў і праграм.

Бюджэтны крэдыт даецца бюджэту базавага і першаснага ўзроўняў на падставе дагавора, які заключаецца з вышэйстаячым мясцовым выканаўчым і распарадчым органам, які выконвае адпаведны бюджэт, на пакрыццё часовага касавага разрыву і для рэалізацыі інвестыцыйных праектаў і праграм.

3. Рашэнне аб даванні бюджэтнага крэдыту з рэспубліканскага бюджэту на пакрыццё часовага касавага разрыву абласнога бюджэту, бюджэту г. Мінска прымае Міністэрства фінансаў на падставе ліста выканаўчага і распарадчага органа абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню з хадайніцтвам аб даванні бюджэтнага крэдыту з указаннем прычын утварэння часовага касавага разрыву і абгрунтаваннем сумы, неабходнай для яго пакрыцця.

Рашэнне аб даванні бюджэтнага крэдыту з абласнога бюджэту на пакрыццё часовага касавага разрыву бюджэту базавага ўзроўню прымае мясцовы фінансавы орган абласнога выканаўчага камітэта на падставе пісьма выканаўчага і распарадчага органа базавага тэрытарыяльнага ўзроўню з хадайніцтвам аб даванні бюджэтнага крэдыту з указаннем прычын утварэння часовага касавага разрыву і абгрунтаваннем сумы, неабходнай для яго пакрыцця.

Рашэнне аб даванні бюджэтнага крэдыту з бюджэту базавага ўзроўню для пакрыцця часовага касавага разрыву бюджэту першаснага ўзроўню прымае мясцовы фінансавы орган выканаўчага і распарадчага органа базавага тэрытарыяльнага ўзроўню на падставе пісьма выканаўчага і распарадчага органа першаснага тэрытарыяльнага ўзроўню з хадайніцтвам аб даванні бюджэтнага крэдыту з указаннем прычын утварэння часовага касавага разрыву і абгрунтаваннем сумы, неабходнай для яго пакрыцця.

4. На пакрыццё часовага касавага разрыву бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду могуць давацца бюджэтныя крэдыты з рэспубліканскага бюджэту, а

рэспубліканскаму бюджэту на гэту ж мэту могуць давацца бюджэтныя крэдыты з бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў.

Рашэнне аб даванні бюджэтнага крэдыту на пакрыццё часовага касавага разрыву бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду прымае Міністэрства фінансаў на падставе пісьма распарадчыка сродкаў дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду з хадайніцтвам аб даванні бюджэтнага крэдыту з указаннем прычын утварэння часовага касавага разрыву і абгрунтаваннем сумы, неабходнай для яго пакрыцця. Рашэнне аб даванні бюджэтнага крэдыту на пакрыццё часовага касавага разрыву рэспубліканскага бюджэту прымае распарадчык сродкаў дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду на падставе звароту Міністэрства фінансаў.

5. Бюджэтны крэдыт, дадзены на пакрыццё часовага касавага разрыву, падлягае звароту да канца бягучага фінансавага года.

6. Для рэалізацыі інвестыцыйных праектаў і праграм мясцовы бюджэт мае права атрымліваць бюджэтныя крэдыты, якія даюцца з вышэйстаячага бюджэту, на тэрмін да пяці гадоў.

Бюджэтны крэдыт для рэалізацыі інвестыцыйных праектаў і праграм не даецца мясцоваму бюджэту, які мае пратэрмінаваную запазычанасць па пагашэнні раней дадзеных бюджэтных крэдытаў.

7. За карыстанне бюджэтным крэдытам устанаўліваюцца працэнты ў памеры стаўкі, якая вызначаецца законам аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год для бюджэтных крэдытаў, якія даюцца з рэспубліканскага бюджэту або бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, і рашэннем мясцовых Саветаў дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год для бюджэтных крэдытаў, якія даюцца з мясцовых бюджэтаў.

Працэнты за карыстанне бюджэтнымі крэдытамі для рэалізацыі інвестыцыйных праектаў і праграм устанаўліваюцца ў памеры не менш 0,5 стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, дзейнай на дзень налічэння працэнтаў за карыстанне бюджэтным крэдытам.

8. Крэдытаатрымальнік нясе адказнасць за мэтавае выкарыстанне бюджэтнага крэдыту, своечасовасць яго звароту ў адпаведнасці з заканадаўствам і дагаворам.

9. Невыкананне або неналежнае выкананне крэдытаатрымальнікам абавязацельстваў па дагаворы цягнуць за сабой прымяненне адказнасці ў адпаведнасці з главой 26 гэтага Кодэкса.

Пры парушэнні крэдытаатрымальнікам устаноўленых рашэннем аб даванні бюджэтнага крэдыту і дагаворам тэрмінаў звароту бюджэтнага крэдыту налічаецца пеня ў памеры стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, дзейнай на дзень узнікнення запазычанасці.

Пры разліку сумы працэнтаў колькасць каляндарных дзён у годзе прымаецца роўнай 360 дням, у месяцы – 30 дням.

**Артыкул 68. Гарантыі Урада Рэспублікі Беларусь**

1. Гарантыі Урада Рэспублікі Беларусь на крэдыты, якія выдаюцца банкамі Рэспублікі Беларусь, і знешніх пазыках даюцца рэзідэнтам Рэспублікі Беларусь на платнай аснове Урадам Рэспублікі Беларусь пасля ўзгаднення з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

2. Выключаны.

3. Гарантыі Урада Рэспублікі Беларусь не даюцца на пазыкі (крэдыты) рэзідэнтаў Рэспублікі Беларусь, якія маюць запазычанасць па выплатах у рэспубліканскі бюджэт, мясцовыя бюджэты і бюджэты дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, якія не выканалі

сваіх абавязацельстваў па раней дадзеных пазыках (крэдытах), у тым ліку выдадзеных пад гарантыі Урада Рэспублікі Беларусь, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, а таксама якія не выканалі сваіх абавязацельстваў па выкананых гарантыях Урада Рэспублікі Беларусь, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, бюджэтных пазычках або якія выканалі ўказаныя абавязацельствы за кошт бюджэтных сродкаў, і, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі, на крэдыты, якія выдаюцца банкамі для рэалізацыі дзяржаўных праграм.

4. Выключаны.

5. Выключаны.

6. Парадак давання і выканання гарантый Урада Рэспублікі Беларусь, а таксама пакрыцця ў рэспубліканскі бюджэт выплат, праведзеных з рэспубліканскага бюджэту ў адпаведнасці з гарантыямі Урада Рэспублікі Беларусь, устанаўлівае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 10
## ДАВАННЕ ДЗЯРЖАЎНЫХ КРЭДЫТАЎ РЭСПУБЛІКАЙ БЕЛАРУСЬ

### Артыкул 69. Даванне дзяржаўных крэдытаў Рэспублікай Беларусь і доўг замежных дзяржаў, міжнародных арганізацый і іншых нерэзідэнтаў Рэспублікі Беларусь перад Рэспублікай Беларусь

1. Рэспубліка Беларусь дае дзяржаўныя крэдыты замежным дзяржавам, міжнародным арганізацыям і іншым нерэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

2. Даванне дзяржаўных крэдытаў замежным дзяржавам, міжнародным арганізацыям і іншым нерэзідэнтам Рэспублікі Беларусь ажыццяўляе Урад Рэспублікі Беларусь па рашэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

3. Даўгавыя абавязацельствы замежных дзяржаў, міжнародных арганізацый і іншых нерэзідэнтаў Рэспублікі Беларусь перад Рэспублікай Беларусь як крэдыторам фарміруюць доўг замежных дзяржаў, міжнародных арганізацый і іншых нерэзідэнтаў Рэспублікі Беларусь перад Рэспублікай Беларусь.

4. У выпадку давання Рэспублікай Беларусь дзяржаўных крэдытаў замежным дзяржавам, міжнародным арганізацыям і іншым нерэзідэнтам Рэспублікі Беларусь законам аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год зацвярджаюцца:

4.1. гранічны аб'ём дзяржаўных крэдытаў, якія дае Рэспубліка Беларусь замежным дзяржавам, міжнародным арганізацыям і іншым нерэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

4.2. праграма давання Рэспублікай Беларусь дзяржаўных крэдытаў замежным дзяржавам, міжнародным арганізацыям і іншым нерэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

5. Дзяржаўны крэдыт можа быць дадзены Рэспублікай Беларусь толькі тым замежным дзяржавам, міжнародным арганізацыям і іншым нерэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, якія не маюць пратэрмінаванай запазычанасці па раней дадзеных дзяржаўных крэдытах.

6. Звесткі аб памерах і структуры доўгу замежных дзяржаў, міжнародных арганізацый і іншых нерэзідэнтаў Рэспублікі Беларусь перад Рэспублікай Беларусь па відах даўгавых абавязацельстваў і па крэдытаатрымальніках дадаюцца да праекта закона аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год пры ўнясенні яго ў Палату прадстаўнікоў.

### Артыкул 70. Праграма давання Рэспублікай Беларусь дзяржаўных крэдытаў замежным дзяржавам, міжнародным арганізацыям і іншым нерэзідэнтам Рэспублікі Беларусь

1. Праграма давання Рэспублікай Беларусь дзяржаўных крэдытаў замежным дзяржавам, міжнародным арганізацыям і іншым нерэзідэнтам Рэспублікі Беларусь

(далей – праграма давання Рэспублікай Беларусь дзяржаўных крэдытаў) за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту ўяўляе сабой пералік крэдытаў на чарговы фінансавы год з указаннем мэты давання крэдытаў, найменняў крэдытаатрымальнікаў, агульнага аб'ёму крэдытаў, аб'ёму крэдытаў, дадзеных у бягучым фінансавым годзе.

2. Праграма давання Рэспублікай Беларусь дзяржаўных крэдытаў зацвярджаецца законам аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год у якасці дадатку да гэтага закона ў выпадку, калі плануецца даванне Рэспублікай Беларусь дзяржаўных крэдытаў.

3. Дагавор аб даванні Рэспублікай Беларусь дзяржаўных крэдытаў можа быць падпісаны беларускім бокам толькі ў выпадку яго ўключэння ў праграму давання Рэспублікай Беларусь дзяржаўных крэдытаў.

## РАЗДЗЕЛ V
## МІЖБЮДЖЭТНЫЯ АДНОСІНЫ

## ГЛАВА 11
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

### Артыкул 71. Асновы міжбюджэтных адносін

1. Міжбюджэтнымі адносінамі з'яўляюцца адносіны паміж рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання і органамі мясцовага кіравання і самакіравання пры ажыццяўленні бюджэтнага працэсу.

2. Міжбюджэтныя адносіны рэгулююцца ў мэтах забеспячэння адпаведнасці паміж паўнамоцтвамі дзяржаўных органаў на ажыццяўленне расходаў, замацаваных заканадаўчымі актамі за рэспубліканскім і мясцовымі бюджэтамі, і бюджэтнымі рэсурсамі, якія павінны забяспечваць выкананне гэтых паўнамоцтваў.

Міжбюджэтныя адносіны рэгулююцца шляхам:

устанаўлення нарматываў адлічэнняў ад рэспубліканскіх падаткаў, збораў (пошлін), а таксама ад мясцовых падаткаў і збораў;

давання міжбюджэтных трансфертаў;

давання бюджэтных крэдытаў.

### Артыкул 72. Прынцыпы міжбюджэтных адносін

Міжбюджэтныя адносіны грунтуюцца на прынцыпах:

размежавання і замацавання даходаў бюджэтаў па пэўных узроўнях бюджэтнай сістэмы Рэспублікі Беларусь;

размеркавання і замацавання расходаў бюджэтаў па пэўных узроўнях бюджэтнай сістэмы Рэспублікі Беларусь;

выраўноўвання ўзроўняў мінімальнай бюджэтнай забяспечанасці бюджэтаў усіх узроўняў бюджэтнай сістэмы Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 73. Перадача даходаў і расходаў бюджэтаў

Калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, перадача даходаў і расходаў бюджэтаў у выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам, ажыццяўляецца з:

рэспубліканскага бюджэту на падставе заканадаўчых актаў;

абласных бюджэтаў на падставе рашэння абласнога Савета дэпутатаў або рашэння абласнога выканаўчага камітэта ў межах праў, дадзеных яму абласным Саветам дэпутатаў;

бюджэтаў базавага ўзроўню на падставе рашэння раённага, гарадскога (горада абласнога падпарадкавання) Савета дэпутатаў або рашэння раённага, гарадскога (горада абласнога падпарадкавання) выканаўчага камітэта ў межах праў, дадзеных яму раённым, гарадскім (горада абласнога падпарадкавання) Саветам дэпутатаў;

бюджэтаў першаснага ўзроўню на падставе рашэння сельскага, пасялковага, гарадскога (горада раённага падпарадкавання) Савета дэпутатаў або рашэння сельскага, пасялковага, гарадскога (горада раённага падпарадкавання) выканаўчага камітэта ў межах праў, дадзеных яму сельскім, пасялковым, гарадскім (горада раённага падпарадкавання) Саветам дэпутатаў.

**Артыкул 74. Правы дзяржаўных органаў пры даванні міжбюджэтных трансфертаў ніжэйстаячым бюджэтам**

Пры невыкананні мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі ўстаноўленага заканадаўствам парадку залічэння падаткаў, збораў (пошлін) і іншых даходаў у вышэйстаячы бюджэт, а таксама пры нямэтавым выкарыстанні сродкаў, выдзеленых з вышэйстаячага бюджэту, або існуючай запазычанасці па выплатах у вышэйстаячы бюджэт прыпыняецца або змяншаецца на гэтыя сумы аб'ём міжбюджэтных трансфертаў, якія перадаюцца з вышэйстаячага бюджэту ніжэйстаячым бюджэтам.

## ГЛАВА 12
## МІЖБЮДЖЭТНЫЯ ТРАНСФЕРТЫ

**Артыкул 75. Формы міжбюджэтных трансфертаў**

1. Міжбюджэтныя трансферты даюцца ў формах датацый, субвенцый і іншых міжбюджэтных трансфертаў у адпаведнасці з гэтым Кодэксам.

2. Датацыя з вышэйстаячага бюджэту ў ніжэйстаячы бюджэт даецца ў выпадку перавышэння прагназнага аб'ёму расходаў мясцовага бюджэту над прагнозным аб'ёмам яго даходаў.

Датацыя з вышэйстаячага бюджэту ў ніжэйстаячы бюджэт можа быць дадзена толькі пасля ўліку ў поўным аб'ёме ўласных даходаў бюджэту.

3. Міжбюджэтны трансферт з ніжэйстаячага бюджэту ў вышэйстаячы бюджэт перадаецца ў выпадку перавышэння прагназнага аб'ёму даходаў ніжэйстаячага бюджэту над прагнозным аб'ёмам яго расходаў або ў іншых выпадках, устаноўленых заканадаўчымі актамі і (або) рашэннямі мясцовых Саветаў дэпутатаў.

4. Аб'ём міжбюджэтных трансфертаў у форме датацый на планаваны перыяд, вызначаецца на аснове розніцы паміж прагнозным аб'ёмам даходаў і прагнозным аб'ёмам расходаў адпаведнага мясцовага бюджэту.

5. Прагнозны аб'ём даходаў мясцовага бюджэту разлічваецца з улікам падатковага патэнцыялу адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі.

Прагнозны аб'ём расходаў мясцовага бюджэту разлічваецца з улікам нарматываў бюджэтнай забяспечанасці і карэктуючых каэфіцыентаў нарматываў бюджэтнай забяспечанасці.

6. Датацыя, субвенцыя або іншы міжбюджэтны трансферт могуць таксама давацца ў бягучым фінансавым годзе ў адпаведнасці з пунктам 7 артыкула 101 гэтага Кодэкса ў выпадку прыняцця акта заканадаўства, які выклікае змяншэнне даходаў або павелічэнне расходаў бюджэту.

7. Нявыкарыстаныя на працягу справаздачнага фінансавага года міжбюджэтныя трансферты, якія мелі мэтавы характар выкарыстання, падлягаюць звароту ў бюджэт, з якога яны дадзены, на працягу першых 10 каляндарных дзён бягучага фінансавага года для завяршэння аперацый справаздачнага фінансавага года.

8. Пры змяненні адміністрацыйна-тэрытарыяльнай будовы Рэспублікі Беларусь мясцовыя Саветы дэпутатаў прымаюць рашэнні аб унясенні змяненняў і (або) дапаўненняў у рашэнні мясцовых Саветаў дэпутатаў аб бюджэце на адпаведны фінансавы год у частцы памераў міжбюджэтных трансфертаў.

**Артыкул 76. Разлік расходаў, якія ўлічваюцца пры вызначэнні аб'ёму датацыі**

1. Аб'ём датацыі на планаваны перыяд вызначаецца на падставе нарматываў бюджэтнай забяспечанасці і карэктуючых каэфіцыентаў нарматываў бюджэтнай забяспечанасці.

2. Нарматывы бюджэтнай забяспечанасці для мясцовых бюджэтаў вызначаюцца зыходзячы з ліку жыхароў або спажыўцоў тавараў (работ, паслуг), якія даюцца дзяржавай, і ўдакладняюцца з прымяненнем карэктуючых каэфіцыентаў, якія ўлічваюць розніцу ў кошце тавараў (работ, паслуг), якія даюцца дзяржавай, у залежнасці ад колькасці насельніцтва і спажыўцоў тавараў (работ, паслуг), якія даюцца дзяржавай, сацыяльна-эканамічных, дэмаграфічных, кліматычных, экалагічных і іншых асаблівасцей адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак па меры іх вызначэння.

3. Методыка разліку датацый, нарматываў бюджэтнай забяспечанасці карэктуючых каэфіцыентаў нарматываў бюджэтнай забяспечанасці зацвярджаецца Міністэрствам фінансаў.

Методыка разліку нарматываў бюджэтнай забяспечанасці расходаў у асобных сферах грамадскіх адносін зацвярджаецца рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання сумесна з Міністэрствам фінансаў у выпадках, устаноўленых Урадам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 77. Субвенцыі**

1. Субвенцыі даюцца іншаму бюджэту пры перадачы паўнамоцтваў на ажыццяўленне функцыянальнага віду расходаў, замацаванага за бюджэтам у адпаведнасці з гэтым Кодэксам, і выкарыстоўваюцца па мэтавым прызначэнні.

2. Памер і мэты субвенцый кансалідаваным бюджэтам абласцей і бюджэту г. Мінска вызначаюцца законам аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год.

Памер і мэты субвенцый з абласных бюджэтаў кансалідаваным бюджэтам раёнаў і бюджэтам гарадоў абласнога падпарадкавання, з раённых бюджэтаў бюджэтам сельсаветаў, пасёлкаў гарадскога тыпу, гарадоў раённага падпарадкавання ўстанаўліваюцца рашэннямі вышэйстаячых Саветаў дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год.

3. Субвенцыі з рэспубліканскага бюджэту і бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду размяркоўваюцца паміж кансалідаванымі бюджэтамі абласцей і бюджэтам г. Мінска ў парадку, устаноўленым Урадам Рэспублікі Беларусь, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

# АСАБЛІВАЯ ЧАСТКА

## РАЗДЗЕЛ VI
## УДЗЕЛЬНІКІ БЮДЖЭТНАГА ПРАЦЭСУ І ІХ ПАЎНАМОЦТВЫ

### ГЛАВА 13
### АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

**Артыкул 78. Удзельнікі бюджэтнага працэсу**

Удзельнікамі бюджэтнага працэсу з'яўляюцца:

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь;

Парламент Рэспублікі Беларусь;

Урад Рэспублікі Беларусь;

мясцовыя Саветы дэпутатаў;

мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы;

органы Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь;

Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь;

іншыя дзяржаўныя органы, на якія ў адпаведнасці з заканадаўствам ускладзены правы і абавязкі па рэгуляванні бюджэтных адносін, арганізацыі і ажыццяўленні бюджэтнага працэсу;

распарадчыкі і атрымальнікі бюджэтных сродкаў;

банкі, іншыя арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі, якія ўдзельнічаюць у бюджэтным працэсе;

адміністратары даходаў бюджэту.

**Артыкул 79. Бюджэтныя арганізацыі**

1. Бюджэтныя арганізацыі ў адпаведнасці з замацаванымі за імі функцыямі і задачамі:

1.1. распрацоўваюць па ўзгадненні з вышэйстаячай арганізацыяй паказчыкі сваёй дзейнасці, выкананне якіх ажыццяўляецца ў рамках планаў дзейнасці распарадчыка бюджэтных сродкаў, складаюць бюджэтныя каштарысы, бюджэтныя каштарысы дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, каштарыс даходаў і расходаў пазабюджэтных сродкаў. Узгадненне паказчыкаў дзейнасці дзяржаўных органаў не ажыццяўляецца;

1.2. забяспечваюць выкананне бюджэту па выдзеленых бюджэтных сродках;

1.3. складаюць і падаюць распарадчыку бюджэтных сродкаў бухгалтарскую справаздачнасць у складзе і парадку, якія вызначаюцца Міністэрствам фінансаў.

2. Бюджэтныя арганізацыі (за выключэннем дзяржаўных органаў, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь) могуць ажыццяўляць дзейнасць, якая прыносіць даходы, пастолькі, паколькі яна неабходна для іх статутных мэт, дзеля якіх яны створаны, адпавядае гэтым мэтам і адпавядае прадмету дзейнасці арганізацый або паколькі яна неабходна для выканання дзяржаўна значных задач, прадугледжаных іх установчымі дакументамі, адпавядае гэтым задачам і адпавядае прадмету дзейнасці дадзеных арганізацый.

3. Калі бюджэтныя арганізацыі ў адпаведнасці з пунктам 2 гэтага артыкула маюць права ажыццяўляць дзейнасць, што прыносіць даходы, то атрыманыя пазабюджэтныя сродкі пасля выплаты падаткаў, збораў (пошлін), іншых выплат у рэспубліканскі і мясцовыя бюджэты, дзяржаўныя пазабюджэтныя фонды і ажыццяўлення расходаў, звязаных з гэтай дзейнасцю, у тым ліку ў частцы пакрыцця праведзеных расходаў бюджэту, застаюцца ў іх распараджэнні і выкарыстоўваюцца для забеспячэння функцыянавання гэтых арганізацый па напрамках, якія вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь, калі іншае не ўстаноўлена артыкулам $26^1$ гэтага Кодэкса або іншымі заканадаўчымі актамі.

Парадак фарміравання пазабюджэтных сродкаў, ажыццяўлення расходаў, звязаных з дзейнасцю, якая прыносіць даходы, напрамкі і парадак выкарыстання сродкаў, якія застаюцца ў распараджэнні бюджэтнай арганізацыі ў адпаведнасці з часткай першай гэтага пункта, вызначае Урад Рэспублікі Беларусь.

Пазабюджэтныя сродкі і набытая за кошт іх маёмасць улічваюцца на адзіным балансе.

Для пазабюджэтных сродкаў бюджэтныя арганізацыі распрацоўваюць паказчыкі ажыццяўлення дзейнасці, якая прыносіць даходы і складаюць каштарысы даходаў і расходаў пазабюджэтных сродкаў у адпаведнасці з бюджэтнай класіфікацыяй Рэспублікі Беларусь.

Бюджэтная арганізацыя адкрывае адзін бягучы (разліковы) банкаўскі рахунак па ўліку пазабюджэтных сродкаў. Пры гэтым бягучы (разліковы) банкаўскі рахунак па ўліку пазабюджэтных сродкаў у замежнай валюце адкрываецца ў тым банку, у якім бюджэтнай арганізацыі адкрыты бягучы (разліковы) банкаўскі рахунак па ўліку пазабюджэтных сродкаў у беларускіх рублях.

Парадак складання, разгляду і зацвярджэння каштарысаў даходаў і расходаў пазабюджэтных сродкаў бюджэтных арганізацый, а таксама ўнясення ў іх змяненняў і (або) дапаўненняў устанаўлівае Міністэрства фінансаў.

Бухгалтарская справаздачнасць па пазабюджэтных сродках складаецца ў адпаведнасці з бюджэтнай класіфікацыяй Рэспублікі Беларусь у парадку і па формах, устаноўленых Міністэрствам фінансаў.

Фарміраванне і выкарыстанне пазабюджэтных сродкаў бюджэтных арганізацый кантралюе вышэйстаячы орган, а таксама органы, якія забяспечваюць кантроль за выкананнем рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, у парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі.

Незаконнае атрыманне, нямэтавае выкарыстанне пазабюджэтных сродкаў, а таксама выкарыстанне пазабюджэтных сродкаў з парушэннем бюджэтнага заканадаўства цягнуць за сабой прымяненне норм адказнасці, прадугледжаных гэтым Кодэксам за незаконнае атрыманне, нямэтавае выкарыстанне сродкаў бюджэту, а таксама выкарыстанне сродкаў бюджэту з парушэннем бюджэтнага заканадаўства.

4. Бюджэтныя арганізацыі не маюць права ажыццяўляць запазычанні ў любой форме і даваць за кошт бюджэтных сродкаў пазыкі арганізацыям і фізічным асобам.

**Артыкул 79$^{1}$. Адміністратары даходаў бюджэту**

1. Адміністратарамі даходаў бюджэту з'яўляюцца рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, іх тэрытарыяльныя органы, іншыя дзяржаўныя арганізацыі, падпарадкаваныя Ураду Рэспублікі Беларусь, іншыя дзяржаўныя органы і іншыя дзяржаўныя арганізацыі, падпарадкаваныя (падсправаздачныя) Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, іх тэрытарыяльныя органы, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы і іх структурныя падраздзяленні, вызначаныя ў адпаведнасці з часткамі другой і трэцяй гэтага пункта.

Пералік адміністратараў даходаў бюджэту, якія з'яўляюцца дзяржаўнымі органамі і іншымі дзяржаўнымі арганізацыямі, рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, іншымі дзяржаўнымі арганізацыямі, падпарадкаванымі (падсправаздачнымі) Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, падпарадкаванымі Ураду Рэспублікі Беларусь, іншымі арганізацыямі, іх паўнамоцтвы і замацаваныя за імі крыніцы даходаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў устанаўлівае Урад Рэспублікі Беларусь.

Пералікі адміністратараў даходаў бюджэту, якія з'яўляюцца структурнымі падраздзяленнямі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, іншымі арганізацыямі, іх паўнамоцтвы і замацаваныя за імі крыніцы даходаў мясцовых бюджэтаў устанаўліваюцца адпаведнымі мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, калі іншае не ўстаноўлена Урадам Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з часткай другой гэтага пункта.

2. Адміністратар даходаў бюджэту:

фарміруе пералік падведамных адміністратараў даходаў бюджэту;

замацоўвае за падведамнымі адміністратарамі даходаў бюджэту крыніцы даходаў бюджэту і надзяляе іх адпаведнымі паўнамоцтвамі;

вядзе зводны рэестр крыніц даходаў бюджэту, замацаваных за ім і за падведамнымі адміністратарамі даходаў бюджэту;

налічвае, улічвае і кантралюе правільнасць падліку, паўнату і своечасовасць выплаты плацяжоў у бюджэт па крыніцах даходаў бюджэту, замацаваных за ім заканадаўствам;

спаганяе ў межах сваёй кампетэнцыі ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку незаплачаныя (не поўнасцю заплачаныя) сумы падаткаў, збораў (пошлін) і іншых падатковых даходаў;

спаганяе незаплачаныя (не поўнасцю заплачаныя) сумы непадатковых даходаў, замацаваных за ім заканадаўствам;

прымае рашэнні аб звароце (заліку) залішне заплачаных (спагнаных) выплат у бюджэт, замацаваных за ім заканадаўствам, і ажыццяўляе іх зварот ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку;

атрымлівае ад арганізацый і фізічных асоб, на якіх ускладзены абавязак па выплаце плацяжоў у бюджэт, інфармацыю, неабходную для ўліку даходаў бюджэту, замацаваных за ім заканадаўствам;

падае Міністэрству фінансаў (мясцовым фінансавым органам) матэрыялы, неабходныя для складання праектаў рэспубліканскага (мясцовага) бюджэтаў, разліковых паказчыкаў па кансалідаваным бюджэце Рэспублікі Беларусь (кансалідаваных бюджэтах адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак);

ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Арганізацыя работы, функцыі і паўнамоцтвы адміністратараў даходаў бюджэту ажыццяўляюцца ў парадку, устаноўленым Урадам Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 14
## РАСПАРАДЧЫКІ І АТРЫМАЛЬНІКІ БЮДЖЭТНЫХ СРОДКАЎ

**Артыкул 80. Распарадчыкі бюджэтных сродкаў**

1. Распарадчыкі бюджэтных сродкаў вызначаюцца шляхам устанаўлення ім бюджэтных прызначэнняў.

2. Распарадчыкамі бюджэтных сродкаў могуць быць:

2.1. па бюджэтных прызначэннях, прадугледжаных законам аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год, – дзяржаўныя органы, іншыя дзяржаўныя арганізацыі, падпарадкаваныя Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь або Ураду Рэспублікі Беларусь, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, законам аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год;

2.2. па бюджэтных прызначэннях, прадугледжаных рашэннямі мясцовых Саветаў дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год, – дзяржаўны орган, яго структурныя падраздзяленні з правамі юрыдычнай асобы, бюджэтная або іншая арганізацыя, надзеленая дзяржаўнымі органамі паўнамоцтвамі па рэалізацыі пэўных задач і функцый дзяржавы;

2.3. па бюджэтных прызначэннях, прадугледжаных заканадаўчым актам аб бюджэце дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду на чарговы фінансавы год, – дзяржаўны орган, на які ўскладзены функцыі па зборы і кантролі за паступленнем сродкаў, якія фарміруюць даходы дзяржаўнага пазабюджэтнага фонда, а таксама па кіраванні сродкамі бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду і іх выкарыстанні, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчым актам аб бюджэце дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду на чарговы фінансавы год.

3. Бюджэтныя прызначэнні ўстанаўліваюцца распарадчыкам бюджэтных сродкаў для ажыццяўлення ўскладзеных на іх функцый, выканання дзяржаўных праграм, падпраграм і мерапрыемстваў, якія праводзяцца за кошт сродкаў бюджэту.

4. Сродкі бюджэту, якія атрымліваюцца фізічнымі асобамі, у тым ліку індывідуальнымі прадпрымальнікамі і арганізацыямі, якія не маюць статусу бюджэтнай арганізацыі, даюцца ім праз распарадчыкаў бюджэтных сродкаў.

**Артыкул 81. Асноўныя функцыі распарадчыкаў бюджэтных сродкаў**

1. Распарадчыкі бюджэтных сродкаў:

1.1. распрацоўваюць планы сваёй дзейнасці ў адпаведнасці з функцыямі і задачамі, вызначанымі заканадаўствам, зыходзячы з неабходнасці выканання паказчыкаў сваёй дзейнасці і эфектыўнага расходавання бюджэтных сродкаў;

1.2. распрацоўваюць на падставе плана дзейнасці разлік неабходных асігнаванняў да праекта бюджэту на чарговы фінансавы год, праект зводнага бюджэтнага каштарыса. Распарадчыкі сродкаў рэспубліканскага бюджэту і мясцовых бюджэтаў накіроўваюць указаныя разлік неабходных асігнаванняў і праект зводнага бюджэтнага каштарыса адпаведна ў Міністэрства фінансаў або адпаведны мясцовы фінансавы орган;

1.3. забяспечваюць кіраванне бюджэтнымі прызначэннямі і вызначаюць (па ўзгадненні з Міністэрствам фінансаў або адпаведным мясцовым фінансавым органам) парадак выкарыстання прадугледжаных ім бюджэтных прызначэнняў;

1.4. зацвярджаюць бюджэтныя каштарысы атрымальнікаў бюджэтных сродкаў;

1.5. кантралююць мэтавае і эфектыўнае выкарыстанне бюджэтных сродкаў атрымальнікамі бюджэтных сродкаў, своечасовы зварот залішне атрыманых бюджэтных сродкаў і падачу справаздачнасці;

1.6. вядуць рэестры расходных абавязацельстваў;

1.7. забяспечваюць своечасовае і поўнае паступленне даходаў у бюджэты ў адпаведнасці з іх кампетэнцыяй.

2. Распарадчыкі сродкаў рэспубліканскага бюджэту і мясцовых бюджэтаў складаюць і падаюць адпаведна ў Міністэрства фінансаў або мясцовы фінансавы орган зводную бухгалтарскую справаздачнасць у складзе і парадку, якія вызначае Міністэрства фінансаў, а таксама зводны бюджэтны каштарыс.

3. Распарадчыкі сродкаў рэспубліканскага бюджэту і мясцовых бюджэтаў выступаюць у судзе адпаведна ад імя Рэспублікі Беларусь, адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі ў якасці прадстаўніка істца (адказчыка) па справах з удзелам Рэспублікі Беларусь, адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі:

3.1. аб пакрыцці страты, прычыненай фізічнай або юрыдычнай асобе ў выніку незаконных дзеянняў (бяздзейнасці) распарадчыка бюджэтных сродкаў, дзяржаўных органаў, падпарадкаваных (якія ўваходзяць у сістэму) распарадчыку бюджэтных сродкаў, органаў мясцовага кіравання і самакіравання або службовых асоб гэтых органаў, у тым ліку ў выніку выдання актаў дзяржаўных органаў, органаў мясцовага кіравання і самакіравання, якія не адпавядаюць заканадаўству;

3.2. аб прыцягненні да субсідыярнай адказнасці па грашовых абавязацельствах падведамных (падначаленых) бюджэтных арганізацый;

3.3. аб спагнанні грашовых сродкаў у даход бюджэтаў у адпаведнасці з іх кампетэнцыяй.

**Артыкул 82. Правы і абавязкі атрымальнікаў бюджэтных сродкаў**

1. Атрымальнікі бюджэтных сродкаў маюць правы на:

1.1. выкарыстанне бюджэтных сродкаў у адпаведнасці з бюджэтным каштарысам і разлікамі, пералікамі да яго;

1.2. своечасовае атрыманне інфармацыі аб бюджэтных асігнаваннях.

2. Атрымальнікі бюджэтных сродкаў абавязаны:

2.1. своечасова падаваць дакументы, якія пацвярджаюць права на атрыманне бюджэтных сродкаў;

2.1[1]. выкарыстоўваць бюджэтныя сродкі ў адпаведнасці з патрабаваннямі гэтага Кодэкса і іншымі актамі заканадаўства;

2.2. эфектыўна выкарыстоўваць бюджэтныя сродкі ў адпаведнасці з іх мэтавым прызначэннем;

2.3. своечасова і ў поўным аб'ёме вяртаць бюджэтныя сродкі, дадзеныя на зваротнай аснове;

2.4. своечасова і ў поўным аб'ёме ўносіць працэнты (плату) за карыстанне бюджэтнымі сродкамі, дадзенымі на аплатнай аснове;

2.5. своечасова падаваць бухгалтарскую справаздачнасць у адпаведнасці з заканадаўствам аб бухгалтарскім уліку і справаздачнасці і іншыя звесткі аб выкарыстанні бюджэтных сродкаў у складзе, вызначаным Міністэрствам фінансаў. Парадак падавання бухгалтарскай справаздачнасці і іншых звестак аб выкарыстанні бюджэтных сродкаў вызначае Міністэрства фінансаў;

2.6. вяртаць нявыкарыстаныя бюджэтныя сродкі ў адпаведны бюджэт, у тым ліку ў дзяржаўны мэтавы бюджэтны фонд;

2.7. прымаць грашовыя абавязацельствы толькі ў межах прадугледжаных бюджэтных асігнаванняў, зменшаных на суму незакончаных разлікаў, якія склаліся на 1 студзеня бягучага фінансавага года;

2.8. у выпадку змяншэння распарадчыкам бюджэтных сродкаў памеру раней даведзеных бюджэтных асігнаванняў, якое прыводзіць да немагчымасці выканання прынятых бюджэтных абавязацельстваў і заключаных дагавораў (пагадненняў), прыняць меры па карэкціроўцы ўказаных дагавораў (пагадненняў) па сумах, тэрмінах і ўмовах выканання;

2.9. забяспечыць падаванне ў тэрытарыяльныя органы дзяржаўнага казначэйства для рэгістрацыі прынятыя грашовыя абавязацельствы, а таксама дапаўненні і (або) змяненні да іх на працягу 10 рабочых дзён з даты іх прыняцця.

## РАЗДЗЕЛ VII
## СКЛАДАННЕ ПРАЕКТАЎ РЭСПУБЛІКАНСКАГА БЮДЖЭТУ, МЯСЦОВЫХ БЮДЖЭТАЎ І СЯРЭДНЕТЭРМІНОВЫХ ФІНАНСАВЫХ ПРАГРАМ

## ГЛАВА 15
## АСНОВЫ СКЛАДАННЯ ПРАЕКТАЎ РЭСПУБЛІКАНСКАГА БЮДЖЭТУ, МЯСЦОВЫХ БЮДЖЭТАЎ І СЯРЭДНЕТЭРМІНОВЫХ ФІНАНСАВЫХ ПРАГРАМ

### Артыкул 83. Агульныя палажэнні

1. Праекты рэспубліканскага бюджэту і мясцовых бюджэтаў на чарговы фінансавы год і сярэднетэрміновых фінансавых праграм на чарговы фінансавы год і планавы перыяд складаюцца ў мэтах вызначэння аб'ёму грашовых сродкаў, неабходных для выканання функцый дзяржаўных органаў Рэспублікі Беларусь, эканамічнага і сацыяльнага развіцця Рэспублікі Беларусь і адпаведных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак.

Праекты сярэднетэрміновых фінансавых праграм на чарговы фінансавы год і планавы перыяд складаюцца па рэспубліканскім бюджэце, бюджэтах абласнога ўзроўню, кансалідаваных бюджэтах раёнаў і бюджэтах гарадоў абласнога падпарадкавання.

2. Складанню праектаў рэспубліканскага бюджэту і мясцовых бюджэтаў на чарговы фінансавы год і сярэднетэрміновых фінансавых праграм рэспубліканскага бюджэту, бюджэтаў абласнога ўзроўню, кансалідаваных бюджэтаў раёнаў і бюджэтаў гарадоў абласнога падпарадкавання на чарговы фінансавы год і планавы перыяд папярэднічае распрацоўка прагнозаў асноўных параметраў эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь, параметраў найважнейшых грашова-крэдытных паказчыкаў Рэспублікі Беларусь і асноўных напрамкаў бюджэтна-фінансавай і падатковай палітыкі Рэспублікі Беларусь на чарговы фінансавы год і планавы перыяд.

3. Прагнозы асноўных параметраў эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь і параметраў найважнейшых грашова-крэдытных паказчыкаў Рэспублікі Беларусь распрацоўваюцца на чарговы фінансавы год і планавы перыяд і ўдакладняюцца пры неабходнасці. Пералік паказчыкаў эканамічнага развіцця, неабходных для складання праектаў рэспубліканскага бюджэту і мясцовых бюджэтаў на чарговы фінансавы год, сярэднетэрміновых фінансавых праграм на чарговы фінансавы год і планавы перыяд, унясенні змяненняў і (або) дапаўненняў у закон аб рэспубліканскім бюджэце, рашэнні мясцовых Саветаў дэпутатаў аб бюджэце на бягучы фінансавы год, парадак падавання іх дзяржаўнымі органамі і арганізацыямі ўстанаўліваюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

4. Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь да 1 мая бягучага фінансавага года падае ў Міністэрства фінансаў прагноз асноўных параметраў эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на чарговы фінансавы год і планавы перыяд.

Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь да 1 мая бягучага фінансавага года падае ў Міністэрства фінансаў прагноз параметраў найважнейшых грашова-крэдытных паказчыкаў Рэспублікі Беларусь на чарговы фінансавы год і планавы перыяд.

**Артыкул 84. Арганізацыя складання праектаў рэспубліканскага бюджэту і мясцовых бюджэтаў**

1. Праекты рэспубліканскага бюджэту і мясцовых бюджэтаў на чарговы фінансавы год і сярэднетэрміновых фінансавых праграм рэспубліканскага бюджэту, бюджэтаў абласнога ўзроўню, кансалідаваных бюджэтаў раёнаў і бюджэтаў гарадоў абласнога падпарадкавання на чарговы фінансавы год і планавы перыяд складаюць у адпаведнасці з заканадаўствам Урад Рэспублікі Беларусь і адпаведныя мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы. Непасрэднае складанне праектаў рэспубліканскага бюджэту і мясцовых бюджэтаў на чарговы фінансавы год і сярэднетэрміновых фінансавых праграм рэспубліканскага бюджэту, бюджэтаў абласнога ўзроўню, кансалідаваных бюджэтаў раёнаў і бюджэтаў гарадоў абласнога падпарадкавання на чарговы фінансавы год і планавы перыяд праводзяць Міністэрства фінансаў і мясцовыя фінансавыя органы (праектаў бюджэтаў першаснага ўзроўню – адпаведныя мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы).

2. У мэтах своечасовага і якаснага складання праектаў мясцовых бюджэтаў на чарговы фінансавы год і сярэднетэрміновых фінансавых праграм бюджэтаў абласнога ўзроўню, кансалідаваных бюджэтаў раёнаў і бюджэтаў гарадоў абласнога падпарадкавання на чарговы фінансавы год і планавы перыяд мясцовыя фінансавыя органы маюць права атрымліваць неабходныя звесткі ад мясцовых фінансавых органаў іншага ўзроўню бюджэтнай сістэмы Рэспублікі Беларусь, а таксама ад іншых дзяржаўных органаў і арганізацый.

**Артыкул 85. Асноўныя напрамкі бюджэтна-фінансавай і падатковай палітыкі Рэспублікі Беларусь на чарговы фінансавы год і планавы перыяд**

1. Праект асноўных напрамкаў бюджэтна-фінансавай і падатковай палітыкі Рэспублікі Беларусь на чарговы фінансавы год і планавы перыяд складае Міністэрства фінансаў з улікам прагнозаў асноўных параметраў эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь, параметраў найважнейшых грашова-крэдытных паказчыкаў Рэспублікі Беларусь на чарговы фінансавы год і планавы перыяд, не пазней 1 чэрвеня бягучага фінансавага года ўносіцца на разгляд Урада Рэспублікі Беларусь і служыць асновай пры складанні праекта рэспубліканскага бюджэту на чарговы фінансавы год, сярэднетэрміновай фінансавай праграмы рэспубліканскага бюджэту на чарговы фінансавы год і планавы перыяд і разліковых паказчыкаў па кансалідаваным бюджэце Рэспублікі Беларусь на чарговы фінансавы год.

2. У праекце асноўных напрамкаў бюджэтна-фінансавай і падатковай палітыкі Рэспублікі Беларусь на чарговы фінансавы год і планавы перыяд утрымліваюцца прапановы па наступных асноўных параметрах:

2.1. удзельная вага прагнознага гадавога аб'ёму валавога ўнутранага прадукту, які пераразмяркоўваецца праз кансалідаваны бюджэт Рэспублікі Беларусь;

2.2. максімальны памер дэфіцыту кансалідаванага бюджэту і асноўныя крыніцы яго фінансавання (мінімальны памер прафіцыту кансалідаванага бюджэту і асноўныя напрамкі яго выкарыстання);

2.3. змяненні ў заканадаўстве, прыняцце якіх неабходна для рэалізацыі бюджэтна-фінансавай і падатковай палітыкі Рэспублікі Беларусь;

2.4. асаблівасці міжбюджэтных адносін, у тым ліку ўзаемаадносін рэспубліканскага бюджэту з мясцовымі бюджэтамі;

2.5. ліміт дзяржаўнага доўгу Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 85$^1$. Абаротная касавая наяўнасць**

1. Звыш прадугледжаных расходаў у рэспубліканскім і мясцовых бюджэтах за кошт рэшт сродкаў па адпаведных бюджэтах на пачатак фінансавага года, які плануецца, і даходаў бюджэтаў бягучага года ўтвараецца абаротная касавая наяўнасць.

2. Мінімальны памер абаротнай касавай наяўнасці, як правіла, складае аб'ём расходаў, роўны тыднёваму фонду заработнай платы бюджэтных арганізацый, якія фінансуюцца з адпаведных бюджэтаў.

**Артыкул 86. Сярэднетэрміновая фінансавая праграма**

1. Сярэднетэрміновая фінансавая праграма ўяўляе сабой дакумент, які ўтрымлівае звесткі аб магчымасцях бюджэту па мабілізацыі даходаў і стратэгіі прыярытэтных напрамкаў расходаў бюджэту ў межах наяўных рэсурсаў на чарговы фінансавы год і планавы перыяд.

2. Сярэднетэрміновая фінансавая праграма складаецца штогод з улікам прагнозаў асноўных параметраў эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь і параметраў найважнейшых грашова-крэдытных паказчыкаў Рэспублікі Беларусь, рэестра расходных абавязацельстваў адпаведнага бюджэту ў мэтах:

2.1. інфармавання дзяржаўных органаў аб меркаваных сярэднетэрміновых тэндэнцыях развіцця бюджэтна-падатковай сферы;

2.2. ацэнкі расходных абавязацельстваў на чарговы фінансавы год і планавы перыяд;

2.3. выяўлення неабходнасці і магчымасці прыняцця ў перспектыве мер для павышэння эфектыўнасці выкарыстання бюджэтных сродкаў;

2.4. адсочвання доўгатэрміновых тэндэнцый і своечасовага прыняцця адпаведных мер.

3. Праекты сярэднетэрміновых фінансавых праграм рэспубліканскага бюджэту, бюджэтаў абласнога ўзроўню, кансалідаваных бюджэтаў раёнаў і бюджэтаў гарадоў абласнога падпарадкавання на чарговы фінансавы год і планавы перыяд складаюцца ў

тэрміны, устаноўленыя для складання праектаў рэспубліканскага бюджэту і адпаведных мясцовых бюджэтаў на чарговы фінансавы год.

У сярэднетэрміновых фінансавых праграмах рэспубліканскага бюджэту, бюджэтаў абласнога ўзроўню, кансалідаваных бюджэтаў раёнаў і бюджэтаў гарадоў абласнога падпарадкавання на чарговы фінансавы год і планавы перыяд устанаўліваюцца:

асноўныя параметры эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь, параметры найважнейшых грашова-крэдытных паказчыкаў Рэспублікі Беларусь на чарговы фінансавы год і планавы перыяд, прынятыя для складання праекта бюджэту і сярэднетэрміновай фінансавай праграмы;

максімальны памер дэфіцыту або мінімальны памер прафіцыту бюджэту на чарговы фінансавы год і планавы перыяд;

гранічныя аб'ёмы даходаў бюджэту на чарговы фінансавы год і планавы перыяд;

гранічныя аб'ёмы расходаў бюджэту на чарговы фінансавы год і планавы перыяд, у тым ліку з разбіўкай па дзяржаўных праграмах і падпраграмах пры выкарыстанні праграмна-мэтавага метаду ў бюджэтным працэсе;

ліміт дзяржаўнага доўгу Рэспублікі Беларусь, ліміты доўгу органаў мясцовага кіравання і самакіравання, ліміты доўгу, гарантаванага мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, на чарговы фінансавы год і планавы перыяд.

4. Мясцовыя фінансавыя органы раённых і гарадскіх (гарадоў абласнога падпарадкавання) выканаўчых камітэтаў складаюць сярэднетэрміновыя фінансавыя праграмы кансалідаванага бюджэту раёна, бюджэту горада абласнога падпарадкавання і падаюць іх пасля зацвярджэння ў мясцовыя фінансавыя органы абласных выканаўчых камітэтаў.

Мясцовыя фінансавыя органы абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў складаюць на падставе пададзеных ім у адпаведнасці з часткай першай гэтага пункта сярэднетэрміновых фінансавых праграм агульную фінансавую праграму аб кансалідаваным бюджэце вобласці і бюджэту г. Мінска на чарговы фінансавы год і планавы перыяд і падаюць яе ў Міністэрства фінансаў і Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь у мэтах выпрацоўкі падыходу да планавання асобных паказчыкаў кансалідаванага бюджэту Рэспублікі Беларусь на сярэднетэрміновы перыяд.

5. Сярэднетэрміновая фінансавая праграма рэспубліканскага бюджэту на чарговы фінансавы год і планавы перыяд зацвярджаецца Урадам Рэспублікі Беларусь пасля прыняцця закона аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год.

Сярэднетэрміновыя фінансавыя праграмы бюджэтаў абласнога ўзроўню на чарговы фінансавы год і планавы перыяд зацвярджаюцца абласнымі і Мінскім гарадскім выканаўчымі камітэтамі пасля прыняцця рашэнняў абласных і Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год.

Сярэднетэрміновыя фінансавыя праграмы кансалідаваных бюджэтаў раёнаў і бюджэтаў гарадоў абласнога падпарадкавання на чарговы фінансавы год і планавы перыяд зацвярджаюцца раённымі і гарадскімі (гарадоў абласнога падпарадкавання) выканаўчымі камітэтамі пасля прыняцця рашэнняў раённых і гарадскіх (гарадоў абласнога падпарадкавання) Саветаў дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год.

### Артыкул 87. Дзяржаўныя праграмы

1. Да дзяржаўных праграм адносяцца праграмы, фінансаванне якіх поўнасцю або часткова прадугледжана за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў, дзяржаўных пазабюджэтных фондаў і (або) якія прадугледжваюць аказанне дзяржаўнай фінансавай падтрымкі.

2. Дасягненне мэты дзяржаўнай праграмы забяспечваецца шляхам выканання задач, вызначаных яе падпраграмамі.

Адказнымі за дасягненне мэты дзяржаўнай праграмы, выкананне задач і паказчыкаў, якія іх характарызуюць, з'яўляюцца вызначаныя дзяржаўнай праграмай заказчыкі.

3. Фарміраванне, фінансаванне, выкананне, ацэнка эфектыўнасці дзяржаўных праграм, а таксама меры адказнасці за невыкананне паказчыкаў дзяржаўных праграм ажыццяўляюцца ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам.

4. Пры выкарыстанні праграмна-мэтавага метаду ў бюджэтным працэсе расходы бюджэтаў фарміруюцца, як правіла, у адпаведнасці з дзяржаўнымі праграмамі і падпраграмамі і з'яўляюцца праграмнымі расходамі. Расходы бюджэтаў, што фарміруюцца па напрамках дзейнасці дзяржаўных органаў, якія не адлюстроўваюцца ў дзяржаўных праграмах і падпраграмах, з'яўляюцца непраграмнымі.

**Артыкул 87[1]. Рэестры расходных абавязацельстваў**

1. Пад рэестрам расходных абавязацельстваў разумеецца пералік структурных элементаў законаў, дэкрэтаў, указаў і распараджэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дагавораў і пагадненняў, заключаных ад імя Рэспублікі Беларусь, яе адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, пастаноў Урада Рэспублікі Беларусь, рашэнняў мясцовых Саветаў дэпутатаў, выканаўчых і распарадчых органаў, якія прымаюцца ў межах іх кампетэнцыі, якія з'яўляюцца падставай для выдзялення бюджэтных сродкаў.

2. Рэестр расходных абавязацельстваў рэспубліканскага бюджэту вядзе Міністэрства фінансаў.

Рэестр расходных абавязацельстваў мясцовых бюджэтаў вядуць мясцовыя фінансавыя органы.

Зводны рэестр расходных абавязацельстваў кансалідаванага бюджэту вядзе Міністэрства фінансаў.

3. Парадак вядзення і падавання рэестраў расходных абавязацельстваў устанаўлівае Міністэрства фінансаў.

Урад Рэспублікі Беларусь мае права ўстанаўліваць у асобных сферах грамадскіх адносін парадак планавання расходаў бюджэту, заснаваны на выкарыстанні нарматываў расходаў на аднаго спажыўца паслугі і (або) у галіне.

## ГЛАВА 16
## СКЛАДАННЕ ПРАЕКТА РЭСПУБЛІКАНСКАГА БЮДЖЭТУ

**Артыкул 88. Дакументы і матэрыялы, якія складаюцца і якія падаюцца адначасова з праектам закона аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год**

1. Пры падрыхтоўцы праекта закона аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год складаюцца і падаюцца наступныя дакументы і матэрыялы:

1.1. асноўныя напрамкі бюджэтна-фінансавай і падатковай палітыкі Рэспублікі Беларусь;

1.2. ацэнка чаканага выканання рэспубліканскага бюджэту і кансалідаванага бюджэту Рэспублікі Беларусь за бягучы фінансавы год;

1.3. паясняльная запіска да праекта рэспубліканскага бюджэту і разліковых паказчыкаў кансалідаванага бюджэту Рэспублікі Беларусь на чарговы фінансавы год, уключаючы інфармацыю аб эканамічным становішчы дзяржавы і асноўных прагнозных макраэканамічных паказчыках Рэспублікі Беларусь на чарговы фінансавы год;

1.4. разліковыя паказчыкі кансалідаванага бюджэту Рэспублікі Беларусь на фінансавы год, які плануецца;

1.5. асноўныя паказчыкі ўзаемаадносін рэспубліканскага бюджэту з мясцовымі бюджэтамі;

1.6. прагнозныя разлікі для асноўных відах даходаў і расходаў рэспубліканскага бюджэту;

1.6[1]. даведачная інфармацыя аб аб'ёмах ільгот, якія даюцца па падатках, зборах (пошлінах) на чарговы фінансавы год;

1.7. даведачна-аналітычная інфармацыя аб дзяржаўных праграмах і падпраграмах, фінансаванне якіх прадугледжваецца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту;

1.8. звесткі аб дзяржаўным доўгу Рэспублікі Беларусь, у тым ліку па формах даўгавых абавязацельстваў;

1.9. іншыя дакументы і матэрыялы.

2. Дакументы і матэрыялы, указаныя ў пункце 1 гэтага артыкула, падаюцца адначасова з праектам закона аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год пры ўнясенні яго ў Палату прадстаўнікоў.

**Артыкул 89. Паказчыкі, якія зацвярджаюцца законам аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год**

Законам аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год устанаўліваюцца і зацвярджаюцца наступныя асноўныя паказчыкі:

максімальны памер дэфіцыту рэспубліканскага бюджэту на канец года і крыніцы яго фінансавання або мінімальны памер прафіцыту рэспубліканскага бюджэту і напрамкі яго выкарыстання;

максімальны памер дэфіцыту (мінімальны памер прафіцыту) кансалідаваных бюджэтаў абласцей і бюджэту г. Мінска на канец года;

даходы рэспубліканскага бюджэту ў агульнай суме і па групах, падгрупах, раздзелах і асноўных падраздзелах класіфікацыі даходаў бюджэту;

нарматывы адлічэнняў ад рэспубліканскіх падаткаў, збораў (пошлін) у кансалідаваныя бюджэты абласцей і бюджэт г. Мінска, калі іншае не ўстаноўлена гэтым Кодэксам;

памеры міжбюджэтных трансфертаў;

нарматывы бюджэтнай забяспечанасці;

расходы рэспубліканскага бюджэту ў агульнай суме, а таксама па функцыянальнай класіфікацыі расходаў бюджэту;

даходы дзяржаўных мэтавых бюджэтных фондаў, уключаных у склад рэспубліканскага бюджэту;

расходы дзяржаўных мэтавых бюджэтных фондаў, уключаных у склад рэспубліканскага бюджэту;

размеркаванне бюджэтных прызначэнняў па распарадчыках бюджэтных сродкаў у адпаведнасці з ведамаснай класіфікацыяй расходаў рэспубліканскага бюджэту і функцыянальнай класіфікацыяй расходаў бюджэту;

пералік дзяржаўных праграм і падпраграм, фінансаванне якіх ажыццяўляецца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, па функцыянальнай класіфікацыі расходаў бюджэту і па заказчыках;

аб'ём асігнаванняў на рэалізацыю дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы;

памер абаротнай касавай наяўнасці па рэспубліканскім бюджэце;

ліміты ўнутранага дзяржаўнага доўгу і ўнутранага доўгу, гарантаванага Рэспублікай Беларусь, знешняга дзяржаўнага доўгу і знешняга доўгу, гарантаванага Рэспублікай Беларусь;

пералік знешніх дзяржаўных пазык, абслугоўванне і пагашэнне якіх ажыццяўляюцца з прыцягненнем сродкаў рэспубліканскага бюджэту;

іншыя паказчыкі.

**Артыкул 90. Асаблівасці выкарыстання праграмна-мэтавага метаду пры складанні праекта рэспубліканскага бюджэту**

1. Пры выкарыстанні праграмна-мэтавага метаду пры складанні праекта рэспубліканскага бюджэту ў законе аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год праграмныя і непраграмныя расходы зацвярджаюцца ў разрэзе праграмнай, функцыянальнай і ведамаснай класіфікацый расходаў бюджэту.

2. Адначасова з праектам закона аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год у Палату прадстаўнікоў падаецца даведачна-аналітычная інфармацыя аб дзяржаўных праграмах і падпраграмах.

**Артыкул 91. Парадак складання праекта рэспубліканскага бюджэту і разліковых паказчыкаў па кансалідаваным бюджэце Рэспублікі Беларусь**

1. Складанне праекта рэспубліканскага бюджэту ажыццяўляецца Урадам Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтым Кодэксам і пачынаецца не пазней чым за дзесяць месяцаў да пачатку чарговага фінансавага года.

2. Арганізацыйна-метадычнае кіраўніцтва работай па складанні праекта рэспубліканскага бюджэту, разліковых паказчыкаў для кансалідаванага бюджэту Рэспублікі Беларусь, разліковых паказчыкаў для кансалідаваных бюджэтаў абласцей і бюджэту г. Мінска ажыццяўляе Міністэрства фінансаў.

3. Выключаны.

4. У адпаведнасці з тэрмінам падавання праекта рэспубліканскага бюджэту на чарговы фінансавы год, устаноўленым Урадам Рэспублікі Беларусь, Міністэрства фінансаў рыхтуе ўказанні аб парадку і тэрмінах падавання матэрыялаў, якія ўключаюць у сябе пералік паказчыкаў і формы, па якіх распарадчыкі бюджэтных сродкаў, выканаўчыя і распарадчыя органы абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню павінны падаваць у Міністэрства фінансаў матэрыялы, неабходныя для складання праекта рэспубліканскага бюджэту, разліковых паказчыкаў для кансалідаванага бюджэту Рэспублікі Беларусь.

У пералік паказчыкаў, вызначаных указаннямі аб парадку і тэрмінах падавання матэрыялаў, могуць уводзіцца фінансавыя і іншыя абмежаванні, абавязковыя для ўсіх распарадчыкаў бюджэтных сродкаў, выканаўчых і распарадчых органаў абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню.

5. Распарадчыкі бюджэтных сродкаў, выканаўчыя і распарадчыя органы абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню ў адпаведнасці з указаннямі аб парадку і тэрмінах падавання матэрыялаў павінны своечасова, дакладна і ў поўным аб'ёме падаваць у Міністэрства фінансаў патрэбныя матэрыялы. Міністэрствам фінансаў з удзелам прадстаўнікоў распарадчыкаў бюджэтных сродкаў, выканаўчых і распарадчых органаў абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню праводзіцца разгляд указаных матэрыялаў з улікам іх адпаведнасці мэце, прыярытэтнасці і эфектыўнасці выкарыстання бюджэтных сродкаў.

6. У выпадку, калі ўзгадненне з распарадчыкамі бюджэтных сродкаў, выканаўчымі і распарадчымі органамі абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню не дасягнута, Міністэрства фінансаў рыхтуе сваё заключэнне па няўзгодненых пытаннях.

7. На аснове ўзгодненых матэрыялаў Міністэрства фінансаў распрацоўвае праект рэспубліканскага бюджэту на чарговы фінансавы год, які ў форме праекта закона разам

з разлікамі, аналітычнымі і іншымі матэрыяламі ў адпаведнасці з заканадаўствам уносіцца на разгляд Урада Рэспублікі Беларусь.

8. Пасля разгляду і адабрэння Урадам Рэспублікі Беларусь праекта закона аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год Міністэрства фінансаў паведамляе:

8.1. распарадчыкам бюджэтных сродкаў – сумы бюджэтных сродкаў з рэспубліканскага бюджэту, улічаныя ў праекце закона аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год;

8.2. выканаўчым і распарадчым органам абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню – разліковыя паказчыкі для кансалідаваных бюджэтаў абласцей і бюджэту г. Мінска.

9. Разгледжаныя і адобраныя Урадам Рэспублікі Беларусь праект закона аб рэспубліканскім бюджэце і разліковыя паказчыкі для кансалідаванага бюджэту Рэспублікі Беларусь на чарговы фінансавы год не пазней 1 верасня года, які папярэднічае чарговаму фінансаваму году, падаюцца на разгляд Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 17
## СКЛАДАННЕ ПРАЕКТАЎ МЯСЦОВЫХ БЮДЖЭТАЎ

### Артыкул 92. Дакументы і матэрыялы, якія складаюцца і падаюцца адначасова з праектам рашэння мясцовага Савета дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год

Адначасова з праектам рашэння аб бюджэце на чарговы фінансавы год у мясцовы Савет дэпутатаў складаюцца і падаюцца наступныя дакументы і матэрыялы:

ацэнка чаканага выканання мясцовага бюджэту і кансалідаванага бюджэту адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі (для бюджэтаў абласнога і базавага ўзроўняў) за бягучы фінансавы год;

паясняльная запіска да праекта мясцовага бюджэту;

разліковыя паказчыкі па кансалідаваным бюджэце адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі (для бюджэтаў абласнога і базавага ўзроўняў) на фінансавы год, які плануецца;

асноўныя паказчыкі ўзаемаадносін з іншымі бюджэтамі;

прагнозныя разлікі па асноўных відах даходаў і расходаў мясцовага бюджэту;

даведачная інфармацыя аб аб'ёмах ільгот, якія даюцца па падатках, зборах (пошлінах) на чарговы фінансавы год;

даведачна-аналітычная інфармацыя па дзяржаўных праграмах і падпраграмах, фінансаванне якіх прадугледжваецца за кошт сродкаў мясцовага бюджэту;

іншыя дакументы і матэрыялы.

### Артыкул 93. Паказчыкі, якія зацвярджаюцца рашэннем мясцовага Савета дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год

Рашэннем мясцовага Савета дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год устанаўліваюцца і зацвярджаюцца наступныя асноўныя паказчыкі:

максімальны памер дэфіцыту мясцовага бюджэту на канец года і крыніцы яго фінансавання або мінімальны памер прафіцыту мясцовага бюджэту і напрамкі яго выкарыстання;

максімальныя памеры дэфіцыту (мінімальныя памеры прафіцыту) ніжэйстаячых мясцовых (кансалідаваных) бюджэтаў на канец года;

даходы мясцовага бюджэту ў агульнай суме і па групах, падгрупах, раздзелах і асноўных падраздзелах класіфікацыі даходаў бюджэту;

нарматывы адлічэнняў ад рэспубліканскіх падаткаў, збораў (пошлін), мясцовых падаткаў і збораў у адпаведны мясцовы бюджэт і ніжэйстаячыя мясцовыя (кансалідаваныя) бюджэты, калі іншае не ўстаноўлена гэтым Кодэксам;

памер міжбюджэтных трансфертаў;

нарматывы бюджэтнай забяспечанасці для ніжэйстаячых бюджэтаў;

расходы мясцовага бюджэту ў агульнай суме, а таксама па функцыянальнай класіфікацыі расходаў бюджэту;

даходы дзяржаўных мэтавых бюджэтных фондаў, уключаных у склад мясцовага бюджэту;

расходы дзяржаўных мэтавых бюджэтных фондаў, уключаных у склад мясцовага бюджэту;

размеркаванне бюджэтных прызначэнняў па распарадчыках бюджэтных сродкаў мясцовага бюджэту ў адпаведнасці з ведамаснай і функцыянальнай класіфікацыямі расходаў бюджэту;

пералік дзяржаўных праграм і падпраграм, фінансаванне якіх прадугледжваецца за кошт сродкаў мясцовага бюджэту, у разрэзе ведамаснай і функцыянальнай класіфікацый расходаў бюджэту;

памер абаротнай касавай наяўнасці па мясцовым бюджэце;

ліміты доўгу органаў мясцовага кіравання і самакіравання і доўгу, гарантаванага мясцовым выканаўчым і распарадчым органам;

іншыя паказчыкі.

**Артыкул 93$^1$. Асаблівасці выкарыстання праграмна-мэтавага метаду пры складанні праекта мясцовага бюджэту**

1. Пры выкарыстанні праграмна-мэтавага метаду пры складанні праекта мясцовага бюджэту ў рашэнні мясцовага Савета дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год праграмныя і непраграмныя расходы зацвярджаюцца ў разрэзе праграмнай, функцыянальнай і ведамаснай класіфікацый расходаў бюджэту.

2. Адначасова з праектам рашэння мясцовага Савета дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год у адпаведны мясцовы Савет дэпутатаў падаецца даведачна-аналітычная інфармацыя па дзяржаўных праграмах і падпраграмах.

**Артыкул 94. Парадак і тэрміны складання праектаў мясцовых бюджэтаў**

1. Праекты мясцовых бюджэтаў фарміруюцца на аснове:

1.1. асноўных напрамкаў бюджэтна-фінансавай і падатковай палітыкі Рэспублікі Беларусь на чарговы фінансавы год;

1.2. прагнозаў асноўных параметраў эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь і найважнейшых грашова-крэдытных паказчыкаў Рэспублікі Беларусь;

1.3. нарматываў бюджэтнай забяспечанасці;

1.4. плана сацыяльнага і эканамічнага развіцця адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі;

1.5. уласных даходаў з улікам адлічэнняў ад рэспубліканскіх падаткаў, збораў (пошлін), адлічэнняў ад мясцовых падаткаў і збораў;

1.6. памераў міжбюджэтных трансфертаў, устаноўленых законам аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год і рашэннямі вышэйстаячых мясцовых Саветаў дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год.

2. Парадак і тэрміны складання праекта мясцовага бюджэту ўстанаўліваюць мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы. Праект мясцовага бюджэту складае мясцовы фінансавы орган (бюджэтаў першаснага ўзроўню – адпаведны выканаўчы і распарадчы орган) на аснове чаканага выканання мясцовага бюджэту за бягучы фінансавы год.

3. Выканаўчымі і распарадчымі органамі абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню ўстанаўліваюцца для мясцовых фінансавых органаў тэрміны складання разліковых паказчыкаў для кансалідаваных бюджэтаў адпаведных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, мясцовых бюджэтаў.

4. Пасля зацвярджэння рэспубліканскага бюджэту канчаткова складаюцца праекты абласных бюджэтаў, бюджэту г. Мінска і разліковых паказчыкаў для кансалідаваных бюджэтаў раёнаў, бюджэтах гарадоў абласнога падпарадкавання.

Пры складанні праектаў абласных бюджэтаў, бюджэту г. Мінска змяншэнне аб'ёму расходаў па кансалідаваных бюджэтах абласцей і бюджэце г. Мінска ў частцы сродкаў на выплату заработнай платы з улікам узносаў (адлічэнняў) на сацыяльнае страхаванне, бюджэтных трансфертаў насельніцтву, на аплату камунальных паслуг, прадуктаў харчавання, лекавых сродкаў і вырабаў медыцынскага прызначэння, субсідзіраванне жыллёва-камунальных і транспартных паслуг, якія аказваюцца насельніцтву, субсідыі арганізацыям, якія рэалізуюць цвёрдае паліва, паліўныя брыкеты і дровы для насельніцтва па фіксаваных рознічных цэнах, абслугоўванне доўгу органаў мясцовага кіравання і самакіравання, прынятых пры вызначэнні аб'ёму датацый, зацверджанага законам аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год, ажыццяўляецца па ўзгадненні з Міністэрствам фінансаў.

Пасля зацвярджэння абласных бюджэтаў канчаткова складаюцца праект раённых бюджэтаў, бюджэтаў гарадоў абласнога падпарадкавання і разліковых паказчыкаў для бюджэтаў сельсаветаў, пасёлкаў гарадскога тыпу, гарадоў раённага падпарадкавання.

Пры складанні праектаў раённых бюджэтаў, бюджэтаў гарадоў абласнога падпарадкавання і разліковых паказчыкаў для бюджэтаў сельсаветаў, пасёлкаў гарадскога тыпу, гарадоў раённага падпарадкавання змяншэнне аб'ёму расходаў па кансалідаваных бюджэтах раёнаў і бюджэтах гарадоў абласнога падпарадкавання ў частцы сродкаў на выплату заработнай платы з улікам узносаў (адлічэнняў) на сацыяльнае страхаванне, трансфертаў насельніцтву, на аплату камунальных паслуг, прадуктаў харчавання, лекавых сродкаў і вырабаў медыцынскага прызначэння, субсідзіраванне жыллёва-камунальных і транспартных паслуг, якія аказваюцца насельніцтву, субсідыі арганізацыям, якія рэалізуюць цвёрдае паліва, паліўныя брыкеты і дровы для насельніцтва па фіксаваных рознічных цэнах, абслугоўванне доўгу органаў мясцовага кіравання і самакіравання, прынятых пры вызначэнні аб'ёму датацый, зацверджанага рашэннем абласнога Савета дэпутатаў аб абласным бюджэце на чарговы фінансавы год, ажыццяўляецца пасля ўзгаднення з мясцовымі фінансавымі органамі абласных выканаўчых камітэтаў.

Пры складанні праектаў бюджэтаў сельсаветаў, пасёлкаў гарадскога тыпу, гарадоў раённага падпарадкавання змяншэнне аб'ёму расходаў у частцы сродкаў на выплату заработнай платы з улікам узносаў (адлічэнняў) на сацыяльнае страхаванне, трансфертаў насельніцтву, на аплату камунальных паслуг, прынятых пры вызначэнні аб'ёму датацый, зацверджанага рашэннем раённага Савета дэпутатаў аб раённым бюджэце на чарговы фінансавы год, ажыццяўляецца па ўзгадненні з мясцовымі фінансавымі органамі раённых выканаўчых камітэтаў.

5. Праекты мясцовых бюджэтаў падаюцца для разгляду ў адпаведныя мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы.

Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы разглядаюць праекты мясцовых бюджэтаў і ўносяць іх для зацвярджэння ў адпаведныя мясцовыя Саветы дэпутатаў.

## РАЗДЗЕЛ VIII
## РАЗГЛЯД І ЗАЦВЯРДЖЭННЕ РЭСПУБЛІКАНСКАГА БЮДЖЭТУ І МЯСЦОВЫХ БЮДЖЭТАЎ

# ГЛАВА 18
# АСНОВЫ РАЗГЛЯДУ І ЗАЦВЯРДЖЭННЯ РЭСПУБЛІКАНСКАГА БЮДЖЭТУ І МЯСЦОВЫХ БЮДЖЭТАЎ

## Артыкул 95. Унясенне праектаў рэспубліканскага бюджэту і мясцовых бюджэтаў на чарговы фінансавы год на разгляд Палаты прадстаўнікоў і мясцовых Саветаў дэпутатаў

1. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь уносіць праект закона аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год у Палату прадстаўнікоў у тэрміны, устаноўленыя гэтым Кодэксам.

2. Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы ўносяць праект рашэння аб бюджэце на чарговы фінансавы год на разгляд адпаведнага мясцовага Савета дэпутатаў у тэрміны, устаноўленыя мясцовымі Саветамі дэпутатаў.

## Артыкул 96. Разгляд і зацвярджэнне рэспубліканскага бюджэту і мясцовых бюджэтаў на чарговы фінансавы год

1. Закон аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год прымаецца не пазней 1 снежня года, які папярэднічае чарговаму фінансаваму году.

2. Рашэнні мясцовымі Саветамі дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год прымаюцца да пачатку чарговага фінансавага года.

3. Ніжэйстаячыя бюджэты зацвярджаюцца пасля зацвярджэння адпаведных вышэйстаячых бюджэтаў.

4. Рашэнні мясцовых Саветаў дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год падлягаюць афіцыйнаму апублікаванню, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

## Артыкул 97. Часовае кіраванне рэспубліканскім бюджэтам і мясцовымі бюджэтамі

1. Часовае кіраванне бюджэтам ажыццяўляецца ў перыяд з пачатку бягучага фінансавага года да дня ўступлення ў сілу закона аб рэспубліканскім бюджэце (рашэння мясцовага Савета дэпутатаў аб адпаведным бюджэце) на бягучы фінансавы год.

2. Пры часовым кіраванні бюджэтам:

2.1. штомесячныя расходы не павінны перавышаць адной дванаццатай часткі аб'ёму расходаў, устаноўленага законам аб рэспубліканскім бюджэце (рашэннем мясцовага Савета дэпутатаў аб адпаведным бюджэце) на справаздачны фінансавы год;

2.2. іншыя паказчыкі, якія зацвярджаюцца законам аб рэспубліканскім бюджэце (рашэннем мясцовага Савета дэпутатаў аб адпаведным бюджэце) на бягучы фінансавы год, прымяняюцца ў памерах і парадку, устаноўленых законам аб рэспубліканскім бюджэце (рашэннем мясцовага Савета дэпутатаў аб адпаведным бюджэце) на справаздачны фінансавы год;

2.3. забараняецца:

даванне бюджэтных пазык;

фінансаванне капітальных укладанняў, за выключэннем выпадкаў, калі неабходна правядзенне работ па ліквідацыі наступстваў аварыі або іншай надзвычайнай сітуацыі ў мэтах захавання жыцця і здароўя людзей, аховы навакольнага асяроддзя;

расходаванне сродкаў рэзервовых фондаў;

ажыццяўленне запазычанняў.

3. Абмежаванні, устаноўленыя пунктам 2 гэтага артыкула, не распаўсюджваюцца на выкананне абавязацельстваў аб выплаце заработнай платы (з улікам узносаў (адлічэнняў) на сацыяльнае страхаванне) і трансфертаў насельніцтву, абслугоўванні і пагашэнні дзяржаўнага доўгу і доўгу органаў мясцовага кіравання і самакіравання, выкананні абавязацельстваў па міжнародных дагаворах.

## ГЛАВА 19
## ПАРАДАК РАЗГЛЯДУ І ЗАЦВЯРДЖЭННЯ РЭСПУБЛІКАНСКАГА БЮДЖЭТУ І МЯСЦОВЫХ БЮДЖЭТАЎ

### Артыкул 98. Унясенне праекта закона аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год у Палату прадстаўнікоў

1. Праект закона аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год уносіцца ў Палату прадстаўнікоў не пазней 1 лістапада года, які папярэднічае чарговаму фінансаваму году.

2. Пры неабходнасці ўнясення змяненняў і (або) дапаўненняў у гэты Кодэкс або Падатковы кодэкс Рэспублікі Беларусь у Палату прадстаўнікоў да ўнясення праекта закона аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год або адначасова з ім уносяцца праекты адпаведных законаў.

### Артыкул 99. Парадак разгляду праекта закона аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год Парламентам Рэспублікі Беларусь

1. Праект закона аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год разглядаецца Парламентам Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Кодэксам і рэгламентамі палат Парламента Рэспублікі Беларусь.

2. Прапановы аб змяншэнні даходаў рэспубліканскага бюджэту павінны вызначаць крыніцы кампенсацыі страт даходаў рэспубліканскага бюджэту або віды і аб'ём расходаў, якія падлягаюць адпаведнаму скарачэнню. Прапановы аб павелічэнні расходаў рэспубліканскага бюджэту павінны вызначаць крыніцы пакрыцця такіх расходаў.

3. Прыняццю праекта закона аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год папярэднічаюць прыняцце праекта закона аб унясенні змяненняў і (або) дапаўненняў у Падатковы кодэкс Рэспублікі Беларусь і іншыя законы пры неабходнасці ўнясення ў іх змяненняў, а таксама прыняцце іншых законаў у выпадку, прадугледжаным пунктам 3 артыкула 21 гэтага Кодэкса.

### Артыкул 100. Асновы разгляду і зацвярджэння праектаў рашэнняў мясцовых Саветаў дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год

1. Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы распрацоўваюць праекты рашэнняў мясцовых Саветаў дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год і ўносяць іх для зацвярджэння ў адпаведныя мясцовыя Саветы дэпутатаў.

2. Праекты рашэнняў мясцовых Саветаў дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год разглядаюць пастаянныя камісіі мясцовых Саветаў дэпутатаў, да кампетэнцыі якіх аднесены дадзеныя пытанні, і рыхтуюць заключэнні па іх.

3. Разгляд і зацвярджэнне праектаў рашэнняў мясцовых Саветаў дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год праводзяцца на сесіях мясцовых Саветаў дэпутатаў.

# РАЗДЗЕЛ IX
# ВЫКАНАННЕ РЭСПУБЛІКАНСКАГА БЮДЖЭТУ І МЯСЦОВЫХ БЮДЖЭТАЎ

## ГЛАВА 20
## АСНОВЫ ВЫКАНАННЯ РЭСПУБЛІКАНСКАГА БЮДЖЭТУ І МЯСЦОВЫХ БЮДЖЭТАЎ

### Артыкул 101. Асновы выканання бюджэтаў

1. Рэспубліканскі бюджэт і мясцовыя бюджэты выконваюцца на падставе закона аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год, рашэнняў мясцовых Саветаў дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год у адпаведнасці з бюджэтным роспісам рэспубліканскага бюджэту і мясцовых бюджэтаў.

2. Улік выканання рэспубліканскага бюджэту і мясцовых бюджэтаў па расходах вядзецца па касавых і фактычных расходах.

Касавымі расходамі бюджэту лічацца ўсе сумы, выдадзеныя з банкаўскіх рахункаў як шляхам безнаяўных разлікаў, так і наяўнымі грошамі, а таксама сумы па праведзеных у адпаведнасці з заканадаўствам заліках (узаемазаліках) без пераводу грашовых сродкаў праз рахункі ў банках.

Фактычнымі расходамі лічацца сапраўдныя выдаткі арганізацый, якія пацвярджаюцца дакументамі ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Аперацыі па выкананні бюджэтаў у замежнай валюце адлюстроўваюцца ў бухгалтарскім уліку і справаздачнасці ў афіцыйнай грашовай адзінцы Рэспублікі Беларусь шляхам пераліку замежнай валюты ў афіцыйную грашовую адзінку Рэспублікі Беларусь па афіцыйным курсе афіцыйнай грашовай адзінкі Рэспублікі Беларусь у адносінах да адпаведнай замежнай валюты, які ўстанаўліваецца Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь, на дату здзяйснення аперацыі ў замежнай валюце.

Абавязацельствы і маёмасць у замежнай валюце на справаздачную дату пералічваюцца па курсе апошняга каляндарнага дня справаздачнага перыяду.

3. Правы арганізацый на расходаванне бюджэтных асігнаванняў, прадугледжаных гэтым арганізацыям у бягучым фінансавым годзе, спыняецца па заканчэнні фінансавага года. Нявыкарыстаныя рэшты бюджэтных сродкаў на рахунках арганізацый па заканчэнні фінансавага года пераводзяцца ў даход адпаведнага бюджэту, у тым ліку дзяржаўнага мэтавага бюджэтнага фонду, уключаючы інавацыйны фонд, а таксама дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду.

4. Разлікі арганізацый па аперацыях мінулага перыяду, якія засталіся незакончанымі на 1 студзеня, праводзяцца ў чарговым фінансавым годзе за кошт бюджэтных прызначэнняў на тыя ж мэты па бюджэце чарговага фінансавага года.

$4^1$. Адкрыццё і абслугоўванне Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь і іншымі банкамі рахункаў дзяржаўных органаў і бюджэтных арганізацый, іншых арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў па адкрытых імі рахунках для размяшчэння бюджэтных і іншых сродкаў у адпаведнасці з заканадаўствам, а таксама выкананне аперацый з указанымі сродкамі, выкананне плацежных інструкцый на пералічэнне падаткаў, збораў (пошлін), пені і іншых выплат у рэспубліканскі і мясцовыя бюджэты, у тым ліку дзяржаўныя мэтавыя бюджэтныя фонды, ажыццяўляюцца без спагнання ўзнагароджання (платы).

За карыстанне грашовымі сродкамі рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, якія знаходзяцца і якія размяшчаюцца на рахунках у банках, у тым ліку ў Нацыянальным

банку Рэспублікі Беларусь, банкі выплачваюць у даход адпаведнага бюджэту працэнты па стаўцы, вызначанай Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Залічэнне грашовых сродкаў на бягучыя (разліковыя) банкаўскія рахункі, уклады (дэпазіты) і выплата з гэтых рахункаў заработнай платы, пенсій, дапамог, стыпендый і іншых грашовых выплат, якія праводзяцца грамадзянам у адпаведнасці з заканадаўствам за кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, ажыццяўляюцца банкамі без спагнання ўзнагароджання (платы).

5. Грашовыя сродкі, якія знаходзяцца на адзіным казначэйскім рахунку, а таксама маёмасныя правы на іх не могуць быць прадметам закладу ў якасці забеспячэння выканання абавязацельстваў па грамадзянска-прававых здзелках.

6. Не допускаюцца прыпыненне аперацый, а таксама спагнанне ў бясспрэчным парадку грашовых сродкаў, акрамя выпадкаў, прадугледжаных пунктам 10 гэтага артыкула і артыкулам 146 гэтага Кодэкса:

6.1. з адзінага казначэйскага рахунка;

6.2. з рахункаў, адкрытых дзяржаўным органам і іншым бюджэтным арганізацыям (за выключэннем рахункаў па ўліку пазабюджэтных сродкаў бюджэтных арганізацый);

6.3. з рахункаў па ўліку сродкаў адпаведнага бюджэту, адкрытых іншым арганізацыям і індывідуальным прадпрымальнікам.

6$^{1}$. Залік (зварот) залішне заплачанай сумы ў бюджэт можа быць праведзены не пазней за пяць гадоў з дня ўзнікнення права на зварот указанай сумы, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам.

7. У выпадку прыняцця акта заканадаўства, які выклікае змяншэнне даходаў або павелічэнне расходаў ніжэйстаячага (вышэйстаячага) бюджэту, гэтаму бюджэту на падставе ўказанага акта кампенсуюцца сродкі з адпаведнага вышэйстаячага (ніжэйстаячага) бюджэту.

8. Страты ў даходах і дадатковыя выдаткі, якія ўзнікаюць у ходзе выканання мясцовага бюджэту, не кампенсуюцца за кошт бюджэтаў іншых адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, за выключэннем выпадку, прадугледжанага пунктам 7 гэтага артыкула.

9. Выключаны.

10. У выпадку неадпаведнасці рашэнняў мясцовых Саветаў дэпутатаў закону аб рэспубліканскім бюджэце і рашэнням мясцовых Саветаў дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год або невыкананні іх мясцовымі Саветамі дэпутатаў і мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі ў працэсе выканання бюджэтаў сродкі, належныя адпаведным бюджэтам, спаганяюцца Міністэрствам фінансаў, яго тэрытарыяльнымі органамі або вышэйстаячымі мясцовымі фінансавымі органамі ў бясспрэчным парадку.

### Артыкул 102. Арганізацыя выканання бюджэтаў

1. Урад Рэспублікі Беларусь забяспечвае выкананне рэспубліканскага бюджэту. Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы забяспечваюць выкананне адпаведных мясцовых бюджэтаў.

2. Міністэрства фінансаў вызначае парадак залічэння, размеркавання і механізм звароту даходаў бюджэтаў, іх асаблівасці ў бягучым фінансавым годзе, парадак арганізацыі і ажыццяўлення выканання бюджэтаў па расходах, парадак фінансавання расходаў, прадугледжаных па бюджэтах, парадак аплаты грашовых абавязацельстваў, прынятых атрымальнікамі бюджэтных сродкаў, устанаўлівае асаблівасці заключэння і выканання дагавораў (кантрактаў), якія аплачваюцца поўнасцю або часткова за кошт бюджэтных сродкаў, ажыццяўляе аперацыі па перадачы сродкаў у форме міжбюджэтных трансфертаў паміж рэспубліканскім бюджэтам і мясцовымі бюджэтамі,

кіраванне рэштамі грашовых сродкаў, якія знаходзяцца на рахунках Міністэрства фінансаў у Нацыянальным банку Рэспублікі Беларусь, устанаўлівае парадак і тэрміны складання і падавання справаздач аб выкананні мясцовых бюджэтаў, арганізуе і ажыццяўляе адзіную метадалогію ўліку выканання бюджэту, а таксама ажыццяўляе кантроль за своечасовым паступленнем даходаў, эфектыўным і мэтавым расходаваннем сродкаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў распарадчыкамі і атрымальнікамі бюджэтных сродкаў.

**Артыкул 103. Бюджэтны каштарыс**

1. Бюджэтныя асігнаванні, прадугледжаныя бюджэтным роспісам атрымальнікам бюджэтных сродкаў, з'яўляюцца падставай для зацвярджэння бюджэтных каштарысаў.

2. Атрымальнікі бюджэтных сродкаў нясуць адказнасць за кіраванне бюджэтнымі асігнаваннямі, а таксама прымаюць бюджэтныя абавязацельствы і ажыццяўляюць расходы толькі ў межах бюджэтных асігнаванняў, устаноўленых бюджэтнымі каштарысамі.

3. Парадак складання, разгляду і зацвярджэння бюджэтных каштарысаў, а таксама ўнясення ў іх змяненняў і (або) дапаўненняў устанаўлівае Міністэрства фінансаў.

**Артыкул 104. Правы Міністэрства фінансаў, яго тэрытарыяльных органаў і мясцовых фінансавых органаў, выканаўчых і распарадчых органаў першаснага тэрытарыяльнага ўзроўню пры выкананні бюджэтаў**

1. Міністэрства фінансаў, яго тэрытарыяльныя органы, мясцовыя фінансавыя органы маюць права:

1.1. атрымліваць ад мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў ніжэйстаячага тэрытарыяльнага ўзроўню, інспекцый Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь, іншых дзяржаўных органаў, арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў любую інфармацыю, звязаную з выкананнем бюджэту і выкарыстаннем бюджэтных сродкаў;

1.2. прыпыняць і абмяжоўваць фінансаванне расходаў за кошт бюджэтных сродкаў у выпадку невыканання іх атрымальнікамі бюджэтнага заканадаўства, у тым ліку незаконнага атрымання або выкарыстання ўказаных сродкаў не па мэтавым прызначэнні, непадавання ва ўстаноўленыя тэрміны бухгалтарскай справаздачнасці і іншых звестак аб выкарыстанні бюджэтных сродкаў, інфармацыі аб руху бюджэтных сродкаў па іх рахунках, а таксама ў выпадку ўзнікнення часовых касавых разрываў;

1.3. спаганяць у бясспрэчным парадку сумы бюджэтных сродкаў, якія падлягаюць звароту ў бюджэт, тэрмін звароту якіх скончыўся;

1.4. спаганяць у бясспрэчным парадку сумы працэнтаў (плату) за карыстанне бюджэтнымі сродкамі, дадзенымі на зваротнай і аплатнай аснове, тэрмін выплаты якіх скончыўся;

1.5. спаганяць у бясспрэчным парадку пеню за незварот або несвоечасовы зварот бюджэтных сродкаў, дадзеных на зваротнай аснове;

1.6. спаганяць у бясспрэчным парадку пеню з банкаў за несвоечасовае выкананне плацежных дакументаў на залічэнне або пералічэнне бюджэтных сродкаў;

1.7. спаганяць у бясспрэчным парадку бюджэтныя сродкі, выдзеленыя звыш зацверджаных бюджэтных асігнаванняў, а таксама бюджэтныя пазычкі, бюджэтныя пазыкі, дадзеныя з парушэннем устаноўленага парадку;

1.8. спаганяць у бясспрэчным парадку бюджэтныя сродкі, незаконна атрыманыя або выкарыстаныя не па мэтавым прызначэнні або з парушэннем бюджэтнага заканадаўства;

1.9. прыпыняць аперацыі па рахунках арганізацый, індывідуальных прадпрымальнікаў у банках пры парушэнні імі бюджэтнага заканадаўства;

1.10. спаганяць у бяспрэчным парадку з юрыдычных асоб, іх адасобленых падраздзяленняў, індывідуальных прадпрымальнікаў пеню за невыкананне або неналежнае выкананне абавязацельстваў, папярэдне аплачаных за кошт сродкаў бюджэту;

1.11. атрымліваць ад банкаў інфармацыю аб рэштах і руху сродкаў на бягучых (разліковых) банкаўскіх рахунках, рахунках па ўліку сродкаў адпаведнага бюджэту і іншых сродкаў у адпаведнасці з заканадаўствам;

1.12. спаганяць у бяспрэчным парадку за карыстанне грашовымі сродкамі, пералічанымі дзеля выканання бюджэтных абавязацельстваў, з прычыны іх неправамернага ўтрымання, ухілення ад іх звароту, іншай пратэрміноўкі ў іх выплаце працэнты, якія налічваюцца ў памеры стаўкі рэфінансавання, устаноўленай Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дзень выканання абавязацельстваў;

1.13. у выпадку незаконнага атрымання або выкарыстання мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі не па мэтавым прызначэнні або з парушэннем бюджэтнага заканадаўства сродкаў, выдзеленых з адпаведнага вышэйстаячага бюджэту, або наяўнай запазычанасці па выплатах у гэты бюджэт, уключаючы запазычанасць па бюджэтных пазычках, бюджэтных крэдытах, невыканання рашэнняў Урада Рэспублікі Беларусь, прынятых у межах яго кампетэнцыі, рабіць пагашэнне (пакрыццё) такой запазычанасці, а таксама налічаных пені і працэнтаў за кошт сродкаў, якія перадаюцца з адпаведнага вышэйстаячага бюджэту ў адпаведныя ніжэйстаячыя бюджэты;

1.14. праводзіць узаемазалік падаткаў, збораў (пошлін), іншых выплат у бюджэт, якія падлягаюць выплаце плацельшчыкам (іншай абавязанай асобай), запазычанасці юрыдычных асоб па бюджэтных пазычках, бюджэтных пазыках, працэнтах па бюджэтных пазыках і пені, налічанай за несвоечасовы зварот бюджэтных пазычак, бюджэтных пазык, а таксама па выкананых гарантыях Урада Рэспублікі Беларусь, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў і працэнтах па іх, іншых абавязацельствах, якія падлягаюць выплаце ў бюджэт, і грашовых абавязацельстваў атрымальнікаў бюджэтных сродкаў перад гэтай юрыдычнай асобай (іншай абавязанай асобай).

$1^1$. Міністэрства фінансаў мае права рабіць выплаты па выкананні гарантый Урада Рэспублікі Беларусь і (або) зварот праведзеных выплат за кошт скарачэння расходаў па іншых напрамках выкарыстання адпаведнага інавацыйнага фонду без узгаднення з распарадчыкам дадзенага інавацыйнага фонду ў выпадку, калі сродкі інавацыйнага фонду з'яўляюцца крыніцай выканання абавязацельстваў у адпаведнасці з дагаворам гарантыі, паручыцельства.

Распарадчык інавацыйнага фонду ў тыднёвы тэрмін пасля ажыццяўлення выплат, указаных у частцы першай гэтага пункта, уносіць адпаведныя змяненні ў каштарыс расходаў інавацыйнага фонда.

$1^2$. Міністэрства фінансаў мае права змяншаць памер фінансавання пазычальнікаў-рэзідэнтаў, калі яны фінансуюцца з рэспубліканскага бюджэту, на суму праведзеных або падлеглых ажыццяўленню выплат з рэспубліканскага бюджэту і налічаных працэнтаў у адпаведнасці з гарантыямі Урада Рэспублікі Беларусь і дагаворамі аб пераўступцы, парадку выкарыстання і пагашэння крэдытаў.

2. Часова свабодныя грашовыя сродкі бюджэту могуць размяшчацца, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь:

Міністэрствам фінансаў, мясцовымі фінансавымі органамі ў банкаўскія ўклады (дэпазіты), інвеставацца ў каштоўныя паперы, іншыя актывы;

выканаўчымі і распарадчымі органамі першаснага тэрытарыяльнага ўзроўню ў банкаўскія ўклады (дэпазіты).

3. Парадак размяшчэння сродкаў рэспубліканскага бюджэту, мясцовых бюджэтаў, бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, а таксама пазабюджэтных сродкаў дзяржаўных органаў і іншых бюджэтных арганізацый у банкаўскія ўклады (дэпазіты) устанаўлівае Урад Рэспублікі Беларусь пасля ўзгаднення з Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь.

---

Дзеянне пункта 4 артыкула 105 у 2015 годзе прыпынена Законам Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2014 г. № 225-З.

---

---

Дзеянне пункта 4 артыкула 105 у 2014 годзе прыпынена Законам Рэспублікі Беларусь ад 31 снежня 2013 г. № 95-З.

---

---

Дзеянне пункта 4 артыкула 105 у 2013 годзе прыпынена Законам Рэспублікі Беларусь ад 26 кастрычніка 2012 г. № 432-З.

---

---

Дзеянне пункта 4 артыкула 105 у 2012 годзе прыпынена Законам Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2011 г. № 331-З.

---

---

Дзеянне пункта 4 артыкула 105 у 2011 годзе прыпынена Законам Рэспублікі Беларусь ад 15 кастрычніка 2010 г. № 176-З.

---

---

Дзеянне пункта 4 артыкула 105 у 2010 годзе прыпынена Законам Рэспублікі Беларусь ад 29 снежня 2009 г. № 73-З.

---

**Артыкул 105. Казначэйская сістэма выканання бюджэтаў**

1. Органы дзяржаўнага казначэйства ўяўляюць сабой адзіную цэнтралізаваную сістэму, створаную па тэрытарыяльным прынцыпе, якая ўваходзіць у склад Міністэрства фінансаў, і ўключаюць у сябе Галоўнае дзяржаўнае казначэйства Міністэрства фінансаў і кіраўніцтвы дзяржаўнага казначэйства галоўных кіраўніцтваў Міністэрства фінансаў па абласцях і г. Мінску, іх аддзелы (сектары) у гарадах і раёнах.

2. Грашовымі сродкамі рэспубліканскага бюджэту, бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў і іншымі сродкамі, якія знаходзяцца на рахунках, адкрытых Міністэрству фінансаў у Нацыянальным банку Рэспублікі Беларусь, кіруе Міністэрства фінансаў.

Грашовымі сродкамі мясцовых бюджэтаў, якія знаходзяцца на рахунках, адкрытых тэрытарыяльным органам Міністэрства фінансаў, кіруюць мясцовыя фінансавыя органы, выканаўчыя і распарадчыя органы першаснага тэрытарыяльнага ўзроўню.

3. Усе аперацыі з грашовымі сродкамі рэспубліканскага бюджэту, мясцовых бюджэтаў, бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў і іншымі сродкамі па рахунках, адкрытых Міністэрству фінансаў і яго тэрытарыяльным органам, улічваюцца асобна.

4. Пазабюджэтныя сродкі дзяржаўных органаў і іншых бюджэтных арганізацый, якія падлягаюць уліку на адзіным казначэйскім рахунку, штогод вызначаюцца законам аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год. Парадак уліку пазабюджэтных сродкаў на адзіным казначэйскім рахунку ўстанаўлівае Міністэрства фінансаў.

За карыстанне пазабюджэтнымі сродкамі дзяржаўных органаў і іншых бюджэтных арганізацый, якія знаходзяцца на адзіным казначэйскім рахунку, Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь, банкі выплачваюць у даход рэспубліканскага бюджэту працэнты па стаўцы, вызначанай Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

5. Адкрыццё, закрыццё, пераафармленне рахункаў распарадчыкаў і атрымальнікаў бюджэтных сродкаў па ўліку сродкаў рэспубліканскага бюджэту, мясцовых бюджэтаў, бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, пазабюджэтных сродкаў бюджэтных арганізацый, іншых сродкаў у адпаведнасці з заканадаўствам, рахункаў упаўнаважаных органаў, якія ажыццяўляюць у адпаведнасці з заканадаўствам прыём асобных выплат у даход бюджэту, а таксама рахункаў па ўліку сродкаў, размешчаных мясцовымі фінансавымі органамі, выканаўчымі і распарадчымі органамі першаснага тэрытарыяльнага ўзроўню ў банкаўскія ўклады (дэпазіты), ажыццяўляюцца па распараджэнні органаў дзяржаўнага казначэйства паводле формы, якую ўстанаўлівае Міністэрства фінансаў.

Распарадчыкі і атрымальнікі бюджэтных сродкаў маюць права адкрыць па адным бягучым (разліковым) банкаўскім рахунку па ўліку сродкаў бюджэту на кожны ўзровень бюджэтнага фінансавання (рэспубліканскі бюджэт, мясцовы бюджэт, бюджэт Саюза Беларусі і Расіі (Саюзнай дзяржавы)), калі іншае не прадугледжана часткай трэцяй гэтага пункта і артыкулам 105[1] гэтага Кодэкса. Пры гэтым бягучы (разліковы) банкаўскі рахунак у замежнай валюце адкрываецца ў тым банку, у якім распарадчыку або атрымальніку бюджэтных сродкаў адкрыты бягучы (разліковы) банкаўскі рахунак у беларускіх рублях.

Распарадчыкі і атрымальнікі бюджэтных сродкаў маюць права адкрыць некалькі (разліковых) банкаўскіх рахункаў па ўліку сродкаў бюджэту на кожны ўзровень бюджэтнага фінансавання, доступ да якіх забяспечваецца з выкарыстаннем банкаўскай плацежнай карткі, а таксама са спецыяльным рэжымам функцыянавання.

Адкрыццё банкаўскіх рахункаў, указаных у частцы першай гэтага пункта, распарадчыкам і атрымальнікам бюджэтных сродкаў ажыццяўляецца ў банках, 50 і болей працэнтаў акцый якіх належыць Рэспубліцы Беларусь.

6. Рахункі Міністэрства фінансаў па ўліку сродкаў рэспубліканскага бюджэту, бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў знаходзяцца ў Нацыянальным банку Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 105[1]. Асаблівасці выканання рэспубліканскага бюджэту дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі і консульскімі ўстановамі Рэспублікі Беларусь**

1. Дыпламатычныя прадстаўніцтвы і консульскія ўстановы Рэспублікі Беларусь (далей – замежныя ўстановы) адкрываюць бягучыя (разліковыя) банкаўскія рахункі у замежных валютах у банках дзяржавы знаходжання або трэціх краін у выпадку адсутнасці магчымасці ажыццяўлення безнаяўных разлікаў у дзяржаве знаходжання.

Замежныя ўстановы маюць права адкрываць некалькі банкаўскіх рахункаў, у тым ліку асобныя банкаўскія рахункі для паступлення выплат у даход рэспубліканскага бюджэту, сродкаў, атрыманых ад ажыццяўлення дзейнасці, якая прыносіць даходы ў

адпаведнасці з заканадаўствам, а таксама для паступлення бюджэтнага фінансавання на ўтрыманне афіцыйных прадстаўнікоў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання ў замежных установах.

2. Даходы рэспубліканскага бюджэту, якія збіраюць замежныя ўстановы і, лічацца залічанымі ў даход бюджэту з моманту іх паступлення на банкаўскі рахунак і (або) у касу замежнай установы.

Даходы рэспубліканскага бюджэту, якія паступілі на рахункі і ў касы замежных устаноў, залічваюцца ў лік іх бюджэтнага фінансавання ў межах зацверджаных бюджэтных асігнаванняў на бягучы фінансавы год, а таксама могуць накіроўвацца на бюджэтнае фінансаванне іншых замежных устаноў.

3. Нявыкарыстаныя рэшты бюджэтных сродкаў на рахунках і ў касах замежных устаноў па заканчэнні фінансавага года застаюцца на банкаўскіх рахунках і ў касах замежных устаноў і залічваюцца ў лік бюджэтнага фінансавання замежных устаноў у чарговым фінансавым годзе.

4. Касавымі расходамі замежных устаноў лічацца ўсе сумы, выдадзеныя з банкаўскіх рахункаў шляхам безнаяўных разлікаў, а таксама з кас замежных устаноў наяўнымі грошамі, за выключэннем выпадкаў бюджэтнага фінансавання іншых замежных устаноў і звароту сум, залішне заплачаных (спагнаных) або няправільна паступіўшых у даход рэспубліканскага бюджэту.

5. Аперацыі па выкананні бюджэтных каштарысаў і каштарысаў даходаў і расходаў пазабюджэтных сродкаў адлюстроўваюцца замежнымі ўстановамі ў бухгалтарскім уліку і справаздачнасці ў замежнай валюце: у нацыянальнай валюце дзяржавы знаходжання, а таксама ў еўра і (або) доларах ЗША.

Абавязацельствы і маёмасць замежных устаноў, адлюстраваныя ў адпаведнасці са звесткамі бухгалтарскага ўліку ў нацыянальнай валюце дзяржавы знаходжання і ў еўра, адлюстроўваюцца замежнымі ўстановамі ў бухгалтарскай справаздачнасці ў доларах ЗША шляхам пераліку па афіцыйным курсе апошняга каляндарнага дня справаздачнага перыяду, устаноўленым нацыянальным (цэнтральным) банкам дзяржавы знаходжання.

## ГЛАВА 21
## ВЫКАНАННЕ РЭСПУБЛІКАНСКАГА БЮДЖЭТУ

**Артыкул 106. Казначэйскае выкананне рэспубліканскага бюджэту**

Казначэйскае выкананне рэспубліканскага бюджэту прадугледжвае:

ажыццяўленне аперацый са сродкамі рэспубліканскага бюджэту праз адзіны казначэйскі рахунак;

размеркаванне рэспубліканскіх падаткаў, збораў (пошлін) паміж рэспубліканскім і мясцовымі бюджэтамі ў адпаведнасці з бюджэтным заканадаўствам;

зварот, залік сум, залішне заплачаных (спагнаных) або няправільна паступіўшых у даход рэспубліканскага бюджэту;

ажыццяўленне аперацый па передачы сродкаў у форме міжбюджэтных трансфертаў паміж рэспубліканскім бюджэтам і мясцовымі бюджэтамі;

забеспячэнне кантролю бюджэтных паўнамоцтваў і абавязацельстваў;

ажыццяўленне выплат ад імя распарадчыкаў (атрымальнікаў) сродкаў рэспубліканскага бюджэту;

улік усіх аперацый і складанне справаздачнасці па выкананні рэспубліканскага бюджэту;

размеркаванне мытных пошлін паміж бюджэтамі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза ў парадку і памерах, устаноўленых міжнародна-прававымі актамі, якія складаюць права Еўразійскага эканамічнага саюза.

**Артыкул 107. Бюджэтны роспіс рэспубліканскага бюджэту**

1. Рэспубліканскі бюджэт выконваецца ў адпаведнасці з бюджэтным роспісам.

2. Бюджэтны роспіс рэспубліканскага бюджэту складаецца ў адпаведнасці з бюджэтнай класіфікацыяй Рэспублікі Беларусь на аснове паказчыкаў рэспубліканскага бюджэту, зацверджаных законам аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год.

3. Бюджэтны роспіс рэспубліканскага бюджэту зацвярджае Міністэрства фінансаў у месячны тэрмін пасля прыняцця закона аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год.

**Артыкул 108. Выкананне рэспубліканскага бюджэту па даходах**

1. Выкананне рэспубліканскага бюджэту па даходах прадугледжвае:

1.1. залічэнне даходаў бюджэту на адзіны казначэйскі рахунак;

1.2. правядзенне ўзаемазаліку падаткаў, збораў (пошлін), іншых выплат, якія падлягаюць выплаце плацельшчыкам (іншай абавязанай асобай), і грашовых абавязацельстваў атрымальнікаў бюджэтных сродкаў перад гэтым плацельшчыкам (іншай абавязанай асобай), у тым ліку па сродках дзяржаўных мэтавых бюджэтных фондаў;

1.3. размеркаванне рэспубліканскіх падаткаў, збораў (пошлін) паміж рэспубліканскім і мясцовымі бюджэтамі па нарматывах адлічэнняў ад рэспубліканскіх падаткаў, збораў (пошлін), устаноўленых у адпаведнасці з бюджэтным заканадаўствам;

1.3[1]. завяршэнне аперацый па размеркаванні рэспубліканскіх падаткаў, збораў (пошлін), якія паступілі ў справаздачным фінансавым годзе, паміж рэспубліканскім і мясцовымі бюджэтамі на працягу першых 10 каляндарных дзён бягучага фінансавага года;

1.4. зварот, залік сум, залішне заплачаных (спагнаных) або няправільна паступіўшых у даход рэспубліканскага бюджэту, у тым ліку шляхам узаемазаліку запазычанасці па бюджэтных пазычках, бюджэтных пазыках, выкананых гарантыях Урада Рэспублікі Беларусь і іншых выплатах у бюджэт;

1.5. улік і справаздачнасць аб выкананні даходнай часткі рэспубліканскага бюджэту;

1.6. аналіз выканання даходаў;

1.7. размеркаванне мытных пошлін паміж бюджэтамі дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза ў парадку і памерах, устаноўленых міжнародна-прававымі актамі, якія складаюць права Еўразійскага эканамічнага саюза, пералічэнне сум размеркаваных мытных пошлін, а таксама іншых выплат у выпадках, прадугледжаных указанымі актамі, у бюджэты дзяржаў – членаў Еўразійскага эканамічнага саюза.

2. Арганізацыі, акрамя падатковых і мытных органаў, упаўнаважаныя ў адпаведнасці з заканадаўствам ажыццяўляць збор даходаў у рэспубліканскі бюджэт, абавязаны ажыццяўляць кантроль за правільным падлікам, поўнай і своечасовай іх выплатай, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам.

3. Размеркаванне рэспубліканскіх падаткаў, збораў (пошлін) паміж рэспубліканскім і мясцовымі бюджэтамі, разлікі з мясцовымі бюджэтамі і плацельшчыкамі па звароце (заліку) залішне заплачаных (спагнаных) або няправільна паступіўшых сум у даход рэспубліканскага бюджэту ажыццяўляюцца органамі дзяржаўнага казначэйства.

4. Аперацыі па даходах рэспубліканскага бюджэту ўлічваюцца па асабовых рахунках, якія адкрываюцца для кожнага падатковага, мытнага органа і іншых арганізацый, упаўнаважаных у адпаведнасці з заканадаўствам збіраць даходы ў рэспубліканскі бюджэт, на адзіным казначэйскім рахунку.

**Артыкул 109. Выкананне рэспубліканскага бюджэту па расходах**

1. Рэспубліканскі бюджэт па расходах выконваецца праз аўтаматызаваную сістэму дзяржаўнага казначэйства ў межах фактычнай наяўнасці бюджэтных сродкаў на адзіным казначэйскім рахунку з абавязковым захаваннем асноўных этапаў, якімі з'яўляюцца:

1.1. устанаўленне бюджэтных прызначэнняў распарадчыкам бюджэтных сродкаў на аснове зацверджанага бюджэтнага роспісу;

1.2. даведзенне бюджэтных прызначэнняў да распарадчыкаў бюджэтных сродкаў, а таксама зацвярджэнне бюджэтных каштарысаў атрымальнікам бюджэтных сродкаў;

1.3. прыняцце грашовых абавязацельстваў атрымальнікамі бюджэтных сродкаў;

1.4. пацвярджэнне і праверка выканання грашовых абавязацельстваў;

1.5. ажыццяўленне выплат (расходаванне бюджэтных сродкаў);

1.6. выкарыстанне тавараў (работ, паслуг) у мэтах ажыццяўлення функцый распарадчыкаў і атрымальнікаў бюджэтных сродкаў;

1.7. правядзенне ўзаемазаліку запазычанасці юрыдычных асоб па бюджэтных пазычках, бюджэтных пазыках, працэнтах па бюджэтных пазыках, пені, налічанай за несвоечасовы зварот бюджэтных пазычак, бюджэтных пазык, а таксама па выкананых гарантыях Урада Рэспублікі Беларусь, і працэнтах па іх, іншых абавязацельствах, якія падлягаюць выплаце ў бюджэт, і грашовых абавязацельстваў атрымальнікаў бюджэтных сродкаў перад гэтай юрыдычнай асобай (іншай абавязанай асобай), у тым ліку па сродках дзяржаўных мэтавых бюджэтных фондаў.

2. Абавязацельствы, не забяспечаныя бюджэтнымі асігнаваннямі, а таксама прынятыя арганізацыямі з парушэннем патрабаванняў, устаноўленых гэтым Кодэксам і законам аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год, не з'яўляюцца бюджэтнымі абавязацельствамі. Расходы рэспубліканскага бюджэту на пакрыццё такіх абавязацельстваў не ажыццяўляюцца.

Наяўнасць бюджэтных асігнаванняў павінна быць пацверджана адзнакай тэрытарыяльнага органа дзяржаўнага казначэйства, прастаўленай ва ўстаноўленым парадку на прад'яўленых да рэгістрацыі дагаворах і іншых пагадненнях.

## ГЛАВА 21[1]
## ВЫКАНАННЕ СУДОВЫХ ПАСТАНОЎ ЗА КОШТ СРОДКАЎ БЮДЖЭТАЎ

**Артыкул 109[1]. Выкананне судовых пастаноў па накіраванні спагнання на сродкі бюджэтаў**

1. Выкананне судовых пастаноў па накіраванні спагнання на сродкі рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў праводзіцца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам на падставе выканаўчых дакументаў з указаннем сум, якія падлягаюць спагнанню ў беларускіх рублях, а таксама ў адпаведнасці з устаноўленымі заканадаўствам патрабаваннямі, якія прад’яўляюцца да выканаўчых дакументаў, тэрмінаў для прад'яўлення выканаўчых дакументаў да выканання, перапынку тэрміну для прад'яўлення выканаўчых дакументаў да выканання, аднаўлення прапушчанага тэрміну для прад'яўлення выканаўчых дакументаў да выканання.

2. Да выканаўчага дакумента, які накіроўваецца для выканання спагнаннікам або па яго просьбе судом або органам прымусовага выканання, павінны быць прыкладзены належным чынам завераная судом копія судовай пастановы, на падставе якой ён

выдадзены, а таксама заява спагнанніка з указаннем рэквізітаў банкаўскага рахунка, на які павінны быць пералічаны сродкі, якія падлягаюць спагнанню.

Заяву спагнанніка падпісвае спагнаннік або яго прадстаўнік з прыкладаннем даверанасці або натарыяльна засведчанай копіі даверанасці або іншага дакумента, які сведчыць паўнамоцтвы прадстаўніка.

3. Падставамі для звароту выканаўчага дакумента, які паступіў на выкананне, з'яўляюцца:

непадаванне якога-небудзь дакумента, указанага ў пункце 2 гэтага артыкула;

неадпаведнасць дакументаў, указаных у пунктах 1 і 2 гэтага артыкула, патрабаванням, устаноўленым Грамадзянскім працэсуальным кодэксам Рэспублікі Беларусь, Гаспадарчым працэсуальным кодэксам Рэспублікі Беларусь, заканадаўствам аб выканаўчым вядзенні;

парушэнне ўстаноўленага заканадаўствам тэрміну для прад'яўлення выканаўчага дакумента да выканання;

падаванне судовай пастановы, якая адмяняе судовую пастанову, якая падлягае выкананню;

заява аб адкліканні выканаўчага дакумента;

прыпыненне выканання судовай пастановы.

Пры звароце выканаўчага дакумента па ўказаных у абзацах чацвёртым – сёмым часткі першай гэтага пункта падставах спагнанніку накіроўваецца паведамленне аб звароце з прыкладаннем накіраваных дакументаў у выпадку накіравання выканаўчага дакумента на выкананне спагнаннікам.

У выпадку немагчымасці ажыццявіць зварот спагнанніку выканаўчага дакумента, які паступіў на выкананне, выканаўчы дакумент і іншыя дакументы накіроўваюцца ў суд, орган прымусовага выканання.

4. Выключаны.

5. Вяртанне выканаўчага дакумента спагнанніку не з'яўляецца перашкодай для новага прад'яўлення ўказанага дакумента да выканання ў межах тэрміну, устаноўленага заканадаўствам для прад'яўлення выканаўчага дакумента да выканання.

6. Дзеянне (бяздзейнасць) органаў, якія выконваюць судовыя пастановы ў парадку, вызначаным гэтай главой, або адмова ў ажыццяўленні такіх дзеянняў могуць быць абскарджаны спагнаннікам у адпаведнасці з заканадаўствам.

**Артыкул 109². Парадак выканання судовых пастаноў**

1. Судовыя пастановы аб выплаце грашовых сродкаў за кошт казны Рэспублікі Беларусь паісках, прадугледжаных пунктам 3 артыкула 81 гэтага Кодэкса, выконвае Міністэрства фінансаў на падставе дакументаў, указаных у пункце 2 артыкула 109¹ гэтага Кодэкса.

2. Распарадчык сродкаў рэспубліканскага бюджэту, які прадстаўляў у судзе інтарэсы Рэспублікі Беларусь, абавязаны накіраваць у Міністэрства фінансаў інфармацыю аб выніках разгляду справы ў судзе на працягу 15 дзён пасля вынясення (прыняцця) судовай пастановы.

Пры задавальненні судом іскавых або іншых патрабаванняў, якія прад'яўляюцца да Рэспублікі Беларусь і задавальняюцца за кошт казны Рэспублікі Беларусь, распарадчык сродкаў рэспубліканскага бюджэту, які прадстаўляў у судзе інтарэсы Рэспублікі Беларусь, таксама інфармуе Міністэрства фінансаў аб наяўнасці падстаў для абскарджання судовай пастановы.

Пры наяўнасці падстаў для абскарджання судовай пастановы распарадчык сродкаў рэспубліканскага бюджэту абавязаны прадставіць у Міністэрства фінансаў інфармацыю аб выніках абскарджання не пазней аднаго месяца з дня ўступлення судовай пастановы ў законную сілу.

3. Судовыя пастановы аб выплаце грашовых сродкаў за кошт казны адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі паісках, прадугледжаных пунктам 3 артыкула 81 гэтага Кодэкса, выконваюцца мясцовым фінансавым органам на падставе дакументаў, указаных у пункце 2 артыкула $109^1$ гэтага Кодэкса.

Распарадчык сродкаў бюджэту адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, які прадстаўляў у судзе інтарэсы адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, абавязаны накіраваць у мясцовы фінансавы орган інфармацыю аб выніках разгляду справы ў судзе на працягу 15 дзён пасля вынясення (прыняцця) судовай пастановы.

Пры задавальненні судом іскавых або іншых патрабаванняў, якія прад'яўляюцца да адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі і задавальняюцца за кошт казны адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, распарадчык сродкаў мясцовага бюджэту, які прадстаўляў у судзе інтарэсы адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, таксама інфармуе мясцовы фінансавы орган аб наяўнасці падстаў для абскарджання судовай пастановы.

Пры наяўнасці падстаў для абскарджання судовай пастановы распарадчык сродкаў мясцовага бюджэту абавязаны прадставіць у мясцовы фінансавы орган інфармацыю аб выніках абскарджання не пазней аднаго месяца з дня ўступлення судовай пастановы ў законную сілу.

4. Выкананне судовых пастаноў праводзіцца на працягу трох месяцаў з дня паступлення выканаўчых дакументаў на выкананне.

Выкананне судовых пастаноў можа быць прыпынена ў адпаведнасці з заканадаўствам.

5. Органы, якія выконваюць судовыя пастановы (Міністэрства фінансаў, мясцовыя фінансавыя органы), улічваюць і захоўваюць выканаўчыя дакументы і іншыя дакументы, звязаныя з іх выкананнем.

6. Пасля ўступлення ў законную сілу судовай пастановы аб выплаце грашовых сродкаў за кошт казны Рэспублікі Беларусь грамадзянін звяртаецца з заявай у мясцовы фінансавы орган выканаўчага і распарадчага органа базавага тэрытарыяльнага ўзроўню па месцы жыхарства грамадзяніна.

Не пазней 10 каляндарных дзён з дня падачы заявы і прыкладзеных да яго дакументаў мясцовы фінансавы орган выканаўчага і распарадчага органа базавага тэрытарыяльнага ўзроўню накіроўвае хадайніцтва аб выдзяленні грашовых сродкаў у мясцовы фінансавы орган выканаўчага і распарадчага органа абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню.

Мясцовыя фінансавыя органы выканаўчых і распарадчых органаў абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню разглядаюць хадайніцтвы мясцовых фінансавых органаў выканаўчых і распарадчых органаў базавага тэрытарыяльнага ўзроўню і на працягу 10 каляндарных дзён з дня паступлення такога хадайніцтва звяртаюцца ў Міністэрства фінансаў з хадайніцтвам аб выдзяленні мясцовым фінансавым органам выканаўчых і распарадчых органаў базавага тэрытарыяльнага ўзроўню з рэспубліканскага бюджэту грашовых сродкаў.

Выплата грашовых сродкаў грамадзяніну ажыццяўляецца мясцовым фінансавым органам выканаўчага і распарадчага органа базавага тэрытарыяльнага ўзроўню па месцы жыхарства грамадзяніна за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту.

Пасля ўступлення ў законную сілу судовай пастановы аб выплаце грашовых сродкаў за кошт казны адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі выплата грашовых сродкаў грамадзяніну ажыццяўляецца па яго заяве мясцовым фінансавым органам выканаўчага і распарадчага органа базавага тэрытарыяльнага ўзроўню або выканаўчым і распарадчым органам першаснага тэрытарыяльнага ўзроўню па месцы жыхарства грамадзяніна за кошт сродкаў адпаведнага мясцовага бюджэту.

7. Пасля ўступлення ў законную сілу судовай пастановы аб выплаце грашовых сродкаў за кошт казны Рэспублікі Беларусь або казны адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі юрыдычныя асобы звяртаюцца адпаведна ў Міністэрства фінансаў або мясцовы фінансавы орган выканаўчага і распарадчага органа ў парадку, прадугледжаным пунктам 6 гэтага артыкула.

## ГЛАВА 22
## УНЯСЕННЕ ЗМЯНЕННЯЎ І (АБО) ДАПАЎНЕННЯЎ У ЗАКОН АБ РЭСПУБЛІКАНСКІМ БЮДЖЭЦЕ НА БЯГУЧЫ ФІНАНСАВЫ ГОД, УДАКЛАДНЕННЕ АСОБНЫХ ПАКАЗЧЫКАЎ РЭСПУБЛІКАНСКАГА БЮДЖЭТУ

### Артыкул 110. Унясенне змяненняў і (або) дапаўненняў у закон аб рэспубліканскім бюджэце на бягучы фінансавы год на працягу фінансавага года

1. Унясенне змяненняў і (або) дапаўненняў у закон аб рэспубліканскім бюджэце на бягучы фінансавы год на працягу фінансавага года праводзіцца законам аб унясенні змяненняў і (або) дапаўненняў у закон аб рэспубліканскім бюджэце на бягучы фінансавы год.

2. У выпадку ўнясення змяненняў, якія прадугледжваюць павелічэнне фінансавання па існуючых напрамках расходаў рэспубліканскага бюджэту, або дапаўненняў, якія прадугледжваюць стварэнне новых напрамкаў расходаў рэспубліканскага бюджэту, якія да прыняцця ўказанага закона не фінансаваліся, павінны быць вызначаны крыніцы і парадак фінансавання гэтых расходаў рэспубліканскага бюджэту.

3. Пры вызначэнні фінансавання новых напрамкаў расходаў рэспубліканскага бюджэту або павелічэнні фінансавання існуючых напрамкаў расходаў рэспубліканскага бюджэту не дапускаецца павелічэнне максімальнага памеру дэфіцыту рэспубліканскага бюджэту.

### Артыкул 111. Удакладненне асобных паказчыкаў рэспубліканскага бюджэту на працягу фінансавага года

1. Павелічэнне або змяншэнне зацверджанага законам аб рэспубліканскім бюджэце на бягучы фінансавы год аб'ёму даходаў рэспубліканскага бюджэту, расходаў рэспубліканскага бюджэту, дэфіцыту рэспубліканскага бюджэту і крыніц яго фінансавання (прафіцыту рэспубліканскага бюджэту і напрамкаў яго выкарыстання), а таксама ўдакладненне іншых паказчыкаў, якія зацвярджаюцца законам аб рэспубліканскім бюджэце на бягучы фінансавы год згодна з артыкулам 89 гэтага Кодэкса, праводзяцца дэкрэтамі і ўказамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

2. Пры выданні Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь заканадаўчых актаў, якія прадугледжваюць павелічэнне фінансавання па існуючых напрамках расходаў рэспубліканскага бюджэту або стварэнне новых напрамкаў расходаў рэспубліканскага бюджэту, якія да прыняцця ўказаных заканадаўчых актаў не фінансаваліся, павінны быць вызначаны крыніцы і парадак фінансавання гэтых расходаў рэспубліканскага бюджэту.

3. Пры вызначэнні фінансавання новых напрамкаў расходаў рэспубліканскага бюджэту або павелічэнні фінансавання існуючых напрамкаў расходаў рэспубліканскага бюджэту не дапускаецца павелічэнне максімальнага памеру дэфіцыту рэспубліканскага бюджэту.

4. Удакладняць паказчыкі рэспубліканскага бюджэту ў межах сум даходаў і расходаў рэспубліканскага бюджэту, максімальнага памеру дэфіцыту рэспубліканскага бюджэту і крыніц яго фінансавання (мінімальнага памеру прафіцыту рэспубліканскага бюджэту і напрамкаў яго выкарыстання), зацверджаных законам аб рэспубліканскім бюджэце на бягучы фінансавы год, могуць:

4.1. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь;

4.2. Урад Рэспублікі Беларусь або па яго даручэнні Міністэрства фінансаў, іншыя ўдзельнікі бюджэтнага працэсу ў межах праў, дадзеных ім законам аб рэспубліканскім бюджэце на бягучы фінансавы год.

5. Міністэрства фінансаў у працэсе выканання рэспубліканскага бюджэту мае права ўносіць змяненні ў:

5.1. квартальнае размеркаванне даходаў рэспубліканскага бюджэту;

5.2. даходы рэспубліканскага бюджэту ў межах зацверджаных гадавых паступленняў;

5.3. квартальнае размеркаванне расходаў рэспубліканскага бюджэту;

5.4. расходы рэспубліканскага бюджэту па ведамаснай, праграмнай і эканамічнай класіфікацыях расходаў бюджэту ў межах зацверджаных гадавых бюджэтных прызначэнняў па функцыянальнай класіфікацыі расходаў бюджэту;

5.4$^{1}$. расходы рэспубліканскага бюджэту па функцыянальнай класіфікацыі расходаў бюджэту ў частцы расходаў рэспубліканскага цэнтралізаванага інавацыйнага фонду ў межах зацверджанага гадавога памеру;

5.5. даходы, расходы, дэфіцыт (прафіцыт) і крыніцы фінансавання дэфіцыту (напрамкі выкарыстання прафіцыту) рэспубліканскага бюджэту ў частцы паступлення і выкарыстання сродкаў у адпаведнасці з рашэннямі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, а таксама ў частцы аперацый па бязвыплатнай перадачы канфіскаванай і іншым спосабам звернутай у даход дзяржавы маёмасці, якая ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі;

5.6. памеры крыніц фінансавання дэфіцыту (напрамкаў выкарыстання прафіцыту) рэспубліканскага бюджэту ў межах зацверджанага гадавога памеру.

6. У выпадку зніжэння паступленняў даходаў рэспубліканскага бюджэту або паступленняў з крыніц фінансавання дэфіцыту рэспубліканскага бюджэту да ўзроўню, які можа прывесці да скарачэння фінансавання расходаў бюджэту ў параўнанні з запланаваным аб'ёмам на год больш чым на 10 працэнтаў, Міністэрства фінансаў неадкладна інфармуе аб гэтым Урад Рэспублікі Беларусь. Урад Рэспублікі Беларусь уносіць Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь прапановы аб скарачэнні расходаў рэспубліканскага бюджэту.

7. Пры невыкананні паказчыкаў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь і асноўных напрамкаў грашова-крэдытнай палітыкі Рэспублікі Беларусь Міністэрства фінансаў мае права прымаць меры па аднясенні асобных бюджэтных асігнаванняў, прадугледжаных атрымальнікам бюджэтных сродкаў, на вызначальныя коды бюджэтнай класіфікацыі расходаў бюджэту, якія абмяжоўваюць іх правы па прыняцці бюджэтных абавязацельстваў і (або) іх выкананні (блакіраванне расходаў рэспубліканскага бюджэту), калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі, з наступным унясеннем ва ўстаноўленым парадку прапаноў аб іх скарачэнні пры ўдакладненні асобных паказчыкаў рэспубліканскага бюджэту.

**Артыкул 112. Парадак унясення змяненняў і (або) дапаўненняў у закон аб рэспубліканскім бюджэце на бягучы фінансавы год, удакладнення асобных паказчыкаў рэспубліканскага бюджэту на працягу фінансавага года**

1. Урад Рэспублікі Беларусь распрацоўвае і падае Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь праект закона аб унясенні змяненняў і (або) дапаўненняў у закон аб рэспубліканскім бюджэце на бягучы фінансавы год або праект акта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб удакладненні асобных паказчыкаў рэспубліканскага бюджэту.

2. Праект закона аб унясенні змяненняў і (або) дапаўненняў у закон аб рэспубліканскім бюджэце на бягучы фінансавы год уносіцца ў Палату прадстаўнікоў Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

3. Падрыхтоўка, унясенне і разгляд праектаў дэкрэтаў і ўказаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб удакладненні асобных паказчыкаў рэспубліканскага бюджэту ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

4. У адпаведнасці з прынятымі законам аб унясенні змяненняў і (або) дапаўненняў у закон аб рэспубліканскім бюджэце на бягучы фінансавы год, актам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб удакладненні паказчыкаў рэспубліканскага бюджэту, пастановай Урада Рэспублікі Беларусь у межах праў, дадзеных Ураду Рэспублікі Беларусь законам аб рэспубліканскім бюджэце на бягучы фінансавы год, Міністэрства фінансаў уносіць змяненні ў сумы даходаў і расходаў рэспубліканскага бюджэту, максімальны памер дэфіцыту рэспубліканскага бюджэту і крыніцы яго фінансавання (мінімальны памер прафіцыту і напрамкі яго выкарыстання), павялічвае або змяншае бюджэтныя асігнаванні па распарадчыках бюджэтных сродкаў, змяняе ўзаемаадносіны рэспубліканскага бюджэту з адпаведнымі мясцовымі бюджэтамі шляхам унясення змяненняў і (або) дапаўненняў у бюджэтны роспіс рэспубліканскага бюджэту.

Удакладненне асобных паказчыкаў рэспубліканскага бюджэту на працягу фінансавага года, якое ажыццяўляецца ў адпаведнасці з падпунктам 4.2 пункта 4 і пунктам 5 артыкула 111 гэтага Кодэкса, праводзіцца шляхам унясення змяненняў і (або) дапаўненняў у бюджэтны роспіс рэспубліканскага бюджэту ў форме даведкі аб змяненні бюджэтнага роспісу рэспубліканскага бюджэту (бюджэтнага каштарыса).

Форму даведкі аб змяненні бюджэтнага роспісу рэспубліканскага бюджэту (бюджэтнага каштарыса) устанаўлівае Міністэрства фінансаў.

## ГЛАВА 23
## ПАДРЫХТОЎКА І РАЗГЛЯД ПРАЕКТА ЗАКОНА АБ ЗАЦВЯРДЖЭННІ СПРАВАЗДАЧЫ АБ ВЫКАНАННІ РЭСПУБЛІКАНСКАГА БЮДЖЭТУ ЗА СПРАВАЗДАЧНЫ ФІНАНСАВЫ ГОД

### Артыкул 113. Падрыхтоўка справаздачы аб выкананні рэспубліканскага бюджэту за справаздачны фінансавы год

1. Справаздачу аб выкананні рэспубліканскага бюджэту за справаздачны фінансавы год рыхтуе Міністэрства фінансаў.

2. Распарадчыкі сродкаў рэспубліканскага бюджэту на аснове бухгалтарскай справаздачнасці атрымальнікаў бюджэтных сродкаў складаюць і падаюць у Міністэрства фінансаў зводную гадавую бухгалтарскую справаздачнасць у складзе і парадку, вызначаных Міністэрствам фінансаў.

3. Справаздачу выкананні рэспубліканскага бюджэту за справаздачны фінансавы год складае Міністэрства фінансаў у адпаведнасці з бюджэтнай класіфікацыяй Рэспублікі Беларусь і па такой жа структуры, што і зацверджаны бюджэт на адпаведны фінансавы год з улікам унесеных у яго змяненняў і (або) дапаўненняў, і ў форме праекта закона да 1 сакавіка года, які ідзе следам за справаздачным фінансавым годам, уносіць на разгляд Урада Рэспублікі Беларусь.

Урад Рэспублікі Беларусь:

на працягу пяці рабочых дзён накіроўвае праект закона аб зацвярджэнні справаздачы аб выкананні рэспубліканскага бюджэту за справаздачны фінансавы год у Камітэт дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь для падрыхтоўкі ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку заключэння аб выкананні рэспубліканскага бюджэту за справаздачны фінансавы год;

накіроўвае звесткі аб ільготах па падатках, зборах (пошлінах) у Камітэт дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь да 5 мая года, які ідзе следам за справаздачным фінансавым годам;

падае праект закона аб зацвярджэнні справаздачы аб выкананні рэспубліканскага бюджэту за справаздачны фінансавы год Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь.

4. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь уносіць у Палату прадстаўнікоў праект закона аб зацвярджэнні справаздачы аб выкананні рэспубліканскага бюджэту за справаздачны фінансавы год не пазней пяці месяцаў з дня заканчэння справаздачнага фінансавага года.

**Артыкул 114. Дакументы і матэрыялы, якія ўносяцца адначасова з праектам закона аб зацвярджэнні справаздачы аб выкананні рэспубліканскага бюджэту за справаздачны фінансавы год**

1. Пры падрыхтоўцы праекта закона аб зацвярджэнні справаздачы аб выкананні рэспубліканскага бюджэту за справаздачны фінансавы год складаюцца наступныя дакументы і матэрыялы:

1.1. звесткі аб расходаванні сродкаў рэзервовых фондаў рэспубліканскага бюджэту;

1.2. звесткі аб дадзеных гарантыях Урада Рэспублікі Беларусь;

1.3. звесткі аб стане дзяржаўнага доўгу Рэспублікі Беларусь;

1.4. звесткі аб даванні і пагашэнні бюджэтных пазычак, бюджэтных пазык, бюджэтных крэдытаў, выдадзеных за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту;

1.5. звесткі аб наяўнасці дэбіторскай і крэдыторскай запазычанасці па бюджэтных сродках рэспубліканскага бюджэту;

1.5$^1$. звесткі аб ільготах па падатках, зборах (пошлінах) за справаздачны фінансавы год;

1.6. паясняльная запіска да праекта закона аб зацвярджэнні справаздачы аб выкананні рэспубліканскага бюджэту за справаздачны фінансавы год.

2. Дакументы і матэрыялы, указаныя ў пункце 1 гэтага артыкула, дадаюцца да праекта закона аб зацвярджэнні справаздачы аб выкананні рэспубліканскага бюджэту за справаздачны фінансавы год пры накіраванні яго ў Камітэт дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь, падаванні Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь і ўнясенні ў Палату прадстаўнікоў.

3. Звесткі аб ільготах па падатках, зборах (пошлінах) падаюцца на разгляд Урада Рэспублікі Беларусь да 1 мая года, які ідзе следам за справаздачным фінансавым годам.

**Артыкул 115. Правядзенне знешняй праверкі справаздачы аб выкананні рэспубліканскага бюджэту за справаздачны фінансавы год**

Камітэт дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь праводзіць праверку справаздачы аб выкананні рэспубліканскага бюджэту за справаздачны фінансавы год, рыхтуе адпаведнае заключэнне аб выкананні рэспубліканскага бюджэту за справаздачны фінансавы год, выкарыстоўваючы матэрыялы і вынікі праведзеных праверак, і не пазней 15 мая года, які ідзе следам за справаздачным фінансавым годам, уносіць яго на разгляд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і Парламента Рэспублікі Беларусь, а таксама накіроўвае яго ва Урад Рэспублікі Беларусь.

Камітэт дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь забяспечвае даступнасць для азнаямлення грамадскасці з заключэннем аб выкананні рэспубліканскага бюджэту за справаздачны фінансавы год.

**Артыкул 116. Разгляд праекта закона аб зацвярджэнні справаздачы аб выкананні рэспубліканскага бюджэту за справаздачны фінансавы год Парламентам Рэспублікі Беларусь**

1. Пры разглядзе праекта закона аб зацвярджэнні справаздачы аб выкананні рэспубліканскага бюджэту за справаздачны фінансавы год Палата прадстаўнікоў заслухоўвае даклад Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь або яго прадстаўніка аб выкананні рэспубліканскага бюджэту за справаздачны фінансавы год і заключэнне Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь.

2. Праект закона аб зацвярджэнні справаздачы аб выкананні рэспубліканскага бюджэту за справаздачны фінансавы год разглядае Парламент Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Кодэксам і рэгламентамі палат Парламента Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 24
## ВЫКАНАННЕ МЯСЦОВЫХ БЮДЖЭТАЎ

**Артыкул 117. Органы, якія ажыццяўляюць выкананне мясцовых бюджэтаў**

Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, мясцовыя фінансавыя органы і інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь у межах сваёй кампетэнцыі арганізуюць выкананне мясцовых бюджэтаў, забяспечваюць паступленне ўсіх прадугледжаных даходаў і расходаванне бюджэтных сродкаў у адпаведнасці з іх мэтавым прызначэннем.

**Артыкул 118. Казначэйскае выкананне мясцовых бюджэтаў**

1. Казначэйскае выкананне мясцовых бюджэтаў прадугледжвае выкананне органамі дзяржаўнага казначэйства, мясцовымі фінансавымі органамі функцый, устаноўленых артыкулам 106 гэтага Кодэкса.

Тэрытарыяльныя органы дзяржаўнага казначэйства ажыццяўляюць касавае абслугоўванне выканання мясцовых бюджэтаў.

2. Аплата бюджэтных абавязацельстваў атрымальнікаў бюджэтных сродкаў, прынятых да выканання, ажыццяўляецца праз адзіны казначэйскі рахунак.

**Артыкул 119. Бюджэтны роспіс мясцовых бюджэтаў**

1. Мясцовыя бюджэты выконваюцца ў адпаведнасці з бюджэтным роспісам.

2. Бюджэтны роспіс бюджэту абласнога і базавага ўзроўняў складае адпаведны мясцовы фінансавы органа на аснове паказчыкаў, зацверджаных рашэннем мясцовага Савета дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год, у месячны тэрмін пасля яго прыняцця.

Бюджэтны роспіс бюджэту абласнога і базавага ўзроўняў зацвярджае адпаведны мясцовы фінансавы орган.

3. Бюджэтны роспіс бюджэту першаснага ўзроўню складае выканаўчы і распарадчы орган першаснага тэрытарыяльнага ўзроўню на аснове паказчыкаў, зацверджаных рашэннем мясцовага Савета дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год, у месячны тэрмін пасля яго прыняцця.

Бюджэтны роспіс бюджэту першаснага ўзроўню зацвярджаецца выканаўчым і распарадчым органам першаснага тэрытарыяльнага ўзроўню.

4. Мясцовыя фінансавыя органы, выканаўчыя і распарадчыя органы першаснага тэрытарыяльнага ўзроўню на працягу фінансавага года маюць права ўносіць змяненні і (або) дапаўненні ў бюджэтны роспіс мясцовага бюджэту ў частцы:

паказчыкаў мясцовага бюджэту на бягучы фінансавы год на падставах, устаноўленых падпунктамі 2.1–2.4 пункта 2 артыкула 122 гэтага Кодэкса;

квартальнага размеркавання даходаў, расходаў, крыніц фінансавання дэфіцыту (напрамкаў выкарыстання прафіцыту) адпаведнага бюджэту;

даходаў бюджэту ў межах зацверджаных гадавых паступленняў;

расходаў бюджэту па функцыянальнай, ведамаснай, праграмнай і эканамічнай класіфікацыях расходаў бюджэту ў межах зацверджаных гадавых бюджэтных прызначэнняў па функцыянальнай класіфікацыі расходаў бюджэту;

расходаў бюджэту па функцыянальнай класіфікацыі расходаў бюджэту ў частцы расходаў мясцовых інавацыйных фондаў у межах іх агульнага зацверджанага гадавога памеру;

крыніц фінансавання дэфіцыту бюджэту (напрамкаў выкарыстання прафіцыту бюджэту).

Змяненні і (або) дапаўненні ў бюджэтны роспіс мясцовага бюджэту па расходах, указаных у абзацах трэцім і пятым часткі першай гэтага пункта, уносяцца па хадайніцтвах распарадчыкаў бюджэтных сродкаў або па ўзгадненні з імі. У выпадку зніжэння запланаваных паступленняў даходаў мясцовага бюджэту або паступленняў з крыніц фінансавання дэфіцыту мясцовага бюджэту, а таксама ў іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўствам, мясцовы фінансавы орган можа ўносіць змяненні і (або) дапаўненні ў бюджэтны роспіс мясцовага бюджэту па расходах, указаных у абзацах трэцім і пятым часткі першай гэтага пункта, без узгаднення з распарадчыкамі бюджэтных сродкаў.

5. Змяненні і (або) дапаўненні ў бюджэтны роспіс мясцовага бюджэту ўносіць мясцовы фінансавы орган, выканаўчы і распарадчы орган першаснага тэрытарыяльнага ўзроўню ў форме даведкі аб змяненні бюджэтнага роспісу мясцовага бюджэту (бюджэтнага каштарыса).

Даведка аб змяненні бюджэтнага роспісу мясцовага бюджэту (бюджэтнага каштарыса) па бюджэтах першаснага ўзроўню складаецца на падставе распараджэння старшыні выканаўчага і распарадчага органа першаснага тэрытарыяльнага ўзроўню.

Форму даведкі аб змяненні бюджэтнага роспісу мясцовага бюджэту (бюджэтнага каштарыса) і форму паведамлення аб змяненні міжбюджэтных трансфертаў устанаўлівае Міністэрства фінансаў.

### Артыкул 120. Выкананне мясцовых бюджэтаў па даходах

Выкананне мясцовых бюджэтаў па даходах прадугледжвае:

залічэнне даходаў мясцовых бюджэтаў на адзіны казначэйскі рахунак;

размеркаванне рэспубліканскіх падаткаў, збораў (пошлін) і мясцовых падаткаў і збораў паміж рэспубліканскім і (або) мясцовымі бюджэтамі па нарматывах адлічэнняў ад рэспубліканскіх падаткаў, збораў (пошлін) і нарматывах адлічэнняў ад мясцовых падаткаў і збораў, устаноўленых у адпаведнасці з бюджэтным заканадаўствам;

правядзенне ўзаемазаліку падаткаў, збораў (пошлін), іншых выплат, якія падлягаюць выплаце плацельшчыкам (іншай абавязанай асобай), і грашовых абавязацельстваў атрымальнікаў бюджэтных сродкаў перад гэтым плацельшчыкам

(іншай абавязанай асобай), у тым ліку па сродках дзяржаўных мэтавых бюджэтных фондаў;

завяршэнне аперацый па размеркаванні рэспубліканскіх падаткаў, збораў (пошлін), мясцовых падаткаў і збораў, якія паступілі ў справаздачным фінансавым годзе, паміж рэспубліканскім і (або) мясцовымі бюджэтамі на працягу першых 10 каляндарных дзён бягучага фінансавага года;

зварот, залік сум, залішне заплачаных (спагнаных) або няправільна паступіўшых у даход мясцовых бюджэтаў, у тым ліку шляхам узаемазаліку запазычанасці па бюджэтных пазычак, бюджэтных пазыках, выкананых гарантыях мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў і іншых выплатах у бюджэт;

улік і справаздачнасць па выкананні даходнай часткі мясцовых бюджэтаў;

аналіз выканання даходаў.

**Артыкул 121. Выкананне мясцовых бюджэтаў па расходах**

1. Выкананне мясцовых бюджэтаў па расходах ажыццяўляецца праз аўтаматызаваную сістэму дзяржаўнага казначэйства ў межах фактычнай наяўнасці бюджэтных сродкаў з абавязковым захаваннем асноўных этапаў, якімі з'яўляюцца:

1.1. устанаўленне бюджэтных прызначэнняў распарадчыкам бюджэтных сродкаў на аснове зацверджанага бюджэтнага роспісу;

1.2. давядзенне бюджэтных прызначэнняў да распарадчыкаў бюджэтных сродкаў, а таксама зацвярджэнне распарадчыкамі бюджэтных сродкаў бюджэтных каштарысаў атрымальнікам бюджэтных сродкаў;

1.3. прыняцце грашовых абавязацельстваў атрымальнікамі бюджэтных сродкаў;

1.4. пацвярджэнне і праверка выканання грашовых абавязацельстваў;

1.5. ажыццяўленне выплат (расходаванне бюджэтных сродкаў);

1.6. выкарыстанне тавараў (работ, паслуг) у мэтах ажыццяўлення функцый распарадчыкаў і атрымальнікаў бюджэтных сродкаў;

1.7. правядзенне ўзаемазаліку запазычанасці юрыдычных асоб па бюджэтных пазычках, бюджэтных пазыках, працэнтах па бюджэтных пазыках, пені, налічанай за несвоечасовы зварот бюджэтных пазычак, бюджэтных пазык, а таксама выкананых гарантыях мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, і працэнтах па ім, іншых абавязацельствах, якія падлягаюць выплаце ў бюджэт, і грашовых абавязацельстваў атрымальнікаў бюджэтных сродкаў перад гэтай юрыдычнай асобай (іншай абавязанай асобай), у тым ліку па сродках дзяржаўных мэтавых бюджэтных фондаў.

2. Абавязацельствы, не забяспечаныя бюджэтнымі асігнаваннямі, а таксама прынятыя арганізацыямі з парушэннем патрабаванняў, устаноўленых гэтым Кодэксам і рашэннямі мясцовых Саветаў дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год, не з'яўляюцца бюджэтнымі абавязацельствамі. Расходы мясцовых бюджэтаў на пакрыццё такіх абавязацельстваў не ажыццяўляюцца.

Наяўнасць бюджэтных асігнаванняў павінна быць пацверджана адзнакай тэрытарыяльнага органа дзяржаўнага казначэйства, прастаўленай ва ўстаноўленым парадку на прад'яўленых да рэгістрацыі дагаворах і іншых пагадненнях.

3. Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы павінны прымаць меры па эфектыўным кіраванні часова свабоднымі грашовымі сродкамі пры мінімізацыі рызык.

**Артыкул 122. Унясенне змяненняў і (або) дапаўненняў у рашэнне мясцовага Савета дэпутатаў аб бюджэце на бягучы фінансавы год**

1. Мясцовы выканаўчы і распарадчы орган распрацоўвае і ўносіць для зацвярджэння ў мясцовы Савет дэпутатаў праекты рашэнняў аб унясенні змяненняў і

(або) дапаўненняў у рашэнне мясцовага Савета дэпутатаў аб бюджэце на бягучы фінансавы год.

2. Рашэнні мясцовага Савета дэпутатаў аб унясенні змяненняў і (або) дапаўненняў у рашэнне мясцовага Савета дэпутатаў аб бюджэце на бягучы фінансавы год прымаюцца на працягу фінансавага года па ініцыятыве мясцовага Савета дэпутатаў або на падставе:

2.1. паведамлення Міністэрства фінансаў, вышэйстаячага (ніжэйстаячага) мясцовага фінансавага органа, выканаўчага і распарадчага органа першаснага тэрытарыяльнага ўзроўню аб змяненні міжбюджэтных трансфертаў;

2.2. паведамлення Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь аб змяненні міжбюджэтных трансфертаў з дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь;

2.3. дагавора аб даванні бюджэтнага крэдыту;

2.4. рашэння мясцовага выканаўчага і распарадчага органа ў частцы накіравання сродкаў рэзервовага фонду мясцовага выканаўчага і распарадчага органа і ў іншых выпадках у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі.

3. Змяненні і (або) дапаўненні, унесеныя ў бюджэтны роспіс мясцовага бюджэту на падставе падпунктаў 2.1–2.4 пункта 2 гэтага артыкула, абзаца пятага часткі першай пункта 4 артыкула 119 гэтага Кодэкса ў частцы ўнясення змяненняў у расходы адпаведнага мясцовага бюджэту па ведамаснай і праграмнай класіфікацыях расходаў бюджэту, а таксама абзаца сёмага часткі першай пункта 4 артыкула 119 гэтага Кодэкса, падлягаюць наступнаму зацвярджэнню мясцовым Саветам дэпутатаў шляхам прыняцця рашэння аб унясенні змяненняў і (або) дапаўненняў у рашэнне мясцовага Савета дэпутатаў аб бюджэце на бягучы фінансавы год.

Дапускаецца ўнясенне змяненняў і (або) дапаўненняў у бюджэтны роспіс мясцовага бюджэту на падставе падпунктаў 2.1–2.4 пункта 2 гэтага артыкула без наступнага прыняцця рашэння аб унясенні змяненняў і (або) дапаўненняў у рашэнне мясцовага Савета дэпутатаў аб бюджэце на бягучы фінансавы год у выпадку прыняцця акта заканадаўства, які прадугледжвае даванне міжбюджэтных трансфертаў і бюджэтных крэдытаў, а таксама накіраванне сродкаў рэзервовага фонду мясцовага выканаўчага і распарадчага органа менш чым за 15 дзён да заканчэння бягучага фінансавага года.

4. Рэшты сродкаў бюджэту, якія ўтварыліся на канец справаздачнага фінансавага года, застаюцца ў распараджэнні адпаведнага мясцовага Савета дэпутатаў, і іх адабранне з бюджэту не дапускаецца.

Накіраванне рэшт сродкаў бюджэту, якія ўтварыліся на пачатак бягучага фінансавага года, ажыццяўляецца рашэннем мясцовага Савета дэпутатаў. На працягу бягучага фінансавага года дапускаецца выкарыстанне рэшт сродкаў бюджэту, якія ўтварыліся на пачатак бягучага фінансавага года, мясцовымі фінансавымі органамі, выканаўчымі і распарадчымі органамі першаснага тэрытарыяльнага ўзроўню для пакрыцця часовых касавых разрываў, якія ўзнікаюць пры выкананні мясцовых бюджэтаў, з іх аднаўленнем да канца бягучага фінансавага года.

5. У выпадку зніжэння паступленняў даходаў мясцовага бюджэту або паступленняў з крыніц фінансавання дэфіцыту мясцовага бюджэту да ўзроўню, які можа прывесці да скарачэння фінансавання расходаў бюджэту ў параўнанні з запланаваным на год аб'ёмам болей чым на 10 працэнтаў, мясцовы фінансавы орган неадкладна інфармуе аб гэтым мясцовы выканаўчы і распарадчы орган. Мясцовы выканаўчы і распарадчы орган распрацоўвае і ўносіць на разгляд мясцовага Савета дэпутатаў праект рашэння аб унясенні змяненняў і (або) дапаўненняў у рашэнне

мясцовага Савета дэпутатаў аб бюджэце на бягучы фінансавы год у частцы скарачэння расходаў бюджэту.

**Артыкул 123. Функцыі адміністрацый раёнаў у г. Мінску і фінансавых органаў адміністрацый раёнаў у г. Мінску па складанні і выкананні бюджэтнага каштарыса адміністрацыі раёна ў г. Мінску**

1. Расходы бюджэту г. Мінска па адміністрацыях раёнаў у г. Мінску (далей – адміністрацыя раёна) па функцыянальнай класіфікацыі расходаў бюджэту зацвярджаюцца рашэннем Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў аб бюджэце г. Мінска на чарговы фінансавы год.

2. Расходы па бюджэтным каштарысе адміністрацыі раёна ў межах гадавых асігнаванняў, зацверджаных Мінскім гарадскім Саветам дэпутатаў па функцыянальнай класіфікацыі расходаў бюджэту з пакватральным размеркаваннем, у двухтыднёвы тэрмін пасля зацвярджэння бюджэту г. Мінска зацвярджаюцца рашэннем адміністрацыі раёна і ўключаюцца ў бюджэтны роспіс г. Мінска.

3. Падставамі для ўнясення змяненняў у бюджэтны каштарыс адміністрацыі раёна з'яўляюцца:

3.1. рашэнне Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў аб павелічэнні або змяншэнні аб'ёму расходаў па бюджэтным каштарысе адміністрацыі раёна, зацверджанага рашэннем Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў аб бюджэце г. Мінска на бягучы фінансавы год;

3.2. рашэнне адміністрацыі раёна ў частцы:

накіравання сродкаў рэзервовага фонда, зацверджанага ў бюджэтным каштарысе адміністрацыі раёна;

унясення змяненняў у квартальнае размеркаванне расходаў бюджэту;

унясення змяненняў у расходы па функцыянальнай, ведамаснай і эканамічнай класіфікацыях расходаў бюджэту ў межах зацверджаных гадавых бюджэтных прызначэнняў па функцыянальнай класіфікацыі расходаў бюджэту;

3.3. паведамленне фінансаваму кіраўніцтву Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта аб змяненні бюджэтнага роспісу (бюджэтнага каштарыса) адміністрацыі раёна па форме, якая ўстанаўліваецца фінансавым кіраўніцтвам Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта.

**Артыкул 124. Справаздачы аб выкананні мясцовых бюджэтаў**

1. Справаздача аб выкананні мясцовага бюджэту за справаздачны фінансавы год складаецца ў адпаведнасці з бюджэтнай класіфікацыяй Рэспублікі Беларусь і па такой жа структуры, што і зацверджаны бюджэт на адпаведны фінансавы год з улікам унесеных у яго змяненняў і (або) дапаўненняў.

Распарадчыкі сродкаў мясцовага бюджэту на аснове бухгалтарскай справаздачнасці атрымальнікаў бюджэтных сродкаў складаюць і падаюць у мясцовы фінансавы орган зводную гадавую бухгалтарскую справаздачнасць у складзе і парадку, вызначаных Міністэрствам фінансаў.

Парадак і тэрміны складання і падавання месячнай, квартальнай і гадавой справаздач аб выкананні мясцовага бюджэту вызначаюцца Міністэрствам фінансаў.

2. Абласныя (Мінскія гарадскія) выканаўчыя камітэты падаюць у Міністэрства фінансаў справаздачы аб выкананні кансалідаваных бюджэтаў абласцей і бюджэту г. Мінска ў парадку і тэрміны, устаноўленыя Міністэрствам фінансаў. Да справаздачы аб выкананні кансалідаваных бюджэтаў абласцей і бюджэту г. Мінска дадаюцца звесткі аб ільготах па падатках, зборах (пошлінах), зводная бухгалтарская справаздачнасць, дакументы і матэрыялы ў складзе, вызначаным Міністэрствам фінансаў.

3. Справаздачу аб выкананні абласнога бюджэту, бюджэту г. Мінска, раённага, гарадскога (горада абласнога падпарадкавання) бюджэтаў складае мясцовы фінансавы орган і падае ў адпаведны мясцовы выканаўчы і распарадчы орган. Справаздачу аб выкананні бюджэту сельсавета, пасёлка гарадскога тыпу, горада раённага падпарадкавання складае адпаведны мясцовы выканаўчы і распарадчы орган.

Справаздачы аб выкананні мясцовых бюджэтаў, за выключэннем абласных бюджэтаў і бюджэту г. Мінска, падаюцца ў адпаведны вышэйстаячы мясцовы фінансавы орган.

4. Справаздачы аб выкананні мясцовых бюджэтаў за справаздачны фінансавы год уносяцца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі на разгляд адпаведных мясцовых Саветаў дэпутатаў ва ўстаноўленыя імі тэрміны не пазней пяці месяцаў з дня заканчэння справаздачнага фінансавага года. Справаздачы аб выкананні мясцовых бюджэтаў за справаздачны фінансавы год разглядаюць і зацвярджаюць мясцовыя Саветы дэпутатаў ва ўстаноўленым парадку.

## РАЗДЗЕЛ X
## АСНОВЫ КАНТРОЛЮ ЗА ВЫКАНАННЕМ БЮДЖЭТНАГА ЗАКАНАДАЎСТВА І АДКАЗНАСЦЬ ЗА ЯГО ПАРУШЭННЕ

### ГЛАВА 25
### АСНОВЫ КАНТРОЛЮ ЗА ВЫКАНАННЕМ БЮДЖЭТНАГА ЗАКАНАДАЎСТВА

#### Артыкул 125. Паўнамоцтвы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Парламента Рэспублікі Беларусь і Урада Рэспублікі Беларусь

1. Паўнамоцтвы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па кантролі за выкананнем бюджэтнага заканадаўства замацоўваюцца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і ўстанаўліваюцца заканадаўчымі актамі.

2. Палаты Парламента Рэспублікі Беларусь кантралююць выкананне бюджэтнага заканадаўства ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь.

3. Паўнамоцтвы Урада Рэспублікі Беларусь па кантролі за выкананнем бюджэтнага заканадаўства замацоўваюцца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і ўстанаўліваюцца законамі і актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

#### Артыкул 126. Паўнамоцтвы органаў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь

Да паўнамоцтваў органаў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь па кантролі за выкананнем бюджэтнага заканадаўства адносіцца ажыццяўленне кантролю за:

выкананнем даходных і расходных частак рэспубліканскага бюджэту і мясцовых бюджэтаў, бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў;

своечасовасцю і паўнатой паступлення даходаў, мэтавым і эфектыўным расходаваннем сродкаў рэспубліканскага бюджэту і мясцовых бюджэтаў, бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў;

выкананнем іншых норм бюджэтнага заканадаўства.

#### Артыкул 127. Паўнамоцтвы мясцовых Саветаў дэпутатаў

Да паўнамоцтваў мясцовых Саветаў дэпутатаў па кантролі за выкананнем бюджэтнага заканадаўства адносіцца ажыццяўленне кантролю за:

правільнасцю складання, разгляду і зацвярджэння мясцовых бюджэтаў на чарговы фінансавы год;

выкананнем мясцовых бюджэтаў, мэтавым і эфектыўным выкарыстаннем бюджэтных сродкаў пры разглядзе асобных пытанняў выканання бюджэтаў на пасяджэннях пастаянных камісій і на падставе дэпутацкіх запытаў;

выкананнем мясцовых бюджэтаў пры разглядзе і зацвярджэнні рашэнняў мясцовых Саветаў дэпутатаў аб зацвярджэнні справаздач аб выкананні мясцовых бюджэтаў за справаздачны фінансавы год.

**Артыкул 128. Паўнамоцтвы Міністэрства фінансаў, яго тэрытарыяльных органаў, мясцовых фінансавых органаў, фінансавых органаў адміністрацый раёнаў**

1. Да паўнамоцтваў Міністэрства фінансаў, яго тэрытарыяльных органаў па кантролі за прытрымліваннем бюджэтнага заканадаўства адносіцца ажыццяўленне кантролю за:

1.1. выкананнем бюджэтнага заканадаўства пры складанні, разглядзе, зацвярджэнні і выкананні рэспубліканскага бюджэту, мясцовых бюджэтаў і бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі;

1.2. выкананнем адзінай метадалогіі вядзення ўліку і складання справаздачнасці аб выкананні бюджэтаў, устаноўленай Міністэрствам фінансаў;

1.3. адпаведнасцю выплат прынятым бюджэтным абавязацельствам і бюджэтным асігнаванням;

1.4. своечасовым і поўным паступленнем даходаў і эфектыўным і мэтавым расходаваннем сродкаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, іншымі арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, выкананнем заканадаўства пры фарміраванні і выкарыстанні пазабюджэтных сродкаў бюджэтных арганізацый;

1.5. мэтавым выкарыстаннем і своечасовым зваротам бюджэтных сродкаў, дадзеных на зваротнай аснове, пені за несвоечасовы зварот бюджэтных сродкаў, дадзеных на зваротнай аснове, а таксама пазык (крэдытаў), атрыманых пад гарантыі Урада Рэспублікі Беларусь, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, своечасовым і поўным унясеннем працэнтаў (платы) за карыстанне бюджэтнымі сродкамі, дадзенымі на аплатнай аснове.

2. Да паўнамоцтваў мясцовых фінансавых органаў, фінансавых органаў адміністрацый раёнаў па кантролі за выкананнем бюджэтнага заканадаўства адносіцца ажыццяўленне кантролю на тэрыторыі адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай (тэрытарыяльнай) адзінкі за:

2.1. выкананнем бюджэтнага заканадаўства пры складанні, разглядзе, зацвярджэнні і выкананні адпаведных мясцовых бюджэтаў, бюджэтных каштарысаў адміністрацый раёнаў;

2.2. своечасовым і поўным паступленнем даходаў і эфектыўным і мэтавым расходаваннем сродкаў мясцовых бюджэтаў, прытрымліваннем заканадаўства пры фарміраванні і выкарыстанні пазабюджэтных сродкаў бюджэтных арганізацый;

2.3. мэтавым выкарыстаннем і своечасовым зваротам бюджэтных сродкаў, дадзеных на зваротнай аснове, пені за несвоечасовы зварот бюджэтных сродкаў,

дадзеных на зваротнай аснове, працэнтаў (платы) за карыстанне бюджэтнымі сродкамі, дадзенымі на аплатнай аснове.

3. Па патрабаванні Міністэрства фінансаў, яго тэрытарыяльных органаў, мясцовых фінансавых органаў, фінансавых органаў адміністрацый раёнаў банкі абавязаны падаваць інфармацыю аб стане бягучых (разліковых) банкаўскіх рахункаў органаў дзяржаўнага кіравання, іншых арганізацый, якія выкарыстоўваюць сродкі рэспубліканскага бюджэту, мясцовых бюджэтаў, бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, і аб руху бюджэтных сродкаў па рахунках іх атрымальнікаў; іншыя арганізацыі, а таксама індывідуальныя прадпрымальнікі абавязаны падаваць інфармацыю аб выкарыстанні грашовых сродкаў, атрыманых з рэспубліканскага бюджэту, мясцовых бюджэтаў, бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў.

**Артыкул 129. Паўнамоцтвы Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь і інспекцый Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь**

Да паўнамоцтваў Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь і інспекцый Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь па кантролі за выкананнем бюджэтнага заканадаўства адносіцца ажыццяўленне ў межах іх кампетэнцыі кантролю за своечасовым і поўным паступленнем даходаў у рэспубліканскі бюджэт і мясцовыя бюджэты.

**Артыкул 130. Паўнамоцтвы мытных органаў Рэспублікі Беларусь**

Да паўнамоцтваў мытных органаў Рэспублікі Беларусь па кантролі за выкананнем бюджэтнага заканадаўства адносіцца ажыццяўленне ў межах іх кампетэнцыі кантролю за своечасовым і поўным паступленнем даходаў у рэспубліканскі бюджэт.

**Артыкул 131. Паўнамоцтвы мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў**

Да паўнамоцтваў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў па кантролі за выкананнем бюджэтнага заканадаўства адносіцца ажыццяўленне ў межах іх кампетэнцыі кантролю за своечасовым і поўным паступленнем даходаў, эфектыўным і мэтавым расходаваннем сродкаў адпаведных мясцовых бюджэтаў і ніжэйстаячых бюджэтаў, своечасовым зваротам бюджэтных сродкаў, выдадзеных мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі і атрыманых імі на зваротнай аснове, своечасовым і поўным унясеннем працэнтаў (платы) за карыстанне бюджэтнымі сродкамі, дадзенымі на аплатнай аснове.

**Артыкул 132. Паўнамоцтвы распарадчыкаў бюджэтных сродкаў**

Да паўнамоцтваў распарадчыкаў бюджэтных сродкаў па кантролі за выкананнем бюджэтнага заканадаўства адносіцца ажыццяўленне ў межах іх кампетэнцыі кантролю за мэтавым і эфектыўным расходаваннем бюджэтных сродкаў атрымальнікамі бюджэтных сродкаў, своечасовым зваротам імі бюджэтных сродкаў, дадзеных на зваротнай аснове, своечасовым і поўным унясеннем працэнтаў (платы) за карыстанне бюджэтнымі сродкамі, дадзенымі на аплатнай аснове.

## ГЛАВА 26
## АДКАЗНАСЦЬ ЗА ПАРУШЭННЕ БЮДЖЭТНАГА ЗАКАНАДАЎСТВА

**Артыкул 133. Парушэнне бюджэтнага заканадаўства**

Невыкананне або неналежнае выкананне патрабаванняў, устаноўленых гэтым Кодэксам і іншымі актамі бюджэтнага заканадаўства па складанні, разглядзе, зацвярджэнні, выкананні бюджэтаў, а таксама патрабаванняў заканадаўства пры атрыманні і выкарыстанні бюджэтных сродкаў, прызнаюцца парушэннем бюджэтнага заканадаўства і цягнуць за сабой прымяненне да парушальніка (яго правапераемніка) мер прымусу за парушэнне бюджэтнага заканадаўства ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі.

**Артыкул 134. Меры прымусу, якія прымяняюцца за парушэнне бюджэтнага заканадаўства, і органы, якія маюць права на іх прымяненне**

1. За парушэнне бюджэтнага заканадаўства могуць быць прыменены наступныя меры прымусу:

1.1. прыпыненне або абмежаванне фінансавання расходаў за кошт бюджэтных сродкаў;

1.2. спагнанне бюджэтных сродкаў;

1.3. прыпыненне аперацый па рахунках у банку;

1.4. налічэнне і спагнанне пені;

1.5. іншыя меры ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі.

2. Органамі, якія маюць права на прымяненне мер прымусу за парушэнне бюджэтнага заканадаўства, з'яўляюцца:

2.1. Міністэрства фінансаў, яго тэрытарыяльныя органы, мясцовыя фінансавыя органы, фінансавыя органы адміністрацый раёнаў;

2.2. органы Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь;

2.3. іншыя ўпаўнаважаныя органы ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі.

3. Дзеянні ўпаўнаважаных органаў, указаных у пункце 2 гэтага артыкула, і іх службовых асоб пры прымяненні мер прымусу за парушэнне бюджэтнага заканадаўства могуць быць абскарджаны ў судовым парадку.

**Артыкул 135. Падставы для прымянення мер прымусу за парушэнне бюджэтнага заканадаўства**

Падставамі для прымянення мер прымусу за парушэнне бюджэтнага заканадаўства з'яўляюцца:

незаконнае атрыманне сродкаў з бюджэту;

нямэтавае выкарыстанне сродкаў бюджэту;

выкарыстанне сродкаў бюджэту з парушэннем бюджэтнага заканадаўства;

даванне бюджэтных пазычак, бюджэтных пазык з парушэннем устаноўленага парадку;

незварот або несвоечасовы зварот бюджэтных сродкаў, дадзеных на зваротнай аснове;

неералічэнне, няпоўнае пералічэнне бюджэтных сродкаў атрымальнікам бюджэтных сродкаў;

неералічэнне працэнтаў (платы) за карыстанне бюджэтнымі сродкамі, дадзенымі на аплатнай аснове;

невыкананне або неналежнае выкананне банкамі плацежных інструкцый на пералічэнне грашовых сродкаў;

непадаванне ва ўстаноўленыя тэрміны бухгалтарскай справаздачнасці і іншых звестак аб выкарыстанні бюджэтных сродкаў, інфармацыі аб руху бюджэтных сродкаў па рахунках іх атрымальнікаў;

парушэнне ўмоў дагавора з выкарыстаннем бюджэтных сродкаў.

**Артыкул 136. Незаконнае атрыманне сродкаў з бюджэту**

1. Пад незаконным атрыманнем сродкаў з бюджэту належыць разумець атрыманне арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі бюджэтных сродкаў незалежна ад крыніцы фінансавання (атрымання) праз завышэнне ў разліках, каштарысах, рахунках і іншых дакументах сум, якія падлягаюць атрыманню, падаванне недакладных звестак аб фінансавым стане арганізацый, індывідуальных прадпрымальнікаў пры атрыманні сродкаў з бюджэту і падаванне іншых недакладных дадзеных, якія з'явіліся падставай для атрымання сродкаў з бюджэту, у тым ліку залішняе атрыманне бюджэтных сродкаў у памерах, якія перавышаюць памеры, устаноўленыя заканадаўствам.

2. Незаконнае атрыманне сродкаў з бюджэту цягне за сабой прыпыненне або абмежаванне фінансавання расходаў за кошт бюджэтных сродкаў або спагнанне ў бясспрэчным парадку ў даход адпаведнага бюджэту атрыманых бюджэтных сродкаў з налічэннем працэнтаў у памеры 1/360 стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь на дату спагнання за кожны дзень з даты іх атрымання па дату пакрыцця (спагнання).

У выпадку добраахвотнага пакрыцця незаконна атрыманых бюджэтных сродкаў працэнты налічваюцца ў памеры 1/360 стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь на дату іх выплаты за кожны дзень з даты іх атрымання па дату выплаты.

**Артыкул 137. Нямэтавае выкарыстанне сродкаў бюджэту**

1. Пад нямэтавым выкарыстаннем сродкаў бюджэту належыць разумець любыя дзеянні распарадчыкаў або атрымальнікаў бюджэтных сродкаў, якія выявіліся ў накіраванні і выкарыстанні ўказаных сродкаў на мэты, што не адпавядаюць поўнасцю або часткова мэтам іх атрымання, вызначаным законам аб рэспубліканскім бюджэце, рашэннямі мясцовых Саветаў дэпутатаў аб бюджэце на чарговы фінансавы год, іншымі актамі заканадаўства, бюджэтным роспісам, паведамленнем аб сродках, якія перадаюцца ніжэйстаячым бюджэтам у форме міжбюджэтных трансфертаў, бюджэтным каштарысам і разлікамі, пералікамі да яго.

2. Не з'яўляюцца выкарыстаннем бюджэтных сродкаў не па мэтавым прызначэнні атрыманне і накіраванне на працягу фінансавага года (са згоды Міністэрства фінансаў, мясцовага фінансавага органа) бюджэтных сродкаў іх атрымальнікамі на аднаўленне ўласных сродкаў, зрасходаваных (з выкананнем працэдур, прадугледжаных пры ажыццяўленні закупак тавараў (работ, паслуг) за кошт сродкаў бюджэту і знешніх дзяржаўных пазык) на пакрыццё выдаткаў, фінансаванне якіх ажыццяўляецца згодна з планавымі бюджэтнымі асігнаваннямі ў адпаведнасці з бюджэтнымі каштарысамі за кошт (або з удзелам) бюджэтных сродкаў, але праведзена несвоечасова, а таксама недакладнае адлюстраванне расходаў па эканамічнай класіфікацыі расходаў бюджэту пры захаванні адраснай накіраванасці.

3. Нямэтавае выкарыстанне сродкаў бюджэту цягне за сабой прыпыненне або абмежаванне фінансавання расходаў за кошт бюджэтных сродкаў або спагнанне ў бясспрэчным парадку ў даход адпаведнага бюджэту атрыманых бюджэтных сродкаў з налічэннем працэнтаў у памеры 1/360 стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь на дату спагнання за кожны дзень з даты нямэтавага іх выкарыстання па дату пакрыцця (спагнання).

У выпадку добраахвотнага пакрыцця бюджэтных сродкаў, выкарыстаных не па мэтавым прызначэнні, працэнты налічваюцца ў памеры 1/360 стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь на дату іх выплаты за кожны дзень з даты нямэтавага іх выкарыстання па дату выплаты.

**Артыкул 138. Выкарыстанне сродкаў бюджэту з парушэннем бюджэтнага заканадаўства**

1. Пад выкарыстаннем сродкаў бюджэту з парушэннем бюджэтнага заканадаўства належыць разумець выкарыстанне бюджэтных сродкаў з парушэннем патрабаванняў, устаноўленых гэтым Кодэксам і іншымі актамі бюджэтнага заканадаўства, а таксама заканадаўства, якое прадугледжвае выкарыстанне бюджэтных сродкаў. Прыняцце абавязацельстваў, не забяспечаных бюджэтнымі асігнаваннямі, пры адсутнасці іншых крыніц фінансавання такіх абавязацельстваў прыраўноўваецца да выкарыстання сродкаў бюджэту з парушэннем бюджэтнага заканадаўства.

2. Выкарыстанне бюджэтных сродкаў з парушэннем бюджэтнага заканадаўства цягне за сабой прыпыненне або абмежаванне фінансавання расходаў за кошт бюджэтных сродкаў або спагнанне ў бясспрэчным парадку ў даход адпаведнага бюджэту атрыманых бюджэтных сродкаў з налічэннем працэнтаў у памеры 1/360 стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь на дату спагнання за кожны дзень з даты такога выкарыстання па дату пакрыцця (спагнання).

У выпадку добраахвотнага пакрыцця сродкаў бюджэту, выкарыстаных з парушэннем бюджэтнага заканадаўства, працэнты налічваюцца ў памеры 1/360 стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь на дату іх выплаты за кожны дзень з даты такога выкарыстання па дату выплаты.

**Артыкул 139. Даванне бюджэтных пазычак, бюджэтных пазык з парушэннем устаноўленага парадку**

Даванне бюджэтных пазычак, бюджэтных пазык з парушэннем устаноўленага парадку цягне за сабой спагнанне ў бясспрэчным парадку сум дадзеных бюджэтных сродкаў і (або) прыпыненне аперацый па рахунках у банку.

**Артыкул 140. Незварот або несвоечасовы зварот бюджэтных сродкаў, дадзеных на зваротнай аснове**

1. Незварот бюджэтных сродкаў, дадзеных на зваротнай аснове, ва ўстаноўлены для звароту ў тэрмін цягне за сабой спагнанне ў бясспрэчным парадку ўказаных сродкаў і (або) прыпыненне аперацый па рахунках у банку.

2. Несвоечасовы зварот бюджэтных сродкаў, дадзеных на зваротнай аснове, цягне за сабой спагнанне пені ў адпаведнасці з заканадаўствам і (або) прыпыненне аперацый па рахунках у банку.

**Артыкул 141. Неператічэнне, няпоўнае пералічэнне бюджэтных сродкаў атрымальнікам бюджэтных сродкаў**

Непералічэнне бюджэтных сродкаў атрымальнікам бюджэтных сродкаў, пералічэнне бюджэтных сродкаў у меншым аб'ёме, чым прадугледжана паведамленнем аб бюджэтных асігнаваннях, цягнуць за сабой пералічэнне бюджэтных сродкаў атрымальнікам бюджэтных сродкаў да памеру, прадугледжанага паведамленнем аб бюджэтных асігнаваннях.

**Артыкул 142. Непералічэнне працэнтаў (платы) за карыстанне бюджэтнымі сродкамі, дадзенымі на аплатнай аснове**

Непералічэнне працэнтаў (платы) за карыстанне бюджэтнымі сродкамі, дадзенымі на аплатнай аснове, цягне за сабой спагнанне ў бясспрэчным парадку сум працэнтаў (платы) за карыстанне бюджэтнымі сродкамі, дадзенымі на аплатнай аснове, і (або) прыпыненне аперацый па рахунках у банку.

**Артыкул 143. Невыкананне або неналежнае выкананне банкамі плацежных інструкцый на пералічэнне грашовых сродкаў**

За невыкананне або неналежнае выкананне банкамі плацежных інструкцый на пералічэнне грашовых сродкаў, якія падлягаюць залічэнню на рахункі па ўліку сродкаў адпаведнага бюджэту і атрымальнікаў бюджэтных сродкаў, і на пералічэнне грашовых сродкаў з бюджэту банкі нясуць адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам.

**Артыкул 144. Непадаванне ва ўстаноўленыя тэрміны бухгалтарскай справаздачнасці і іншых звестак аб выкарыстанні бюджэтных сродкаў, інфармацыі аб руху бюджэтных сродкаў па рахунках іх атрымальнікаў**

Непадаванне ва ўстаноўленыя тэрміны бухгалтарскай справаздачнасці ў адпаведнасці з заканадаўствам аб бухгалтарскім уліку і справаздачнасці, а таксама іншых звестак аб выкарыстанні бюджэтных сродкаў у складзе, вызначаным Міністэрствам фінансаў, інфармацыі аб руху бюджэтных сродкаў па рахунках іх атрымальнікаў цягне за сабой прыпыненне або абмежаванне фінансавання расходаў за кошт бюджэтных сродкаў.

**Артыкул 145. Парушэнне ўмоў дагавора з выкарыстаннем бюджэтных сродкаў**

Юрыдычныя асобы, іх адасобленыя падраздзяленні, індывідуальныя прадпрымальнікі, якія атрымалі за кошт сродкаў бюджэту папярэднюю аплату і якія не выканалі або неналежным чынам выканалі абавязацельства па пастаўцы тавараў (выкананні работ, аказанні паслуг) у тэрміны, прадугледжаныя дагаворам, выплачваюць пакупніку (заказчыку) за кожны пратэрмінаваны дзень пеню ў памеры, устаноўленым заканадаўствам, а таксама працэнты за карыстанне грашовымі сродкамі ў памеры 1/360 стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь на дзень выканання абавязацельства або яго адпаведнай часткі з залічэннем сум пені і працэнтаў у даход адпаведнага бюджэту.

**Артыкул 146. Спагнанне грашовых сродкаў з арганізацый, індывідуальных прадпрымальнікаў і прыпыненне аперацый па рахунках арганізацый, індывідуальных прадпрымальнікаў у банках**

1. Сродкі бюджэту, у тым ліку ў выглядзе бюджэтных пазычак, бюджэтных пазык, незаконна атрыманыя або выкарыстаныя не па мэтавым прызначэнні або з парушэннем бюджэтнага заканадаўства, запазычанасць па бюджэтных пазычак, бюджэтных пазыках, працэнты па бюджэтных пазыках, а таксама запазычанасць па выкананых гарантыях Урада Рэспублікі Беларусь і мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, працэнтаў па іх, пеня, налічаная Міністэрствам фінансаў, яго тэрытарыяльнымі органамі, мясцовымі фінансавымі органамі, і іншыя выплаты (працэнты за карыстанне грашовымі сродкамі бюджэту, якія знаходзяцца і размяшчаюцца на рахунках у банках, даходы ад здачы ў арэнду маёмасці, іншыя непадатковыя даходы ў адпаведнасці з заканадаўствам) у выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі, спаганяюцца Міністэрствам фінансаў, яго тэрытарыяльнымі органамі, мясцовымі фінансавымі органамі, фінансавымі органамі адміністрацый раёнаў у бясспрэчным парадку.

Сродкі бюджэту, незаконна атрыманыя або выкарыстаныя не па мэтавым прызначэнні або з парушэннем бюджэтнага заканадаўства, налічаныя працэнты на сумы бюджэтных сродкаў, незаконна атрыманых або выкарыстаных не па мэтавым прызначэнні або з парушэннем бюджэтнага заканадаўства, спаганяюцца органамі Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь, якія праводзілі праверку, у бясспрэчным парадку.

2. Спагнанне накіроўваецца на грашовыя сродкі, якія знаходзяцца на рахунках арганізацый, індывідуальных прадпрымальнікаў у банках, у тым ліку дэпазітных, на падставе загада Міністэрства фінансаў, яго тэрытарыяльнага органа або мясцовага

фінансавага органа, фінансавага органа адміністрацыі раёна, прадпісання органа Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь аб прымусовым спагнанні грашовых сродкаў, якія з'яўляюцца выканаўчымі дакументамі.

3. Спагнанне сродкаў бюджэту, пені, запазычанасці і іншых выплат, указаных у частцы першай пункта 1 гэтага артыкула, за кошт сродкаў дэбітораў арганізацый, індывідуальных прадпрымальнікаў праводзіцца ў бясспрэчным парадку на падставе загада Міністэрства фінансаў, яго тэрытарыяльнага органа або мясцовага фінансавага органа, фінансавага органа адміністрацыі раёна аб прымусовым спагнанні грашовых сродкаў.

Спагнанне сродкаў бюджэту, указаных у частцы другой пункта 1 гэтага артыкула, за кошт сродкаў дэбітораў арганізацый, індывідуальных прадпрымальнікаў праводзіцца ў бясспрэчным парадку на падставе прадпісання органа Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь аб прымусовым спагнанні грашовых сродкаў.

4. Загад Міністэрства фінансаў, яго тэрытарыяльнага органа або мясцовага фінансавага органа, фінансавага органа адміністрацыі раёна, прадпісанне органа Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь, указаныя ў пункце 3 гэтага артыкула, прымаюцца з улікам тэрмінаў выканання абавязацельстваў паміж арганізацыяй, індывідуальным прадпрымальнікам і іх дэбіторамі. Загад, прадпісанне выносяцца ў адносінах да аднаго або некалькіх дэбітораў арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка на падставе акта праверкі арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка або іх заявы аб уступцы патрабавання крэдытора і дакумента (акта зверкі або іншага падпісанага дэбіторам і арганізацыяй, індывідуальным прадпрымальнікам дакумента), які пацвярджае наяўнасць дэбіторскай запазычанасці ў арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка і крэдыторскай запазычанасці ў дэбітора на дату падачы заявы. Загад, прадпісанне павінны ўтрымліваць указанне на дэбітора арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка і суму, якая падлягае спагнанню і якая не можа перавышаць суму дэбіторскай запазычанасці гэтага дэбітора.

5. Загад Міністэрства фінансаў, яго тэрытарыяльнага органа або мясцовага фінансавага органа, фінансавага органа адміністрацыі раёна, прадпісанне органа Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь аб прымусовым спагнанні грашовых сродкаў і плацежная інструкцыя выдаюцца банку, які абслугоўвае адпаведны орган, на папяровым носьбіце або па ўстаноўленых фарматах у выглядзе электроннага дакумента.

6. Адказнасць за дакладнасць звестак аб дэбіторах і сумах дэбіторскай запазычанасці нясуць арганізацыя, індывідуальны прадпрымальнік.

7. Спагнанне не праводзіцца за кошт грашовых сродкаў на спецыяльных рахунках і субрахунках арганізацый, індывідуальных прадпрымальнікаў, іх дэбітораў, адкрытых у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі, дабрачынных рахунках, адкрытых для збору, захоўвання і выкарыстання грашовых сродкаў, у тым ліку ў замежнай валюце, якія паступаюць у выглядзе бязвыплатнай (спонсарскай) дапамогі або ахвяраванняў, а таксама на рахунках, якія выкарыстоўваюцца для ажыццяўлення разлікаў у форме акрэдытываў за кошт бюджэтных сродкаў.

8. Пры недастатковасці або адсутнасці на рахунках арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка грашовых сродкаў спагнанне накіроўваецца на іншую маёмасць арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка ў судовым парадку.

9. Бюджэтныя арганізацыі ажыццяўляюць зварот сродкаў, незаконна атрыманых з бюджэту або выкарыстаных не па мэтавым прызначэнні або з парушэннем бюджэтнага заканадаўства, у даход адпаведнага бюджэту за кошт пазабюджэтных сродкаў, а пры іх адсутнасці або недастатковасці – за кошт бюджэтных сродкаў бягучага года, прадугледжаных у каштарысе расходаў бюджэтнай арганізацыі па артыкуле, па якім

дапушчана парушэнне, а пры недастатковасці або адсутнасці сродкаў па дадзеным артыкуле – за кошт агульнай эканоміі сродкаў па каштарысе бюджэтнай арганізацыі.

10. У выпадку невыканання арганізацыяй, індывідуальным прадпрымальнікам абавязацельстваў перад бюджэтам, пені і запазычанасці, а таксама немагчымасці прыняцця мер, прадугледжаных пунктамі 1–3 гэтага артыкула, Міністэрства фінансаў, яго тэрытарыяльныя органы або мясцовыя фінансавыя органы, фінансавыя органы адміністрацый раёнаў, органы Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь, іншыя ўпаўнаважаныя органы ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі маюць права прыпыняць аперацыі па рахунках у банках, за выключэннем аперацый, якія ажыццяўляюцца са спецыяльных рахункаў і субрахункаў, адкрытых у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі, дабрачынных рахункаў, адкрытых для збору, захоўвання і выкарыстання грашовых сродкаў, у тым ліку ў замежнай валюце, якія паступаюць у выглядзе бязвыплатнай (спонсарскай) дапамогі або ахвяраванняў.

Прыпыненнем аперацый арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка па рахунках у банках прызнаецца спыненне банкам усіх расходных аперацый па рахунках у парадку, устаноўленым актамі заканадаўства.

Прыпыненне аперацый па рахунках у банках у выпадках, указаных у частцы першай гэтага пункта, не распаўсюджваецца на аперацыі, звязаныя з ажыццяўленнем выплат у бюджэт, і на іншыя аперацыі ў выпадках, устаноўленых заканадаўчымі актамі.

Пры наяўнасці ў банку рашэння аб прыпыненні аперацый арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка па рахунках у банку ўказаны банк не мае права адкрываць гэтай арганізацыі, індывідуальнаму прадпрымальніку іншыя рахункі (за выключэннем спецыяльных рахункаў і субрахункаў, адкрыццё якіх прадугледжана заканадаўчымі актамі, а таксама рахункаў па ўліку сродкаў бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь). Іншыя банкі не маюць права адкрываць арганізацыі, індывідуальнаму прадпрымальніку рахункі (за выключэннем спецыяльных рахункаў і субрахункаў, адкрыццё якіх прадугледжана заканадаўчымі актамі, а таксама рахункаў па ўліку сродкаў бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь) пры наяўнасці ў іх атрыманай з аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы, якая выкарыстоўваецца пры ўзаемадзеянні рэгіструючых органа з упаўнаважанымі органамі і арганізацыямі, у тым ліку падатковымі і мытнымі органамі, банкамі, інфармацыі аб прыпыненні аперацый арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка па рахунках у іншых банках.

Рашэнне аб прыпыненні аперацый або аб заканчэнні прыпынення аперацый арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка па рахунках у банку перадаецца ў банк на папяровым носьбіце або па ўстаноўленых фарматах у выглядзе электроннага дакумента.

$10^1$. Парадак узаемадзеяння Міністэрства фінансаў, яго тэрытарыяльных органаў, мясцовых фінансавых органаў і банкаў, нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацый Рэспублікі Беларусь з прымяненнем электронных дакументаў пры спагнанні бюджэтных сродкаў і прыпыненні аперацый па рахунках у банках устанаўліваецца Міністэрствам фінансаў і Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь.

11. На падставе хадайніцтва арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка Міністэрства фінансаў, яго тэрытарыяльныя органы, мясцовыя фінансавыя органы, фінансавыя органы адміністрацый раёнаў, органы Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь, якія праводзілі праверку, маюць права аднаразова даваць адтэрміноўку і (або) растэрміноўку пакрыцця ў рэспубліканскі або адпаведныя мясцовыя бюджэты незаконна атрыманых з бюджэту або выкарыстаных не па мэтавым

прызначэнні або з парушэннем бюджэтнага заканадаўства бюджэтных сродкаў і налічаных працэнтаў на тэрмін да шасці месяцаў.

Рашэнне аб даванні адтэрміноўкі і (або) растэрміноўкі прымаецца ўказанымі ў частцы першай гэтага пункта органамі не пазней 15 дзён з дня паступлення хадайніцтва аб даванні адтэрміноўкі і (або) растэрміноўкі. На тэрмін разгляду падананага хадайніцтва бясспрэчнае спагнанне грашовых сродкаў прыпыняецца.

Органы, якія прынялі рашэнне аб даванні адтэрміноўкі і (або) растэрміноўкі, маюць права адмяніць рашэнне аб прыпыненні аперацый арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка па рахунках у банку.

Пры прыняцці рашэння аб даванні адтэрміноўкі і (або) растэрміноўкі налічэнне працэнтаў у памеры 1/360 стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь на сумы бюджэтных сродкаў, незаконна атрыманых або выкарыстаных не па мэтавым прызначэнні або з парушэннем заканадаўства, спыняецца з першага дня тэрміну, на які даюцца адтэрміноўка і (або) растэрміноўка, пры ўмове выканання ўстаноўленых рашэннем аб даванні адтэрміноўкі і (або) растэрміноўкі тэрмінаў і іншых умоў выплаты ўказаных сум.

Пры незахаванні тэрмінаў і іншых умоў пакрыцця бюджэтных сродкаў, незаконна атрыманых або выкарыстаных не па мэтавым прызначэнні або з парушэннем заканадаўства, у даход адпаведнага бюджэту дзеянне адтэрміноўкі і (або) растэрміноўкі спыняецца па рашэнні органа,  які яе (іх) даў, са спагнаннем працэнтаў на суму, якая падлягае пакрыццю ў даход адпаведнага бюджэту.

## РАЗДЗЕЛ XI
## ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

## ГЛАВА 27
## ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

### Артыкул 147. Прызнанне, што некаторыя акты заканадаўства і асобныя палажэнні заканадаўчых актаў страцілі сілу

У сувязі з прыняццем гэтага Кодэкса прызнаць, што страцілі сілу:

1. Закон Рэспублікі Беларусь ад 27 мая 1993 года «Аб унутраным дзяржаўным доўгу Рэспублікі Беларусь» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1993 г., № 19, арт. 213).

2. Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 чэрвеня 1993 года «Аб бюджэтнай сістэме Рэспублікі Беларусь і дзяржаўных пазабюджэтных фондах» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1993 г., № 20, арт. 240).

3. Закон Рэспублікі Беларусь ад 24 верасня 1996 года «Аб унясенні змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб унутраным дзяржаўным доўгу Рэспублікі Беларусь» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1996 г., № 32, арт. 581).

4. Закон Рэспублікі Беларусь ад 5 мая 1998 года «Аб бюджэтнай класіфікацыі Рэспублікі Беларусь» (Ведамасці Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, 1998 г., № 20, арт. 223).

5. Закон Рэспублікі Беларусь ад 22 чэрвеня 1998 года «Аб знешнім дзяржаўным доўгу Рэспублікі Беларусь» (Ведамасці Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, 1998 г., № 25-26, арт. 431).

6. Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 1998 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб бюджэтнай сістэме Рэспублікі Беларусь» (Ведамасці Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, 1998 г., № 34, арт. 476).

7. Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 снежня 1998 года «Аб дапаўненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб бюджэтнай сістэме Рэспублікі Беларусь» (Ведамасці Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, 1999 г., № 1, арт. 1).

8. Закон Рэспублікі Беларусь ад 2 снежня 1999 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб бюджэтнай сістэме Рэспублікі Беларусь і дзяржаўных пазабюджэтных фондах» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 1999 г., № 95, 2/106).

9. Закон Рэспублікі Беларусь ад 25 кастрычніка 2000 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб бюджэтнай класіфікацыі Рэспублікі Беларусь» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2000 г., № 103, 2/214).

10. Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 ліпеня 2002 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб бюджэтнай сістэме Рэспублікі Беларусь і дзяржаўных пазабюджэтных фондах» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2002 г., № 80, 2/868).

11. Артыкулы 13 і 18 Закона Рэспублікі Беларусь ад 24 ліпеня 2002 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўнення ў некаторыя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь у сувязі з рэарганізацыяй сістэмы рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2002 г., № 87, 2/883).

12. Закон Рэспублікі Беларусь ад 18 снежня 2002 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб бюджэтнай класіфікацыі Рэспублікі Беларусь» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2003 г., № 2, 2/914).

13. Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 лістапада 2003 года «Аб унясенні дапаўнення ў Закон Рэспублікі Беларусь «Аб бюджэтнай класіфікацыі Рэспублікі Беларусь» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2003 г., № 125, 2/991).

14. Артыкул 6 Закона Рэспублікі Беларусь ад 22 снежня 2005 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь па пытаннях натарыяльнай дзейнасці» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 6, 2/1173).

15. Артыкул 10 Закона Рэспублікі Беларусь ад 31 снежня 2005 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па падатковых і бюджэтных пытаннях» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 6, 2/1177).

16. Закон Рэспублікі Беларусь ад 29 снежня 2006 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях бюджэтнай класіфікацыі» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 4, 2/1286).

17. Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 27 мая 1993 года «Аб парадку ўвядзення ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унутраным дзяржаўным доўгу Рэспублікі Беларусь» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1993 г., № 19, арт. 214).

18. Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 4 чэрвеня 1993 года «Аб парадку ўвядзення ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь «Аб бюджэтнай сістэме Рэспублікі Беларусь» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1993 г., № 20, арт. 241).

**Артыкул 148. Прывядзенне актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Кодэксам**

Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у шасцімесячны тэрмін з дня афіцыйнага апублікавання гэтага Кодэкса:

падрыхтаваць і ўнесці ва ўстаноўленым парадку ў Палату прадстаўнікоў прапановы аб прывядзенні заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Кодэксам;

прывесці рашэнні Урада Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Кодэксам;

забяспечыць прывядзенне рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, падпарадкаванымі Ураду Рэспублікі Беларусь, іх нарматыўных прававых актаў у адпаведнасць з гэтым Кодэксам;

прыняць іншыя меры, неабходныя для рэалізацыі палажэнняў гэтага Кодэкса.

**Артыкул 149. Уступленне ў сілу гэтага Кодэкса**

1. Гэты Кодэкс уступае ў сілу з 1 студзеня 2009 года, за выключэннем гэтага артыкула і артыкула 148, якія ўступаюць у сілу з дня афіцыйнага апублікавання гэтага Кодэкса, а таксама артыкулаў 30–37, 44–47 і пункта 4 артыкула 105, які ўступаюць у сілу з 1 студзеня 2010 года.

2. Да прывядзення заканадаўства Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Кодэксам акты заканадаўства Рэспублікі Беларусь прымяняюцца ў той частцы, у якой яны не супярэчаць гэтаму Кодэксу, калі іншае не прадугледжана Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь** **А. Лукашэнка**

Дадатак
да Бюджэтнага кодэкса
Рэспублікі Беларусь

**Функцыянальная класіфікацыя расходаў бюджэту па раздзелах і падраздзелах**

| Раздзел | Падраздзел | Найменне раздзелаў і падраздзелаў |
|---|---|---|
| 01 | | АГУЛЬНАДЗЯРЖАЎНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ |
| 01 | 01 | Дзяржаўныя органы агульнага прызначэння |
| 01 | 02 | Міжнародная дзейнасць |
| 01 | 03 | Міжнародная эканамічная і гуманітарная дапамога |
| 01 | 04 | Забеспячэнне правядзення выбараў і рэферэндумаў |
| 01 | 05 | Абслугоўванне дзяржаўнага доўгу Рэспублікі Беларусь |
| 01 | 06 | Дзяржаўны матэрыяльны рэзерв |
| 01 | 07 | Фундаментальныя навуковыя даследаванні |
| 01 | 08 | Прыкладныя даследаванні ў галіне агульнадзяржаўнай дзейнасці |
| 01 | 09 | Рэзервовыя фонды |
| 01 | 10 | Іншая агульнадзяржаўная дзейнасць |
| 01 | 11 | Міжбюджэтныя трансферты |
| 02 | | НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АБАРОНА |
| 02 | 01 | Абарона і Узброеныя сілы Рэспублікі Беларусь |
| 02 | 02 | Забеспячэнне мабілізацыйнай падрыхтоўкі і мабілізацыі |
| 02 | 03 | Іншыя пытанні, звязаныя з нацыянальнай абаронай |
| 03 | | СУДОВАЯ ЎЛАДА, ПРАВААХОЎНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ І ЗАБЕСПЯЧЭННЕ БЯСПЕКІ |
| 03 | 01 | Органы ўнутраных спраў |

| | | |
|---|---|---|
| 03 | 02 | Органы пракуратуры |
| 03 | 03 | Органы пагранічнай службы |
| 03 | 04 | Органы і арганізацыі крымінальна-выканаўчай сістэмы |
| 03 | 05 | Органы дзяржаўнай бяспекі |
| 03 | 06 | Выключана |
| 03 | 07 | Органы судовай улады |
| 03 | 08 | Мытныя органы |
| 03 | 09 | Органы і падраздзяленні па надзвычайных сітуацыях |
| 03 | 10 | Папярэджанне і ліквідацыя наступстваў надзвычайных сітуацый |
| 03 | 11 | Прыкладныя даследаванні ў галіне праваахоўнай дзейнасці і забеспячэння бяспекі |
| 03 | 12 | Іншыя пытанні ў галіне праваахоўнай дзейнасці і забеспячэння бяспекі |
| 04 | | НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ЭКАНОМІКА |
| 04 | 01 | Агульныя эканамічныя пытанні |
| 04 | 02 | Сельская гаспадарка, рыбагаспадарчая дзейнасць |
| 04 | 03 | Лясная гаспадарка |
| 04 | 04 | Прамысловасць, будаўніцтва і архітэктура |
| 04 | 05 | Транспарт |
| 04 | 06 | Дарожная гаспадарка |
| 04 | 07 | Сувязь |
| 04 | 08 | Паліва і энергетыка |
| 04 | 09 | Прыкладныя даследаванні ў галіне нацыянальнай эканомікі |
| 04 | 10 | Іншая дзейнасць у галіне нацыянальнай эканомікі |
| 05 | | АХОВА НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ |
| 05 | 01 | Выключана |
| 05 | 02 | Ахова прыроднага асяроддзя |
| 05 | 03 | Прыкладныя даследаванні ў галіне аховы навакольнага асяроддзя |
| 05 | 04 | Іншая дзейнасць у галіне аховы навакольнага асяроддзя |
| 06 | | ЖЫЛЛЁВА-КАМУНАЛЬНЫЯ ПАСЛУГІ І ЖЫЛЛЁВАЕ БУДАЎНІЦТВА |
| 06 | 01 | Жыллёвае будаўніцтва |
| 06 | 02 | Жыллёва-камунальная гаспадарка |
| 06 | 03 | Добраўпарадкаванне населеных пунктаў |
| 06 | 04 | Прыкладныя даследаванні ў галіне жыллёва-камунальных паслуг |
| 06 | 05 | Іншыя пытанні ў галіне жыллёва-камунальных паслуг |
| 07 | | АХОВА ЗДАРОЎЯ |
| 07 | 01 | Медыцынская дапамога насельніцтву |
| 07 | 02 | Дзяржаўны санітарны нагляд |
| 07 | 03 | Прыкладныя даследаванні ў галіне аховы здароўя |
| 07 | 04 | Іншыя пытанні ў галіне аховы здароўя |
| 08 | | ФІЗІЧНАЯ КУЛЬТУРА, СПОРТ, КУЛЬТУРА І СРОДКІ МАСАВАЙ ІНФАРМАЦЫІ |
| 08 | 01 | Фізічная культура і спорт |

| | | |
|---|---|---|
| 08 | 02 | Культура |
| 08 | 03 | Сродкі масавай інфармацыі |
| 08 | 04 | Прыкладныя даследаванні ў галіне фізічнай культуры, спорту, культуры і сродкаў масавай інфармацыі |
| 08 | 05 | Пытанні рэлігіі і іншыя пытанні ў галіне фізічнай культуры, спорту, культуры і сродкаў масавай інфармацыі |
| 09 | | АДУКАЦЫЯ |
| 09 | 01 | Дашкольная адукацыя |
| 09 | 02 | Агульная сярэдняя адукацыя |
| 09 | 03 | Прафесіянальна-тэхнічная адукацыя |
| 09 | 04 | Сярэдняя спецыяльная адукацыя |
| 09 | 05 | Вышэйшая і пасляўніверсітэцкая адукацыя |
| 09 | 06 | Дадатковая адукацыя дарослых |
| 09 | 07 | Дадатковая адукацыя дзяцей і моладзі |
| 09 | 08 | Прыкладныя даследаванні ў галіне адукацыі |
| 09 | 09 | Іншыя пытанні ў галіне адукацыі |
| 10 | | САЦЫЯЛЬНАЯ ПАЛІТЫКА |
| 10 | 01 | Сацыяльная абарона |
| 10 | 02 | Пенсійнае забеспячэнне |
| 10 | 03 | Дапамога сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей |
| 10 | 04 | Дзяржаўная маладзёжная палітыка |
| 10 | 05 | Садзейнічанне занятасці насельніцтва |
| 10 | 06 | Дапамога ў забеспячэнні жыллём |
| 10 | 07 | Прыкладныя даследаванні ў галіне сацыяльнай палітыкі |
| 10 | 08 | Іншыя пытанні ў галіне сацыяльнай палітыкі |